Марыя ВАЙЦЯШОНАК



# Сад нявіннасці

Марыя ВАЙЦЯШОНАК

# *Сад нявіннасці*

Апавяданні

Мінск
2002

**Вайцяшонак М.**
Сад нявіннасці. Апавяданні / М. Вайцяшонак.
2002. — 192 с.

Вядомую аўтарку найперш хвалюе біблейскае папярэджанне: Бог пасе коней апакаліпсіса па дзікай траве. «Сад нявіннасці» — кніга прозы аб складанейшым свеце так званага простага вяскоўца, у якім патрывожаны дух земляроба, парушана генетычная сувязь з маткай-зямлёй; гэта нераўнадушнае слова аб звярах і дрэвах , а ўвогуле — аб прыродзе (чалавечы асяродак). Усё падаецца ад асобы, якая ў жыцці быццам і не была ніколі абражаная, бо пераадолела абразу. Няма нічога на свеце лішняга, нічога непатрэбнага, як кажа адна з вясковых жанчын у апавяданні, таму гармонію ўсяго жывога трэба пільна аберагаць, падтрымліваць, ствараючы тое адзінае, што выратуе і зямлю, і жывую душу.

Апавяданні Марыі Вайцяшонак друкаваліся ў штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», часопісах «Полымя», «Беларусь» і «Крыніца».

© Вайцяшонак М., 2002



# ДВА ГАДЫ ДА ВЯСНЫ

Сабакі забрахалі, пачуўшы чужыя крокі на лесвічнай пляцоўцы, яна адчыніла адразу, не чакаючы званка. Заўсёды збіралася ў дарогу загадзя, якая б тая дарога ні выпадала: кароткая ці доўгая. Чакала па-вясковаму, седзячы, каленькі разам, быццам ужо сядзіць на людзях, далёка глядзела перад сабой, пільнуючыся, бо варта толькі адхінуцца, адысціся ў бок, да люстэрка, як скранецца пад нагамі, не ўстоіш. Яна амаль адчувала пачатак сваёй дарогі пад сабой тут, у гарадской кватэры, выкінуты адным канцом, як цяжкі скрутак. І вось зараз сама пераступіла парог насустрач і, ледзьве прывітаўшыся, ужо бралася за вандзэлкі, мальберт, падрамнік, выстаўленыя за дзверы. Мужчына адхіліў яе няўлоўна, сабраў усё ў абедзве рукі гірляндамі, панёс уніз, да машыны. Юля яшчэ пастаяла нейкае імгненне разгубленая, сагнуўшы плечы, як пад каромыслам, гатовая цягаць на сабе, натурачыся, што можа абысціся — і павінна — без чужой дапамогі. «Няхай ж бы я хоць кубак кавы прапанавала, — слаба падумалася. — А, незнаёмы чалавек... Ну, прыяцель сяброўкі, што яму бавіцца, час марнаваць на госці... Казала, мусі, лётчык... Шкада, імя не памятаю...»

Не любіла адлучацца, але трэба пачынаць дачны сезон — матчына хата пустуе ўсю зіму.

Мужчына яшчэ раз адчыніў дзверцы, калі яна ўжо сядзела ззаду, нахіліўся блізка пад нізкай столлю машыны, каб папраўіць ейную пакладзь: адно — пацягнуў да сябе, другое — вышэй падняў; нагам стала слабадней. Не паспела адхіліцца (ледзь на калені не апёрся!), збянтэжыцца — і чужога духу не пачула, — бы анёл парадкаваўся побач. У люстэрку насупраць бачыла ўсю дарогу, ягоныя ціхія галубовыя вочы, без

зрэнак, усё роўна як пасля лёгкага сну з галавой пад шызым скрыллем. «Вельмі ўжо тыповы лётчык... каб чорт на форму не знёс, часам...»

— Не дзьме? — адчыніў акно. — Можа, печку ўключыць?

— Не, не, не, дзякую.

Так звыкла зняў увесь клопат, як галаўны боль, ні аб чым не думалася. Нешта гаварыў, нязначнае, можна было не адказваць, і дрэнна чувалася, нічога потым не магла ўспомніць. Толькі стомлена заўважала іншы раз, як ён ускідваў галаву, гледзячы ў высокае люстэрка ў машыне. Выдавала, нібы яны стаяць вельмі блізка насупраць адзін аднаго, зазіраючы ў твар пры нейкай надта крэўнай размове... Вандзэлкі на выбоінах — «паветраных ямах» — краталіся з усіх бакоў, як на возе. «Каб хаця фарбы не патаўчы... — Ужо брала дасада, што, пэўна, не ўпаліш дровы, дым будзе паўзці на хату, пакуль трапіць у сыры комін. — Занадта прыгожы мужчына...» — думала яна як не з дакорам. Не, такія ёй не падабаліся. Яна магла б змоўчыць яму, каб і невядома што-якое, не азвацца, — сядзела, як баба кірмашовая, укуліўшыся, абы даехаць, абы не пехатой.

...Што гэта быў сёлета за год ці, можа, два? Якая пара? Даўно атрэсла з рук пярсцёнкі, пацеркі ў пеляну, падазвала да сябе дачку, цацкалася разам з ёй. Недзе зшарылася дарагая завушніца — не шкадавала. Устане, шморгне з падала ўбок, страсе з сябе залатыя пырскі. Адарваўся верхні гузік у блузцы, паляцеў далоў, як спелая ягадзіна, — не падымала. Зачэсвалася густым грэбнем, валасок да валаска, бы ўвесь час на вялікім ветры стаяла, падцінала кучары, усё вясёлае, гулёнае ад чужога вока, каб нічога прываблівага, нічога прыкметнага. Так лягчэй увайсці ў натоўп, уціснуцца — як знікнуць. Ад роду сарамлівая, цяпер сустракалася вачыма з мужчынамі й нічога ўжо яе не кранала, не палохала. Нават падабалася гэтая незалежнасць — ужо спэўнілася яна, што няма ейнага, адзінага на свеце чалавека, нечага прыглядацца, прыхарошвацца. І сэрца не балела, калі ўспаміналася

няўдалае замужжа. Толькі сціплая няёмкасць, бы занадта падрабязна ведае нейкую чужую любоўную гісторыю. Спахоплівалася: на яе ўжо ніхто не азіраецца, як раней, быццам і не ходзіць побач з людзьмі, а можа, і зусім не існуе? Толькі на момант. І зноў гэтая вялікая вада, гэтая павольная плынь жыцця несла, праносіла паблізу людзей, вясёлых, сумных, гаманкіх, а яна сама, як у дзяцінстве, ляжала на спіне, утрымліваючыся на адным месцы, і ёй да дарослых з іх сустрэчамі, каханнем, не было аніякай справы. Любіла глядзець у неба, на аблокі. Яны плылі, рухаліся, кожную хвіліну мянялі выгляд. Вось дурона, укуліўшыся ў сабачую запрэжку, строячы пыхі, едзе з разяўленым ротам стары вылюдак. Санкі — набок,ываліўся, ляжыць дагары, перабірае нагамі, як дзіця... Вось усё неба ў ружовых пялёстках — аблятаюць яблыні ў райскім садзе... Ейны чалавек, пэўна, таксама павінен быў з'явіцца не з боку людскога натоўпу, а адтуль — з-пад аблокаў... «Чые гушкалкі?» — пыталіся людзі ў яе, ужо немаладой жанчыны, ведаючы, што і дачка вырасла. Вісяць, зачапіўшыся вяроўкамі за сукі дрэва, заляцеўшы бязмерна высока. «Гэта ж і забіцца можна...» Яна задзірала галаву, дзівячыся разам з усімі: вядома, ейныя, яшчэ дзявочыя арэлі, спыніліся, яшчэ гойдаюцца на ветры...

Пыталіся сябры, што зараз малюе, яна палохалася, бралася тлумачыць: маўляў, хоча пейзаж... хаты... дрэва... птушкі... і зяляніна першая, каб як пушок на вербных катках...

А ўсяго толькі атрымлівалася... восень. Партрэт дачкі? Падобна вельмі, казалі, падобна, але яна бачыла: кроў быццам не ейная, сядзіць прыгожанькая чужая натуршчыца, а не дачка. І кветка белай півоні побач гэткая ж нежывая, як бант у касе: не паравая, прымусова разгорнутыя пялёсткі, без характэрнай вясковай бухматасці, а заўсёды ж сярод лета, сярод даўгога стала на першы дзень вясельнага застолля. Як без імя — кветка.

Што за пара? Выдавалася, што ўжо і не загаворыць ні да кога, як нямко.

Прыехалі, знеслі клункі, ужо развітваліся, калі раптам ускочыла суседка з вёскі, Кацярына (яна глядзела за хатай) адчыніла падполак, бясконца дзівячыся:

— Глядзіце, людцы, Юльча! Драбіна скінута ўніз, і дзежка з мачонымі яблыкамі ўверх дном!

І сцены быццам цалыя, а вада тут, пэўна, аж кіпела, падышоўшы. Хіба што з самага мора яе прынесла з белай кучаравай хваляй па пяты. Веснавая, шалёная, яна і ў шклянцы бабскай бяды наробіць.

— Хоць ты яе было замаўляй! І насос спусцілі, і вёдрамі выносілі, -— расказвала гаваркая Кацярына, а сама празрыста так паглядала ў вочы, маючы другое наўмя, выпытвала, у вёсцы абы мужчына — нагой у хату, то ўжо і жаніх.

Не паспелі агледзецца, як той ужо быў у падполку, падымаў драбіну, ставіў усё на месца, лёгенька, звыкла так. Выскачыў, рукі насаткай выцер і... паехаў. Не даспелі й рушніка падаць.

Суседка не магла апамятацца. Прызвычаеная да свары, матаў, век як праз галаў той ейны мужык куляецца, усю работу робіць нехаця, і яна яго коціць гэткага, папіхаючы, узалапкі ходзяць, бараюцца ўсё жыццё. Чалавек як зломак. А калі што і зробіць, то хоць ты яму бутэльку стаў, бы які прыхадзяка ў хаце. Калі ён калі захінуў яе, забег наперад, як гэты чужы мужчына! Стаіць сама на ўвесь панадворак, як ліпа, днюе і начуе, правіць гаспадарку, жыля́ецца, вымагаючыся. Пройдзе з рэзьгінамі, а за ёй аж след на камяні мокры.

Яна яшчэ доўга пыталася пра лётчыка, пэўна, часта быў на памяці. Юля нешта адказвала, амаль нічога болей не ведаючы, сяброўка, праўда, неяк гаварыла, што ён ваяваў у Афганістане. «Божа, няўжо гэты анёл там страляў?!. Пэўна, стаяў недзе каля брамы, сустракаў душы загінуўшых, вытрабоўваў, каб усе трапілі ў рай... Такі добры чалавек...» — дзівілася Кацярына.

Воблакі над вёскай так нізка, лятуць хутчэй, цень адкідваецца на зямлю, бы ад вялікага птушынага крыла. Адусюль

чуюцца ў полі танюткія, дробныя гукі. Не выводзячы аніякай мелодыі, у захапленні, кожны сам сабе, адным строем, бы толькі яшчэ спрабуючы смычок, пяюць-іграюць самавукам вясновы баль вясковыя музыкі-жаўрукі. Сумна, быццам чуеш самую ўлюбёную песню сваёй маці, якой ужо даўно няма на свеце. І табе ўжо да скону не далучыцца да вяселля пад гэтую музыку, як калісьці было ў дзяцінстве... А спадзявалася, што ў вёсцы акрыяе. Натрапіла, ідучы ў лес, на старую таполю, тая стаяла, абчапаўшыся цветам — чырвонымі кутасамі, бы нявесела абхінуўшыся старым шалем, нетрывушчыя брынды тлелі й пад нагамі. Бела пад дубамі ў Кудрах ад пралесак, а наўмя, як на тое, даўнейшае. Некалі, расказвалі старыя людзі, забілі тутака вясной у вайну млынара, тут недзе і закапаны. І цяпер грыміць увушшу ягоны млын. Сцёрся камень на жорнах, трашчыць жвірам. Укіне птушка дзікае зярнятка — увесь свет белы ад вальцаванай мукі, як на радаўніцу заслана пад дубамі.

Пакарацелі ейныя сцежкі, лес зрабіўся непрыхілкі. Стаіць удзень і ўночы, блізка каля хаты, стаіць з нейкай незаўважанай дагэтуль сумнай урачыстасцю, хоць і ты сам спаць не кладзіся, агонь не гасі, бы ў вёсцы нябожчык начуе. Знарочыста вярталася на змроку, і ўжо быццам весялей, цемра не пужала, бы ўдвух прыйшоў, прывёўшы некага з лесу. Адной хадой (толькі каб не бегчы!), той самай глухой сцежкай і праз лес, і праз панадворак, і праз хату. Нешта прыручанае, амаль свойскае ў гэтым пераходзе на змроку. Лясны страх пасля ўжо не тоіцца, не стаіць пад вокнамі, ён, як дзікае кацяня, толькі во што не прылашчыш. І жаба рудая ідзе да парогу на змроку, яна ўлюбіла халадацца пад гумовым дыванком, ідзе прысадзіста, марудна адставіўшы ззаду лапу, бы на сагнутых нагах з вялікай ступнёй ад самага калена. Ідзе пільнуючыся, каб ніхто не бачыў; зараз, выдавалася, рэзка азірнецца, перад самым парогам — і сэрца пакоціцца, пазнаўшы пагляд бабкі-варажбіткі з таго канца вёскі. Дом, як нежылы.

Прачнулася яна ў тую ноч перад самым світаннем. Не тое, каб не спалася. Што гэта, хіба — птушкі?! Але ж надта яшчэ зарана, можа, хто спудзіў? Галасы не пеўчыя, птушкі, прачнуўшыся, яшчэ проста перагаворваліся паміж сабой, коратка так, дзелавіта, звыкла. Галасоў большала, ужо, пэўна, цэлы птушыны натоўп. Зусім незнаёмае асвятленне ў пакоі, ноч увачавідкі перакідвала свае ўборы, спяшалася, яшчэ зіхацела юлёвая зорка — самая дарагая начная пацерка. Выдавалася, што чуе, як адляцеўся кажаном пад бэльку ўстрывожаны сон. Чула, як чуюць сляпыя атожылкі хмелю высокую апору, — аднекуль набліжаўся магутны рух. Жывое навокал падымалася, паварочвалася насустрач яму тварам, чакала. Незвычайная цішыня. Усё быццам прачытвалася, як на паперыне, моўчкі, аднымі вуснамі. Так чытаюць лісты кахання. Магутны рух набліжаўся, гул ішоў па самай зямлі, нізка, бы пешшу, пад гару. Блiснуў першы прамень, быццам паказаўся, нарэшце, з-за пагурка хрэсны ход, урачыста несучы наперадзе пазалачоны абраз. Зіхацелі пратэсы. Узыходзіла сонца.

Нешта ўсё-ткі здарылася... Ляжала нерухома, ранішні водар запоўніў пакой. Спахапілася, калі змерзла, ложак, лапнула, халодны, бы й не начавала, толькі што вярнуўшыся са спаткання. Няўжо пакахала таго анёла?!. Божа, навошта? Жанаты чалавек, дзеці, нічога больш пра яго не ведае... Жарт — у машыне правёз, драбіну з падполку дастаў... Не было ж аніякага знаку... І наогул, усё вельмі звычайна...

Лётала па ваду, мыла бялізну, фіранкі з зімы на свежае. Голас зязюлі, як у пустым памяшканні: усё вынесена з хаты, ператрасаецца, мыецца, сохне, пустыя пакоі, чыстыя, толькі два галасы жаночых: «Ку-ку! Ку-ку!», а можа — мужчынскі й жаночы, ад сцяны да сцяны, ад акна да акна. Падушкі — на лаву, посцілкі, сяннік узбіць на пяро, польты — з шафы! Будзённа так, аб нечым учарашнім, звычайным, аднаслоўна: «Ку-ку, ку-ку, ку-ку!» А слухаць хочацца. Ад адной сцяны пустога лесу — да другой, з аднаго канца пустога поля — да

другога! Заляцелі дзве сініцы на веранду, ледзь выправадзіла, і сёння, бачыць, былі: абтрэсены аберуч букет чаромхі на стале. Жарптушанём сядзіць на кусце, зацвітае кветка чырвонага бухматага маку, па яйку ягоная лопнутая шалупайка бутона долах. Ужо і кароў выганяюць да ракі. «Ого-го-о! У поле! У поле!» — знарок аднастайна, працягла, зыкам, берасцяным рогам выпрастаўшы ўсё сваё нутро, ходзіць каля статка стары Вінечка. Быццам тут, перад ім, поле, воля і табун бясконца вялікі. Нараджаецца даўнейшы голас гону, вялікага перагону, каб не спынілася каторая, не змарылася, не адлучылася каб. А сам, забываючыся, стаіць на адным месцы, круціцца з ранку да вечара — няма пашы, не выдзелілі вясковым каровам. І ўвесь статак на вачах, рабымі фасолінамі ў жменьцы. Пастухова вясенняе мроіва...

Учора чула раніцай салаўя. Хадзіла каля ягонага кустоўя, не заўважала, што мокрыя ногі. Вярталася дамоў — і ўжо суха, нехта, як вяршок лыжкай, зняў з травы расу. Пужалася гэтай вясновай радасці, весялосці, ужо, думалася, не дазволена табе такое вось чыстае шчасце. Так пакаянна, са слязьмі радуешся ў храме, прымаючы прычасце, калі побач з табой у адной чарзе бязгрэшныя дзеці. І няўжо праўда лятуць да нас птушкі з цёплай стараны за тысячы вёрст, каб толькі напіцца таючай вады, адмыслова патрэбнай ім дзеля прадаўжэння свайго роду?

Такой ціхай, амаль непрыкметнай, з мелкімі беражкамі, дзе-небудзь у полі ці каля лесу, пастаіць дзень-два на адным месцы — і ўжо малочная трава адскочыцца. Густая вада, яе і вецер не калыша, аж, выдаецца, салажавая, бы нектар, сабраны па кроплі на паверсе чорных сот зямлі.

І яна сама прыляцела-такі, нарэшце, з свайго краю — два гады няспыннага смутнага пералёту. «Цэлы падполак заспела цудоўнай вады у хаце!..» — смяялася сама сабе.

— Не ведаеш, Юльча, чаго Зінка старая ў лес пайшла: можа, па елачку комін чысціць? У лесе ж яшчэ пуста, — пераймае даходная да ўсяго на свеце Кацярына. — І жарт —

такая здаровая — узяла і пайшла бадзяцца!.. Ты, сама, Юльча, адмянілася, як была прыехаўшы. Думала, што хворая. Аж пераборала сябе, вясёлая, бачу... Зіна састарэла, як мужыка пахавала. Баба цікавая. Як узлуецца на сябе, конскі шчавук карчуе каля плоту, а так — сядзіць, утравеўшы, аніяк не абароніцца. А трэба б упільнавацца, каб семя ягонае не саспела, не насеялася... Так і маркота бабская... Я, калі надумаюся вазьму, аж у грудзях займіцца, дык звару сабе што-небудзь смачное — і палягчэе.

Не далей, як учора старая Зіна казала, па-змоўніцку блізка падышоўшы, як дзеўка:

— Ён, салавей, пад лістом сядзіць, перакуліцца і — пяе. А яшчэ ж ліст малы. Слабая пакуль песня, але пайду сёння да ракі слухаць...

Перасаджвала кветкі, мяркуючы дзе каторую, а самой раптам падумалася, аж работу з рук спусціла: «Бог, пэўна, паслаў гэтае неспадзяванае, як у юнацтве, кароткае каханне...» Але перабірала ўсё ў памяці, зайшоўшы ўжо задалёка збоку. Жыва будзеш і па гэтым, як сказала б суседка Кацярына. ...Шчодра адкінула ад сябе ўсе магчымасці бачыць таго анёла. Думалася, цяжка, удзячна — па-сялянску, — як зямля набрынялая пасля доўгачаканага ліўня.

Мусова было б ехаць у горад па харчы, але не хацелася адлучацца: рупіць да астатняга дабыць тут, дагледзець, як цвітуць сады. Бо кожны дзень, як вялікая навіна, — трэба брацца за эцюднік. Вось і сёння з раніцы ішоў буйны, рабы дождж. Куры высыпалі на вуліцу, як толькі ён перастаў, ходзяць рухава, спяшаюцца адна перад адной, бы ім тут толькі што падсыпалі свежую жменю. Клён насупраць акна ўжо сёння ў шырокім, расхрыстаным адзенні, цені ад лісця лянiва кратаюцца па вечку студні, гарачае сонца — скрозь бліскаўкамі, быццам вада стаіць блізка, як у пасудзіне, з беражкамі, калыхаецца і зіхаціць на сонцы. Раптам далёка ўбок, сарваўшы з пяцелек, аднесла лёгкім дыхам фіранку на адчыненым акне. Зляцела з падаконніка блакітнае птушынае яйка, зној-

дзенае ў лесе, і не пабілалася. Яна амаль бачыла, як лёгка, гулёна, толькі што веснічкі не ляпнулі, зайшло на панадворак... Лета. «Трэба будзе букет змяніць...» — падумалася, быццам толькі што адцвіла ў стаўбуне вясновая лотаць, кветкі ўніклiва слаліся па днішчы стала, шукаючы ручаіну талай вады.



# МЕСЯЧНАЯ КАМЕЯ

## (Святочнае апавяданне)

Час у горадзе гэтай зімой ідзе супраць гадзіннікавай стралы. Снегу амаль няма, змэнчана чарнеюць дарогі, анікольк і не варожачы ў налецці на багатае зерне грэчкі, пшаніцы. І гэта на вялікі пост перад Калядамі. Праз акно, пераходзячы з пакоя ў пакой, раптам убачыш маладзік, спынішся, як ад выразнага, уніклівага позірку праз акно: ён — на цябе, ты — на яго. І наогул, здзіўляе, таямніча хвалюе, як іншы раз на вуліцы ўвечары хацелася неспадзявана азірнуцца, паглядзець якраз у той бок неба, дзе зіхацела камеяй поўня. Калі яна і хавалася за хмарамі, заўсёды адным позіркам знаходзіш яе ў ейных нават самых далёкіх пакоях. Звычайна з прыцемкамі ўжо анікога. Можа, каму ў гэтай пустэльні й адкрываўся Бог і выпрабоўваў катарага.

— Я сёння цэлы дзень шчыра пасціла і нават да нікога не загаварыла, — звоніць сяброўка Лена. — Але надта хачу табе расказаць... Аліна ж да мяне прыходзіла ўчора...

Забірае грэшны смех: а ці не высявала яна ўжо сабе ў пасцелю, варожачы перад Калядамі, насенне канапель, ці не спявала яна: «Святы Андрэй, дай мне знаць, з кім буду іх ірваць?»

Лена паспяхова займалася бізнесам, без грахоў не абыходзілася. Пачуўшы пра маю знаёмую з дзяцінства Аліну з трыма дзецьмі ды амаль без бацькі, дакляравала аддаць ёй кажушок сваёй дачкі, як кажуць, ахвяравала на ўбогія. Кажушок амаль новы, зазначыла тады мне крыху ніякавата, маўляў, няхай бы Аліна прынесла ёй наўзамен хаця б варэння ці так чаго свойскага. Аліна жыла з таго, што гандлявала на

Камароўцы гароднінай, ягадамі, грыбамі. На ўсё лета кідала горад, ехала з дзецьмі ў вёску, у матчыну хату, засявала соткі, запасілася з лесу. Ну, прыходзіла Аліна, добра, але чаму такі ўзрушаны, багабойзны голас у маёй гараджанкі? Яна ж такая справядловая мінчанка, што і вёскі ніколі ў вочы не бачыла. А тут — да яе сама Аліна! Уяўляецца, як зайшоўшы ў кватэру да Лены, Аліна распранулася не адразу. Доўга звычайна стаіць у парозе, азіраецца па кутах, як на кароткім прыпынку, абы нага да нагі — і ўся ейная аддуха, заўсёды быццам увесь час і дзень і ноч у доўгай дарозе. Сціпла падціснe вусны, а вочы пільныя, чаплістыя, во, маўляў, як людцы жывуць — у Лены паркет, гарнітуры скрозь! Без зайздрасці, з нейкім глыбокім сумам ці то па сабе, ці то па ёй, пакаёўцы, на ўсім гатовым. Але ніколі не блытаючы свой лёс з чужым. Разуецца, блісчаць шкарпэткі рознага колеру, абы цэлыя — не саромеецца. Доўга маўчыць, галаву набок, прыслухоўваецца да сцен, да рэчаў, як да мелодыі, каб жа не даць фальшу ў гаворцы. Гэта той чалавек, які доўга сам-насам бывае ў полі, у лесе, на зямлі. Акрыяе, загаворыць толькі тады, калі пачне павольна расхінаць пакункі, даставаць, як з кустоўя ўсё роўна, шклянкі з варэннем: вось чарніцы, маліны, вось грыбы. А сёння дачка Юлечка, самая меншая, адразу пайшла па пакоях. Стук-стук-стук, зазіраючы ва ўсе вуглы, быццам шукае дзірку, каб уцячы, як вожык з лесу — стук-стук. Дзякавала, пэўна, за кажушок без уніжэння, брала, як ад Бога: маўляў, ён лепей за яе ведае, каму што патрэбней. Папросіць гаспадыня да столу крыху пачаставацца. Пасядуць, і будзе Аліна даваць знакі Юльцы, каб бралася есці. Дзяўчо насцярожана пазірае на піццу, дома ніколі не модзіліся з ежай, кавалак хлеба ў адну руку, кілбасу — у другую, вось і ўвесь сервіс. Яшчэ раз, адыходзячы, паглядзіць Аліна вакол сябе з сумам, як на беразе вялікай стаячай вады, ёй, рухаваму чалавеку, гэта не жызня.

— Але ўсё гэта не галоўнае, — ужо амаль жалілася Лена. — Раніцай б'ю на патэльню ейныя яйкі — сапсаваныя!

Грыбы праз ноч паплылі на падлогу — слоік, аказалася, быў пабіты... Муж сеў піць чай, паклала яму Аліміных малін. «Ну і не смачнае ж тваё варэнне...» — кажа. А я ўжо маўчу... Усё, каб ты ведала, такое на смак не нашае, такое яно нічогае...

Сэрца стоілася, пачуўшы так блізка знак боскай кары, як перад відавочным здарэннем: ад Аліны няволле нічога браць узамен, тым больш перад Калядамі — не спажывеш, не разгавеешся, не задапаможышся ейным. Даць чыстай рукой, шчыра, як пакласці на ахвярнік у храме...

А выдавалася, што па гэтым смутным часе ў горадзе аніякія прыкметы не збываюцца, ніколі не спраўдзіцца добры сон і грэху няма. Нарэшце-такі адчыніліся, бы ад ветру, гарадскія вароты, упусціўшы да людзей сваіх чараўнікоў, варажбітак, краснаюдкаў! Дзеўкі, спахапіўшыся, пякуць каморку на адной солі, ядуць яе перад ноччу, кладучыся спаць, каб прыйшоў у сне жаніх, падаў сасмяглай нявесце вады. Сеялі каноплі ў пасцелю. Раніцай, на ўскрайку горада, дзе яшчэ жылі па-вясковаму, сваёй хатай, прачнуўшыся, гаспадар, пэўна, ішоў у хляўчук, падымаў на ногі з начы казу ці свінчо, паварочваў галавой да варот. Кратаў лапату, граблі, абы з месца зрушыць. Мяшаў такое-сякое зерне, насенне, каб павярнуць усё на спрыяючае лета. Бо дзень пабольшаў ужо, як кажуць, на казіны скок. На таго, хто пасціўся, каяўся, спавядаў свае грахі, накладалася эпіцімія з благачынных спраў і нават пазбаўлення волі, каб чалавек мог пераадолець свае благія звычкі. Ружанцам блішчалі густыя зоркі, варожачы на мароз. Нарэшце, зіма знялася з белага гнязда.

Апошняй у адчыненыя гарадскія вароты ўвойдзе Аліна, крыху кульгаючы, — з дзяцінства сталася, маці не дагледзела, упусціла з рук, нага зраслася, як дрэўца. Ніхто не заўважаў ейнай знявечанасці — рэдкая прыгажосць сляпіла вочы й мужчын і жанчын. Яна цягнула на сабе цялежку з гароднінай, ягадамі, грыбамі — перад гадавы́м святам звычайна ўдалы торг. Паліто на ёй старое, вясковага крою, недапасаванае, толькі што вяроўкай не падперазаўшыся. Боты-гумовікі

па такой слабай зіме, хустка-крыпанка — так звычайна ідзе вясковы чалавек з хаты ў поле, у лес, да работы. Яна перавезла сюды, у горад, разам з сваёй цяжкой покладдзю свае строі, свае парадкі. Ні на кога не звяртае ўвагі, ідзе павольна, вачыма перад сабой, на дарогу, як цёмным лесам, каб аглобляй не зачапіцца за дрэва, за нізкі сук, галаву паспець прыгнуць. Як не перабірае лейцы ў руках, кіруецца раздумляючыся... Мужу, бачыш, не падабаецца ейная работа, заве яе шпікулянткай. Свекрыве ў вёсцы таксама яна непанараўная, кожны раз упікне пры сустрэчы, маўляў, таргоўля — нетрудавыя даходы. А што яна — перапрадае?.. Такія ласі сядзяць у камерцыйных будках, яны, бачыш, у законе, а яна са сваімі буракамі й сваёй бульбай — шпікулянтка?!. Другая маладая баба і ў бізнес, як той казаў, і пад бізнес, ці грэх ці не... Скрыпіць левае кола, каб як дацягнуцца хаця да Камароўкі. Сёння будзе ўдалы торг.

Але што гэтыя гараджане ведаюць пра сапраўдны смак, сапраўдны пах свойскіх ягад, грыбоў, увесь час седзючы на крамным?..

У вёсцы Аліне не вельмі спагадаюць, маўляў, надта ж сквапная: жыве ў горадзе і соткі матчыны засявае.

— Чаго ты ўбілася ў маё сена? — выгаворвае суседцы, калі тая скасіла ейны ўзмежак.

— А нашто яно табе без каровы?

— Расце трава, дык хай будзе і сена!.. — адказвае Аліна, маўляў, усё ёй спатрэбіцца, не чапайце.

Ды каб жа яна сама спажыла тое, што вырасце, як яны кажуць, гэтая шпікулянтка. Надта нязвыкла вёсцы, далёкай ад горада, зразумець, што можна прадаць тое-сёе з зямлі, мець дабаўку да пенсіі. Бы яно табе крэўнае тое, што народзіцца на сваёй спрадвечнай дзялцы. Старыя людзі ганьбавалі таргаваць. Калі хто крычыць на вуліцы, то гэта ўжо ў Алінін адрас. Возьме каня, адзін дзень паробіць, а людзі: «Назаўтра яго на лісіцы ў звярынец здалі, гэтак уездзіла скаціну!» І ніхто адзін аднаму не ўспомніць, што даўно меліся таго старога

каня збываць. Усе пры калгасе, а яна ўжо тут як прымака, як прысцябай кабыле хвост. Стараецца ўхапіць, спарадкавацца, аж тэтар бярэ на яе гледзячы. Быццам парушаецца Алінай даўнейшы вясковы рытм, маўляў, пары хопіць: гэты жаліцца — хворы, той — бы прысмерці, але кожны, злуецца Аліна, да глыбокай старасці дакалышацца, жывучы абы дзень да вечара. Сядзіць, шануецца каторая баба, за гэты час можна было б, ці грэх, ці не, і памерці! «Ты мае грыбы сабрала», — сапе суседка, сустрэўшы на вуліцы. Пакуль яна, каторая, карову выгнала, пакуль нашлэпалася, людзей зводзячы па вёсцы, Аліна ўжо ў лесе. Адна зязюлька яе пераймае. Едзе ў лес з дзецьмі на ровары. Як можна размінуцца з грыбамі, калі іх як касой касі, ды ўсё дармавое! Назад цягнецца абчапаўшыся кашамі, вёдрамі. Сабака з таго канца вёскі не пазнаў — укусіў за хворую нагу. «Сваіх не чапае, а ты прыехала тут!» — накрычала і гаспадыня. А сама з-за свету, нядаўна пабудаваўшыся. «Гультайка! Во такія грудзі, а малака ані кроплі пасля родаў...» — падумала Аліна памсліва з вялікай злосці й супакоілася.

Шмат у вёсцы новых хат, наезджых людзей. Зайдзіцца, ідучы з ягад, на могілкі, адразу за возерам. Такія блізкія твары на здымках на помніках, такія родныя, што і дамоў ісці не хочацца. Цвіце жасмін — спакой, раскоша, як у вёсцы калісьці, толькі дзікія пчолы лётаюць, гудуць. Тут памятаюць ейных дзядоў і прадзедаў. Тут і не пытаючыся, усё ведаюць, што замуж ейны ў горадзе не ўдаўся. Мужык п’е, гуляе, прыйшоў неяк з «танцаў», кажучы па-вясковаму, не пусціла начаваць, да суседзей прасіўся. На рабоце яе скарацілі, добра што хоць далі групу, ідзе такая-сякая пенсія па інваліднасці. Жывым не пажалішся, што збіраецца кідаць мужыка, яе ж і абвінавацяць... Возера каля могілак поўнае, як вочка, вада чыстая, відаць, як вялікая рыба ходзіць, гуляючы. Вёска на тым беразе, пасачкам паміж небам і вадой. Некалі стаяць, любавацца, тады толькі й нагледзілася на гэтую прыгажосць, калі яшчэ жывучы ў вёсцы, радоўку адбывала за карову...

Людзі абселі, ягады абсыпалі — ужо ёсць чарніцы. Усё кідае, ляціць з дзецьмі ў Царкоўе, бліжэйшы лес. Бабы абшчэбаюць, хадзі тады, шукай, а то ж можна на месцы вядро сабраць, як вады зачэрпнуць. Па кавалку хлеба з саланінай у хустцы — да паясніцы, чатыры крыжыкі на зямлю перад лесам, каб з гадыняй размінуцца.

Цвіркуны — гарачым прысакам пад нагамі. Спякота, упаўдні лес душкуецца, цякуць як са свечак, смолы, пахне лампадным алеем. За дзень даспяваюць ягады ў цёмных кутках, схаваных ад сонца, ад людзей — птушыныя ласункі. Гадыні, разамлеўшы, ляжаць кружалкамі. Сіпла азавецца катораяз кустоўя. А такі ж якраз тут ягаднік харошы, лісту не відаць за ягадамі! Сляпні абступяць ейны маладзенькі табун — некалі абараняцца, трэба й назбіраць з коптарам і наесціся ў лесе, каб дома не хацелася ўкрасці з кошыка — ягады ж на продаж. Але ёсць такая хвіліна ўпаўдні, калі лес змірыць чалавека са зверам, палягуць у адзін бок галовамі, паснуць, скруціўшыся, і страх адляціць ад іх шэрай птушкай на высокае дрэва ў дупло. Кідаюцца ноччу малыя ў ложку, віўкаюць, снючы гадыню, смыліць на руках, на твары ейны нерухомы, пільны пагляд. «Дзеці, уставайце... Сонца высока... Вецер ужо расу абтрос!..» — будзіць Аліна. «Во, каб даў Бог дождж, — думае кожны з іх сам сабе. — Тады ягады пахаваюцца, тамсям таямніча блісне вочка красналюдка...» Куляюцца дзеці з ложка, ножкі нягнуткія, як калкі.

Ніколі не купляю чарніцы на кірмашы, яны мяне смажаць, гэтыя чорныя ягады й майго дзяцінства. Солана ў роце ад поту, ад слёз. Вусцішна есці, бы яны сабраны ў цёмным ягадніку на кінутых могілках. А варэнне, калі пачастуе Аліна, хоць ты на куце стаў, пад абразамі, дзеля прычасця — такое яно дарагое, з такіх дарагіх да болю мясцін...

Чарніцы, потым — маліны, ягады, як сухоты: нічога не баліць, а чалавек на іх як хварэе. А туг ужо і бульбу трэба капаць, сусед барозны разагнаў за бутэльку. Аліна — зноў у лес, па грыбы, адна, дзяцей адправіла ў горад да бацькі, да

школы. Прыедзе на сокавы завод у Паставы здаваць, запозніцца: «Ну, людзінка, ну прыміце грыбы... Маю дзяцей малых трое, паспагадайце», — гэтак просіць. За другім разам устыдаецца, нялоўка жаліцца, тады ідзе ўнаначкі да сяброўкі, каб раніцай першай быць у чарзе. Падхопіцца ноччу — абразы бачыць, не на тым месцы, не пазнае, дзе заначавала. Чуе праз ноч, праз лес, праз Царкоўе і Забаладдзе, як людзі смяюцца ў вёсцы несцішоным смехам: «Бульбу кінула, не спарадкавала, зелянее на сонцы... Сама бадзяецца па горадзе з грыбамі!» Прыехаўшы з Пастаў папацёмках, калі ўсе паснулі, крадучыся, ішла на соткі, на каленьках выбірала бульбу. Ды раптам узышла поўня! Бульба ляжыць белая, відаецца добра! Дапаўначы пераглядаліся з той поўняй, як змоўшчыцы. Смяялася сама сабе, цешылася — вось і дзень надтачыла, залатала, ніхто не пазнае, як яно было! З галадоўкі ўзбілася на яблык з хлебам — і жыва па гэтым. Раніцай усе беглі глядзець, хто толькі быў на хаду, дзівіліся — чыстае бульбянішча, пэўна, чэрці ёй дапамагаюць.

Усё сабрала, пасеяла лубін на заворку. Выкапала моркву, ды такая яна спелая, у руках трэскалася, як выбірала. Прыехала ў горад — дома непарадкі: адно дзіця згубіла акуляры, другое — прапусціла ўрокі музыкі, трэцяе, самае большае, — грыўку адрэзала! Вось табе і хвалёныя дзеці! Як новая настаўніца казала: «Такія яны прыхілкія, такія ліпкія, што ўжо там за бацькі?!.» — дзівілася. Строгая Аліна матка, а ў вёсцы лічаць — благая, маўляў, малыя за работай свету не бачаць.

І мужык той, бы кот, шусь! праз парог, пад ногі выслізнуў, як толькі дзверы ў кватэру адчыніла.

— Мой запатрабаваў, каб спраўку ўзяла... Будзе на развод падаваць, — сказала Аліна замест прывітання на гэты раз.

З самага рання зайшлася да мяне, бы гэта начная бяда, з начы сталася. Каб далучыліся да ейнага гора, прыйшлі ў хату. Як па нябожчыку наказала. Стаіць у парозе, вочы падняла ўгару, стрымліваючы слёзы. Набегла аж пад вечка, глянула

перад сабой — перакуліліся вёдры, плача не хаваючыся. Не, развод яна яму не дасць, маўляў, няхай будзе мужык, які ёсць, дзеля людзей, дзеля вёскі. Толькі мелася пажаліцца на мужа адной жанчыне, тая ўжо, можна сказаць, пры смерці была, такая старая, — назаўтра ўся вёска галавой ківала, маўляў, сама вінаватая, што не ўжываюцца. Не, няхай ужо мужычок на гэта выбачае! Кідаецца ў хітрыкі, смяецца з сябе: спраўку дасць, калі той падлогу ў кватэры пафарбуе! Вось і ўсё! Дык жа зіма на двары, пярэчу?! Яму будзе лета, і яшчэ лета, ён ніколі не адважыцца што-небудзь зрабіць у сям'і, адказвае. І дзеці дубка пасталі: ты, мама, замуж ішла, нас не было, — трэба было глядзець, а цяпер — жыві! Дасталася Аліна і да варажбіткі. Насядае на мужа твая знаёмая, кажа тая, яны разам працуюць. Адкуль? З Калодзішчаў! Не па любасці сышлася, ад зайздрасці, што ты ў пары, а яна дзявуе. Грошы запрасіла за нагаворнае зелле немалыя, яно сабе. А яшчэ трэба шэсць дзесяткаў яек, на могілкі чарцей карміць. І шэсць метраў палатна, любой матэрыі, бо чэрці ўсё роўна яго ў балота завалакуць. Тады падробіць так, каб у яго, брыдка казаць, не стаяў. Начорта такі й ёй самой, адказада Аліна! Не да спадобы ёй старая варажбітка, мала што ўгадала. «Усё ведаю, але гавару мала», — паўтарае і маўчыць. Аддала ёй грошы, каб не думала, што яна ёй павінна. Зелле, праўда, і сама п'е і мужыку ў кампот падлівае.

Няма аніякага пазнатку — муж усё роўна звер зверам. «Што ты такая вясёлая, глядзі, каб не галасіла!.. Не лашчыся, я яшчэ зарплату не атрымаў!» — і ўся ягоная гаворка. Тады яна адважылася, ішла да яго на работу. Не, не жаліцца, вядома. Хто чужы з боку паверыць, што мужык ейны п'яніца? Ён жа не валяецца. Другі пад сталом ужо ў бяседзе, а ён яшчэ сядзіць, бо яму конская доза патрэбна, каб адужаць. Ішла пагаварыць. Што дома — толькі свара і свара, там, на людзях, можа, хоць стрымаецца. Дабірала час, апранала абавязкова што-небудзь доўгае, лічыла, надта па модзе. Ішла павольна, пагляд — паверх галоў, як пастыр у барме з кіем. Муляла ўсю

дарогу словы сухімі, жорсткімі вуснамі, рыхтавалася. Рэдкая хвіліна, калі яна, нарэшце, «па́сціла» сваю сям'ю.

Дзень у дзень — Камароўка, торг.

Заедзе на кірмаш, не спаўшы, не еўшы, сядзіць, разглядаецца. Ужо яна і разгаварылася, ужо і засмяялася. «Во, Камароўка мяне і адкалыхала...» — скажа сама да сябе. Малады мужчына спыніўся насупраць.

— А я тут учора буракі купляў! — стаіць, смяецца ўзрадавана.

Жонка пацягнула за рукаво, той, схамянуўшыся, адышоўся. І невядома ці дасць сабе рады здагадацца, чаму спыніўся. Гэткая ж падзея — ён тут буракі купляў! Але якраз жа тымі днямі па тэлебачанні ішла рэклама дарагога французскада мыла «камея». Памятаеце, жанчына ў чырвоным, павольна паварочваецца праз плячо да вас тварам, пазірае, як поўня ноччу ў акно, па-сялянску круглатварая, прывабная. Зноў адвярнулася, віхурыць у танцы па вялікай нябеснай зале, таямніча ўсміхаецца, усіх спадманваючы, нікому не належачы. І нават калі на ейнай галаве ўжо толькі ружовая істужка, каб не запэцкаць мыльнай пенай валасы, глядзіць на вас з даверлівай і цнатлівай бессаромнасцю, бы мыючыся ў агульнай лазні разам з вамі. Рыхтык Аліна!

Толькі тая і розніца, што Аліна за ўвесь дзень не зірнула ў люстэрка, укінуўшы з раніцы расчоску ў вядро, якім прадае бульбу. «Ну, ты сваё прадасі, такая жанчына прыгожая...» — скажа іншы раз баба, стоячы з ёй побач на кірмашы. Падышоў неяк палкоўнік, у форме, зорачкі на пагонах. «Шкада, у мяне, — кажа, — няма ўжо болей грошай на вашу моркву». «У вас ды няма грошай?! А мы так на вас раўняліся! — дзівіцца Аліна. — Прыходзьце пасля палучкі...» — «Як вас завуць?» — пытае афіцэр. Ну, палкоўнік яшчэ ніколі ў яе мення не пытаўся! Пэўна, гэта ўжо знаёмства?! Адкажа што-небудзь вясёлае, на ўзвей вецер.

«Камароўка на маё бязмужжа, на маю бязроднасць! Яна і паспагадае, і пасмяецца. І схітруе, і выручку дасць у руку...» — як не галосіць.

Пачуўшы, што Аліна разводзіцца, мужчына адзін, такcама таргуе гароднінай, так і сказаў: «Ай, гэта не ты сама вінаватая, па табе бачу. Я ж не п'ю і не куру. Як толькі муж твой апошнюю нагу забраў праз парог, то і я да цябе ў хату, калі захочаш...» Гэта ўжо сватаўство... Каторая гараджанка доўга цацкае ейны тавар, адкіне ўбок, абы на моркве плямку заўважыла. Аліна ніколі не пярэчыць. Адыдзецца пераборлівая пакупніца, яна зноў пакладзе выбракаванае на вагі, спадзеючыся неяк жа збыць на кірмашы ўсё, што прывезла. Глядзіць табе ў вочы, як замаўляючы, каб чалавек не перабіраў, мнецца, аж хварэе. Гэтак цяжка яно ёй далося. Яшчэ яно ёй буяе бацьвіннем. Яшчэ, здэйся, толькі з зямлі. Рукамі перабранае, кратаецца, пясочак ад карэньчыка адсыпаецца, як ад жывога. А ўжо яго зямелька назад да сябе забірае, ужо яно сапсавалася, гіне. Глядзіць пакутніцай, не даючы гараджанцы слова сказаць, маўляў — бяры й з канцом! Не любіць аддаваць зямлі, ніколі нічога не выкідае.

Сёння, перад самым Новым годам Аліна запазнілася, як ніколі. Камароўку ўжо закрылі, тады яна стала з дзецьмі за варотамі, прадала, што было. Ішлі дамоў, нідзе ані чалавечка, вуліцы пустыя, светла. Усе людзі ўжо недзе каля святочных сталоў, прыбраўшыся. А ёй і так добра. А што тут крыўдаваць, на каго? Дзеці з ёй, усе пры дзеле, усё з ёй, што нажыла. Нечый мужчына забадзяўся, дапамог сесці з цялежкай у аўтобус. І тут — пуста, ніхто не зыркае, не сварыцца, што баба з сваімі калясьмі ў гарадскім транспарце. І дзякуй Богу. Ехала, глядзела на прыбраны горад як з свайго вясёлага, вясковага акна, дзівілася, цешылася — і тутака ўдалося дзень надтачыць, пакуль людзі гуляюць. Вось якая яна ўпраўная.

Вернецца з таго торгу, завядзе руку з грабеньчыкам над галавой і забудзецца, што збіралася прычасацца. Падайце, дзеці, табурэт сесці, падайце талерку, так змарылася. Лыжку толькі што памочыць ва ўчарашнюю капусту і пойдзе спаць. Вецер прагрукоча над дахамі новага мікрараёна, як скоры цягнік — ні дрэўца, ні куста каля дамоў — няма жывой га-

монкі. Успомніла наастатак, як адна баптыстка, разам стаяла з гароднінай, таксама таргавала, раптам сказала: «Я думала, што ты... святая... А бачу: у цябе завушніцы...» Усміхнулася, так і заснула.

Усмешка далёкай поўні не сыходзіла з твару. Была гэта надта відная ноч усім, хто святкаваў...



# АД ХАЛОДНАГА БОКУ СОНЦА

На панадворку анікога. Ужо здалёк ад варотцаў відаць, што дзверы ў хату пазачыняныя, але звыкла, недавяркам, гоніш пад самы парог, ветрам заварочваешся назад. Толькі кружалкамі за табой слабка віхурыцца свежае сена. Сенам выслана вуліца, усе двары, бы стол на калядную куццю. Лугавы ветрык заходзіцца ў адзін двор, у другі, як не аберучкі, растрасе тугія каслаўкі, — раўнуе сянны настольнік. Неспадзявана павее святам. «А-а-а, — здагадваешся, — гэта ж Сенакос!»

Сонца гарыць, патрэсквае пад нагамі яго вялікае шаламя.

Анікога, пустыя двары. Раней за ўсіх упільнуеш суседку Стасю. Ідзе па той бок ракі за возам сена. Ідзе іншы раз за козамі, вядзецца наважаць да лесу, ланцуг на плячы, ідзе сама за імі, як на тым жывым ланцугу ўсё роўна, занялася на ўсю вуліцу, ступае спорна, прастуючы дарогай, гледзячы не перад сабой, а намнога далей сваёй сцежкі. І калі адна ідзе, выдаецца, бы век за козамі ходзіць. Толькі вочы надта далёкія адгэтуль. «Адна ў адзін бок, другая — у другі, каб звязаў, хай бы бараліся», — смяецца, абы загаварыць... Свежы загар чырвоным закальцам — занадта, пэўна, блізка стаяла каля сонца, найперш ад усіх. Яшчэ раніцай, толькі ўстаўшы, бачыла, ішла яна з мужам Пётрам з косамі ў руках ужо дамоў. Ішла крыху адлучыўшыся ад яго, ззаду, нага за нагу, гуляючы, галава высока, бы п'ючы асалоду. Такая вялікая работа ўжо зроблена, а яшчэ ж надта рана, быццаам і расходу не было — увесь дзень наперадзе! Мокрая ідзе ад расы, аж патанела, здаецца, сукенка да ног лісне, хустка на плячы сохне, памаладзела з твару — адцягвае раніца стому, лёгка робіцца.

Няздобрацца, ведаю, ёй гэтыя выперадкі.

Стася, калісьці яшчэ дзеўкай, ад'ехала з Бараўкоў у горад, вярнулася з мужам у матчыну пустую хату, пайшоўшы ўжо на пенсію (гарадскую кватэру адпісала жанатаму сыну). Сядзеў на лаўцы пад сваімі вокнамі напроці яе хаты, скаваны цяжкай хваробай, родны брат Рыгор, паліў вачыма і хату ейную, і хлеў, і агарод, і сад, і во гэты воз сена. Труднаваў.

— Хадзі пасядзі, — зваў мяне да сябе, каб выгаварыцца, і пачынаў у каторы раз то пра Стасю, то пра яе мужыка.

— От гадкі чалавек, гэты Пецька Лешчык!

— Чаму, дзядзька?

— Жабрак! У мяне і плуг, і барана, і хамут, у яго — анічога! У мяне ўсё ёсць, я ж жыць збіраўся!..

— Дык ён жа ў горадзе жыў, навошта яму было гэта мець? Круціць галавой, як з пахмелля, не, маўляў, усё роўна ён не гаспадар, вымяраў свайго швагра старой меркай і ўдоўжкі, і ўшыркі, даўнейшай мужыцкай сялянскай меркай. А той яе перарос, увачавідкі вырабіўся і без свайго плуга, і без свайго хамута — на пазыцы. Мелі ўжо Лешчыкі карову, стаялі клетухі з трусамі, хадзілі па двары куры, гусі, козы, буяў агарод. Чаму б не любіць, што родная сястра разжывацца стала?

З чаго яно, варожае, пачалося, каб жа ўспомніць... Як толькі перабіраліся Лешчыкі ў Бараўкі, адразу ўзяліся рамантаваць старую хату. Даўно яна, пасля смерці бацькоў, служыла ўжо абы цыбулю абсушыць, выцягнуўшы з зямлі, паставіць што-небудзь узіму на расоле. І мышы за сабой, ведама, дзверы не зачынялі, здзіркаваўшы на рэшата падлогу. Пазвалі да сябе, праўду кажучы, бадзялага чалавека Аляксея аднекудь з Расіі, хваліўся, умее сталярку рабіць, абмылі яго, пасадзілі разам да столу. Зацыравала Стася ягоную адзежу. Блізка нахінулася да кашулі, адкусваючы нітку. Глядзь: стаіць Аляксей з мужыкамі вясковымі, рукі ўбокі, нагу адставіў, смяецца, усё на ім свіціцца, а костка моцная, маладая, што ты на яго ні ўскінь — не брыдка. «Стася!» — пазваў яе, яна ішла з хлева, дзверы зачыняла. Крута павярнулася да яго, лёгка скра-

нулася застоенае ў сямейным катуху цела, абазначыўся стан, ускалыхнуліся грудзі, туга перацятыя станікам...

Вось і ўся іхняя інтымная размова паміж сабой, і то на маіх вачах.

Паехалі з Аляксеем у лес, разам — падрубы, разам — слупы на плот, абабілі шчыт, пераставілі печ у другі бок чалеснікам, разгарадзілі хату па-гарадскому. Сядуць на вялікай верандзе, як на пароме, і плывуць, смеючыся, пасярод зялёнай завадзі бульбоўніку з белымі пеністымі грабеньчыкамі квецені. Засталося толькі хату ашаляваць. Знаходзіла яму работу і знаходзіла, сама з ім камандавалася, як валкам прыціскаючы, качала яго ў рабоце па двары, па хаце, па хлявах, прастала ўсю на рубцах ягоную басяцкую, як кажуць, жызню, каб прывык, асмакаваўся на адным месцы, прыжаніўся ў вёсцы, — на вачах будзе. А сядуць есці, ды яшчэ калі пры гасцях, настольнік пакладзе белы-белы, ражкі ўверх падымаюцца, выгінаюцца лёгкай перынай. Сама сядзе задалёка ад яго, на вугле, Аляксей — на другім, хаця ўвесь бок стала слабодны. Каб было відацца, што ён тутака пасталец, чужы, лішні. Усё жыццё на вугле, на рагу. І яна, бы на рагу, у сваёй хаце...

Дзядзька Рыгор выйшаў, трымаючыся за вушак, на панадворак, па сцяне — на лаву. Хата Стасіна стаяла насупрацьнавюткая, бы толькі што прыдбаная на кірмашы. Падысці бліжэй, паглядзець не мог. Сядзіць іншы раз, глядзіць перад сабой на сцежку да ракі, аж узмокне, так глядзіць, ківаецца, бы тую сцежку, як вяроўку на цэўку, зматвае, падцягвае да сябе бліжэй, каб убачыць, што там далей, каб усю сабе на вочы, аж за раку, за лес, на той луг, дзе ягоная сівая трава каторы год дзявуе някошанай. Анікога ззаду за ім, каб узяў, касой залажыў — адныя дочкі, а зяці гарадскога заводу, і кала каторы дарэчы не зачэша.

Дом Стасін, бачыць, як новы. Дык ён жа сам столяр добры, і ён мог бы паднавіць бацькаву хату і прадаць, не такія прадаюцца за грошы, дачніку абы пляц. Што тая карова, якую

бацька даў яму (Стасі адпісаў хату), каровы даўно няма. Ашуканцы! І сястра і... бацька, калі так! Свая, праўда, хата неблагая, але будавалася за бедным часам і яшчэ рамонту не мела — не паспеў за хваробай. Верандачка тая малая, бы дзіцячая калыска-зыбаўка, унукі там гуляюць, піскլюкі ад дажджу хаваюцца. Старая вагонка выгінаецца, высахла на трэску, павыцягвала цвікі абцугамі, пашчапалася. Аж, здаецца, чуваць у хаце, як закладаюцца тыя абцугі, сыплюцца далоў іржавыя цвікі, разыходзіцца шво. І чорны ход ёсць, і чысты ход, але ўсё жыццё праз адзін чорны ўдалося. Чысты завалены старымі валёнкамі, восы летась завяліся ці чмялі. Каля хаты з усіх бакоў — сюды торк, туды торк — стаялі то палка, то калок, то лясіна, усё, што траплялася, падымала жонка Агата, несла да вугла, несвядома, як бусліха, мацавала гняздо. Вось і ўвесь паратунак. Нічога ўжо ён сам не можа ў хаце папрадіць. І, здаецца, не памёр, і жызні няма — на парозе стаіць, ні туды, ні сюды, не размінуцца, яшчэ толькі кіем можа паківаць.

Калі раптам абступілі яго пчолы, вуллі Лешчыкавы стаялі ў агародзе, блізка. Біў сябе па грудзях, на твары лапаў, выбіраў у валасах, а рукі не слухаліся, толькі ўверх-уніз, уверх-уніз — не завядзеш убок, цяжкія рукі, валяцца на каленькі. Можа, ужо тыя пчолы й адляцеліся, але закрычаў малы ўнук у садзе, пэўна, і да яго дасталіся. Галасок спужаны, тоненькі, балюча віўся ўвушшу, аж засмылела. Зноў заторгаліся рукі ўверх-уніз. Пётра ўбачыў, падбег, схапіў Рыгора на рукі, панёс у хату.

«Во, як малога... са двара... са свайго... а ім, халера, мёд?!»

Дабавілася злосці.

Каб і не хвароба, ці забіў бы Рыгор цвіка? Вунь, да каго ні зазірнеш, не зайдзішся — высыпаўся кош, паваліўся плот, асоўвалася цымбравіна ў студні, пырснула дошка з-пад нагі на ганку. Старэлі й самі вочы, не заўважалі. Асядала хата, асядалі й ногі — столь быццам і не ніжэла. Нікога з мужыкоў рух не браў. А можа, усё яно на памяці, як новае, бо надта доўга, надта цяжка нажывалася. На памяці й трыма-

ецца і выдаецца нязбытным, трывушчым само па сабе, уваччу стаіць зданню.

Лешчыкі ўносілі ў філасофію дзядзькі Рыгора, усёй вёскі блытаніну, трывогу: нешта ўсё будуюцца і майструюць!

Далей — болей. Бараўкі абляцела навіна: Лешчыкі будуць купляць карову, кажуць — у калгасе.

Сабраліся ісці.

— З хлебам трэба, гэта ж карміцелька... Хлеб у руку вазьміце, — падказала Агата, жонка Рыгора, і свайго прынесла, у Стасі якраз быў хлеб выйшаўшы.

Зойдзе заўсёды ў хату да Стасі, як праз шыбу, нячутна, асвеціць табе вочы нейкім патаемным сэнсам, быццам на кладзежы закапаным жывеш... А! Марудзіцца з ёй! Але хлеб такі ўзялі.

«Карову?!.» У самога Рыгора такая старая, хоць ты кашай кармі — ні зубоў, ні капытоў, а не выходзіць пусціць цялушку ўзамен, — то скіне, носячы, то грошы пільна спатрэбяцца — вядуць здаваць. Скуль? З чаго? Агата нічога не разумела, як разжылася залоўка на новым месцы. І не ўглядалася ў іх бок. Калі й падзівіцца, то ўсё роўна зробіць пасвойму, у яе рукі наламаныя адзін раз, ужо не будзе перавучвацца жыць. Курыца заквохча, яна яе — жыватом у ваду. Жывот у чалавека забаліць — няма, кажа, лепшага лякарства, як паўкубка гарэлкі з соллю. А каб жа запытацца, хто навучыў? Не ведае. Асядае, кальцуецца ў ёй векавое, бы на немаладым моцным дрэве. Пойдзе ў камору, там мяшок стаіць з мукой, — ай, як добра жывецца, усяго поўна! Зніме з мукі мышку, сытую, нерухомую, і ўцячы ўжо тая ад ката не здужае, так наеўшыся. Засмяецца. Во, каб мышы ды не было ў хаце, яна ўсюды дастанецца, няма чаго і бараніцца, пасткі купляць, ставіць. Жарт?!. Абы з вачэй далоў. Крот парыў сенажаць? Ну, дык жа некалі зморыцца і перастане... Увосень зловіць каторую маладую курыцу, курыца рабая-рабая, да дзікасці, бы ў лесе з дрэва знятая птушка, паважыць на руках, пагушкае, як не на язык возьме прывес, зморшчыцца,

калі выдаецца залёгкай. Штодня будзе мацаць, не здагадваючыся кінуць лішку, жменю круп ці зерня, маўляў, па волі ж ходзяць, хай самі стараюцца. Увесну зноў спусціць на зямлю поўны падол, стоячы на ганку, здэйся, і з рукавоў пісклюкі пасыпяцца, рукамі палопае, пастрашыць — ляціце сабе, жыруйце! Аніякая гаспадыня, падумаецца з боку. Але ж пускае во гэтак сваіх птушанят і бусел, і варона, і ластаўка, маўляў, на даверы ўсё трымаецца. І не лічыць Агата, колькі іх, інкубатарскіх, назаўтра застанецца — хай ратуюцца.

Пацягне ад яе панадворка халадком, халадок вясновы, блізкі да сэрца, а ногі студзіць.

Во, калі ўжо Агата пайшла ўборкі з усімі, калі здумала авечак завесці. У Стасі нагледзела, адзін раз пазайздросціла, і сваю гаспадарку наважылася трохі перайначыць. Як ужо хавалася, як украдалася ад усіх у хаце, чаго паехала да Ракава на кірмаш! Гэта ж якое дзіва! Народзіцца маленькі й ужо стаіць, нагой тупае, і ўсё разумее, не трэба яму ні гаварыць, ні чытаць. І прасці яна ўмее, і пруткамі рабіць, і шыць яшчэ з дзявоцтва, толькі, во, за работай, за гаспадаркай не пасядзіш, не пазабаўляешся. Швэдру, праўда, сваю, як адзене, дык яна не тое што цёплая, а жывая да цела.

Толькі чаму гэта Агаце ўсё помніцца, не забываецца, як свякроўка адразу пасля вяселля загадала яшчэ чыстыя цюлі на вокнах памыць? Усім з ягонай радні ўспамінаецца... «Манька, — папрасіла ўпотайкі суседку, — памажы мне, я не патраплю...» Здагадвалася, што свякрова мацае яе на зуб, ці ўмее яна рабіць далікатную работу — надта ж з беднай хаты была браная... Цяперака толькі здыме іх з вяроўкі — і падпаху, нясе, не шманаючы, белае воблака па зямлі — абы ваду бачылі.

Спыніць на дарозе, запытаецца знянацку:

— Як ты тварог робіш? Га?

Стаіць, слухае, ды раптам, як хто яе за рукаво пацягнуў, галавой круць — і пайшла ў другі бок. І яшчэ раз запытаецца (пэўна ж, дочкі данімалі, бо такі сыр кіслы, частавала, аж за вушмі пішчыць), і зноў кіне гаворку, каб не парушыць у сабе

нешта сваё, цалнае. Быццам ёй дазволу не было вышэйшага перарабляць, іначыць свае звычкі, работу, навуку мацеркі. Аж, выдаецца, кішэні пераверне, вытрасе тое, што трапіла туды, як кастру, вытрасе чужую параду, чужую навуку. Завяжа хустку, рублёвую, на тры рагі, дробныя рудыя кветачкі на ёй. Хоць якой парой кветкі, і сонца не бярэ іх, і не змываюцца, вадой не зносіць. Рукой лапнеш ад печы — няма пазнатку, бо рабенькая. Вочы цёмныя, нізкія, падымае іх на цябе, падымае, прывыкаючы як не кожан дзень. Цёмная ўся, летам счарнее, сасмагне на смуродзіну.

Прыслухоўвалася Агата да мужавай гаворкі пра Лешчыкаў, а сабе думалася, што выбалела ў ягонай галаве, у целе, добрага ўжо ніколі ні да кога не скажа. Не, без гаспадаркі, разумела, якая жызня? Гэта ж розны смак пазнаеш: то з мясам вада, то з цыбуляй — усё ж перамены. А ў магазіне ж батон адным смакам...

Але няма на свеце нічога найбольш едкага, як бабская прыглядка. Вой, што гэта мне холадна і холадна?!. Я і целагрэйку, я і хустку на галаву, цёплую, валёнку, а мяне калоціць! А Стася, паглядзіш, ногі голыя, сукенка з кароткім рукавом — лётае! І ёй цёпла?! Не-е-е. Тутака нешта ёсць... Як прыйдзе чаго ў хату прасіць — дык жа ўсё да мяне і да мяне! — і проста з рук вырывае, калі падаеш ці рэшата, ці касу... Па што прыходзіць?.. Сілу забірае... Вусцішна робіцца... Яна ж, Агата, куды ні йдзе, ніколі нічога не баіцца — перахрысціцца, крыжыка на сябе наложыць, бо не заўсёды ж носіш на целе — і йдзе сабе смела што днём, што ноччу, што полем, што лесам. А тутака ў сваёй хаце ні тое, ні сёе...

Але гэта ўжо іхняя свара ўвабралася ў добрую сярэдзіну. Сенакос! Мужчыны, ім ці сенакос, ці не — усе на адзін твар.

— Во, каб знаў, што гэта ты там, у Чорным лагу, уварваў маё — даў бы!

— А я бачу чужыя пракосы й сабе думаю: добра, што мне нехта памог, аднаму не ўходаць...

Размова толькі пра сена. То там воз рыпіць, то там, едзе каторы, кружаняе, як аб'ездчык, быццам усюды той самы

чалавек, тырчыць камлём з воза. Бабы — не. Усё пакідана ў хаце, як зачыніць, нагой папіхнуўшы тое, што не тоўпіцца. Некалі, пагоду трэба ўхапіць! Затое сукенка — абавязкова лёгенькая, з шафы, чыстая, бо чыстая і работа, быццам святочная. Як гэта — ад печы, у тым самым? Сонейка свеціць, весела! Хустку ў рукі — і цераз парог! На ляту перад сабой выпрастаць за рагі — дзе тут найніца, дзе добрыца? — тузануць, прасуючы, і мах! на галаву. Абы выскачыць скарэй з дамашняга пекла. За вёскай ужо крок павольней, шырэйшы, грабелькі на плячо лёгкім вёселкам. Вяслуе ад раніцы да вечара, свежыя пракосы бягуць рачнымі хвалямі. А то такая гушча, як вір, трава, касі, дзе хочаш — лясы! Толькі мільгане раптам рабы лубін у далёкіх кустах, выдасца, бы мужчынская кашуля ў шклянкі, можа, хто гарадскі бryндае? Спыніцца на хвіліну, торгнецца, бы на асцюк колкі ўступіла. Блісь вачыма ўбакі — а ці блізка свой мужык? Ведама, кусты.

Агата гразкі хвартух з сябе — далоў, набок. Сенакос! Першай выйдзе з хаты, за ёй — дачка Тася выскачыла, пэўна, нядаўна прачнулася, пачуўшы, як ужо за маткай ляпнулі дзверы. Выйшла і адразу не можа патрапіць на матчыну сцежку, туды, сюды па двары, як у поцемках, заспаная, бы з калыскі, стала шырока, зірк-зірк вачыма — ага-а-а, сена ж сённяка! І — за граблі. За ёй на ганак — унучка Валечка. Абедзве наязджаюць з Мінска, калі ў бацькоў пільніца. Унучка падобна на бабу. Бораецца ўвесь час у яе на твары тое падабенства, гоняць бабіны бровы цёмным скрыллем прэч прыдбанае набаку, ад бацькавай радні. А вочы схаваюцца і зноў блішчаць, гуляюць з вамі ў вясёлыя схованкі.

— Граблі браць? — пытаецца яна. — Га?

Таксама ногі адразу шырока паставіла, на ўвесь пракос каб.

— Вілы бяры, хмарыцца, можа, мама загадае ў капешкі складваць!

Вісяць нажуткі на цвіках, на хаце, пад рукой, каб хоп — і пайшоў скоранька.

— Рэзгіны вазьміце! — крычыць Агата здалёк.

Зморацца. Агата пакоціцца першай на сене, сцішыцца, тварам да неба. Во, калі толькі адвалілася баба, як на ложку, і сяніна ў руцэ каля вуснаў, па-дзявоцку. Свята! Загаворыць да дачкі пра што-небудзь, пра тое, што доўга мелася сказаць. Пра што нікому не здагадацца, пра Лешчыкаў, вядома.

Зайдзішся да яе ў хату, так нехаця адварочваецца на дзверы, хоць ты яе за плечы бяры, паварочвай. Стане, глядзіць табе ў ногі — прывыкае да чужога. Напроці ў печы паліцца, агонь — бліскавіцай на цёмнай кухні. Маўчыць, абірае ваўчкі з падала хвартуха. Пад нагамі склізка, выдаецца, што палавіцы плывуць, душна, аж па сценах цячэ, гразь тонкая, чорная, бы яе ластаўкі ў дзюбах нанасілі Агаце на гняздо. Пах чалавечага стойла. Ні табе дзе сесці. Выедзена дрэва на лавах, выкачана. Бярвенне на столі цёмнае, цяжкое, на грудзях ляжыць. Загавэльвай рукой праз акно і выцягвай, выбірай усё вон, як з параспелага гарбуза, — склізкае жытло. Ведама, болей тутака гатуецца скаціне, чым сабе. Век рукі ў першай вадзе не памые: то з бульбы, калі адцэдзіць, то калі даёнку спаласне. Злівае ў церніцу. Павернецца — рукі памочыць. За кацёл улепіцца — і зноў да вады. Цальны дзень мачае, атрасаючы на падлогу, бы якая варажба на вадзе, замова. Яе свянцоная чаша... Шух! праз дзверы памыі на бульбоўнік — і пазнатку няма. Як пасля балю, носяць на панадворак са стала посуд з хаты й носяць — вялікая сям'я летам, дочкі, зяці, кожны з малымі дзецьмі.

Толькі хто б адкуль ні прыехаў (і сястра гарадская наведваецца), і жывуць доўга, а ўсё неяк па-ейнаму, па-агацінаму выходзіць, і нічога не перарабляецца. Ідзе ад ракі, ногі мыла, ідзе па траве, сушыць, нечым цёмным на ганку выцерла, абулася — дзюб! анучу на калок. І там рызінка, і там ветрае шкуток, бы касцы на траве разуліся, раскруцілі анучы, зайшліся да Рыгора павітацца. Яшчэ стаіць тонкі звон па кустах, менцяць казельчыкі ў траве іхнія косы. Валюх-валюх катлы па панадворку, цяжкія, ненажэрлыя, стоўпіліся перад ганкам, блішчаць чорным аксамітам сытыя бакі. Замочана ў балеі адзежа на сонцы, а там, на сенажаці сохне памытае проста на траве, можа, і

чысцейшае і бялейшае, калі на траве. Ружавеюць па бураках, па цыбулі, па агурках вянкі паўружыкаў. Пад вокнамі чыстай палавіны цвіце невыводная чырвоная ружачка, бы на куст ускінута, сушыцца Агаціна святочная хустка-кашміроўка. Жоўтымі вузкімі ручаямі разліліся на двары ейныя сцежкі, усе па іх ходзяць, сваіх не маючы, бо за адно лета не вытапчаш. Здалёк відацца, што тут старая гаспадыня правіць. Усё тут падаўнейшаму. Доўга цепліцца печ.

Ніхто з маладых не здужае выпратаць хату. Як кватухха, топчацца Агата на адным месцы, перастыпае з нагі на нагу, ну, можа, толькі, во, прыедуць — вокны паадчыняюць. Ветраюць фіранкі, а выдаецца, што гэта яна б'е, лопае скрыллем па вокнах, не даецца нікому.

Цяжка да яе заходзіцца, як праз галаву перакідвае кожнае слова. Хата мая побач, гады разам зжываюцца, а яна і аднаго кроку насустрач не зрабіла. І да сябе не пускае, маўляў, ты гарадская, нашай жызні не панімаеш.

Са Стасяй, як на тое, і ў грыбы, і ў ягады, і ў кмен — Стася дружбістая.

Ёй чалавек не замінае, а то і весялей пасля гарадской звычкі ўсюды табуном хадзіць. Ідзем з кмену, снапы на плячах. Падол мокры да паясніцы, выбрыдалі ранішні луг, бы па днішчу ішлі. З вады выйшлі й няма розніцы, нават не ўздрыгнеш — цёплы дзень, парыць — што вада, што паветра, у адным кацялку гатуецца. Уходае Стася каго хочаш. Ідзеш па вёсцы, вяслуеш рукамі, целам, бы ўсё расхінаючы й расхінаючы высокую плынь травы, паваліўшся на каменны ганак, сцягваеш боты — вось ён, нарэшце, бераг! Доўга сядзіш, выцягнуўшы ногі, баючыся скінуць з плячэй, як абдымак, салодкі спакой. Валкам нешта коціцца па табе, бы ветрык на траве.

Ну, зрабіў работу, ну, добра, можна і пасядзець. А Стася ўжо далёка. Сцякае сонца па дрэўку грабель на шыю. Ідзе насустрач Аляксей, ён ужо «падрабляецца» у другой гаспадыні. Галава высока, ледзь-ледзь сам сабе ўсміхаецца, чорны твар ад работы. Ідзе лёгка, ідзе наперадзе вясковых

мужчын, яго быццам выносіць наперад, як самага лёгкага на нагу, самага моцнага — так бывае ў доўгай хадзе, у доўгай дарозе сярод равеснікаў: заўсёды ёсць нехта ды маладзейшы. Мужчыны йшлі за возам, пільнаваліся, каб бервяно не зачапіла хвастом плот ці слуп.

Стася — бліснь! — і ўжо з унукам па грыбах.

— Чаму ж твая краля не прыйшла ў лес? — пытаецца, сустрэўшы суседа Ўладзюка.

— Зараз будзе! — адказвае.

— Уладзюк! — крычыць, шукае яго жонка Манька.

— Ён недзе тут, у той бок пасунуўся! — размінаецца з ёй Стася.

— А-а-а-а! Ты ўжо і тутака?! За табой нічога не суберыш! Усюды ты даляціш! А-а-а-а! Нідзе за табой і ў лесе першым не будзеш! Першую маліну агледзіш! Струк! Траву! От — сквапная! У бульбе калгаснай сядзіш і цябе ніколі не зловяць! От — хітрая! А я на адным разе папалася! Ці нажарэшся калі? Няўжо цябе не парвець?!

Цётка Манька ішла ў той бок, куды паказала Стася, крык адносіла назад, здавалася, яна яшчэ тут, блізка, данесла сваю злосць аж во куды, во дзе развязаўся матуз. Манька малаціла ў вёсцы ўсё спарадку. Ідзе звычайна па вуліцы, галавой круціць, як пілінгатар усё роўна: што там у каго нарабілася, каб усчапіць на вілы? «Я ўжо нічога не ўмею рабіць, зжылася...» — паківае на сябе галавой, выбачаючы, і адпэйтае кожнага, хто тут, у вёсцы, яшчэ кратаецца. Сядзяць за ёй зломкамі на лаўцы каля хаты й дачка з унучкамі. Не тое, што ў Стасі.

Што яны ўсе ў вёсцы да яе маюць?

Во, і сёння раніцай, выганяючы кароў, перакінулася Стася словам з суседкай, пахвалілася, што паркалю купіла ў краме, а тая, смеючыся, — нeяк бокам: «За табой нічога не купіш, нічога і не ўкрадзеш... Казалі бабы: прывезлі тавар, а ты ўжо стаіш, пільнуеш... Праўда ці не?» Адлучылася і пайшла, распінаючыся за кароўскім крупам, нага ў нагу з ёй, каб тая не саступіла ў чужы агарод ці двор.

Дзіва брала, што Стася ні на кога не крыўдзілася. Абатрэ пот і пайшла. Засмяецца кароткім смехам, натурыста сцісне вусны, бы яе за руку лапнулі, калі яна сваё ў сваёй, як кажуць, каморы дабро брала — не злодзей! Абмывалі Стасю, блоцілі такога працавітага чалавека. За што?

— Хадзі сюды! — падзывае мяне да сябе дзядзька Рыгор. — Да мяне ж ніхто не заходзіцца...

— А Лешчык і сёння, бачыла, быў.

Махнуў рукой, каб і не ўспамінала. Той прыйдзе наведаць, дык толькі ту ды гу, ту ды гу — Рыгор на яго, як на ваўка. «Ну што? Усё пчол сваіх калавурыш? Вунь, глядзі, ужо адна некуды падалася, ляці даганяй!» Усё з падкусам да яго, з падкусам.

— От, у нас суседзі благія...

— Кожнага на добрае можна павярнуць, не трэба толькі самому благому патураць, — не саступаю.

— А-а-а-а. Адкрыты чалавек адкрыта благое зробіць, а ваш добры — спадцішка!

— А чыста добрых хіба няма!

— Няма! Каб ён каторы добры з'еў тое, што думае, дык бы здох!

Агата сядзіць на панадворку, перабірае чарніцы. Адвярнулася спіной да сонца, прыпякае, грэецца, дай, кажа да Бога, аддыхну трохі. Знойдзе парушынку, пырх-пырх рукой — і выкінула на ветрык. Слабкую ягадзіну ў рот кіне, чорна ўваччу, чорныя думкі збіраюцца, хоць вядром, хоць кашом цягай пад Лешчыкаву хату. «А ў іх ужо трусоў паўсотні, а то і болей... а яна кур заводных прывезла аднекуль, яйкі малыя нясуць... цьфу!.. Агарод ейны расце, аж зямлю дзярэ... А ім сена ўжо прывезлі хлопцы на трактары, — маюць чым пачаставаць, — пэўна, і калгаснага скінулі — дварышча ўсё затоплена. А нам дык і каня не напаткаць...» Рыгор сядзеў, аберуч учапіўшыся, на лаўцы, ківаецца. «Во табе, во табе!» — торкала яму ў думках фігі, і ад сябе, і ад калгаса. Не будзеш мець чаго даць механізатарам і застанешся без сена, згноіш у лесе!

Шчыра злавалася, зайздросна, тонкім голасам, да плачу шкадуючы сябе — калі ўжо такая нячэсная жызня пайшла, дык каб жа не застацца ад яе, таксама трэба хітраваць, падманваць. Усе цягнуць, а ты сядзі!?. Чакай ад калгаса павагі, непатрэбен ты цяперака анікому! Спажылі чалавека, адно шалупінне засталося! Печ трэба было б падправіць — цэглы няма, кожан дзень свежы дым у хаце... Цымбравіны ў сельсавеце былі даклераваўшы, студня абсунулася — а цяпер, кажуць, няма цэменту. Усё, пэўна, пайшло на гэтую пераст-ройку...

Раптам быццам паселі вакол вялікія птушкі й лушчаць сланечнік — лусь-лусь па шыбах, па страсе шалупіннем, і скрыллем лопаюць, адна адну адганяючы. Падняла галаву — гарыць! Склеп ейны гарэў. Агонь на сонцы слаба быў і відаць, і дыму не чуваць, полымя ў гарачым паветры плямінай апаўзала, цякло, як па шкле.

Бразгалі вёдры, аблівалі страху, каб не загарэўся шыфер, і пажарная прыехала. Агонь перакінуўся ўжо і на Лежчыкаў склеп, загарэлася салома — рады не дасі.

— Хадзі пасядзі, — дзіка азіраючыся, нічога не разумеючы ад спужання, клікаў да сябе дзядзька Рыгор то таго, то другога чалавека, што беглі каля яго да студні. Казаў, пэўна, яму самому найпільнейшае: хворы, амаль нерухомы, а людзям век то пільніца, то рупніца, то пажар, усё некалі й некалі да яго зайсціся. Тыя і цяпер памінаюць, што гэта ён думаў, седзючы, можна сказаць, каля агню?!. Агата, тая была ў хаце, абціскаючы перапужаных унукаў, і ў вокны не глядзела — схапіла сэрца. Злодзей прыйдзе, то хоць вуглы пакіне, а агонь усё забярэ... Ведала яна, што нешта будзе благое. Толькі што? Сястра снілася родная... Блізка гэтак да яе падышла, выдаецца, а потым круць — і пабегла на могілкі, у сасоннік. «Пачакай, я ж цябе тамака не знайду, густы сасоннік!..» І прачнулася. Вось яно і ёсць амярцвенне. Вёска ўжо ведала прычыну пажару — унук запаліў, — гуляў, падпаліў кудзелю.

Абтушылі неяк, людзі разышліся, а поўная хата свары, як дыму. Раніцай Агата ўстала: «Дачушка, — кажа старэйшай, — каб нікому папроку не было за тое, што ў нас адбылося, ні ўнуку, ні ягоным бацькам. На ўсіх трэба падзяліць... Калі што якое, паміж сабой перагаварыцеся, але каб я не чула... За сябе баюся... слабка мне робіцца...» Скажа, як са сланечніка вылушчыць — поўнае зярнятка, усе наядуцца, будуць сыты. Возьме жменю гарбузікаў, сядзіць, лушчыць — і палягчэе. Гарбузы не садзіла б, на сенажатку паўзуць, касіць цяжка, але ж увосень вечары даўгія, і бядуецца з імі весялей.

На чорнай жардзіне вісеў абгарэлы стары кажух, высока, як не на неба ўскінуты, звалілася настольніца са старога стала, расцягалі за нагамі кудзелю, цыгарэтай віўся тонкі дымок. А Лешчыкі назаўтра ўсё расчысцілі, адзін пах ад бяды застаўся. Такі самы склеп стаяў, які й быў да пажару, на тым самым месцы, толькі, можа, во, венікам яго, старога, абвіхнула Стася, апратала вуглы.

Чаму ў іх усё ёсць і збытку не відаць? Хай сабе і склеп. Такое яно яшчэ балючае месца, такое яшчэ гарачае, а яны на яго плясь! — і гатова! І не адбедавалі як след, і не аббыліся хоць трохі. Як гэта?! Яны з Рыгорам б'юцца ўсю жызню, ніяк не могуць разжыцца, а Лешчыкі за адзін год усё маюць! І шалёўка вунь аж блішчыць, і карову задумалі трымаць. Не-е-е, тутака нешта ёсць! Хітрыя яны, Лешчыкі! Абышла сястрыца, абманам усё тут! А сам Лешчык, дык, глянь, стаіць, граблі толькі круць-круць у руцэ, кашуля, халера, галубовая!

— Я сорак пяць гадоў жыву тут, у вёсцы, і меней маю! — крычала на ўсю вёску і цётка Манька, седзючы на лаўцы ля вуліцы, выцягнуўшы перад сабой хворыя ногі, злосць яе, як раўгеня, перабродзіць — і гатова, спажывай, не пашкодзіць.

— Ідзе Сташка з козамі, гляджу — ейнай сівой няма, — пераймае яна кожнага, пачынае каторы раз спарадку. — А дзе ж, пытаюся, сівая? Што, яна мне хіба адказала? Звярнула рот набок: у хлеве, кажа, стаіць! А я ж ведала, што прадала... От мне не панаравілася! Ая-я-яй! От благая, ані на дух!

Сварылася, як матка на дачку. А равесніцы ж! Што ж, можа, хацелася Маньцы зачапіць Стасю, загаварыць, як гэта было даўней, калі Стася жыла ў горадзе. Вымкнулася неспадзявана тое колісьняе. Век бачыла яе: бы пані, ідзе звычайна ад аўтобуса, завіўка ветрае харошая, сукенка чыстая, хочаш не хочаш, а першай павітаешся. Жыве ж, падумаецца, чалавек, ну і добра, наш чалавек і таксама выбіўся ў людзі — хай усе ведаюць. Бокам заносіла гонарам і на яе самую, калгасную даярку... Ая-я-яй! Яна ж, Манька, так тутака цяжка жыла, жылячыся, зблоцілася за работай — і павагі няма?!. На чыім ты, прыехаўшы, разжываешся? А ці гаспадыня тутака? А ці ты калгасніца? Ці ты зарабіла? Што б ты тады, з майго трудадня мела? Чым бы грэбла да сябе, каб твае рукі, ногі ад работы апруцянелі! Выгулялася тамака! А мы ж цябе ў горад па розум адпраўлялі, а ты — якая была, такая і ёсцека! І гаворку гаварыць не навучылася! «У хле-е-ве стаіць», каб цябе... Гэткая ты, празгэткая!

Я затрымалася каля цёткі Манькі даўжэй, чым патрабавалі гэтага мае шчырыя, амаль сяброўскія адносіны да Стасі.

— Ну, Стася, ты б трохі далікатней, ты ж добрая, харошая, нашто табе вёску цкаваць? — прасіла я потым, здагадваючыся, чым яна замінала бабам. — І Рыгор... выбачай ты яму, змоўчы, няма з кім сварыцца, ледзь чалавек хліпае...

— Вой, хворы! Да старасці дакалышацца! А хай хоць на тым свеце будзе знаць, што няможна сястры роднай на благое думаць! Гультаі, зайздроснікі! Агата ўсё сцеражэцца. Гэта яна цяпер трохі абламалася! А то ж сядзе з курамі, пасядзіць, то стане, стаіць абапіраючыся на венік, нечага разглядаецца, то цянёк знойдзе, сядзе, ногі выцягнуўшы, фасолю лушчыць. Век бокам да работы! — порскала Стася, абы скарэй агрызнуцца; круць перад сабой граблі — і паляцела, ходка лятучая, напрасткі, толькі платы ўбакі лажацца.

Мне дык і Рыгор з Агатай, і тая Манька, злосніца Стасіна, сядзелі недзе незадалёка ад самога Бога, таксама, можна сказаць, стварыўшы й зямлю і ваду. Толькі што адзежа ў іх другая, не белая. Агата то ў сукенцы, чатырохклінка ці шасціклінка,

усё ў талію, з паскам каб. Плюшаўка ў яе амаль новая, не знасіла ад той маладой пары, мала давялося святкаваць, а гэта ж адзежа святочная. Ці на ёй паліто вішнёвае, па-дзявоцку ў талію, кароткае, лытка таўстая з-пад яго відацца, на крыжы напята, бы баба не іначай, як цяжарная. У нечым чыстым сядзіць, яшчэ не абношаным, нягнуткія рукавы, як заверчаная ў адзежыну. Манька дык крыху і модзіцца, у яе ўжо рукаў у сукенцы адразаны, якраз, каб локця не было відаць. Рыгору нядаўна купілі двое штаноў. «Абое малыя!» — не то жаліцца, не то цешыцца дзядзька, маўляў, калі патаўсцеў, то, пэўна, і паздаравее. Сядзяць старыя на пагорку, усё жыццё быццам радоўку адбываюць, кароў пасучы, людзей пільнуючы, парадкі, адзін аднаго. Рабыя каровы хмарамі распаўзаюцца па лузе. Сядзяць старыя, хворыя, не дапускаюць Стасю да сваіх здабыткаў. Пільнуюцца, дзе яна косіць, што нясе, куды ідзе. Перагавораць кожнае ейнае слова, маўляў, чыё яна тутака спаганяе, свайго не зарабіўшы? Бацькава? То трэба было не ехаць у прочкі! І самі яны, вядома, не гідзіліся зайсціся ў калгасную свежую бульбу ці струкі, але ж гэта, лічылі, іхняе поле, іхняя і шкода... Не, каб пацешыцца, што работнік, нарэшце, прыйшоў на зямлю... Працавіты, увішны, здаровы, не дасць ёй зарасці дзірваном.

Але, як я дазналася пазней, была яшчэ адна прычына, даўно яны яе чулі, і не слыхам, вядома.

Дождж пачаўся з начы. Раптам так круга сцішылася, быццам нехта, захінуўшыся ад ветру, настроіўся запаліць сярніка. Бліснула маланка. Ліло і дзень, і два, і тры. Пахінуліся да зямлі глечыкі напярсцянкі, крутабярозкі, званочкаў, паўружыкаў. Увесь посуд, здавалася, які быў, перакуліўся, адусюль ліло, дрыжэлі ў хаце шыбы, паліцы. Ужо можна, нарэшце, во гэтак стаць на ганку, як перачакаць, і стаяць сабе. Агата выйшла, узяўшыся рукой за драбіну, надоўга абаперлася, марудзіць вяртацца ў хату. «Макрыядзі наробіць, усё ён без меры», — гавораць з дачкой. Унучка з цёмнага праёму дзвярэй ловіць цурубалкі са страхі, збярэ жменю,— страсе, зноў

збірае шкляныя вясковыя пацеркі. Унук падышоў з конаўкай, назбіраў дажджу, выпіў. Высокі дэльфініум прагнаў у паветры цэлую прошву буйным сінім шклярусам, якраз каторай хоць на рукаво, хоць на падол. Камар над вухам цягнуў тую самую ноту, што і на двары.

Потым дождж пайшоў пераходамі, плісне з сіняга глечыка — і ходу, толькі каб яшчэ рушніка хто падаў абцерціся, — завысока вісіць у сем нітоў рог радугі. Вунь там, дзе елкі, нехта падымае тонкую газавую фіранку, падымае вышэй, вышэй, ужо адна елка добра відацца, ужо другая, і птушкі заспявалі. А ў тым канцы накідвае на елчыны вочы тую самую газоўку, пакуль не прымусіць іх спыніцца, пастаяць ціха, паслушна, дачакацца дажджу. Узляцеў з-пад ног матыль, пляма на скрыллях дваіцца ўвачу, як пад кропляй дажджу, вось-вось саслізне каляровай пацеркай. Неба сіняе, цёмнае, едка цёмна-зялёнае, і чорна-белы бусел ляціць, вяртаецца ў сваё гняздо — густы вясковы малюнак, якраз жа Агаціна посцілка-набіванка каля ложка.

Стася, як толькі крыху парадзее, нябеснае дно пакажацца, ужо бульбу панесла на каромысле са склепа. Быццам увесь час у сенцах стаіць, перажыдаючы, каб хаця хутчэй пільную работу парабіць. Скочыла ў хлевушок, выпіхнула парасят, каб подсцілку ім памяняць. Аніяк назад свінку не загоніць. Хвастала дзеля прыліку дубцом, а потым ухапілася за добры кій.

— А каб ты апраглася! А каб ты сасмагла! А каб цябе паляруш! А каб ты галавой налажыла! А каб ты астатні дзень, халера на цябе! — гаварыла ціха, клялася, і сама, здавалася, разбітая тым палярушам, клалася разам.

Ці пры сваёй яна памяці гэтак казаць? Яшчэ зусім нядаўна, бачачы, як хутка прыбывае, расце Лешчыкава гаспадарка (каза прывялася, карова ацялілася, рознае птаства), як захлынаецца Стася работай, я стала раіць ёй патрохі збываць сёе-тое, каб, часам, не падарвацца. Стася выслухала, блізка села, нахінулася, каб нашую гаворку не падслухаў злы дух, сказала:

— Няволле гэтак гаварыць, што трэба скаціну збываць, бо весціся перастане... Ужо як яно ёсць, хай так і будзе. Да кароўськай смерці не разыдземся... Дзеці тут... прыедуць з горада, адной нашай бабе ўсё казалі, казалі, каб трохі паменшыла гаспадарку — і карова, на табе, захварэла... На стол сабе маю, і дзецям у кішэнь дам... Кіну, калі ўжо не буду магчы...

— Стася, твой Лешчык жаліцца, што цяжка робіць...

— А мужыку воля шкодзіць, няхай лепей будзе заняты...

Парася чула блізка карані, кідалася пад ногі гаспадыні ўзяць зямлю на лычык, пакрыўджана вісчэла, атрымаўшы па баку. Безабаронна станавілася на каленькі, каб схаваць вушы пад нізкую прыступку. Нарэшце неяк жа скіравалася, пайшло ў хлевушок.

Такое ж яно ўшанаванае, дагледжанае, жывое... Клясці скаціну?..

Няўжо адлучылі Стасю тыя, што на пагорку: Агата, Манька, Рыгор, тыя, што незадалёка ад Бога, адлучылі ад сваёй «паствы»? Сама ж Агата, памятаю: вырвалі дзеўкі гарбуза, той яшчэ быў з цветам на макаўцы, зялёны, — і пасварыліся. «Я не магу есці, каб яно яшчэ з вачыма было — не паравое!..» — злавалася Агата, ёй усіх шкада, усё ёй жывое. Няўжо-такі адлучылі?

Тузаецца Стася адна ад усіх на ўсю вёску, правіць гаспадарку, і гэта ў такі час, калі і ў мададых і здаровых на вёсцы рукі абабітыя, мала ахвоты калупацца ў зямлі. А Стасі ўсюды жывы прыбытак, пад нагамі, трэба толькі не ленавацца, нахінуцца, каб падняць. На заводзе жыла ад зарплаты да зарплаты, а тут, у вёсцы, на кожным кроку рубель. Шчыра закідвала на плечы цяжкую посцілку з ахрап'ем і паддаць нікога не прасіла. З раніцы да вечара, з раніцы да вечара. Вымые ўжо ў поцемках ногі, уключыць тэлевізар, выспіцца да ночы, на адну хвіліну вочы спусціўшы. Ноч кароткая, як царкоўны венчык з малітвай, на лоб толькі палажыць, — і ўжо ўставаць пара. Не паспееш і на другі бок перавярнуцца.

З раніцы да вечара з мокрым каркам, сцёрлася з твару хусткай з галавы ўсё гарадское, даўно раскруцілася завіўка, толькі, можа, во, перад вачыма — аніяк ужо не саступіш убок, не аслабанішся — бо ідзе ейны завадскі канвеер, праз агарод, праз хлеў, праз поле, праз лес, — торгаецца нерв, не адпускае, як хвароба. Вернецца з горада (калі-нікалі наведвае сваю кватэру), толькі яна прыехала, толькі сумкі занесла, а ўжо на ганку, у благой сукенцы, ужо ў садзе, ідзе наўгад, кругамі, усё шырэй забірае, шырэй, прыглядаецца да работы. Лешчык ззаду, а потым — напрасткі да яе, наперарэз: што скажа жонка рабіць?

Дождж штодня. Налушчыў жвіру на сцежках — босай нагой не ступіш. Увечары падымаюцца ад зямлі густыя туманы. Ідуць па вуліцы клубамі, быццам каровы пыл паднялі, нічога за ім не відацца. Дагоніць — пачуеш блізка ў твар чыстае старэчае дыханне зямлі, і не адвернешся, не адхінешся, быццам на тваім плячы — маці пасля доўгага няўцішнага плачу. На золку ад акна цягне халадком, бялёсае святло, нацягвае раніца праз рукі на голыя плечы свежую халаднаватую кашульку — спавівае, як малога. Рыгор радзей выходзіць на вуліцу. Слабей вочы бачаць, свет ягоны меншае, толькі што не на выцягнутую руку, белы, хвароба, абжаргаўшы, сядзіць ужо на карку. І пчолы злыя, бо няма работы дажджом — баіцца, каб не аступілі. Сядзіць у сенцах. Тутака пахне вымытымі яшчэ сырымі лавамі, чадзіць галавешка з печы ў памыях, сінім пацягнута — свенцяцца сені, ціха, прыцемкі, тлее на падлозе першы чырвоны ліст. Адымае Рыгору іншы раз і мову. Але што яно вакол да нас гаворыць мовай? А зразумець жа можна і траву, і дрэва, і скаціну і без гаворкі. Нахіліцца да яго Агата, ціха скажа што-небудзь, каб не парушыць ягоную цішыню, бы на магільніку. Ужо што яна наважыць, тое і будзе, адзіная ейная ў хаце папраўка, і дзвярыма мужык не ляпне, не тое што. Каб гэтая воля ды ў маладосці, у свекрыві, у старой Лешчыхі! Разводдзем, нідзе зямлі не відацца, сышла была з дзіцем з хаты, падалася дамоў, да маткі. Дзе ты тут вытрываеш? Мыюць, грабуць, мятуць,

скрабуць, палошчуцца, а хіба ад зямлі адцураешся? То схаваецца ад усіх, дзень, два няма, бацькоў ейных паклічуць шукаць. «Дачушка, акажыся, — заве бацька. — Тутака толькі жыць!» — «Вам парабак патрэбен, каб усю работу парабіць...» — скажа свякроўцы ў вочы. І цяпер спіць на капе, паўгода не перасцілаючы.

— І дзе ты адзежы гэтай набіраеш? Мые і мые! Увесь свет боскі завесіла бялізнай, кожан дзень на драціне поўна рыззя! А сёння ж Пятро! — не асцерагаючыся, крычыць Агата на Стасю.

— Чаму ж ты мне ўчора не сказала, калі ведала?

— Пара ўжо самой знаць усе святы й прысвяткі! Цябе ж і на Ўшэсце, казалі, бабы з буракоў прагналі былі. Што гэта, скажы, робіцца?!.

І праўда, і ў хаце ж мужык Пятро (усё Лешчык ды Лешчык!), і ён не ведаў, паласкацца памог на рацэ.

— На Пятра ж заўсягды дождж, хіба не ў памяці табе? І што гэта ты круцішся, круцішся, няма табе перадыху? Да вады, глядзі, дастанеш! — смяялася Агата.

— А як ты век час маеш? А паглядзі — работа стаіць! Усё знішчыш, стопчаш пад сябе! Ці ж бы я да гэтай пары была моркву не прарваўшы! Ці ж бы так папусцілася, каб за лебядой бульбоўніка не было відацца? Ці ж бы я пер'е выкінула на шуметнік, курыцу засекшы? Каб вы з Манькай ведалі, што ўжо дзевяць падушак маю, дык палопаліся б са злосці! Усю зімку скубла, смагла, а вы семкі грызлі! Гультай ты несусветны! Усё жалішся: ой, не магу, ой, не магу. А я магу? Ці я ад шчырасці, ці з патрэбы раблю, ці з хваробы — нікому не кажу! У грудзях гарыць, на цябе гледзячы!

— І ты надта не перарабілася, калі сілы мела ў агрэсце з Аляксеем качацца, за шалёўку адбываючы!

Жах у вочы! Стася як стаяла так і стаяла. І крыжыкам не налажылася, маўляў, нічогачкі паміж імі не было! І не бажылася, толькі засмяялася далёкім глухім смехам, каб дакаціцца да той пары (а ўсяго ж прайшло месяцы са тры — лета!), калі

падабаўся Аляксей. Ёй горача зрабілася ад бабскага навету, нешта маладое штурханула ў грудзі, ногі палягчэлі. А адыходзіцца ад Агагы не хацелася — хай бы ж яшчэ што сказала.

Агата сцішылася, адышлася. Пабрахалі й досыць... Вось-вось пшаніца перастоіць, што каля хаты, у агародзе, і летась пад касу пусцілі. Шкода, добрая пшаніца, харошая, густая, хоць ты нажом рэж. Калі дождж зноў пойдзе, яна ж, скошаная, у траве прарасце. Трэба было б сярпом зняць. Але сыходзіць пара, Бог не дае паратунку. Хай будзе па-ягонаму, не парвешся ж, яшчэ ж сена неспарадкаванае. Павярнулася круга, пайшла святкаваць, да Бога. Усё тутака навокал ягонае, што дасць, тое і добра — на ўсё боская воля. Ага, юргіня ўжо расцвітае, каторая ж гэта будзе: юлёвая, жоўтая, чырвоная? Ледзь-ледзь абазначыўся, нараджаўся самы ўлюбёны, самы невыводны то на сукенцы, то на блузцы, то на хустцы, то ў гародчыку,— малінковы колер. Стаіць і любуе.

Цёпла, сонца ўжо не струменіцца, залаты, гарачы ягоны пылок церушыцца, сыплецца скрозь дрэвы, скрозь пальцы, тут ёсць, тут не, нехта цярэбіць сонца — вялікі спелы сланечнік. Маладыя буслы навучыліся лётаць. Але яшчэ няма сабе веры. Разверне каторы скрылле, а ляцець — не ляціць. Стаіць, забыўшыся, кратаецца на ветры. Ледзь-ледзь заламанае крыло, свежае белае пер'е падпашкамі — выслана, як у анёла, стаіць, распяўшыся, над Агацінай хатай.

Недалёка ад гнязда ляжала свежа спілаваная арабіна, і яшчэ адна побач. Спілавана высока, нават чалавек і не сагнуўся да камля — як рукой заламаная, у пояс стаіць пень.

— Стася, што там нарабілася, буры ж не было?.. Арабіны ляжаць каля гнязда. Чыя шкода? — пытаюся ў кожнага, хто натрапіцца.

— Я спілавала... бо ягады няможна дастаць, завысока надта. Хачу ў віно дабавіць... Кажуць, смачна з арабінамі.

— Гэта ж не каліва, не зёлка, каб заламаць, у дрэва ж зусім накшы век?!.

Стася апраўдвалася з нейкім адчаем у голасе, быццам нешта даўно боралася ў ёй і вось, неспадзявана для яе самой, перамагло. Стаяла, шырока расставіўшы ногі, вызвалаціўшыся ад сумненняў, ад розных перашкод. Прыспусціўшы вочы, сцішана смяялася з мяне, маўляў, хавацца не будзе, вось захацела і спілавала!

Крычу, заву яе, як у благім сне, — няма голасу. А яна ўсё далей і далей, з поўным падалом арабін ходзіць па зямлі ад халоднага боку сонца, чыніць запас на зіму.

«Наш са Стасяй бацька ніколі дрэва з пня не зняў, век у хаце дровы гнілыя былі, сухастой валіў...» — малітвай успомніліся Рыгоравы словы.

Пераступаю парог Агацінай хаты, гразка занесены жыццёвым глеем.

Яна цадзіла малако, гаварыла сама да сябе:

— Каня брыгадзір даў... дзеці прыехалі, пшаніцу ў ток звазілі... камбайнам памалоцяць... мужчыны гной кінулі з хлева, жыжу выбралі, падлілі пад атаву...

Гаварыла надзіва роўным голасам, пералічвала работы, толькі што не на пальцах. Рыгор сядзеў ля стала. Цурчэла малако белым ручаём. Усё ішло як мае быць. Была ўпраўка ў яе гаспадарцы, такая рэдкая госця... Мы ўсе глядзелі, слухалі, як шуміць у даёнцы пена.

І ніхто не пытаўся, чаго, па што-якое зайшоў у хату чужы чалавек...



# КАЦІЎСЯ ПЯРСЦЁНАК

Хата цёткі Барбары каля самай ракі, павярнуўшыся да яе якраз тым бокам, дзе печ. Турчаком не сціхае вада. У непагадзь вецер коціць з блізкага лесу шум дрэў па садзе хвалямі, валам. Іншы раз туман падымаецца па сходках на ганак, потым аж пад вокны. Тады хата скранаецца з месца, і не пазнаць, на гэтым беразе яна ці на тым. Старая жанчына ходзіць па хаце, як па пароме, круціцца галава — падняўся ціск.

Цётка Барбара не любіла благіх вестак, звадак. Зноў цукар падаражаў, мука, крупы, хоць ты на вуліцу да баб не выходзь. Калі выпадала чарга каровы пасвіць, пільнавалася, каб першай у вёску вярталася ўвечары ейная сівая, варожачы на заўтрашні светлы дзень. Ідзе тая, бакі калышуцца, клубы блішчаць, аж галубовым заносіць. І белая галава, бы ўвесь час пад самым ліхтаром вялікага летняга поўдня. За ёй ляснныя птушкі лятуць, садзяцца на высокія рогі, пераплываючы, як на чаўне, з лесу ў вёску — доўгі шлях прыручэння да чалавека. Раніцай Барбара зноў пачуе незнаёмы голас у сваім старым садзе. Будзе дзівіцца таму, які вакол яе бясконцы свет. І гэтай навіны хопіць у ейнай хаце. Надта не залюбіла апошнім часам такой работы: пасядуць дзеці, прыехаўшы з горада, глядзяць тэлевізар, а там — зноў вайна, Чачня. Нашто глядзяць, злуецца, ці каб галава потым балела? Ёй спакайней, калі пра благое не чуе, ціск не падымаецца.

— Мама, вось пачнецца ў нас тая самая вайна, дык мы, пакуль Шырчыха не скажа, і ведаць не будзем, — смяюцца з яе.

На Вербніцу не знайшла каляровай паперы, каб прыбраць вярбу, тады зрабіла кветкі з таго, што мелася. Пялёсткі — з абгорткі ад цукерак, з старой цюлевай фіранкі, з каснічка, з

сіняга пер’я вутачча. Як не ўсю хату пасвенціла ў царкве, гэтак удалося, абараніла ад усяго благога ейныя куты. Не трудзіце яе, не чапайце, не рушце. Яшчэ яна гора сваё не зжыла, году няма, як мужа Петрыка пахавала. Яшчэ ён прыходзіць унаначкі, сніцца. І днём, выдаецца, увесь час недзе побач. Прыляжа яна: «Ты спіш?» — пытаецца. Сядзе: «Што ты робіш?» — зноў ягоны голас. Ён ёй і прадказвае, папярэджвае, каб не пужалася, калі што благое натрапіцца. Сніць нядаўна: ходзіць Петрык па аўсе, у чорным капелюшы. А авёс жа, здагадалася раніцай, — слёзы. Скора на тым разе і спраўдзілася.

Ад гэтай навіны ёй ужо не ўдалося схавацца: сын жэніцца, бярэ сабе бабу з горада, развядзёнку, з двума дзецьмі! Выйшла з хаты, якраз жа сусед помнік прывёз па мужу. Не, ставіць яна яго цяпер не будзе, схавае да часу ў паветцы, пакуль сама не памрэ. Ёй асобны не патрэбен, каб на галаву не ціснуў, пасярэдзіне паміж імі гэты няхай дзеці паставяць, ёй толькі, калі спатрэбіцца, крыж лоўкі. Хутка ейная чарга, маўляў. Паклікала сына да сябе: «Паўла!» Той з суседам размаўляў, хацела лепей распытацца пра навіну. А голас збочыў, ніхто яе не пачуў, і яна адвярнула твар ад людзей, зайшоўшыся ад плачу, ідзе, не разбіраючы дарогі.

Ці плакаў бы, ужаліўшыся, так шчыра чалавек сам-насам, каб не адчуваў у адчайную хвіліну побач з сабой Бога?

Колькі жыла, цуралася чужых людзей, няўжо гэтым ухваліла Багародзіцу? Калі й пазычала каму што-небудзь, дык наўздагон трэба было аддаць, усе ведалі. Ад смерці не адкупілася б, каб хто кубачак малака папрасіў. «Сваім трэба», — адкажа, не прызнаючы суседства. І той пойдзе з двара чужынцам, на момант адчуваючы сябе адлучаным ад чалавечага роду, як ад царквы. Кош бульбы-сямянкі папросіць Шырчыха, але з чым прыйшла ў двор, з тым і пойдзе. Гэта не з-пад каровы, што калі раніцай аддасі, дык увечары надоіш. А як сабе не хопіць пасадзіць? Скора знаходзіла апраўданне, доўга не пакутавала. Ніколі ні ў кога ў вочы не спытала: як

чалавек жыве, як здароўе. Лепей не ведаць, а то яшчэ прыйдзецца спагадаць ці пазычаць. Суседзі век па людзях, а ў яе ўсяго свайго хапае, няхай і яны самі ратуюцца. А тут раптоўна адразу двое дзяцей чужых у хату ўкінулася! Сын перастарак, за сорак гадоў мае. Прыедзе з горада на выхадныя, — кім ён там працуе, не можа яна здумаць, — адразу за касу, за матычку — і ў агарод. Не, каб гэта на вечарыну ў клуб ці так — у вёску да дзяўчат; не п’е і не курыць. Сэрца матчына балела. Але і выгаду мела вялікую — сын ужо ёй і за бацьку, і за мужа, усю мужчынскую работу паробіць. Хай сабе будзе як яно ёсць, раздумлялася.

— Не вытрымаю, пайду скажу: кідай, пляменнічак, матычку, ідзі жызню сваю пара́дкавай, бабылём застанешся!

Прыляціць у двор сястра Петрыка Клаўдзя, жыве насупраць, пасміхнецца:

— Кажаш, зямлю надта любіць?!. Гэта не любоў! Ён у цябе з маленства ў зямлю глядзіць, ён яе і робіць. Пануры чалавек, паніклівыя вочы, ён нічога іншага не бачыць, толькі тое, што пад нагамі! А ты, матка, яшчэ і патураеш! Гані ты яго з агарода!

Па злосці гаворыць Клаўдзя, пужаецца цётка Барбара, не мае яна ласкі да Петрыкавай сям’і. У сына ў горадзе і кватэра, і дзве вязальныя машыны, і чатыры вярблюджыя коўдры, шмат чаго дэфіцытнага назапасіў яшчэ пры былой уладзе. А дзеўкі, праўда, чамусьці не квапяцца на ягонае багацце. А каб жа яны яго бачылі за плугам! Ім, гарадскім, каб мужчына век на кані...

Не, Клаўдзя па злосці кажа на яго.

І Петрык сястры адтуль, з таго свету, не спрыяе, на маладняк, бачыш, падае ягонае. І цялушку не датрымалі, як меліся, трэба было прырэзаць, і труска акацілася мёртвым, і агуркі — толькі завяжуцца, як нехта іх есць, псуе. Карова маладая захварэла, гуз каля вымя знайшоўся. Яна хадзіла да мужа і на могілкі, прасіла: «Петрык, адпусціся, надта шкода Клаўдзіну кароўку...» Адкінулася яму старая крыўда, як хва-

роба, а за яго пасварыліся брат з сястрой, і не памятаецца. Да году гэтак будзе, а пасля году ўжо сіла ягоная прападзе, усё мінецца.

Хадзіла, людзей баялася, будуць пытацца пра сынаву жаніцьбу, што ім адказваць. Спадзявалася: а можа, яно яшчэ разладзіцца. Сын усё жыццё запасіўся, скупіўся, будуючы свой дом, а атрымалася — паветка. Налятуць, як вераб'і, чужыя дзеці, усё расцягнуць, папсуюць. Ад Шырчыхі толькі не схаваешся. Ідзе тая, яшчэ здалёк глядзіць, прыглядаецца з-за вугла, з-за хлявоў, каб заспець Барбару на двары, убачыць, куды яна паляціць хавацца. Цоп! — убачыла! І цяпер ужо не спускае вачэй, ідзе, спатыкаецца, як на вяроўцы наважаная. Пабыўшы, сунецца аж з таго канца стары Пэндзаль, астатні п'яніца, глядзіць на вокны хаты, як у вочы вясёлай бабе пры дарозе, таксама ўжо ўчуў, спадзяецца на чарку. Толькі зачыніла за імі дзверы, стукнуў нехта ў шыбіну. Стук не пачуты, бы за плечы нехта павярнуў да акна. Падняла галаву... стаіць ейны Петрык, на нешта, во, выдаўся. Гадзіна якая мінулася — і Клаўдзя прыйшла, быццам сырніцу прасіць. А яна б ужо і забылася на тое, што ён казаў паміраючы, дык жа, як напомніў, во, пад вокнамі варожачы. Казаў: нічога ягонай работы Клаўдзі не давай — ні калёс, ні бараны, ні гэтай і сырніцы. Цётка Барбара аж узлавалася. Што ён усё сваё правіць? Увесь час яе пільнуе! Не так ужо яны й маладымі любіліся, каб не разлучацца і пасля смерці! Хіба ёй зараз па сырніцы галава баліць?

І адзін раз прывёз Паўла нявестку з дзецьмі, і другі, а яна ў думках сваіх яе не прымала. Выляціць насустрач, хустка расхрыстана, ногі ў розным абутку, сама ў твары, як з-пад мяльніцы. Як нервы разыдуцца, не можа сабе рады даць, кіне ўсё, пойдзе ў паветку быццам дровы складаць. Сядзе, сціснецца ў камячок, пазірае здалёк бежанкай, не пазнаючы ні хату, ні мясціны. Абы пераседзець як непагадзь, пакуль зноў у горад ад'едуць. Нявестка выйдзе на ганак у пляжным камбінезоне, Барбарыны замужнія дочкі кажуць, што над-

та дарагі. Белыя шкарпэткі, белыя красоўкі, рукі ззаду ў кішэнях — не памочніца, думае цётка Барбара. А трэба агарод сеяць, самая пара.

— Паглядзі, як спіну трымае, бы ўвесь час у крэсле сядзіць! — перагаворваліся дочкі, разглядаючы сваячку, маўляў, надта «дзелавая» гараджанка, хлопца адхапіла, нежанаціка.

Паўла адмяніўся, зморшчыўся, вочы без зрэнак, як у народжанага дзіцяці, светлыя, нявінныя, ходзіць спавіты сваімі думкамі, нічога не гаворыць ні да кога, рукі аж да долу дастаюць. Бы вялікае вогнішча, лом расклала нявестка сярод двара блізка каля жытла. Уся радня спалохана глядзіць на агонь, засланяючы гарачыя твары. Не, гэта не ён, яна яго ўзяла, на сабе жаніла, думала цётка Барбара. Вазьме семя ў руку, хоча на ветры ўзвеяць — няма ветру. Глуха вакол яе, лясны гушчар абступіў, зацiснуў, голы, восеньскі, каб табе дзе хто птушкай азваўся. Пойдзе да ракі бульбу-паранку мыць, стаіць у поцемках, уся ў чорным. І гадзіна, і другая мінецца, ужо яе ад чорнай вольхі не адрозніш. Ужо і вада па нагах бяжыць, да сярэдзіны камля падымаецца. А гэта туман халодны выкінуўся, трэба ў хату ісці.

Гляне на нявестчыных дзяцей, ёй выдаецца, што паміж імі чэрці гуляюць. Бо пры жывым бацьку маці замуж ідзе. Дзяўчынка гадоў шасці, першы раз яе ўбачыла, тая сядзела на траве каля Паўлавых ног. Падняла галаву, пагляд на дзіва сталы, разумны, глядзела карліцай. Дзіця ад нараджэння абцяжарана ці то заганай, ці то нейкім талентам, як гарбом. Неяк уначы цётка Барбара пачула на панадворку клік дзяўчынкі: «Та-та!» Ускочыла, сэрца калацілася — гэта быў ейны голас, ейны адчай, што даўно быццам заглушылі муж, дзеці, унукі. Яна сама вельмі рана пахавала бацьку, якога любіла болей за ўсіх, і маркоцілася па ім усё жыццё. Дзяўчынка адна на ганку, ноч, цёмна. І стрымалася, не падышла, не пазвала да сябе. А была ж такая хвіліна, такая шчырая, такая едная, болей ці ўдасца. Пабаялася дакрануцца, як да

птушаняці ў лесе на зямлі, якое вывалілася з гнязда. Ні ўссадзіць на дрэва, ні з сабой забраць, адно спадзяванне, што сама птушка знойдзе, уратуе.

З хлопчыкам, той старэйшы, намнога прасцей. Дзяўчынка ўвесь час верадзіла ейную непрыхілкую душу. Вернецца Паўла з поля ці з пасты, калі радоўку адбывае, ніхто і не вучыць, а дзіця выляціць з хаты, яго ўбачыўшы, на высокі ганак, зловіць, калі ён толькі падыдзе да сходак. Ашчалепіцца каля шыі, павісне. Паўла збянтэжыцца, ледзь рукі ўзложыць на цельца, быццам абдыме, і зноў яны цяжка асунуцца ўздоўж свайго як нежывога цела. Нязвыкла, няма ў іхняй сям'і моды, каб лашчыцца адзін да аднаго. Паўла кожны раз аж усхліпне ад нечаканасці. А можа, ад сірочай расчуленасці. Бо ўсё часцей сам прытуліць дзіця. Возьмуцца за рукі, ідуць. Павольна, як двое дзяцей, без патрэбы, без дарогі, абы ісці, вучачыся хадзіць разам. Моўчкі ідуць, сцішаныя нязвыклай адзін для аднаго блізкасцю. Глядзела ўслед, зайздросціла. Ніколі яе мамай не назваў, пакуль яна на яго свае вочы не падыме, не загаварыць. Калі што якое і пільна трэба — не азавецца. Ніколі, каб і яна, маці, пагладзіла па плечуку, запыталася, як жыве, баялася, што зазлуецца, мужчына ж. А ён, можа, і чакаў...

Не было ніводнай начы, каб не плакала, каб заснуць удалося. Тады толькі вочы спусціла перад раніцай — і Петрык во гэтак перад ёй, як Паўла ці каторая з дачок. «Матка, уставай... Строй есці, кармі сям'ю». І яна зразумела: муж наказваў зміpыцца, прыняць у душу ўсё, як яно ёсць.

Лёгка стала, дала, нарэшце, сабе раду. Выйшла на ганак, рукі ўбокі, калі яна яшчэ гэтак стаяла?!. Ну, усё, дзеці ў парадку! «Божа, твая воля...» — прамовіла, адчуўшы, нарэшце, над сабой уладу, вышэйшую за сваю.

Раз-пораз клікала да сябе дачок, унучак, усе павінны быць пад рукой, нікуды далёка не адыходзіцца — трэба хату да вяселля рыхтаваць! Падцепліла печ, яшчэ не развіднелася, дым з коміна падымаўся высока, ішоў па цёмным небе над

вёскай белым Млечным шляхам. Пільнае, штодзённае ўжо адышло ўбок. Паздымалі фіранкі. Удзень вокны напроці саду зелянелі цёмнымі глыбокімі вірамі. Скранулася жыццё, шырокім рэчышчам захапіла ўвесь падворак. Нешта складалася ў мяхі, выносілася да часу на гарышча. Ужо яно тамака і забудзецца, і прападзе. Посцілкі ваду ўбачылі. Сувоямі скручвалася чыстая бялізна. Падкасілі, прыбралі вакол, хата адразу бы на новае месца перасела. Во калі толькі вынесла на сонца з-пад пахаванага мужа пярыну, на адну хвіліну, каб не зжыўся ягоны дух. Увечары, калі запальвалася святло, віднеліся праз вокны пасярод вялікага пакоя, як на ўзгорку, адны сталы й лавы.

— Адбіце, адчыніце чысты ганак! — крычыць, а сама думае: «Праз яго Петрыка выносілі на могілкі, няхай і маладая праз тыя самыя дзверы на вяселлі пераступіць парог, бо гэта ён, ейны муж, загадаў яе прыняць, ягоная воля, што боская.

Ужо цётка Барбара мела што сказаць людзям, калі пыталіся пра Паўлаву жаніцьбу. Маўляў, лепей падабраць чужых дзяцей, чым сваіх кінуць. Нечага былі засварыліся паміж сабой дочкі, нявестка спалохана выйшла з хаты. Цётка Барбара стоцьма кінулася яе ўшчуваць: «Ты ў вялікай сям'і не жыла. А ў вялікай сям'і пасварацца — і тут жа добра гавораць. Гамонка ў нас, вясковых, такая: надта не асцерагайся, многа яе, гаворкі, у нас адно да аднаго, як шуму ў густым лесе».

Узад-уперад па панадворку, цалны дзень. Нясе яна нешта ў маленькіх начовачках, далікатна захінёнае белай марлёўкай, як зыбаўку. Старыя вольхі каля ракі з птушынымі гнёздамі, лазенька, хлявы, хата, яблыні, вецер гойдаў, калыхаў ад плоту да плоту. Над ёй, як на абразах пад самай рамай, пэўна, віліся анёлы. Карунковым капусным лістом скручваўся, спавіваўся ў агародзе маладзенькі качанок. Усё навокал згадвалася, усё ёй варажыла на малое. «А ці будзе тая баба яму ўжо раджаць, маючы сваіх двое?..» — гаварылі на вёс-

цы, даходзіла і да яе, Шырчыха даносіла. Спынялася, глядзела далёка, ёй відалася і тое, што на рацэ, там малако адстойваецца ў бляшанцы, стронгі віюцца, студзяць ваду, і тое, што на агародзе, і нават на сотках, за лесам, — і ў снах, і на памяці. Ад ракі ішлі Паўла з дзяўчынкай, узяўшыся за рукі. Штодзень так, абы сустрэліся.

Дзіця быццам вучыла яго хадзіць у пары.

Нявестка чакала іх на ганку, усміхалася. Ледзь чутна даносіліся грымоты далёкай навальніцы. Маланка бліскала па небе, у вачах маладых залатым кольцам.

Каціўся па панадворку пярсцёнак...

Не можа быць, каб маладая разбіла хату на два канцы, паставіўшы пераборку: у адным пяюць, у другім — галосяць. З гэтымі перадумкамі яна і йшла запрашаць на вяселле. Загінала пальцы, лічыла. Як бацюшку пазваць, гэтак найперш Клаўдзю трэба запрасіць, родная ж цётка. Няхай Петрык выбачае на яе. Пазбіраецца толькі радня. Шырчыху пакліча апасля вяселля, пасядзяць удваёх, нагаворацца — гэта ўжо як справаздача якая. Шырчысе адмыслова трэба ўсё ведаць.

Дарэмна тая строілася падпяяць Паўлу за сталом, чыста па-жаноцку, не даруючы старому дзецюку такое доўгае халасцяцтва:

Дзе ж ты, хмэлю, зімку зімаваў,
Што й не развіваўся?..

Нервова лапнула па кішэнях, нічога не знайшла, каб рукі чым-небудзь заняць, засяродзіцца. Хай сабе хоць наастатак удасца паспытаць тую свойскасць да чужых, чаго не мела, век баронячыся. Ні галінкі як на тое, ні ліста на вочы не трапілася. Падняла каменьчык на дарозе — гару несла перад сабой.



# АСЕННІЯ ПТАХІ

Яна выходзіла з пад’езда, сумкі ў абедзвюх руках — звялым скрыллем да самай зямлі. Ідзе ўкрадаючыся, бы з чужога дома, стала, азіраецца — ці бачыў яе хто. Прыгнуўшыся, ступіла ў цемру, як пад абложанае неба.

— Ніна! — заву, ідучы дадому.

Куды гэта стары чалавек пайшоў унаначкі? Добра ведаю, яна пачула, пэўна, спынілася — зусім жа блізка. Але не азвалася. Стаіць, пэўна, смяецца з мяне недзе на мяжы святла і цемры. І як заўсёды ў спрэчках скажа аднымі вуснамі, запэўніваючы: «Маўчы, маўчы, ты жызні не ведаеш...»

Позні вечар насупіўся, непрылюдна мільгне зрэнкай адзіная лямпачка. Сквер, куды пайшла Ніна, не асветлены, як той лес, цёмным гушчаром — адразу за нашым домам. Недзе побач, а можа, якраз і на гэтым самым месцы, горад калісьці пахаваў хутар Мядзьвежына, паклаўшы яму пад голаў вехаць цыкоры. Улетку цыкора ўзыходзіць, падымаецца высока, але мала хто ведае ейную назву. Блакітныя зіхатлівыя кветкі сярод цёмнай травы, пылу невядомым, густым сузор’ем. Першы снег увосень, абы да яго дакранулася сонца — толькі трэба лучыць, заспець — на імгненне запахне вялымі кветкамі. Тут, кажуць, быў Вялікі белы сад. Калі палягуць снягі, такія вузкія сцежкі ад дому да дому, хоць ты вітайся з незнаёмым чалавекам, цесна размінаючыся, як не абхапіўшы адзін аднаго рукамі, каб не паваліцца.

Позна ўвечары гэтым чорным часам ідзеш насустрач незнаёмаму сцяўшыся, як на мядзведзя.

Яшчэ раз удалося ёй схавацца ад людзей. Усё ж меней будуць ведаць, што яна гандлюе на вакзале півам, гарэлкай, цыгарэтамі... Уся ў цёмным, ужо яна плячо ў плячо з ноччу,

нічога не баіцца, усё роўна, калі што якое, то і рукой не адпіхнеш — рукі занятыя. Ужо яна адной парой з тымі, хто пакідае цемрай, як пацук, падвалы, цёплыя вуглы кацельні, ідзе «на паляванне». А варта стаць побач з бабамі на вакзале, абавязкова каторая адцісне яе з бойкага месца, як не прызнае ад учарашняга. Усё яна тут ім навенькая быццам. Можа таму, што так пужліва азіралася, калі хто перацягне мацюком. Драбніўся позірк на дробныя шкельцы. Тады яшчэ ніжэй насоўвала хустку на лоб і паліто апранала пушчэйшае. Ёй цяпер і бутэльку пустую могуць аддаць у рукі, спагадаючы. Але ж і міліцыя забірае без следства, раз бабка ноччу на вакзале. Круціш галавой, як пеленгатарам, каб не папасціся, каб паспець уцячы за вугол. Апранулася неяк чысцей, вусны намалявала, да такой, вядома, маёр міліцыі не падыдзе, не западозрыць, што таргуе. Але ж і п’яніца не спыніцца. Вось і згадай, што лепей. Спасцігалася хітрая навука малога бізнеса. Што, хіба вунь тая, на вугле, Мышкай завуць, худзізна, уся цыгарэтамі аберчана, а не пазнаеш — нарадзілася і адразу ў торг?!. Тая, дзе мацюкамі, а дзе — на каленьках перад міліцыянерам, каб не забраў, кожнага дагоніць на вакзале, прымусіць купіць. Выручку мае зайздросную, Ніне такое і не сніцца.

Ледзь-ледзь затрымлівалася пад бяздоннем вакзальнага гвалту, бязбожжа. «Тамара, — сказала неяк сяброўцы, — давай крыжыкі надзенем на шыю, інакш — прападзём...» Гудок цягніка глушыў галасы. Яна разам з ад’язджаючымі бегла па пероне, спадзеючыся добра ўтаргаваць. На нейкі момант выдавалася, што гэта якраз ейны вагон. Здэйся, усё б кінула, села б і паехала адсюль у сваю вёску, да пляменніцы, жыла б у катушку, абы на зямлі, сярод сваіх. І адведаць хацелася б. Вось толькі шкада, што новую газавую пліту яшчэ не атрымала, абяцалі ў домаўпраўстве памяняць. Штодзённыя клопаты мелі вялікую сілу, каторы ўжо раз зміналі на дарозе да вёскі, затрымлівалі. І вазоны на вокнах без яе пасохнуць. Слаба і цвітуць, яна пачапляла на іх чырвоныя ліхтарыкі су-

хога фізаліса, усё ж весялей. Калі ў доме адныя свары, у ім пасяляецца нячыстая сіла, чула па радыё. Нават умывальнік ніхто з сантэхнікай не можа адрамантаваць, слініцца вада і слініцца. Маўляў, не кватэра, а неспрыяльная зона...

Адышоў цягнік, разышліся людзі. На пустым пероне па свежаму павольна ішла нейкая старая, кіем падымала, пераварочвала скамечаную паперу, шматкі імпартных упаковак. І другая за ёй — асеннія людзі, як птушкі, па полю ўслед за вiруючым жыццём.

— Ого-го-го!.. — калоціцца Ніна ад радасці, смяецца, сустрэўшыся ў калідоры. — Я знайшла сёння харошую хустку на вакзале!

Глядзі, дзівіся, і людзі ішлі ўперадзе, і не заўважылі! Такая неспадзяванка! Яна заўсёды нешта знаходзіць. Мы разам з ёй не думаем аб тым, хто згубіў, хто панёс страту. Можа, каму і не вядома гэтае дзіцячае пачуццё: заціснуты босай нагой толькі што ўпушчаны некім рубель у краме. Тым больш, калі ты ад нараджэння ясі, сілкуешся не са стала, як людзі, а з зямлі, з шуметнікаў. І цяпер яшчэ поўнае валлё каменьчыкаў, жвіру ад той пары. Тая радасць заўсёднай перашкодай паміж табой і людзьмі, якія маюць што згубіць, зблоціць ці проста выкінуць.

У доме асцерагаліся Ніністай шчырасці. Перахопіць каго ў калідоры й трымае як не з паўгадзіны. Той ужо просіць змілавацца, каб карацей гаварыла, маўляў, надта спяшаецца, няма часу бавіцца.

— Не магу табе карацей! Ну, во, такі хлеба кавалачак ці так чаго адрэзаць, — паказвае на дзвярах пальцам, — а гэта ж разгавор, як адрэжаш?.. Во, здумала, што мяса ейнае з балкона ўкралі! А там балкон — толькі кату перайсці! — зславіла яшчэ гарачую плётку адной старой суседкі на другую, кінула аб зямлю, і больш няма чаго гаварыць.

Вось яна ўжо некаму і злосніца! Спяшаліся абысці, калі яна, стоячы ў калідоры, жалілася ўсім спарадку на свайго Андрука: зноў, маўляў, напіўся, падлай абазваў:

— Я трыц-цаць гадоў толькі гэта чую!

Слёзы раптоўныя, з сухіх вачэй, быццам гэта ўпершыню чутае — першым дажджом пасля спёкі на сухую дарогу, людзям пад ногі. Рукі да твару, уся сцінецца, плача ціхенька, па-сіроцку, бы дзіця ў кутку чужога дому. Нехта з маладых суседак раіць ёй зрабіць завіўку, падмодзіцца, маўляў, можа б мужчына палепшаў да яе.

— Аніколі! Ён не бабнік! — злуецца Ніна. — Мая завіўка, мая ўся харашба, гэта тое, што я яму смачна ежу строю!

І бярэцца тачыць нож аб прыступку лесвіцы. Не памятае, каб яна калі была свайму Андруку за жонку. О, мужчына пад чаркай! Дзікім хмелем завіваюцца ягоныя кучары. Які ён вольны й вясёлы, як блізка, увесь час наўмя, ягоныя моцныя жаданні! Хмелевай лазой выцінаецца побач... Такога Ніна не зведала. Андрук чайнік з кіпенем на пліце забудзецца выключыць, спаліць дашчэнту, затое ўспомніць ёй п'яны найдрабнейшую нікчымніцу, абы каб толькі пасварыцца. Цела ейнае асядала пустой, халоднай мураванкай, адныя блакітныя вочы блішчэлі нясцерпна чыста, ніколі не хаваліся за аканіцамі, бы сонца навылёт ад усходу да захаду.

Пустазеллем цвіла навокал ясная цыкора, ёй таксама невыносны цень...

Не злучана яна з Андруком, не ейная гэта палавіна, да крыку даходзіць, гвалтам крычыць у калідоры, аж на вуліцы. Ідуць людзі, азіраюцца, стыдаючыся. А яна знаходзіць усё новыя і новыя доказы супраць мужчыны, быццам ён злодзеем праз акно залез у ейнае жыццё. І яна сама не ў сваю долю трапіла. Ратуйце, лавіце яго! Не прызнае Ніна гэтыя гарадскія сцены, гэтыя дзверы, скрозь праходзіць ейнае асабістае, жаночае. А калі ў вас і ціха, нічога не чуваецца, то гэта вы проста стаіліся са сваёй нядоляй. «І ты няшчасная...» — скажа суседцы знянацку, спачуваючы ёй, як сабе. Тая потым далёка будзе яе абыходзіць, баючыся адназначнасці. Чалавек звычайна падумае так аб сваёй долі толькі ў горкую гадзіну, у гадзіну адчаю. А не штодня.

— Чулі? Чыталі? Паліцыянт забіў учора дзяўчынку з аўчаркай! — пераймае.

Навошта, Ніна, увесь час пра благое ды яшчэ з самай раніцы? Век у брыдоце, адкажа, колькі жыве. Ёй, маўляў, лягчэй, калі й іншыя ў горы, у няшчасці. Ёй тады свайго жыцця не так шкада, калі разам з усімі. Як у вайну ўсё роўна.

Шчаслівых яна не бачыла.

Хоць ты запытайся: ці заўважаў хто з суседзей, што ходзяць каля ейнай кватэры надзіва лёгка, не адчуваючы адчужанасці? Быццам увесь час адчынены ейныя вокны, дзверы, у пакоях заўсёды чыста, і толькі скразняк гойдае фіранкі, як у той песні. Выкрычыцца, выплачацца, справіць абедню па ўсіх, хто курчыцца ў адзіноце. І мы, сустрэўшыся ў калідоры, лягчэй загаворваем адзін да аднаго. Не пра сябе, вядома, — пра Ніну: зноў, маўляў, напіўся ейны. Але ж хоць гаворым, хоць вітаемся. Іншы раз выдаецца, што яна ўвесь час на парозе. Здалёк пачуўшы Ніну, ужо ў калідоры быццам скідаеш з сябе цяжкую барму. Як бывае, калі йдзеш з аўтобуса да сваёй вёскі. За ліпамі ў лагу заплача кнігаўка. Адразу падумаецца: вось ты й дома.

Сумная птушка пры тваёй дарозе.

Але няма ёй куды зайсціся, перасядзець, пакуль Андрук заціхне, абасне. Тады яна аднойчы ўзяла ў рукі сумачку, паклала бутэльку гарэлкі — і на вакзал. І ўжо ёй быццам прычына: і работа, і капейка. Абы сысці. Цяпер яна сама хавалася ад людзей, бо набыла тое, што лічыла найбрыдчэй за ўсё на свеце. «Маўчы! Маўчы!..» — скажа, пужаючыся самой сябе, варта толькі запытальна паглядзець ёй у вочы.

Вернецца з вакзала звычайна паўначой, у доме ціха — якая пара, адныя павукі начным страхам кратаюцца на дне ванны, спусціўшыся па ваду.

Піў мужык заўсёды, але цяпер не хапала ейнай пенсіі на закусь, на ежу. Праўда, п’яны быццам меней есць і што толькі трапіцца на вочы, і бульбай у мундзірах не пагрэбуе. Абляціць Ніна ўсе крамы, прыцэніцца, каб выгадаць капейку. На два-

ры бура, завея, а Ніна ідзе дамоў вясёлая, коцяцца слёзы на твары ад марозу. О! У непагадзь, маўляў, людзей на кірмашы меней, можна дзешавей купіць тое-сёе. І дзеля самой сябе стараецца. Не, яна апошняе не з'есць, лепей хай прападзе, сапсуецца і выкіне, але каб было, каб у людзей не прасіць.

— Калі халадзільнік няпоўны, тады ў мяне во тутака пачынае балець,— паказвае на галаву, на самое цемя. — Я ў вайну так галадавала, уся спухшы была, пальцам не коркнеш — скура на мне лопалася...

Глядзіць на маладых суседак вачыма бежанкі, якая ўвесь свой век у дарозе, уцякаючы ад ваеннага голаду.

Гэтак любіла штодня, каб бутэрброд з'есці: масла, сыр і соллю пасыпаць, каб солька ў роце чувалася — так ёй смачна. Ад вайны цярпець не можа ні крапівы, ні лебяды, ні бурака. Цяперашнім часам не да выгодаў. Але ж нехта, во, смажыць катлеты, пэўна, з дарагога любовага мяса. Так смачна пахне! Высока падымае грудзі, убіраючы паветра, слабка смяецца, бы не ў калідоры, а пад квітнеючым бэзам стоячы. Спахопіцца — і пабегла здаваць то слоікі, то бутэлькі. У мужа знойдзе пад ложкам пустую пляшку, усцешыцца, бы на вуліцы ёй пашэнціла. І спужаецца сваёй радасці. Абы не спыніцца, дзень пусты, калі няма набытай капейкі. Так-сяк рухае жыццё, усё бліжэй ссоўвае яго да краю. Ёй жа, як яна кажа, і пахавацца на могілках самой трэба. Дзяцей не нажылі, яна ж адна, і на гэты выпадак нешта ўжо запасіцца. А хавацца хоць пад гармонік, але каб усім чутно было — іншы чалавек хоць і не спыніцца каля ейнай труны, але хоць азірнецца на яе, ідучы па сваіх справах.

Забывалася на крыжык нацельны.

Выдавала, няма на свеце нічога, што магло б змяніць накірунак ейных пошукаў здабытку, няхай сабе і проста на дарозе, за людзьмі йдучы, ейных думак, як дзешавей пражыць. Праўда, неяк узялася чытаць Біблію, пэўна, вакзал усё болей змушаў ісці да Бога, шукаць суцяшэння. І вярнулася на паўдарозе. Чытала, чытала, а там усё кругамі: і зноў аб тым са-

мым, і зноў новы круг, аніякага ёй сэнсу. Быццам пісаў, дзівілася, малапісьменны чалавек. Ці, можа, яшчэ горш — па п'янцы?!. Але ж даўней быццам і п'яніц не было, спахоплівалася, разважаючы. Дык жа можна было да гэтай пары ўжо і паправіць, перапісаць! Колькі ж, маўляў, часу прайшло! Гэтак сама, калі перадаюць па радыё сімфанічную музыку. Жах! У яе ціск падымаецца, у галаве шуміць. Сімфонію ідуць слухаць у тэатр, лічыць упэўнена, каму дома не спіцца, як на гіпноз. Сама бачыла па тэлевізары: сядзяць, вочы заплюснуўшы. І Біблія, і музыка — казкі! Яна ж разумее толькі канкрэтна тое, што бачыць на свае вочы: дзверы, дык дзверы, талерка, дык талерка. Жыццё жорсткае, грубае, не любіць выдумляць таго, чаго няма.

Пэўна, вера ў Бога не можа існаваць без веры ў чалавека...

Бясстрашна вырашала жыць толькі ў сваім маленькім свеце рэальных рэчаў, сварак. Маўляў, яна не двуручная: ёй калі маліцца, дык маліцца, калі мацюкацца, дык мацюкацца. Старой цыганкай хавалася ў цемры начэй. Так і мроіцца ейны асцярожны крок вакол нашага дому быццам і не па зямлі — па багне: прапасці, трапіць у міліцыю, забіцца, але каб толькі не папасціся на вочы суседзяў. «Змарылася я... Як я змарылася...» — пажаліцца. І ніхто не паверыць, не ведаючы ейных начных ходак.

Чаму ж не, раней людзям пенсіі хапала на пражыццё. І ёй марылася сціпла, а пра што — як яшчэ можа думаць, уяўляць сабе адпачынак (так Ніна сама кажа) ішак, які ўсё жыццё на заводзе, на канвейеры ды яшчэ і ўдарніца? За грыбамі будзе ездзіць у лес, у кіно хадзіць, гэтаксама, як недзе ў свеце людзі жывуць. Начную кашулю хацелася пашыць сабе прыгожую. Корпалася б, сядзела, шыла. Яна так змарылася. Шкада, не вучылася пруткамі рабіць, маладая была поўная, баялася сядзець доўга на адным месцы, каб не растаўсцець. Думалася сціпла, але і гэта не збылося. Жыве цяпер чалавек недавяркам.

І раптам самымі маразамі сузор'е цыкоры зазіхацела ў небе! Колькі хадзіла ноччу, а першы раз бачыла гэтак густа блакітных зорак — якраз над былым Мядзвежыным хутарам.

— Ці верыш, пра што гавораць знакі задыяка? На гэтым тыдні мне варажылася на перамену работы. І спраўдзілася — я семкамі цяпер таргую... Трэба ж жыць...

Не хавае балючых вачэй, гэта, маўляў, ужо быццам «сваё дзела». Закупіць зерне, перабраць, памыць, папражыць з алеем — уга колькі трудоў! Няма ганьбы, калі яно трудавое. Праўда, міліцыя ганяе. І вось жа нядоля: усе людныя месцы пазайманыя ўжо. «Я інвалідка, і жыву ў гэтым доме, тутака торгу на аднаго чалавека!..» — злуецца на яе старая з кіем. Тады Ніна стала пільнавацца: калі тая выходзіць раніцай, яна ўжо ідзе з семкамі вечарам. Побач зусім малады мужчына з паламанымі пашчэнкамі, прадае крадзеную з калгасных буртоў бульбу. Яшчэ адзін алкаголік — тэлефонны апарат збывае за бутэльку. Ага, ужо ўчастковы прыйшоў, дапытваецца, дзе той браў тавар, пэўна, кватэру абрабаваў. Ая-я-яй, што робіцца! Яна стаіць, збірае людское гора, дакладае да свайго. І яно робіцца ўсё меншым, з мышку, што ўчора злавіла ў кішэні. Стаіць на марозе, на ветры, лузгае семкі — і есці меней хочацца. Галубы садзяцца зусім блізка. Тады яна высока ўзмахвае рукамі, распінаючыся пудзілам, страшыць — не крычаць жа на вуліцы.

Купіце шклянку сланечнікаў — ёй будзе весялей. Высыпце галубам, калі не любіце лузгаць.

Я сама дрэнна разбіраюся гэтай халоднай парой, не адрозніваю: дзе старыя жанчыны, дзе летуценныя птушкі...



# СУХІЯ НАВАЛЬНІЦЫ

*Вёска мая, чараўніца,*
*Што сэрца ўкрала?*
Цётка

Калі ж гэта яшчэ было. Зямля толькі што ўзарана, ідзе цёплая пара, бы нарэшце адчынілі вечка. Поле на пагорку, як на стале. Ціха навокал, благачынна, так бывае ў хаце на першы дзень пасля Запустаў. Торгнешся ступіць крок, не адчуваючы гэтай хвіліны, і спынішся з незразумелай дзіцячай паслухмянасцю, бы нехта побач з табой, намнога старэйшы й мудрэйшы, падымае руку да ілба — хрысціцца. Не перайсці — у вёсцы ў кожным кутку намоленае месца.

І раптам спёка. Яшчэ з вечара бачыла, як маладое сонца не ў пару сабе прымярала карону. Ззянне разыходзілася кароткімі шылаватымі зубцамі — зіхаценне дарагіх халодных каменняў. Рэдкі птушыны голас, кожны гук у паветры шчапаўся на трэску. «Сухаветрыца, як на сенакосе, — спарней за ўсіх скажа Броня на вёсцы. Ідзе па вуліцы, як заўсёды, подбегам. — Я шчаслівая, да старасці дажылася, а ніколі ні рукі, ні нагі не зламала. Птушка, тая на скрыллях і то, бывае, ударыцца ў шыбіну, не скіраваўшыся...» Прырода пільнавала ейныя таропкія крокі, бы пусціўшы сярод нас, людзей, на завод. У дзяцінстве, праўда, два пальцы ў сячкарні адрэзала. Па гэтым фальшы не мела, як і ў дзеўках хадзіла. Век рукі ў руху, у рабоце, аж у вачах мігціць, бы ў паветры, як птушка. Калі й згубіцца пёрка, не заўважыш. Ідзе, ветрае парваным падалом, няма часу зашыць, гуляюць скразнякі каля ног — халадок! Стаіць, пераймае яе Тамара, сяброўка з дзяцінства, прыехала стараваць у вёску, аддае ёй грошы за малако.

— Чаму гэтак робіш, у хату да мяне не зойдзешся? — злуецца Броня.

— Ты ж якраз дарогай ідзеш... За адным разам, во...

— І ты дарогай да мяне прыйдзі, не полем...

Злуецца, а сама сабе ўжо не можа рады даць, улёгшы ў работу. Не да сяброўства. «Як калі дзе пасяджу ці пастаю з кім на вуліцы, пагавару, дык мне гэтай мінуты шкода. Шкадую, бы што згубіла...» — шчыра прызнаецца. Людзі ўсё бачаць, абходзяць яе. І дзеці быццам адракаюцца. Якраз жа каля маіх вокнаў ішоў ейны зяць з сынамі, былі прыехаўшы з горада на выхадны дзень. Апошнім часам ён неспадзявана разбагацеў, займаючыся нейкім бізнесам.

— Бацька, паедзем адсюль, пастаўім у лесе палатку, вогнішча раскладзем, га? Хоць адпачнем, — ціха, пазмоўніцку настойваў старэйшы.

— Мае раптам падхапіліся, нешта ўспомніўшы, і паехалі, нейкая ў іх пільнасць... Запрасілі сала, цыбулі, хлеба... што да чаго... — тлумачыла Броня потым мужу Мікалаю мімаходзь.

Не, не здагадваецца. А мне шчыміць іхняя таямніца, бы ў маёй хаце нейкая няўдача. Ці то хлеб у печы ад моцнай гарачыні разламаўся на дзве паловы, на два акрайцы, пашчапаўся — і абодва сырцом, комам. Ці то... і здумаць няможна, што яшчэ благое. Яшчэ стаіць Броня сярод двара, прыбраўшыся, усклала на сябе, як толькі зяць прыехаў, сівы сарафан. І рубцы відаюцца на ім, як быў зложаны ў шафе, не адвісеўся яшчэ на ёй. Паправіла новую хустку, абвяла рукой па самым брыжыку, акрэсліўшы рэдкую на вёсцы прыгажосць: вытанчаныя рысы твару, бы за мроівам стагоддзяў. Так старэюць святыя жанчыны на вясковых абразах. Мікалай у новай блакітнай кашулі. Быццам і ў іх ужо другая жызня за багатым зяцем. Сарафан шарсцяны, горача, твар гарачы, позірк аж кіпіць, але ж дзеля дачкі, тая стала сварыцца, што бацькі ходзяць у карэлым, як заключонікі. Толькі — бліснь на мужа вачыма, маўляў, наробіць ён мыцця, вось і ўсё! Трэба ісці пераапранацца, раз ад'ехалі.

І дагэтуль, па-ейнаму, зяцёк не вельмі ляпіўся за работу, ведама, мужык гарадскога заводу. Во, нясе салому! Глядзі! Мала ўзяў, мне не хопіць! У цялушкі капыт задраўся, кроў цячэ. Падлога ў хлеве гнілая, можа, цвік загнала, трэба ёй падаслаць. Глянь, колькі ўзяў! Гультай! Ці ў цябе сілы няма?.. Паробіць паўгадзіны якой і кладзецца спаць! А трэба ж рабіць!.. Выгаворвала яму здалёк, у вочы не адважвалася. Нечага было дзівіць, ён працаваў недзе ў будаўніцтве, хапала, пэўна, клопатаў. Гэта не конь, што ўсё ў грыву і ў грыву, чалавеку трэба і аддыхнуць. Але ж трэба, прыехаўшы, і адрабляць цешчы за харч, адбываць павіннасць, як умее, без ейнай дапамогі дзяцей цяжка гадаваць. Не хапала ў зяцька звычкі працаваць без аддухі ўсю нядзелю запар. У цешчы зусім іншы дзень, іншы год. Часам збяруцца з хаты раней, чым меркаваліся быць, і паехалі дамоў, не дабыўшы да вечара.

— Няхай сабе едуць... Бачу, як ён усё ўкладаецца і ўкладаецца... Дашчэнту, бачыш, спрацаваўся ў канторы седзячы, — махне ўслед рукой, маўляў, такая з іх дапамога, яны ёй болей замінал.

Затое цяпер, спадзяваліся маладыя, пажывуць па-людску — справы ў бізнесе ішлі вельмі паспяхова. І дачка стала прасіцца:

— Мама, я ўсё магу купіць і сабе, і табе. Паспагадай, мне хочацца, прыехаўшы, каля рэчкі пасядзець, а я свету не бачу за работай... З табой некалі пагаварыць.

Ведала Броня ейную гаворку: една тое, мама, трэба меней трымаць скаціны, толькі калі трохі дзеля сябе, ім ужо дапамога непатрэбна.

— А што я загадаю рабіць, калі не буду занятая? Вазьму аднаго гусачка на рукі да грудзей і буду лашчыць?! Што я з гэтага буду мець?.. Трэба дзеля спажывы трымаць, а не дзеля строю ці ўцехі! — бараніла сваю вялікую гаспадарку.

Нарэшце, волю далі — скаціны трымай колькі адужаеш, зямлі выкупленай поўна, аж да ракі. Дачка, шкадуючы матку, з граблямі ішла на сена. Зяць, насупіўшыся, з дзецьмі — у

грыбы, маўляў, ён ужо зарабіў на ўсіх, можа і адпачыць. Ішлі ў розныя бакі, бы з розных хат, з розных сем'яў. Дачка не кажа ў банку, дзе працуе, што яна з вёскі, што кожную суботу едзе туды сеяць ці сенаваць. Каб не ганьбавалі ёю «новыя» беларусы. У нядзелю ўжо вёска не святкавала. Амаль да ўсіх дзеці прыязджалі з горада толькі на выхадныя. Як упусціць такую дапамогу? Не было калі чалавеку спыніцца, не труднаваць дзеля зямнога, а падумаць аб сваёй душы. Адмяняліся і гадавыя святы. Прыехалі былі дачка з зяцем на Тройцу — і зноў няўпраўка. «Якубіха сказала, што можна работу рабіць», — з палёгкай абвясціла Броня. Маўляў, старая суседка ў царкву ходзіць, яна бліжэй да Бога, лепей ведае. Сама ж бывае ў храме толькі калі як выпадае вяселле ці хаўтуры. Убачыла ў лесе неяк, па нешта ж хадзіла, цвіце жменька ветраніцы дуброўнай, курганком, і дрэўца побач, якраз як у галавах магілкі дзіцячай. Войкнула, спужаўшыся — гэта ж скора Радаўніца! А яна і запамятавала — трэба ж да бацькоў схадзіць на кладоўе. Адмяніла старая Якубіха Тройцу надоўга, а можа, і назаўсёды. Адлучыла і сваё пакаленне ад Бога, якраз жа і да яе прыехалі дзеці. Не заламаўся ў лесе бярозавы май, голыя бэлькі ў хаце, голая брамка. Свята ўжо не заходзілася ў вёску. Стаялі пасвянцоныя за даўнім часам старыя хаты, бы закінутыя пастуховы буданы на стойбішчы. І зямля не аддыхнула.

Два вяслы ў вясковага чалавека: работа і малітва — казаў нехта. Толькі, пэўна, цяпер дні карацейшыя, калі пасталелі. «Ці я пераббораю, ці яно мяне», — скажа Броня з адчаем Якубісе пры сустрэчы. «Пра што ты?» — перапытае тая. «Ну ці захварэю і памру ад такой работы, ці вазьму ў рукі й яно пойдзе ў мяне ладам...» — «Як зіма мінулася, дык і не памятаю. Каб не карова, не свіння, я памерла б, а так... ветрык мяне абвее на агародзе — і мне лягчэй. Так бы я зляжалася, як гнілая салома ў полі...» — спяшаецца ўлучыць у шчырую размову Якубіха.

Вядома, не толькі дзеля дзяцей у горадзе распачата вялікая гаспадарка, але і дзеля саміх сябе, адчуваючы спрадвечную магнасць да зямлі. Запозна ўволю яна ім дасталася. Якубіха ўжо і мужа пахавала, дзеці ў горадзе.

Было голасу па вёсцы, калі зяць купіў адну імпартную машыну, потым — другую. Ужо меў вялікую ўласную кватэру, будаваў маёнтак і дзецям. Броня быццам і не чула, што дачка разбагацела. Няўцямна замоўчвала пра іхнія даходы, як не гавораць услых аб нечым недазволеным. Адкуль яно, багацце? Нечыё ж было. Не трудом, а хітрыкай, лічыла, дасталося. А калі не ўдасца схітраваць другі раз?!. Зноў гаворку заводзяць, каб цялушку збывала, не пускала ў зіму другую карову. Адпіхвалі яе ад гаспадаркі, шкадавалі ейную старасць. Яна, як сляпы за поручні, хапалася за граблі, за вілы, за лапату. Не забыцца ўжо ёй на тое, як прыехала была аднойчы дачка — багацейка: «Мама, у мяне ні капейкі... падкінь штонебудзь...» Сала і раней ніколі не бралі, калі жылі, як прыйдзецца, а цяпер узяла. Трэба ехаць купляць у Ракаў, у яе самой адзін радок у кубле, да новага году не хопіць. Стары Мікалай, калі ўжо і машыну завялі, нёс наўздагон у руцэ, зняўшы з гнязда, і пакладзь. Надточваў канцы, бы з гэтага дачка толькі й жыла. Дзіва што малая ўнучка, ледзь навучыўшыся гаварыць, казала: «І я буду бізнесменам». А што гэта такое, запыталіся. «Гэта рулетка такая, круці й грошы будуць», — адказала. Маўляў, як удасца. «Во каб усе так жылі!..» — хітала галавой Броня, пабыўшы неяк у дачкі ў гасцях. Цяпер ужо не падзяляла іхняе багацце на ўсіх, як раней. «Каб яны ўсягды так жылі...» — бедавала, маўляў, нічога пэўнага, нічога і завіднага, часовае яно. Не, Броня лічыла, ейная гаспадарка больш надзейная за іхнюю.

І гэта пад такім спякотным небам гэтай сёлетняй вясной. Суха, зямля звініць, не ўмінаецца пад нагамі. Няма следу, бы па каменні ходзім. Усё пахавалася, як у непагадзь. Такая здыхата. Не развіхнуць кветку, пра́жылася насенне, няспелае

зерне. Ішлі аблокі, міналі сад, агарод, хату, недзе, пэўна, бокам ішоў дождж. Хмары, спяшаючыся, куляліся праз галаву: то блісне белым падбрушшам, то спіной з чорнай поўсцю. Ішла пад імі Броня з пустымі вёдрамі, палілá ўжо агарод, не спадзявалася на Бога. Марыў сон. Ледзь адзываўся далёкі гром. А выдавалася, што гэта яна шпульку нітак з пеляны ўпусціла, задрамаўшы, кацяня качае яе на падлозе, маскоча. Не памятаецца, калі гэта брала іголку ў рукі, вышывала ці ткала, хоць і ўмела. Мацерыны посцілкі, рушнікі каля абразоў. У яе і вазоны перасталі цвісці. Што такое? Думалася аб тым, што дзеці настойваюць, каб на дзень нараджэння мужа сабраць гасцей — юбіляр, семдзесят гадоў ужо. Дзецям лёгка прыехаць, ім коні не заварочваць. А гэта ж столькі руху! Не выходзіць баляваць, якраз у той дзень пісклюкі павінны вылупіцца, трэба пільнаваць. Няма ахвоты да таго балю. Сёння сядзела пад каровай, даіла і плакала, так змарылася. Яна ўжо і есці не варыць, некалі за работай. Мікалайка злуецца. Не бяда, неяк жа з зімы выйшаў, смяецца сама сабе. Румянец вунь на твары густы, цёмны, як закалец, валасы з-пад шапкі тырчком, выпетраныя ветрам, бы трава — сенажатка на самым пагорку. Чаму ж не сесці б, пасядзець, злажыўшы рукі, як у гасцях, — усяго ў іх поўна, хлеў трашчыць ад скаціны, грошы ёсць. Даўно не збіраліся за доўгім сталом. За ім яна і замуж ішла. Каб жа ёй, як штатнай, падмену хто даў. А то: мама, аддыхні, а назаўтра ў яе ў два разы болей работы будзе. У хаце, як у хляве, ледзьве дошкі віднеюцца. Іншы раз дабярэцца дачка, выпратае з большага і дзверы зачыніць — хай хоць крыху пабудзе чыста. Адна сцежка: з хаты — у хлявы, з хлявоў — у хату, некалі разувацца, модзіцца ў хатнія пантоплі. Хоць ты на вілы бяры, цягні з хаты ўтаптаныя дарожкі.

«Сто разоў на дзень нагінацца! — злуецца на дачку. — Лепш я раз у тыдзень нагнуся і памыю». — «Мама, нашто мы печ белім, ці хіба надоі ў нашых кароў павялічацца?»

Маўляў, ужо табе самой парадак гэты не патрэбен стаў. Вечка ў студні храснула, адвалілася. Адстаўлены ўбок, адарваныя ў веснічках дзверы. Ледачкамі на сонцы вылузгваюцца шкельцы з аконных рам... «Броня! Але ж дзверы ў жылой хаце могуць быць адарваны толькі часова!» — хочацца закрычаць на яе, не ўтрымаўшыся, як узбудзіць ад нейкага цяжкага сну. Завядзеш гаворку здалёк. Маўляў, Якубіха не гаспадыня, гэтак гразка ў хаце, у гумовых ботах не перайсці, пылам занесена, як завеяй праз выбітыя вокны. Жыве начлежніцай, ні свёнткаў, ні пёнткаў. «А ці ведаем, колькі яна за год свіней выгадуе!» — запярэчыць, ухваляючы суседку.

Успаміналася, гледзячы на іх, некалі чутая прытча... Мужыку амерыканец даў работу з той умовай, каб ён не стрыгся, не мыўся і рукавом нават не адважыўся абцерціся. Толькі адна работа. За ім будуць сачыць і ўдзень, і ўночы. Калі ён парушыць дагавор, усё ад яго адымуць. Праз кароткі час мужык разбагацеў... Даўно было парушана і маё кволае ўяўленне аб сялянскай працы. Яшчэ летась з восені неяк, навозілі яны сушыць з далёкага сенакосу сена. Ужо яно і высахла. Назаўтра — дождж. Толькі ледзь віднелася. Броня з Мікалайкам посцілкай носяць сена ў хлеў. Твар у яе напяты, цяжкі, пот цырубалкамі — праз сілу набірае на плечы. Не гавораць адзін да аднаго, моўчкі крадуць у сябе самы сон. Яшчэ і дзень не пачынаўся, а яна так напрацавалася. Золак мне тады падаўся невясёлым, цьмяным, бы святло ў галавах цяжка хворага чалавека. І сумнелася: ці на добрае ўжо гэткая праца, ці благачынная яна, калі на згуб душы?.. Зноў я падкацілася да яе з сваімі меркамі, з сваімі парадамі: «Бронечка, глядзі, якія ёсць твае сёстры стрыечныя! Чыста апранутыя кожан дзень, з твару гладкія, аж блішчаць! — Тыя наязджаюць на лета з горада да Броніна брата ў хату, дапамагчы ў гаспадарцы й тое-сёе спажыць, што выпадзе, з агарода, з саду, не маючы сваёй зямлі, дачы. — Ты ж іхняя равесніца, а хіба скажаш...»

Броня толькі назаўтра вярнулася да гэтай размовы:

— Я ўвесь час думала сабе, што ты сказала... Сёстры ж — парабчанкі тут, у брата, а я — гаспадыня! Карэлая хаджу? У мяне толькі зверху гэтак, бо работа такая, а падыспадам, глядзі, якое на мне!

Стаіць на вуліцы, адкасвае сукенку ля шыі, расшпілілася — бліснуў станік, падняла спадніцу — бліснулі рэйтузы. Ва ўсім белым, ва ўсім чыстым, што найбліжэй да целы, да душы. Чыста, бялютка гэтаксама, як у старым вясновым лесе, калі зацвітаюць першыя кветкі кісліцы, анемонаў — самае танюткае, самае далікатнае — маладое споднее адзенне.

Пэўна, на Пятра нейкі бязбожнік гарадзіўся, кол глыбока загнаў — аніяк дождж не распачынаецца. Зірнеш ноччу ў акно, як у кузню: цёмна, толькі сполахі гарачай бліскавіцы, у два молаты яе куюць. Раз-пораз асвецяцца збялелыя вокны суседскай хаты. А сэрца і не зварухнецца. Звыклася ўжо сухая навальніца. Гэтым днём таксама зусім не варажылася на дождж. Ластаўкі будаваліся пад страхой. Адна за адной, узмахвалі чорным рукавом, бы манашка з напёрсткам перад акном седзячы. Пярун ляскаў над самай галавой. Раптоўна падхапіўся віхор, мёў нізка, збіраў венікам след чалавечы, след скаціны, падымаў угору. Дарога ўжо тая ішла над хатамі, вілася шэрым шляхам да лесу. Ляскаў пярун па баках сытых коней, ірвалася вупраж, далёка ззаду ўжо кацілася адламанае ад вазка кола. Пэўна, ехаў нехта багаты, хацеў паспець да дажджу — нічога не шкадаваў.

— Едзьце, збірайцеся, неба дужа замурзалася! — заспяшалася Броня, зносячы напакаваныя сумкі ў багажнік, дачка з зяцем была зноў прыехаўшы.

— Мама, я павязу мыць тваё пасцельнае ў горад, паласкацца тут, у халоднай рацэ надта ж нязручна, такія доўгія прасціраДлы...

— Дык жа і рака доўгая, — адкажа, смеючыся.

Мае давер, як да сваёй зямлі, так і да сваёй вады.

«Няхай сабе едуць, — гаварыла сама да сябе потым. Едзьце, не замінайце, нечага час бавіць, ейную ахвоту да работы не зводзьце, не квяліце ейную больку. — Няхай яны сабе едуць...» — паўтарала. Кацілася, накочвалася даўняя крыўда, яна адганяла яе ўслых, супакойвалася. Як не пры сваёй памяці, засяваючы вялікія соткі, няўцямна спадзявалася на іхнюю дапамогу, бы й дачка і ўнукі яшчэ побач, у хаце. Яшчэ яна лашчыць іх па галаве, падымае руку вышэй і вышэй — ужо і не дастаць. Прыехаў быў неяк большы ўнук: «Вось тут, у садзе, будзе стаяць тэніс!» І паехаў. Памятае, як толькі першы раз яго былі прывёзшы ў вёску, узяла на рукі, вынесла з хаты. Нідзе не спынялася, як не затуляючы яму вочы, мінала панадворак, сад, няўцямна ішла да ракі, дзе пасвіўся конь. Каб першае, што ўбачыў, зацьменнем засланіла гарадскі свет. Яму было раней ягад з куста агрэсту, як вады напіцца, — толькі з аўтобуса, адразу ў агарод. Цяпер банан аблупіць — і ўвесь пачастунак. Перарвана ўжо даўно сялянскае пупаўё.

Рыкала калгасная карова за ракой. Два дні й дзве ночы не сыходзіць з месца, дзе была прывёўшы цяля. Яго адразу забралі, а яна аніяк не зразумее, дзе яно магло ад яе дзецца, жывое, цёплае, толькі, во, паспела пысу яму аблізаць. Набракала вымя, цякло па нагах малодзіва. Каровы збіраліся вакол яе, рылі капытамі: чуючы пах крыві, пах пасцелі з улоння, трубілі, склаўшы галовы. Дзікі ваяўнічы рык ахопліваў вёску. Труднуючы грудзьмі, Броня бегла да яе і раз, і другі, каб хаця на зямлю крыху здаіць, малако перагарыць. Пайшлі б дажджы, змылі б тое месца... «Няхай сабе едуць...» І на гэты раз не ўзяла ад дачкі грошы, скаціне — на муку, курам — на крупы. Ніколі не брала, атумысла. А калі яна сама занядужыць, і ёй прыйдзецца за дзецьмі старавацца? Запасіла, складаючы ім у сумкі масла, сыры, гародніну, на сваю будучую доўгую зіму. Гэтак сама як збірае ўсё лета, гатуе надалей варэнне, ніколі не ўзяўшы ў рот свежай ягадзіны. Няхай будзе чысты ўклад, нечапаны, як у банку. Няма ў яе надзеі на гэты свет: невядома, ці надоўга гэты дазвол трымаць скаціны колькі

хочаш, урабляць сваю зямлю. Трэба спяшацца, трэба запасіцца: «Будзем рабіць, пакуль ногі не скінем».

Дождж пайшоў буйны, нізкі, бы з куста ў лесе стрэсены на плечы. Але ніколі не бывае доўгага дажджу, калі гром. Гусі Броніны пасталі на вуліцы, высока падняўшы галовы насустрач струменям, толькі што лапкамі не вяслуюць супраць цячэння. Гэтай ноччу Броня не паспела ўжо і ў хлеў іх зачыніць. А хваліцца, што лёгка іх глядзець, маўляў, пусціў на траву і ўсё. Гусі навобмацак пераходзілі з месца на месца, качаліся да раніцы па вуліцы белымі клубкамі — дзікай чарадой, што, высіліўшыся, асела на зямлю пераначаваць. Неяк рана заспявалі салаўі, далучыўшыся да дзённых птушак. Выходзіш на вуліцу, як на тое свята. Малыя жабы з-пад ног — празрыстымі зеленкаватымі пацеркамі з тваёй шыі.

І Броня якраз ідзе насустрач, карова захварэла, пэўна, прыпасвала яе каля лесу. Вяроўку ўскінула ёй на спіну, маўляў, ідзі сама дамоў, дай хоць рукам аддуху. Круп шырокі, на ім вяроўка — як на лаве. Броню пазнаеш здалёк, постаць прыкметная ад усіх баб. Людзі толькі ў поле — яна ўжо там, усе — дамоў, а ёй — хоць бы што. Галаву заўсёды трымае высока, пагляд з прыкідам на дзень, на год, на ўвесь наш цьмяны век.

Я не ейная сяброўка Тамара, што ўжо і ў хату не заходзіцца, баючыся трапіць у гарачую, як вар, пільніцу. Варта ўбачыць яе на вуліцы ці на другім полі, абы трапілася на вочы, — іду, бягу да яе, замінаю, пад ногі, пад рукі, перадкуюся спатыкачом. Не ўсё разумеючы ў ейным жыцці, нешта асуджаючы, дзівячыся і брыдзячыся іншы раз, стараюся лучыць у ейны спорны крок, прайсці побач, стаўшы на ейную нясканчоную спрадвечную сцежку. Ляту на голас. Каб скрозь тусоўкі, войны, бязбожжа, безуладдзе пачуць адзіны пэўны покліч, як да непаслухмяных дзяцей, што чула яшчэ ў дзяцінстве: «Да работы!» Ратуюся, заблытаўшыся ў чалавечым тлуме, спаталяю асабістую бяду, як у мацярынскім зацішку...

Толькі шум дажджу з пераходамі, бы на старым млыне часу.



# САД НЯВІННАСЦІ

Весткі з гор, як вятры, выхаладалі дом. Тэлевізар глядзіш толькі тады, калі перадаюць «Навіны»... Асцюкамі тырчаць сцены разбураных хат, яшчэ нечая печ курыцца, умомант здзічэў сад. І раптам: ідуць дадому белыя качкі. Павольна, важка, пэўна, добра пажыраваўшы, тым жа, як заўсёды, парадкам, пільнуючыся, адна за адной, на зямлі. Ні двара, ні хлева, ні табе дзе чалавек, няма дзе спыніцца, як у небе. І гэта ўжо мне велічныя птушкі, боскім знакам, з моцнай памяццю, з непарушным пачуццём спакою, гнязда, вечара, калі патрэбна вярнуцца з ракі, з лугоў пад страху — не збадзяцца...

Кадр з Харвацкай вёскі не выходзіў з галавы. Ці можна Богу прызнацца, менавіта, *што* крыху ратавала твой розум ад дзічэння? Гаворка вояў была чужая, незнаёмая, гэта быццам аддаляла крывавыя падзеі на неверагодную адлегласць — у небыццё. Вось толькі тыя белыя Птушкі... А ўжо стаіць рускі танк за плотам чачэнскай станіцы. Такі звычайны, знаёмы паркан вакол агарода, як і ў тваіх вёсках, за́гарадка ад чужой курыцы, ад скаціны, ад свавольных дзяцей.

Такі самы паркан, які кожны з нас маляваў у дзяцінстве вакол хаты: некалькі калкоў, перацянутых паскам. О, якая гарачая свара бушавала паміж суседзямі, калі пераляціць курыца праз плот, здратуе лехі! І мова вояў ужо знаёмая, руская, бы з таго канца тваёй вёскі... Над усімі войнамі, руінамі, вогнішчамі хат успамінаецца цяпер, вымаўляецца як не ўголас, некалі выпадкова пачутае ў вёсцы ад старога суседа-гаспадара: «Я дзіўлюся на цябе, як гэта ты дазваляеш сваім дзецям самім яблыкі ў садзе ірваць?!. Я дык сцярпець не магу, калі хто і траву патопча, не тое што!..» Такая звычайная, такая патрэбная чалавеку мера дазволу, каб пазначыць непа-

рушнасць сваіх звычаяў, сваіх правоў, сваіх трудоў у садзе. Што да мяне самой, то я не навучылася маляваць і стаўшы дарослай: і на палях канспектаў, дзённікаў, ці так, бавячы час, марудзячы, абы аловак у руцэ, адразу — дом, паркан, сад. І нязменна, амаль набожна лічу, што нават калі чалавек проста пераязджае з месца на месца, ён павінен забраць з сабой не тое, што скаціну, сабаку, катка, але і сад. Усё, што дзічэе без гаспадара.

Каб не парушыўся чалавечы код.

Зноў «Навіны». Зноў расейскія танкі падмінаюць пад сябе ўсё жывое. Тым часам каля ног блытаецца, гуляе сын, чуе стрэлы, выхоплівае цацачны пісталет і спрабуе цэліць у люстру. Ужо зброя і ў тваім доме. А тым часам немалады чачэнец, выправіўшы сям'ю ў надзейнае месца, застаецца пільнаваць сваё жытло, на разумеючы, як тая птушка, небяспекі: «Я за скацінай гляджу... А загарыцца дом, ён чакаць мяне не будзе, пакуль вярнуся, трэба будзе гасіць...» Яго забіла асколкам снарада, бядуе рэпарцёр, наведаўшы знаёмую сядзібу. Скрозь выбухі гармат выразна чуўся спеў пеўня. Пэўна, дух гаспадара ўсё яшчэ абараняў дом, хлявы, сад... Чачэнка з плачам кідаецца, тлумачыць, што не можа бегчы ад сваёй хаты, ратавацца — на руках у яе дачка-калека: «Пакуль я дабягу з ёю, мяне дзесяць разоў заб'юць!..»

Гарыць Грозны. У шпіталях не хапае лекаў, ніхто не ведае дакладна, колькі салдат загінула, хто трапіў у палон. Адныя мацеркі, галосячы, кладуцца на рэйкі ў Сібіры, каб не пусціць цягнік у Чачню з салдатамі асенняга прызыву. Мацеркі едуць забіраць з палону, выкрадаюць сыноў з войска. Кожная — сам-насам з горам, бы маці-адзіночка. Не чувалася, каб хто-каторы з мужчын спыніў завод, шахту, а хоць бы й сячкарню ў паветцы, пратэстуючы супраць распачатай вайны, як гэта неаднойчы рабілася проста дзеля павелічэння заробкаў. Хоць на момант не спыніўся будзённы рух на зямлі, каб прымусіць кожнага скалануцца ад навіны: пайшло на гарады й вёскі войска зусім маладых мужчын, акурат банда,

сваім одумам, сярод белага дня. Няўжо ніводзін царкоўны служка на ўсяночную перад Калядамі, стоячы найбліжэй за нас ля калыскі Хрыста, не сарваў з сябе ў роспачы багатую святочную рызу, не запатрабаваў хаваць кожнага салдата гэтай вайны не па-хрысціянскаму звычаю, а — за агароджай могілак, як самагубца ці цяжкага злачынца — без адпявання?!. Хіба не яго-каторага справа рабіць веру вобразам жыцця? Ці, можа, для нас гэтае свята проста як прыход у наш дом чужога дзіцяці, якога абавязкова трэба пачаставаць, аказаць увагу, ласку і праводзіць з хаты? Віншаванні, падарункі, радасць на Каляды — абрад і больш нічога?

«Радуйся зямля — Сын Божы нарадзіўся...» У скверы, якраз напроці вокан, дзеці кідаюць у вогнішча бутэлькі з вадкасцю, чуюцца выбухі, кідаюць моўчкі, метадычна, з нейкай памслівай асалодай вярэдзячы ціхае наваколле. І няма ў дарослых сёння бацькоўскага права забараніць ім гуляць у вайну... Мароз маскоча па голай зямлі. Каб хоць жменю снегу на скроні. Няможна даць рады сваёй галаве. Адзіным паратункам — успомніць, бы паклікаць да сябе на бяседу, на чэсць, Зосю з вёскі Барок. Ветрам, як слабае полымя свечак, павярнула тады ў наш бок пагляды старых жанчын, ейных таварышак, — хліпкае святло ці то бабскай спагады, ці то знявагі.

— Хай бы ты да мяне зайшлася, я хоць бы сваё гора табе расказала, га? — пераймала яна мяне на вуліцы іншы раз.

Спыніцца на момант, усміхаецца, глядзіць табе ў твар, нахіліўшы галаву, як да малога дзіцяці, якога ёй хацелася б нечым прывеціць, як толькі па кішэнях сябе не лапае, але нічога не мае, вось толькі — гора.

— Трэба пагаварыць, але, во, часу няма, — крычыць ужо здалёк, адыходзячыся. — Можа, прыйдзеш, калі дождж будзе? Га?..

«Якое ў Зосі гора? Што здарылася, ці чулі?» — пытаюся ў баб.

«Аніякай навіны! На вайну з немцамі ўсё яшчэ хварэе!..» — адказваюць абыякава. А Зося ўжо далёка, ейныя сцежкі ні

з кім не перакрыжоўваюцца, зжывае свой век на восьмым дзесятку адна, у дзявоцтве. Кажуць, сваталіся да яе, а як жа, але ні за кога не пайшла. Чаму?!. І цёткай ніхто ў вёсцы яе не называе.

Блісне ейная постаць то ў полі, то на ферму ляціць калавурыць, то каля ракі з касой. Першы пракос, бы валасы ў сталай дзеўкі напрабор, прамы, разважлівы. Але хутка знямoжыцца і дзяўбе траву, абы рукамі не ірваць, спяшаецца, добра ведаючы: калі не ўхопіш сёння, то заўтра, калі не дождж, мужык чужы скосіць. Не бяда, што да касы не хапае клінка, а ў граблях — некалькі зубоў. Спыніцца, узбіўшыся на чалавека, загаворыць амаль шэптам, усё цішэй і цішэй, ужо, выдаецца, адныя вусны кратаюцца. Слоў не распазнаеш, а стаіш і слухаеш, бы над вадой бягучай, сцюдзёнай, па дробных каменнях. І ты ўжо бачыш у ёй свой адбітак. «Табе, — кажа, — каб свежыя кветкі, краскі ў хаце кожны дзень, а мне, край меры, каб — буракі былі чыстыя! Край меры, каб — салома з поля звезена!.. Ты — дачніца...» А шчаслівая хвіліна ёй тая, калі натрапіцца сын суседскі, паможа з канём — яму меней гарэлкі трэба, чым ягонаму бацьку.

Слабка азіраешся па баках і раптам чуеш шчэбет, хоры птушыныя, бы яны таксама з ейных вуснаў. Глядзіць услед, сама ва ўсім цёмным, хустка на галаве чыстая паверх учарашняй — адзін рог з-пад аднаго, як на ахвярным крыжы пры дарозе. Вецер сіні павее надвячоркам, нахіляцца каласы травы ў адзін бок, блісне маладзік, нізка, як з-пад ног, з ейных рук упушчаны. Тады яна ляціць дахаты, хвалюецца, ці не забылася суседка карову пераняць, хлеў зачыніць. Адважыцца і ўкосіць посцілку на калгасным белым полі. Цвіце дзяцельніца, нізенькая, кучаравая, маладзенькая. Поле прыбрана, як на хрэсьбінах, дзе-нідзе купінамі пракінуліся незабудкі — галубовымі матузкамі паверх карункавай коўдры. Укосіць і не надта ўкрадаецца, бо з цёмным выйшла з хаты, з цёмным і вярнулася, захінуўшыся начным покрывам ад вачэй. Неяк была пажалілася: «Гарох з бабамі сушылі на

складзе, дамоў, бачыла, кожная сабе ў вядро ўзяла, а мне сказалі: «Высып, бо пападзешся!» Гэтак я пакрыўдзілася! На той дзень каліва пры людзях не вазьму, баюся, што ўдадуць начальству, аднымачкай, калі што якое надарыцца — укасіць ці бульбы сабраць пераворанай». І ў грыбы ходзіць адна, адшчапенцам.

Вёска невялікая, старая, кароў нямнога, часта даводзіцца радоўку адбываць. Ці непагадзь, ці так якая золь, ідзе на пасту ў тым самым, быццам і дадому ўсе дні не заходзілася, быццам і не тутэйшая, здалёку людзіна. Паша за лесам. Разыходзяцца выбітыя скацінай дзень у дзень сцежкі, вяроўкамі віюцца, за рогі закінулася каторай, самай панаўзлівай, каб у жыта не ўбілася, шкоды не нарабіла. Карэнне старых ялін павыбівалася з зямлі, лягло пругка, моцнымі цэўкамі. Выдаецца, сашчапілі бабы рукі, парамі пабраўшыся ўздоўж сцежкі, ідзе па іх Зося дзяўчынкай у вянку, нечапанай мужчынам, ідзе да поля, каб яно багата радзіла. Правіцца даўнейшая ваража на багатае каласаванне збажыны...

І што гэта іншы раз надарыцца? Зморыць неспадзяваная аддуха, ногі самлеюць, ці сонца распесціцца ў ейнай пеляне, галава да галавы — і засне на хвіліну — не ўпільнуецца, пагубляе кароў. Ці раззыгуюцца ўпаўдні— не ўтрымаеш адной пугай. Ходзіць тады да паўначы, ліхтар запаліўшы. Выйдзе з лесу да вёскі, хістаючыся, куляецца, узбіўшыся на дарогу з цемры, як па галбанах. Ногі калкамі, жыватом уперад, бы яе нехта ззаду з лесу папіхае. Выдавалася іншы раз, як падумаеш, што і не вернецца Зося, сыдзе ад людзей, нікому з мужчын не даўшы даверу, не пусціўшы дзіця ў племя. Сыдзе з гэтай вёскі, жорсткай, непрыхілкай да наезджых. Зося пасялілася тут пасля вайны — ды яшчэ з ганьбай, маўляў, замужам не была, дзявуе. Ведама, лясныя людзі. Неяк распавядала, ездзіў сюды некалі ейны дзядзька карову сабе купляць. А каб капыты не пазбівала, не спяклася на сонцы, вёў яе дарогамі глухімі, па лясных вёсках. Ішоў гэтак, ішоў, карова змаглася, сам змарыўся, стаў прасіцца,— ніхто не пускае

ўнаначкі. «Ідзі адсюль, — кажуць у адзін голас, — мы цябе не ведаем і знаць не хочам, нам бяды не трэба». І даёнкі не далі, здаіў малако ў пыл, карова палягчэла... Сабралася ехаць сюды, хату напытаўшы, дзядзька дуба стаў: «Не едзь у лясы, там людзі нядобрыя!..» Ноч, туман сунецца з гары, бы табун блудных белых авечак з апушчанымі галовамі ў час перагону. Каля ракі, каля агародаў збунтуюцца, палягуць да раніцы. Ідзе Зося з туманом, басанож, невідушчым крокам, што ноч, што дзень, у руках ахапак калгаснага турнэпсу.

І сабакі не чуюць, калі што ўдасца ўкрасці.

Вось і дажджы пайшлі, самая тая пара наведацца да Зосі. Яна ўхапіла з плоту сноп буракоў з насеннем, кінула на голую падлогу сярод хаты, як на зямлю, абы суха. На стале лустачкі сала, хлеб, самагонка ў алюмініевым кубку — сусед прывозіў дровы, частаваўся. Дзверцы ў шафе рассохліся, адлушчыліся стручком, шпалеры пакруціліся габлюшкамі, усё тут абвалілася, абламалася, як позняй восенню пад небам у агародзе, у полі, на лугах. Фіранка на акне на панадворак крыху адсунута, бо нечага брэша сабака, трэба паглядаць — мужыкі, як восы, чуюць, абы корак у бутэльцы адторкнуў.

— Зося, ці ты дома? А ці прыйшла твая карова? — пытаецца суседка праз дзверы.

— Я карову здала, а ты не ведала, га? — крычыць услед. — Не, не плачу па ёй. Яна ўжо мне і малако не аддавада, старая. З хлебам свянцоным развіталася з ёй. І купляла з хлебам. Памятаецца, заве-е-я, узялі хлеба, гарэлкі, сала, як у сваты, ехалі па карову.

Хата ў Зосі пустая, ужо і хлеў апусцеў, нават куры зводзяцца. Учора, сама бачыла, бабы пыталіся, ці не ейную курыцу, белую, п’яны трактарыст затаптаў. «Мая ты мілая...» — прызнала Зося. Галаву жалобна — набок, загаварыла, як да нябожчыцы. І пайшла ў поле да работы, на цэлы дзень. І не закапала — некалі.

— Іншы раз прыйду ўвечары дамоў, дык выдасца — пахне смажаным, варанай капустай, быццам хто ў хаце, поўна

хата, восем душ, як даўней... Во, дзівіся, пахі памятаю, як котка ўсё роўна... Я за бацькам бегала ззаду, гэтак любіла, ён аж хаваўся ад мяне... Яго немцы забілі на першы дзень, як у вёску ўвайшлі, бо старшынёй быў... І братоў, пад самы корань. Людцаў з суседняга сяла патапілі ў студні. І нашых ужо заганяюць. Паўначой, у свіран, бабы дык без спадніцы катораяя. Бягу з усімі, ногі не ідуць, як не паўзу, поўны рот пяску. Віхнула ўбок, у канаву, — суседка, бачу, хаваецца з дзецьмі. «А ці ўмееш хрысціцца?» — пытаецца, маўляў, бацька ж камуніст, Божанька не захоча ратаваць... Татка, бывалася, паставіць нас і кажа: «Хрыстос — гэта чалавек такі быў, хадзіў па свеце, людзей лячыў, вучыў добрае рабіць. А Бог, ён ёсць, але гэта — дух. Яго ніхто блізка не бачыў. Можа, і сонца Бог...» Перахрысцілася я, тады суседка піхнула мяне да сваіх дзяцей, я лягла ў ямку і... адразу заснула. Прачнулася — вёска згарэла, людзі, хто не ўратаваўся, папякліся. Два кіламетры кроў ішла ад таго свірна. Мамка, бачу, ідзе па вуліцы. Я да яе. Селі во так, толькі тое ў нас, што на целе, у цёплы попел, каб сагрэцца. Яна мне ногі сваім падалом накрывае: «Дачушка, твае ногі такія халодныя». Гэта ж твае, кажу. Яна ўжо не чула сябе, здранцвеўшы была, як дрэва. І есці ніколі не папрасіла, колькі жыла...

Вайну тую Зося яшчэ не закапала, як, не раўняючы, птушку белую, забітую трактарам. Стаіць ейная вайна труной пасярод хаты. Абы свежы чалавек на парог, будзе хадзіць вакол яе, кожны раз крыху перайначваючы перажытае, бы папраўляючы адзежу на нябожчыку. Абы дакрануцца сваёй рукой, пакуль не зачынілася вечка, не забілі апошні цвік. Гаворыць цішэй і цішэй, ужо толькі дождж за вокнамі шапоча. Голас без жалю. І цябе падбадзёрвае позіркам, маўляў, яна лёгка плача, упэўненая, як нявеста Хрыстова, што спакой і радасць не на гэтым свеце, дзе войны.

Дзе і цяпер страляюць мужчыны адзін у аднаго. І ва ўласным доме...

Дождж мацнее, ужо топчыцца пад вокнамі, на ганку. Няма ў агародзе ні дрэўца, ні смуродзінавага куста, каб адысціся яму ад хаты, пагуляць, пазабаўляцца. Гаспадыня, як бежанка, абы перабыць жыццё, як непагадзь. Праўда, сядзе іншы раз во гэткім дажджом, і вышывае наўлечку ці рушнік. Кветкі з памяці, як яна сама кажа, з таго даўнейшага жыцця за вузкай брамай, дзе яна набыла вопыт смерці.

— У мяне валасы былі, дзівіся, во па гэтуль! — правяла рукой па каленьках. — Пайду на танцы, ніхто з дзевак ці баб болей за мяне не натанцаваўся. Адна на мне кофтачка, босая, а хлопцы бяруць і бяруць! Адзін прыйшоў у сваты на багатую Каляду. Мамка на яго ганенне несла: казалі, што гэта ён удаў татку немцам. І другі, ды на белай кабыле, а красівы, каб ты бачыла! А ці ён ведаў, што той прыйдзе... Хата яшчэ без вокан, кругляком, голад, адзін кусанак хлеба і той напалам. Які там замуж... Сядзяць, памятаю, во гэтак, абодва маладыя, смяюцца. А мяне нейкі страх бярэ, немцы наўмя... Ці казала я табе: як мы закопвалі сваіх абгарэлых людцаў, дык немцы плакаць не дазвалялі. Ці паверыш, стаялі ўбаку і смяяліся... Ад той пары стала баяцца маладых мужчын, дзіцячым страхам баюся... А тут яшчэ вярталіся з Германіі нашыя дзяўчаты. Адна з іх як пазнала, што панесла ад немца. «Ну, фрыца я не павязу дамоў», — сказала і... павесілася. Во які шлюб бралі мае таварышкі... У мяне ж быў і свой хлопец, якраз войска адбываў, ягонага бацьку немцы вылегчалі. Ну, вярнуўся мой Васіль. Я ж як з розуму не ішла, гэтак яго любіла. Прыйшоў да нас. Ён сеў на ложак, мне не панаравілася: што гэта ён! Толькі, во, заслала, ды перад людзьмі!

А штаны шыро-о-кія! Узяў танцаваць, арэхі ў руцэ, я стукнула пад руку — арэхі рассыпаліся. Тады бабы на мяне: «Зоська, што ты штукуешся! Ён жа толькі з войска, чаго ты, адумайся!..» Сышла мая любоў... Мне, пэўна, было падчаравана... Ідзём з Васілём да маёй суседкі, Васіль трохі карагодзіўся з ёй да войска, і рука ягоная яшчэ на маім плячы, і разам у

дзверы гэтак, ага. А матка той дзеўкі якраз — торк! нож, з касы роблены, у бервяно над дзвярыма, над намі. Я тады нічога не падумала. А пасля, як у нас з Васільком усё папсавалася і прычыны на тое не было, то я стала сабе раздумляцца. І ўспомніла пра нож... Ніколі нож не падавай з рук у рукі, пакладзі, каб чалавек сам яго ўзяў, бо пасварыцеся... Сышла любоў... Той Васіль у Маскве цяпер ёсць...

— Ты яшчэ, Зося, такая спрытная, дужая...

— Бо цяжкую работу раблю!

— Колькі ж табе гадоў?

Доўга мнецца, муляе вуснамі, бы прыпамінаючы, а потым:

— Калі праўду табе сказаць, дык і не ведаю!

Адкажа з такой палёгкай, што і на гэты раз не вымкнулася, не ўдалося чужому чалавеку дазнацца пра ейны ўзрост.

Ужо яна быццам і перастарак, і сонца ўжо ў акне садзіцца, а хлопцы ідуць ды ідуць да яе ў сваты. Алёша дамаўляецца правесці з вечарыны, яна ціхенька збегла дамоў адна. І танцы без яе разышліся. «Цётачка, мамулька, кукулька, буду ў вас жыць!» — прыляцеў Алёша ззаду, просіцца ў прымы. «А яна ж — старэйшая!..» — загаласіла маці. «А ніхто не ведае, калі памрэ!» — «Мне ж ганьба!» — злуецца Зося. «А чаго Мішка са старэйшай за сябе Тацянкай жыве? І добра жывуць, і дзеці ё! Чаго ты? Які цябе пуд бярэ?!» Напіўся і пайшоў іграць вечарыны ў суседнюю вёску.

— Тамака мая таварышка жыла... Дзеўка як стаяла і... пахінулася да Алёшы. І замуж пайшла за яго...

І тут не выпаў лёс, надта малады быў Алёшка, надта вясёлы, смяяўся замнога.

— Во, бачыш, і састалела... У складзе неяк гарох перабіралі... Стаў адзін удавец сватацца. Ды не пры тым размовы ён падкаціўся, трэба было па-людску, у хату прыйсці... Потым неяк пераняла матка жанілы з другой вёскі: «Можа, — кажа, — пойдзеш за майго Шуру?» Я ведала яго,

раз неяк барозны мне разганяў, гарбаценькі такі... Цяпер у Мінску, жонка ягоная харошая, нізенькага росту...

«Мне, пэўна, падчаравана...» — скажа часам яна, запэўніваючы каторы раз. Водзіць па далоні пальцам, паказвае, як у паперу, не здагадваючыся, што гэта ейная прырода пратэстуе супраць мужчынскай жорсткасці, ваяўнічасці, бунтуе ў адзіночку, не даруючы, праз усё жыццё ні чужым, ні сваім... Хачу зрабіць ёй фотаздымак, ды каб сядзела яна на сваім, скрозь у вышыванках ложку. Прашу паправіць крыху падушкі, пакласці адна на адну, пад столь, як звыкла бачыць у вясковых хатах.

— Не, я па-дзявоцку іх пастаўлю! — пярэчыць.

Бярэ кожную, узбівае, адцягвае за вушкі, рукамі вакол абціскае, бы ўсаджваючы малых дзяцей, якія яшчэ і сядзець адны не ўмеюць. Ставіць уздоўж сцяны. Кожная паасобку — на доўгую ночку, на невясёлыя перадумкі, на кароткі сон. Куляешся ўслед, стоцьма ляціш, як за руку хто пацягнуў, ва ўладанні старых вякоў, дзе кожная рэч гаварыла да цябе, варажыла, папярэджвала. Дзе зняць дзявочы вянок з галавы жанчыны мог толькі муж. Няўжо праўда, кажуць у вёсцы, што Зося цяпер ужо ніколі не спіць на гэтым прыгожым ложку, сцелецца проста на падлозе, пэўна, уступіўшы яго сваім дзявочым мроям.

— Чакай, я пераапрануся! — спяшаецца, адчыняе шафу. — Глядзі, колькі ўбораў маю! Во гэтую сукенжу — на першы дзень Вялікадня! Гэтую — на другі, гэтую — на трэці... Якая харашэйшая?

Пустая хата. Радня толькі на фотаздымках на сцяне, людзі рэдка заходзяцца, і Бога вачам не відаць. Анікога, котка ейная рабая, як толькі хто чужы дзверы адчыніць, ляціць хавацца ў падпечак. А яна села, усыпаўшы ў падол спелыя яблыкі, строіць вясёлыя вочы, жартуе, смяецца — святкуе сваю восень. Пасцігае сусвет у невядомым нам вымярэнні.

Выйшлі мы на ганак. Дождж цёплы напроці восені, дробны, можа, праз тое рэшата, якім дзеўкі ў старажытным Рыме насілі ваду, каб даказаць пляткаркам сваю нявіннасць.

— Во, падзівіся, я садок пасадзіла! — крычыць яна мне праз плот, паказваючы на тры кволыя дубцы ў агародзе, якіх ад зямлі не адразу і заўважыш.

Не дзецям сваім, вядома, гэты сад, і ўжо, пэўна, не сабе. Можа, вясёлай, белай птушцы на гняздо, калі адляціць ейная душа.

«Я дык сцярпець не магу, калі хто і траву ў садзе патопча, не тое што!..» — увесь час чую, грыміць з вышынь ейнага непарушнага сялянскага свету, як з тых чачэнскіх гор...



# КОНІ

Дождж ішоў нялюдска, высокімі светлымі слупамі, і быццам не з неба, а нейкай сваёй хадой, па зямлі, з поля, як з мора, да лесу і там знікаў, бы ў цёмных адчыненых вокнах багны. Каторы дзень запар. Вечарам іншы раз спыніцца на момант, сцішыцца. Тады ад зямлі падымаецца гарачая пара, як ад каня, бы яна на сабе гэты дождж цягнула, упрогшыся, круга хадзіла, наважаная на срэбныя ланцугі. Во стала, нарэшце — і дождж спыніўся. Вільготна, пахне росным дзіцячым потам. Вось, выдавалася, і наўлечкі ўжо выкруцілі насуха — цяпер нарэшце распагодзіцца. Але перад ноччу, яшчэ на шэрай гадзіне плыткае неба зноў дыхала цяжкімі туманамі. Пачуццё блізкасці вялікай вады, жывой, рухомай, як бяда, варочала чалавека з поля, з лесу дамоў.

Ганна, спяшаючыся, падпіхала пад галаву жарэбцы Ляльцы вехаць сухой саломы, ставіла долах побач кош дзяцельніцы нанач, пераважвала кабылу Глашу, ішла дахаты.

Валіліся на страху яблыкі старой дзічкі, зрэдку так, стукне і адкоціцца на зямлю, быццам нехта ўсю ноч бяссонна, маркотна іграў у більярд.

Не спалася. Падсвядома разумела: трэба браць нейкі рух, клікаць ветурача, бо ўжо скора тыдзень, як жарабя закульгала. Казала старому Юзючку, яму даручылі былі ў калгасе даглядаць жарэбную кабылу падвозчыка Бабра. Той толькі хуценька так, як самае пэўнае і добра ў хаце з жонкай Настасяй абмеркаванае: «Не-не, я добра ведаю, не трэба!» Маўляў, пройдзе само, павінна прайсці. Сам маленькі, вушкі тырчаць адтатурыўшыся, бы чалавек ніводнай шапкі не знасіў, ні салдацкай, ні мужыцкай, не абцісnуў дзіцячую галаву, вочы блізка каля носа, бы ў акулярах, чыстыя, блакітныя, век на пагоду

варожаць. Юзючок пільвваваў, каб Бабёр і на гэты раз не забіў малое, як толькі народзіцца, бо яму, падвозчыку,— адкрыта ўсім казаў,— патрэбен на ферме конь рабочы, а цяля замінае, блытаецца пад нагамі, трэба пільнавацца — яму няўпраўка. Дый ці ўпільнуешся, скарэй скалечыш. Малады Бабёр ні з чым не хаваўся, і кабылу ягоную звалі ў вёсцы Глаша ад той пары, як ён яшчэ з вечара паставіў быў яе каля варот наезджай дачніцы Глашы, і ад'ехаўся ажно раніцай. Толькі калі зрэдку цверазеў. Людзі дапаміналіся, што ён не такі ўжо вараўны чалавек, і нават заікаецца як цвярозы, бы нязвыклы да гаворкі вясковы маладзёнак. Але ж, маўляў, гарэлка зводзіць. «Прамаргалі»,— дасадаваў Бабёр, пачуўшы, што кабыла даўно ажарабілася. «Ну што, прывяла сучку?» — быў наведаўшыся да яе.

Само павінна прайсці... Конь, кажа Юзючок, не баіцца дажджу, сцюжы. А хворае, малое? Можа, і праўда. Тут, у вёсцы, век са скацінай, спраканалыя людзі, як не верыць. Хіба яна, гараджанка, калі каня гадавала? Яна і падысці да іх першыя дні не адважвалася. Кабыла стаяла, як на палатне Рубенса. Калені, клубы — усё вываранана магутнай сілай родаў, вываранана схваткамі, пакутамі, боль штуршкамі ішоў, хвалямі. Расхіненае ўбакі пасляродавае цела ільснілася, бы ў дарагім уборы, з яго яшчэ не сышла тая раптоўная палёгка, калі нарадзілася жарабя, цела з той высокай амаль боскай прыгажосцю саміцы. Непадалёк ад іх некалькі раскідзістых старых дубоў. Быццам і задалёка адзін ад аднаго, але выдавалі гаем. І з якога боку на іх не зірнуў, усё роўна яны стаялі не паасобку, быццам кожны з іх увесь час, увесь век памятаў пра астатнія, паварочваўся тварам, пільнаваўся, бы ў нейкай сур'ёзнай мужчынскай гульні. А можа, гэтая блізкасць ад рэдкай дасканаласці волатаў напроці іншых дрэў. Ніводнай лішняй галіны ці лістка, і нават заламаны навальніцай сук не калечыў. Сухі, павалены дуб абапіраўся аб зямлю моцнымі сукамі, стаяў сярод жывых высокім урачыстым саркафагам. Падысці асцярожна, пачаставаць кабылу ласункам і зноў сесці

пад дубамі, глядзець збоку, сцяўшы вусны ад захаплення. Доўга не знаходзіла да яе слоў пяшчоты, ласкі, бы перад вачыма велічная высечаная статуя. Жарэбка Лялька, нагойсаўшыся, іншы раз клалася каля самых матчыных ног, каля капытоў, цяжкіх, каменных, перавязаных путам, нязграбных. Якраз жа галавой, і вочы заплюшчвала, спала, без усялякай асцярогі, бы спушчанае з рук, нізка, у прыпол. Няўжо не зачэпіць?!. Кабыла аднойчы сама першай пазвала жанчыну да сябе, ціхім, як да жарэбкі, іржаннем, нават і не іржаннем, а быццам проста па клавішах прабеглі лёгкай рукой. Убачыла, высока падняла галаву і пайшла насустрач, да рук, крок далікатны, на абцасах. Захапленне, страх згаслі, асвяціліся сінія — па вядру, разумныя вочы жывой істоты, якой звычайна патрэбна чыстая вада, бульба, бурак, абмешаны мукой, нялішне і кош травы, яблык, каб не прапала малако.

А дождж амаль не пераціхаў. Спрабавала напытаць, каб хто ў вёсцы пусціў жарэбку, пакуль хварэе, у свой хлеў. У адказ една тое: коні, маўляў, сцюжы не баяцца, дождж ім не шкодзіць, не бядуй, вучыцелька!

У тую ноч надышла бура. Хату накрывала цяжкой хваляй, не паспееш адсапсціся, як за ёй ішла другая, трэцяя. Захлынула вокны, шум, плёскат, гойданне дрэў укалыхвалі да ванітаў. Страх заснуць, бы ты яшчэ можаш сваім розумам даць якую раду, упільнавацца, каб цябе не сарвала з месца, не аднесла далёка ад людзей. Назаўтра, ступіўшы на зямлю з таго начнога каўчэга, ледзь пазнаеш наваколле. Мокрая, шэрая, як мыша, птушка на клёне. Суседка на ганку ў хустцы нанайніцу, ступае асцярожна, каб не паваліцца, ідзе ў сад да вывараченых яблынь, да затопленай бульбы. Рукі вісяць уздоўж цела, ужо яна, выдавалася, доўга не змусіць нічога імі рабіць, наглытаўшыся гэтай цёмнай вады — бяды. Рака затапіла хлявы, лазню, ідзе перакатамі, шуміць дажджом, бы кожная кропля ў ёй яшчэ жыве асобна, гамоніць сваім голасам. Праехала па вуліцы пустая падвода, а падалося, што зноў варочаецца навальніца. Галасы ў вёсцы над вадой чыстыя,

званчэйшыя, далёка чувацца. Жанчыны клічуць да сябе дзяцей, пабыўшы, зноў клічуць — надта блізка бяда. Нават паспускалі з ланцугоў сабак. Скрышаныя зёлкі, кветкі, водарaслямі матляецца лісце дрэў, чорная зямля пад нагой, ані следу, бы й не было дагэтуль жыцця твайго, працы. І самае нязвыклае пасля — мыць ганак, ставіць чайнік, трымаць запалены сярнік, бачыць агонь, бо ты ўжо на самым дне затопленага сусвету.

Раптоўна ўспомніцца, што на тых днях, якраз перад бурай, бачыла жанчыну ў чорным. Ішла яна ў поле да лесу ад вёскі, не зразумець толькі, ад чыёй хаты, хто. За плячыма высока каса і граблі. Ідзе, крокаў не відаць, а рухаецца, перамяшчаецца хутка, быццам і не на сваіх нагах, а па ветры, зачапіўшыся грабавідлам за хмару. Лёгка, краем лесу, зайшлася ў кусты, дастала свой грыб, пэўна, зазначаны надоечы. І зноў яе бачыш ужо на гэтым баку пералеску. Ідзе нетаропка, не тое што каб да нейкай работы. А здалёк дык быццам ходзіць пракосамі: узад-уперад, узад-уперад. Граблі высока над галавой — пэўна, зграбала, ссоўвала да вёскі хмары. І сонца свяціла, і відно, што не старая, а яна выйшла сенаваць у чорным... Назаўтра — бура, разводдзе, бяда.

Нехта каля ракі сказаў і забыўся на тое: маўляў, загінула народжанае гэтай ноччу жарабя, набрала вады ў вушкі. «Як гэта?!.» — перапытвала Ганна ў людзей. «А, ведама, калгаснае...» — адказвалі абыякава, бы яно, калгаснае, нетрывушчае, асуджанае на пагібель, нечага і дзівіць.

І Ляльцы з начы пагоршала. Кабыла нервавалася, ускідвала азадкам, ляскала ў паветры капытамі, шугала мачой, як з вядра, ці то баронячыся ад двух жарабцоў, ці то штукуючыся перад імі; тыя, пэўна, недзе адарваліся ноччу, табуніліся каля яе. Лялька ўжо не здужала нават падняцца з зямлі. У храпах стаялі буйныя кроплі расы, цельца як мачонік, а яна нетаропка, па-жабрацку, бы са стала старэчай рукой, падбірала губой крошкі хлеба. Во калі парвала ўсе зашчапы, забароны вясковыя — трэба самой браць раду, нікога болей

не пытаючыся! Гэтая скачаная бурай трава, гэтае мокрае поле не выцягнеш з-пад жарэбкі, не перасушыш, як посцілку, не перакінеш. І самой табе не будзе спакою, што б там ні казаў Юзючок, чаго б ні маўчала абыякава вёска, бы й ты ўвесь час на ейнай сырой хворай ложы. Ні з кім не радзячыся, фуфайку на сябе — пабегла ў суседнюю вёску па ветурача.

Ішла, злавалася на сябе, выгаворвала некаму як не ўголас. Бурым заносіла паабгрызеныя каровамі пагоркі. «Хапае кабыле травы», — пярэчыў Юзючок. А жарэбцы? Чаму ніхто з вёскі не падышоў, не параіў ёй, гараджанцы, даваць яйка з сахарам, яшчэ ж на памяці ў старых людзей, як выхаджвалі немцы сваіх знямоглых у дарозе жарабят? Лялька ж усё радзей падыходзіла да вымя. «Калгаснае...» — як яны кажуць. Сама вінавата, не звярнула ўвагі, думалася, што сп'яна выгаворваў ёй сусед Паўла: «Каб гэта сваё, а так і спасіба ніхто не скажа! Я во быў узяўшы з фермы ў кішэню, можна сказаць, смецця, прадсядацель мяне пасля гэтага на кожным сабранні спавядае. Дык я пасля буду ягонае жарабя падымаць?!.» Але ж гэта не мёртвы калгасны інвентар, не кола ці плуг, каб ісці й паражаргаць. Гэта ж не старшынёва, а жывая, боская істота, як душа трывае? Вось няхай, маўляў, Бог і пільнуецца, і ратуе жарэбку? І ты пяклуйся, калі табе трэба... Ці не спазнілася яна? Ці не позна пайшла перак вёскі? Перак старога гаспадара Юзючка, ухваленага дзедам Ляксеем: «Во, Юзюк! Ён хадзяін! У яго, каб ты паглядзела, якія сві-і-нні!» Чаму ж не — свінні ж свае, не калгасныя! Цяпер, ідучы па слізкай дарозе, разумела, чаму не хінуліся да яе Юзючок з Настасяй, як бы й не заўважалі ейнай дапамогі, быццам чакалі, калі нацешыцца гараджанка, надакучыць ёй забаўляцца з коньмі. Паздароўкаецца каторы — і прэч, не пастаіць, не загаворыць. «Можа, проста некалі ім, старыя ж людзі, а бульба яшчэ на полі, а свая скаціна ў хлеве, восень,— разважала раней. — Як у злосці ўсё роўна ходзім...» Тады, успомнілася, дашчэнту збедаваўшыся па Ляльцы, адчула патрэбу нарэшце сустрэцца са старымі, пара надышла пабедаваць разам, як

парадніцца на момант,— адну ж бяду маюць. Пайшла ў хату. Падсвядома жадаючы ўдзячнасці ад старых, сама ўзяла з сабой гасцінец, панесла. Настася сустрэла на панадворку, несла поўнае вядро сырадою. О, якім знакам, якой дарагой узнагародай быў бы ёй кубак малака! Яна, як чараўніца, напаіла б ім усіх зняверанных у сялянскай добразычлівасці, у сялянскай высакароднасці, акрыяла б сама, амаль пакутуючы каля хворай Лялькі. Але Настася, як заўсёды, спяшалася.

Вярнуўшыся да сябе ў хату, Ганна стала тады перад Адзігітрыяй. Не ведаючы пацераў, прасіла дапамогі, звярталася чамусьці да ейнага дзіцяці, пэўна, не адважваючыся трывожыць засмучоную чалавечым лёсам Багародзіцу. А можа, яно, маленькае, народжанае ў хлеве, каля жывёлы, само распытвала ў жанчыны пра жарэбку? Чужыя ў гэтай вёсцы й калгасныя коні, і яна, гараджанка, каму ж яшчэ да іх справа?..

Там-сям у лесе падымаліся з нізін, спяшаючыся, надзявалі аберуч шапкі на самыя вочы, беглі на пагорак апёнкі. Зарана, праўда, але ж такая сёлета сырызна. Зусім побач храснула, павалілася надламанае бурай уначы дрэва. Медзвядзём роў, выдавалася, у самыя вушы дзед Ляксей, неяк ведучы кабылу да работы. А заўсёды ж быццам такі прыветны чалавек: «Няхай ро-о-біць, нагуля-я-лася, халера яе не возьме!..» Успомнілася, як помсліва тузаў за аброць, спаганяў тое, што жарабя прывяла, што гуляе, а ў вёсцы такая пільніца — якраз жа салому калгас дзяліў. Пакуль усе навазілі... Доўгая была Ляльцы тая дарога, тады й закульгала...

— Ну, што, цётка, маеш? Чаго прыйшла? — запытаўся ветурач, калі знайшла яго ў канторы.

Ганна тлумачыла, збівалася, зноў гаварыла, а самой аж у твары стала горача. Цётка... Думаў, што нейкая калгасніца... Ён жа не такі ўжо і малады гэты «пляменнік». Можа, і аднагодак... Пэўна ж, абшушкаўшыся, у фуфайцы, боты гумовыя ў гразі па халяву, твар збедаваны. Не, каб напудравацца, намаляваць вусны!.. Адным словам, бясполая істота перад муж-

чынай — «цётка!» Не, не ўмее яна сябе паставіць у вёсцы! Трэба было з'явіцца амаль афіцыйна, патрабаваць, а не прасіць хуткай дапамогі, ведаючы ад людзей, што ветурач аніякі ў калгасе, што гіне маладняк на ферме. Ён жа і сам быў павінен даўно наведацца і сачыць за здароўем малой... «Падыду, калі буду час мець»,— адказаў, з гэтым і вярталася. Грэбліва абмінаючы лужы, ішла з фермы, як на тое, жанчына... у лакірках на босую нагу. Во, пэўна ж з вясковай інтэлегенцыі, не іначай. А яна, адным словам — цётка, аніякая не настаўніца...

Каго цяпер дакараць, каго вінаваціць? Ну як нельга было зразумець, здагадацца, што меў на ўвазе Юзючок, калі казаў: «Што будзе, тое будзе, а бульбу то ўжо выкапаем!..» Марудзіў клікаць на дапамогу, бо прыедзе ветурач, мусіць забраць кабылу з жарэбкай лячыць на канюшню — нечым будзе разагнаць барозны. Вось і ўся прычына! Мокрая сёлетняя восень. Бачыла, неяк зайшоўшы: ляжыць баба Стэпка ў халоднай хаце, увярцеўшыся ў коўдру: «Ай, гэтак да дажджу спяшалася ўхапіць бульбу! Ухапіла... Але ж, во, печ яшчэ не цеплілася, сагрэцца не здужаю, ўсё цела ахлудзела...» «Задаўленне», як яна кажа, паднялося ад такой работы... Лятуць людзі навыперадкі да Юзючка, просяць каня — ратуюць бульбу.

Той потым толькі сядзіць узапечку, счапіўшы галаву рукамі, маленькі, вушы тырчаць, сіні ад гарэлкі, як лятучая мыш. Праставўляюць яму за кабылу — дармавізна! Хіба зарачэшся ад дармавога, хоць яна яму надта шкодзіць. Зямля цяжкая, прыводзілі ўвечары кабылу, сама бачыла, мокрую да сподніцы, віўкае, злуецца на Ляльку, калі тая прагна, балюча ўлепіцца за пустое вымя. «Паспрабуй ты не даць катораму каня! Ого! А як на лета не мне самому даручаць кабылу дагдядаць, то ўжо не дапросішся, не-не»,— апраўдваўся звычайна Юзючок. І ўся ягоная палітыка.

Цяпер, калі ветурач, наведаўшыся, сказаў, што позна, жарэбка загіне, Ганна адчувала сябе ў гэтай вясковай супольцы раўнёй, амаль сужыцелькай падвозчыка Бабра, як тая

дачніца. Толькі што не каля ейнай брамы начуе ягоны жарабец з калясьмі, скінуўшы пад ногі палюбоўніцы п'янага гаспадара. Не, яна не вытрывае болей, кіне школу, з'едзе адсюль — і не ўспомніць...

Як ніводзін год раскашавалі гусі, вады хапала, вёска якраз на злому ракі плыла птушыным востравам, засланым белым пер'ем. Раз-пораз гусі залятаюць праз плот у сад па яблыкі. Днём змрочна, як увечары на шэрай гадзіне. Сонца не відалася, але ледзь улоўна ружавелі белыя крылы. Невідушча, аберуч гарнула яно іх да сваіх румяных шчок, лашчыла, клікала ў далёкі вырай, як на вячэру. Нізка над хатай лятуць дзікія гусі, чамусьці выходзіш за веснічкі, каб праводзіць, бы яны адлятаюць з твайго дому, з твайго саду.

Дзень у дзень хадзіла да жарэбкі — яе, нарэшце, Юзючок пусціў у хлеў, натурыста цягала кашамі траву, карміла з рук усім чым. Слабая была ўжо і тая трава, і ў садзе пуста, дзенідзе па яблыку, як на сірочы новы год. Ветурач больш не прыходзіў, сама старалася лекаў, сама змазвала рану (пухліну прарвала-такі), доўга, каб хто бачыў, як ваража біткa, глядзела на балючае месца, бы дапамагаючы яго выбалець. Млечны шлях якраз над галавой выдаваўся пустым гасцінцам, глухі асенні гром — цяжкім тупатам позніх коней. Занадта блізка гарызонт пад лясістым пагоркам, зоркі скрозь дрэвы блукаюць воўчымі вачыма. І кабыла ноччу так храпла, некага чуючы, што хоць ты бяры бляху ў рукі й бі ў яе, баронячы хворую жарэбку. Ізноў дождж, раніцай на момант пераціхне, збяжыць з мокрай страхі ў вадасцёкавую трубу тонкі струмень, цягучай слінай падберыцца ўверх спрасонку і зноў аслабне. Дождж і дождж, халодны, ужо асенні. А то выдасца і цёплы дзень, аж яшчэ з раніцы, лежачы ў ложку, пачуеш яго — дыхае хата, зусім накшы дух. Выскачыць суседскі ўнук у адной кашульцы, стане на высокіх сходках і цымбурыць уніз. Не азіраецца, ці хто бачыць, не стыдаецца, стаіць нерухома, цнотна, рыхтык фантан у гарадскім садзе — дождж дажджом. Адзін раз расхінулася надвечар неба, якраз напроці ейных вокан. Ру-

жовы з пазалачаным праём, вузкі, высокі, бы адчыніліся дзверы. І нехта, пэўна, выйшаў нябачны, бо якраз у гэтым месцы прывідам узнік стромкі пагорак — Ганна яго раней і не заўважала — ён, бы трап падагнаны ці сходкі пад чыесьці ступні, каб сысці на зямлю. Плечы, душу агарнула, сціснула тая неспадзяваная хвіліна, калі ўтрапёна спыняешся перад абразом, раптам адчуваючы, што і сам стаіш на святым месцы.

Усё навокал: вёска, людзі — падалося адзіным кутком на ўсёй зямлі, ціхім, благаславёным, як накут у хаце, абхінуты блакітным рушніком ракі. Тут займаюцца праведнай працай, усё рукамі, навобмацкі: якое сена сырое, якое сухое. Нясе каторая баба ўзаплечкі з вечара дровы ў печ, перацятыя мужавай дзягай, сагнецца, як пад крыжам нескончоных марных клопатаў. Тут у паўдні, у спёку гавораць, дзівячыся, пра тое, якая цяперака халодная зямля, басаНож не ступіш, забываючыся, што гэта проста падціскае холадам старасць. Тут п'яны конюх з суседняга калгаса, ідучы ў вёску па самагонку, раптам рэкнуў, шчыра зажалеўжы жарэбку: «Такое дзіцятка...». Надта глыбока ў душы, падыме са дна толькі сівы хмель, носяць людзі жальбу па калісьці ўласных конях. Тут чарнеюць з кожным асеннім днём у лясным храме лікі дрэў, толькі адна бярозка ў светлым — парафіянкай. Тут амаль без сцябла, бы донцам стаіць на зямлі, царкоўнымі чашамі цвіце ў ейным садзе сіні познацвет...

Ганна доўга пасля не магла аслабаніцца, пазбавіцца ад пачуцця, што перад ёй у гэтым зацішку ўвесь час расчынены малітвеннік, а ёй некалі пацеры мовіць — трэба бегчы да коней.

Каля хлявоў яе пераняла Настася.

— Ты ж капусты не маеш... — і кладзе ў ейнае вядро белыя качаны.

— Колькі я вам за іх павінна?

— Бронь, Божа! Мы ж з табой дружым,— бароніцца Настася і ўсміхаецца, слабка так, бы толькі што замарозка адышла.

«Дружым?!.» — ледзь не ўсхліпнула расчуленая Ганна. Значыць, нарэшце-такі прыняла Настася і ейную дапамогу калгаснай жарэбцы, як сваёй уласнай, прыняла і яе, гараджанку. І ейныя нязвыклыя адносіны да чужых на гэтай зямлі коней.

— А куды, баба Стэпка, маркоўнік зносіце? — пытаецца праз плот, спадзеючыся выпрасіць Ляльцы, бо трава ўжо слабая.

— Жарэбцы,— адказвае старая, і сама панесла.

Нехта скінуў каля хлявоў посцілку бурачніку. Настася хлеба булку раскроіла, морквы накрышыла.

— Хай сабе, я жарэбцы, як той казаў, чужая, дык жа, жарт, ніхто са сваякоў, з калхознага начальсва, не прыйдзе, не папытаецца, не выпіша мукі! — сварылася яна, паварочваючы твар у бок цэнтральнай сядзібы.

Вёска, нарэшце, субожылася, і вяскоўцы, як дзеці, забываліся на сваю віну, няпамятліва шукалі адзін перад адным прычыну, быццам толькі зараз, гледзячы, як жыляецца гараджанка, усвядомілі тое, што здарылася. Лёгка вінавацілі адзін аднаго. І салома была звезена, і бульба выкапана, і сена ўжо хопіць, можна пачынаць зімаваць. Другая пара на двары, другі клопат. Дажджамі змыла той летні саланаваты пот, тую горыч, аж памяць адбірала, калі выпадала каня папасці... Адзін п’яны Бабёр цвяроза прыпамінаў кожнаму, каго сустракаў на вуліцы, пільнуючы свайго маладога жарабца, якога яму далі замест кабылы:

— Людзі! Ого, людзі! Абы, дай каня на дзень, то ўжо і канец! Даў Алёшку лес на лазню вывезці, дык праз дзень капыты паляцелі! Ён жа ішоў — я любаваўся! А цяпер, як цэлка, толькі тэп-тэп-тэп! Я ж за ім гляджу: важу буракі — і яму даю бурак, бульбу — яму бульбу, зерне — дык зерне. А ў людзей дзень галодны!.. Мой жарабец бяшчоту харошы! Ехаў нядаўна, зваліўся ў лесе, ён мяне не кінуў, стаяў, пакуль я не працверазіўся...

Мала прыслухоўваліся да яго. Казалі ў вочы: ён, Бабёр, болей за ўсіх вінаваты. Ён першым парушыў запавет сялянскі, калі пільнаваў жарэбную кабылу, каб забіць ейнае дзіця, ён, маўляў, увёў у грэх. Скачаны, збіты на горкі яблык, Бабёр не бараніўся, больш выдаючы на пакутніка, чым на злодзея. Піў, гуляў, і не было весялосці ў ягоных гулях. Ніколі не зманіў, ні з чым не схаваўся, пэўна, ведаў, што ходзіць увесь час на боскіх вачах...

Раніцай, ледзь развіднелася, прыбегла Настася, каб наказаць: Ляльку выпраўляюць на канюшню, а потым, вядомая справа ў такіх выпадках, і не вымавіць, куды павязуць... Трымцела ў голасе. Выхадзіць жарэбку то выхадзілі, жывой галавы, як той казаў, не згубілі. Але ж гэта не чалавек. Жыць будзе, толькі які з яе рабочы конь. На нагу Лялька так і не стала, адным словам, пакаёўка, не давала надзеі на лепшае... Ганна як не сваімі рукамі схапіла пакет, сабрала ўвесь хлеб, які быў на той час. І Настася потым дабавіць акраец. І стары Ляксей вынясе з хаты кавалак, укіне. Хто яе астатнія дні там на канюшні будзе песціць? А жарэбка, во, са сваім хлебам, як з роднага дому.

Са сваёй торбай у цяжкую дарогу. У дарогу на бойню, па якой каровы, дык тыя ўпіраюцца, равуць. Свінні пішчом пішчаць, адзін аднаго з ног валяць, кідаюцца ўбакі. Коні ж ідуць памаленьку, моўчкі...

«Не кажыце мне пра коней...» — папросіць Ганна сяброў аднойчы ў бяседзе так, бы размова ішла пра кагосьці ёй вельмі блізкага, па кім яна носіць жалобу. Ніколі ўжо не магла любавацца іхнім хараством. Пасля Лялькі кожны конь ёй бы кінуты, бяздомны сабака. Толькі калі пашкадаваць і... адвярнуцца...



# НА ПЛЫВУНЕ

Яшчэ дзень такі зімовы, з марозам, блішчыць, лопаецца пад нагамі, бы спакаваны, загорнуты ў фольгу. А ёй ужо нехта даў знак на цяпло. Прыйшла ўся ў белым, лёгка па-вясноваму, і з кветкамі. З кветкамі Ірына прыходзіць да Чэсі заўсёды, нават калі няма ў краме зрэзаных, ёй наламаюць з вазонаў на вокнах, крохкія дудачкі, кволыя кветкі-пакаёўкі. На нейкі момант не падымаючы вачэй, Чэся пужаецца, што так нізка, цесна абступае іх змрочнае скляпенне прыхожай, што сама апранута так звычайна, быццам усю зіму не распраналася на калавуры. І наогул, яна ўжо спазнілася туды, дзе вельмі было пільна быць усім жанчынам на свеце. Ледзь дазваліся, дабудзіліся яе людзі, птушкі. Лепей сказаць, як вясковая баба, задрамаўшы на паставе ў полі, раптам падхапілася — сонца высока, скаціна сышла ў шкоду! А яна выцірае салодкую сліньку з вуснаў — і не разумее, якая цяпер пара!

Няўжо вясна?

— Я табе дзіўлюся — ты дома і дома, не любіш збораў. А мне выйсці на людзі — адзін момант! Што кубак чаю выпіць... Я да цябе на хвіліну, потым — у басейн. Жэня павінен туды падысці... Чамусьці выдаецца заўсёды, што ён спозніцца ці зусім не прыйдзе...

— Чаму?..

Чэся звычайна не распытвала пра Ірынінага каханка, пра тое, як ім удаецца так часта бачыцца. Ірына была намнога маладзейшая, высокая, прыгожая, з лёгкім характарам, яна стаяла наводдаль ад іншых жанчын, пэўней сказаць, навідавоку. І розныя любоўныя гісторыі, заляцанкі, палкія прызнанні былі гэткім жа звычайным антуражам, як біжутэрыя, яе Ірына мяняла амаль кожны дзень. Толькі мастак Жэнечка маляваў яе

заўсёды чамусьці з адным і тым жа ўпрыгожваннем — кулон з цёмна-юлёвым каменем на грудзях. І жаліўся што ніяк не ўдаецца падабраць фон на партрэце, змушаны распінаць плюшавае прасцірадла, як у дарагім футляры.

Сёння хацелася спыніць Ірыну, пагаварыць, распытацца. Як у Венеры Мілоскай: ці не шкодзяць ёй чужыя пагляды? Ці не баіцца яна, што жонка Жэнечкі плісне варам у твар? А дзеці? У самой Ірыны — двойня.

Нешта ляснула ў суседнім пакоі. Не, ніхто не прыйшоў, дом стаіць на высокім месцы, гуляюць скразнякі. Чэся ўстала, каб упэўніцца. Не, гэта фортка. Такім часам іншы раз прыходзіў дадому муж, разы тры-чатыры на тыдзень. Аб тым, што ён болей жыве ў другой жанчыны, Чэся нікому яшчэ не гаварыла. Часта вецер уздымаўся нанач, грукаў, будзіў, яна ўставала і спрасонку ішла... да дзвярэй. Схамянуўшыся, падыходзіла да акна. Далёка ўнізе бакенамі свяціліся рэдкія агні горада, глыбокай плыняй чарнела Кальварыя, буяла цемра могілак. Неба нізка нахілялася, як над вадой. Выдавалася, няма куды саступіць нагой, ніколі не сысці з гэтай стромкай вышыні.

— Пасля ўчарашняга, баюся, Жэня можа і не прыйсці... — спавядалася Ірына. — Учора мы з мужам былі ў гасцях, у Курловічаў. Ужо селі за стол, як раптам заходзіць ён з жонкай. Аказалася, яны таксама былі запрошаны... Уяўляеш: мы сядзелі з ёй якраз насупраць... Я так прагна разглядала яе, як ніколі... Такая швэдра на ёй, чорная, каўнерык з люрыксам, карацей кажучы, — даўнейшым строем, напятая швэдра, як панчоха, жывот не схаваеш... Мне хацелася крычаць: глядзі на мяне, якая я!.. Ён павінен быў за табой мяне пакахаць! Павінен!.. Мне і раней карцела пабачыць яе, паказацца ёй... Яна ведае пра нашу сувязь...

Чэся ніколі яшчэ не бачыла маладую сяброўку такой узрушанай. Тая, як не аберуч, несла высока перад сабой сваю прыгажосць. Маўляў, глядзіце на яе, яна прыгожая, маладая, усім падабаецца, усе любуюцца ёю, як на партрэце, на выс-

таве! Любуйцеся, яна дазваляе! Што, хіба хто-небудзь з вас адважыцца за гэта даць ёй, па простаму кажучы, па мордзе?!. Непазбежна тое, што ён закахаўся! Вы не здолееце яе за гэта абразіць!.. І чуўся іншы голас, ціхі, малітоўны, каб нехта з людзей ці з багоў усё-ткі жорстка апраўдаў яе побач з немаладой, у чорнай нямоднай швэдры жонкай мастака. І дараваў ёй.

— Не, я праўду не скажу: прыгожая яна ці не... Іншы раз раптам бачу: такая яна ядраная, шыя высокая, белая. Сядзіць, і такі спакой у сініх вачах, што хоць ты каменем кінь, як у ваду, каб узрушыць...

Зноў грукнула фортка. Чэся рэзка паднялася, абы хутчэй схаваць ад Ірыны сваю роспач.

Ці ведае яна, што такое пусты дом?.. Вось прыйшоў муж, і дзень і два дома, — усё як звычайна. Раптам — тэлефонны званок. Ён збіраецца, ідзе да дзвярэй. І сама пачынаеш мітусіцца, спяшацца, быццам і табе трэба ісці, з'ехаць з гэтага месца, адкуль увесь час з'язджаюць. Калываецца тут усё пад нагамі, як на плывуне, трэба саскочыць на цвёрдае. Яе зацягвае, засмоктвае ветрам у ягоную дарогу. Але яна застаецца. Яна проста не паспее сабрацца. У што і як загарнуць гэты дзевяціпавярховы дом на гары, дом на дваіх — старую хрушчоўскую шпакоўню? Яшчэ чувацца скрозь у пакоях, б'юцца птушкамі ў вокны крыкі, воклічы галасоў, гірляндамі, рознакаляровымі стужкамі звісаюць, уюцца іхнія доўгія згодныя размовы па начах. Не пераступіць, не зачыніць за сабой дзверы, колькі тут сяброўскай споркі! Як усё гэта забраць, нічога не пакінуць? Нават зямля, стары патрушчаны асфальт, як грыбніца, свяшчэннае месца, на якім родзіць шчасце...

Пайшоў... Раптам здрадзілі рэчы, адчужана, недарэчна пастаўшы адзін каля аднаго. Яна яшчэ тады на разумела, што ўвайшла ў адзіноту, як у зусім іншы, незнаёмы дагэтуль пакой. Час цёк без напрамку, так ідзе па гарачым пыле дажджавы паток, іртутнымі кроплямі скурчваецца вада і знікае, толькі ззаду — крохкі след сухой ручаіны. Ля парога наўмысна не

прыбірала ягоныя хатнія пантоплі, каб заставаўся ў доме свежы, будзённы знак прысутнасці. Даражыла менавіта будзённым, непрыкметным, тым, што дзень у дзень, як няспынны ход гадзінніка. Прыйшоў... Пужалася самой сябе, калі раптам пачынала настойліва, раздражнёна дапытвацца ў яго: «Дзе мой грэбень? Ён жа тут заўсёды ляжаў!..» Ужо падсвядома ўзнікала звычка адзінокага жытла, дзе ўсё на тваім воку, адзіным парадкам і непарушнае. Губляліся, як кажуць, навыкі хадзіць упарцы. У прыпадку горычы хацелася скінуць з сябе, як аброць, гэтую сувязь, залежнасць адзін ад аднаго... На лесвіцы па сходках ішла старая жанчына, кіем далёка занесла, аж ёй пад ногі. Божа! Колькі ў доме старых адзінокіх жанчын! Ніколі раней не заўважала, не чула, не разумела іхнія думкі. Яны павольна соваліся ўздоўж высокага дома, асядалі на лаўках каля пад'езда і, выдавалася, нерухома, сведкамі глядзелі на яе, у вочы, маўляў, ведаем, усё ведаем — і ты ўжо тут адна. У цёмнай адзежы, кружанялі вакол зграямі, на ноч, пэўна, усе разам падымаліся пад самы дах.

Вечарам яна падсоўвала да канапы, на якой спала, вялікае старое крэсла. Каб толькі што-небудзь было побач, блізка. Яно нерухомай сядзелкай начавала каля яе з дня ў дзень. Раней ёй здавалася, што адзіноту адчуваюць, пужаюцца яе толькі слабыя, бездапаможныя людзі. Цяпер Чэся разумела, што гэта такое: быццам у дом без дазволу зайшла, жыве старая набожная жабрачка, увесь час жаліцца, шкадуе сябе. І сваё жыццё, успаміны раптам выдаліся побач з ёй таксама ўбогімі, бы й табе разам з ёй нехта змілаваўся, паклаў у руку. І горыч нечаканая, што меней, бядней падарылі, чым тваім сяброўкам — не жыццё, а посны праснак. Непрыхілкія рэчы ў доме, чужы горад, на ўсё вакол адкінулася непамерна вялікая мужава цень здрады. Нехта ноччу, як на тое, падпілаваў пад вокнамі маладыя таполі, яны доўга ляжалі непрыбранымі, як бязродныя ў труперні. Усё наганяла жалю... Яна ведала: не, нельга па жывым чалавеку так труднаваць...

Ірына заклапочана хадзіла па пакоі, мяркуючы, дзе б лепей паставіць кветкі. Спынялася то каля камода, то каля пісьмовага стала. З суседняй кватэры данесліся гукі фартэпіяна.

— Мы з Жэнем неяк на нядзелі былі ў філармоніі, слухалі Моцарта... Такое, скажу, задавальненне...

— Вы ўжо адкрыта ходзіце ўдвух? У філармоніі шмат нашых агульных знаёмых... Надта віднае месца... Скажуць ягонай жонцы...

— Пра такое звычайна ў вочы не гаворыцца... Паміж сабой перабяруць і кінуць...

Маўляў, рэдка да жонак даходзіць праўда, толькі ворагі адважацца данесці, ці варта катораму чалавеку мяшацца ў чужую сям'ю. І ўсё гэта Ірына гаварыла шчырым, амаль дзіцячым голасам, як дзяўчо, абсыпаўшыся буйным вясновым рабаціннем, бы толькі што была нізка нахіліўшыся пад кветкамі, падняла твар, запэцканы пылком. Адкуль у яе, маладой жанчыны, такі жорсткі вопыт? Чэсі выдаваўся доўгі, маўклівы, як калідор, шлях, скрозь натоўпы людзей, скрозь дрэвы — усе ў змове. І Ірына з Жэнем ідуць па ім поруч, моўчкі. Але варта толькі палюбоўнікам знікнуць з вачэй, як адразу ўслед адчыняліся вокны, шумела лісце, краталіся, кідаліся ў гаворку людзі...

Па такім самым маўклівым калідоры, пэўна, і яна сама ходзіць амаль нічога не ведаючы ад людзей пра мужа, пра ягоную каханку. Казалі, вельмі маладая... Хутка павінен зноў прыйсці дамоў... Яна падасць, як заўсёды, яму свежую бялізну, выжме кашулю, усё перамые лёгка, без дасады, быццам здыме пот з ягонага гарачага ілба. І адчуе сябе найбліжэй да яго за ўсіх.

— Не дзівіся, але больш не хачу хаваць сваё каханне, як нешта крадзенае... Нядаўна было, убачыла: ён стаіць з жонкай каля машыны, пэўна, толькі з дачы вярнуліся, слоікі памідораў у руках... Сваячка з імі разам... Такая ўжо сямейная ідылія... Што мне рабіць? Падышла да іх і давай гава-

рыць з Жэнем... пра палітыку. Няхай усе бачаць: гэта вельмі й вельмі маё!

Няўжо Ірына ўвайшла ў правы, жорсткія правы законнай палюбоўніцы? І чым болей перашкод, тым весялей яна рызыкуе, амаль адчуваючы патрэбу пераадольвання, як у спорце? Пярэчыць Ірыне, павучаць? У яе становішчы? Чэся маўчала.

Госця заспяшалася, хутка пайшла, маладая, уся ў белым, недаткняльная. Як толькі зачыніліся дзверы, Чэсю ахапіла невядомая дагэтуль пачуццё ўзрушанасці, нават цуд, быццам свежы вецер сарваў на людзях з ейнай сівой галавы хустку. Кідалася па пакоях, сілілася нешта сабе, як нямко, растлумачыць. Хацелася кінуць гэты калавур у высокім доме на пагорку, як на маяку, уціснуцца ў жыццё, бы ў лясны гушчар, з Ірынінай блытанінай, суперніцтвам, спрэчкамі, выперадкамі, смехам, сварай... І каб з кветкамі ў руках... Свежы вецер у пакоях расчыняў шафу з нямодным адзеннем жанчыны, якая прыняла сваю сталасць дасціпна, пакорна, бы пострыг у манашкі. Не хапала толькі, каб ляснуў першы пярун і вясновая навальніца, разбіўшы падвойнае шкло на акне, вынесла з дому праз парог зімовую шуму.

Нарэшце Чэся зразумела, што мае нешта пільна зрабіць — і старанна працерла ў пакоях люстэркі. Супакоіўшыся, падышла да акна. Вакол ляжаў снег, на пагорку ён заўсёды як свежы, бо тут намнога халадней, чым унізе, на вуліцах. І нават калі ўдзень крыху раставала пад нагамі, то за ноч лужыны высмагалі, заставаліся адны пустыя сподачкі. На кроне старой яблыні гойдаліся, галёкалі малыя дзеці, яны заўсёды асядаюць на ёй перад самым прылётам птушак. Ужо ружавела, цвіла кара на вербах. Яна адчувала цеснату дрэў у скверы насупраць, быццам расхінала іх сваім плячом, стоячы разам. Ужо вечар спускаўся да людзей з неспадзявана галубовымі крыламі, праседзеўшы ў чаканні ўвесь дзень на правадах чыста белым галубком.

Вакол панавала вясна чакання.



## ХАННА МУРЗА

Уставала раніца. Праз летнія ейныя ўборы ўжо віднеліся ў вялікіх вокнах натоўпы дрэў. Яны падыходзілі да дому з цемры, іх большала ўвачавідкі. Ужо можна і начное святло выключаць. Стаяў на верандзе засланы стол. Сёстры то разам, то паасобку садзіліся да яго, быццам спрабавалі снедаць, гаварылі ціхімі ранішнімі галасамі. Уставалі, хадзілі кругам, па пакоях, і зноў вярталіся, і зноў аб тым самым гаворка: «...Разумееш, я б цяперака любыя роды прыняла... Жарт, ножкамі двое ішло, я так спужалася, каб ты не закрычала на мяне... Марта сама ўжо вымаглася, не мінулі б асфіпсіі... Ледзь знайшла простыя ніткі для пупавіны...»

Нешта ўсё свежае бралася ў рукі з хададзільніка, стол быў ужо застаўлены, бы ў доме поўна гасцей. Праз ноч едуць сюды, ідуць, стаяць пад вокнамі з нейкай вялікай урачыстай нагоды, ціха частуюцца, як у адведзінах. Доўга са стала ніхто не прымае, быццам яшчэ не ўсе дасталіся, хто меўся быць.

Сёстры вярталіся да Марты. Сучка са шчанюкамі ляжала на баку, падымала галаву, глядзела на сваіх гаспадынь вільготным, мігатлівым позіркам, як з зорнага неба пасля доўгага дажджу. Плюшчылася, ківала прывітальна аднымі вейкамі. Яшчэ футра на ёй скамечана, ускінута абы-як, бы з чужога пляча. Шчаняты краталіся, згубіўшы сіську, ці ў сне, запаволена пластаваўся каторы ўсім цельцам, цесна адзін каля аднаго, як у мацярынскім лоне, у водах каляплодных. Старэйшая сястра садзілася на падлогу крыху наводдаль ад іх, яе клікалі іншы раз, злаваліся, яна не азывалася. Магнэзам вабіла ўбіраць у сябе вачыма невідоныя дагэтуль чыстыя, свежыя фарбы, адценні, блікі на поўсці нованароджаных — так зіхацяць раніцай першыя кветкі анемонаў. Любавалася і несвядома для самой сябе ўжо

бараніла іх зрокам ад едкага з дымам лясных пажараў паветра, ад сонца вісакоснага лета, атручанай ежы й чужых людзей. Як замаўляла. Як ведала, што знікне хутка маціцовы бляск на пысе і вушках у Мірты й Макуша, бы на створках выкінутай нагой з вады, расчыненай перлавіцы. Ханна Мурза згубіць цёмную праз усю спіну воўчую дзягу. Памяльчэе глыбіня чорнага колеру ў Марцініка і Мальты. Кожны з пяцёх ужо меў імя.

Дом адмяніўся. Не гулялі, не стукалі скразнякі — малым зашкодзіць, марфенамі распаўсюджваўся па пакоях ледзь улоўны, можа, улоўны толькі зверам і жанчынай, малодзіўны пах малой істоты.

— А можна паглядзець? — пыталіся дзеці каля веснічак, даведаўшыся, што Марта прывялася.

— Не, яны яшчэ сляпыя...

— Што, хіба шчанюкі нараджаюцца... у акулярах?!.

Сёстры смяюцца надзіва шчырымі моцнымі галасамі, як дзеці, раз-пораз успамінаюць пра акуляры — і зноў у смех. І нават ноччу зусім накшы дом, ледзь пазнаеш, што гэта з кошыка: «У-у-оў-у! У-у-оў!» Коратка так, патрабавальна, як на калавуры каторы, нехта самы пільны шчанюк правяраў, ці спіць чалавек. Кошык стаяў, вядома, у пакоі старэйшай.

Раптам пачула — кугае сава, дзіцячым голасам, зусім блізка. Нейкая трывожная начная зверка. Хацелася ўскочыць, праверыць пакоі, усіх, хто спіць: ці ўсё добра ў доме і ў свеце з блізкімі людзьмі. І не адважвалася падысці да акна: можа, можна прыкінуцца, не прызнацца, што чуеш, што табе крычыць, табе варожыць. Абхінулася вялікай хусткай, пайшла з хаты. Поўня гуляла па небе сярод маціцовых кучаравых воблакаў, бы на пагорку па яблыневым садзе ў кветках. На зямлі пахла дымам, каторы дзень гарэў лес у Наваселлі, аўтобусам, казалі, не праехаць. І ніхто ж не гасіць. Абышла круга, падняла свой згублены пасак ад начной кашулі, схамянулася, здзіўўшыся, што доўга ходзіць. Зачапіла куст напёрстаўкі, чувалася ўначы, як сыпалася насенне, бы з сухой жмені — расы ані кроплі, стаялі адныя гарачыя дні.

Назаўтра, казалі ў вёсцы, загарэўся лес, і гэта каля Лісаўшчыны, зусім побач. Сава ж ведала, будзіла ноччу. Выдавалася, вось-вось з'явіцца на парозе дрэва, ахопленае жахам. Спуджаная птушка каля Белага поля, дзе цвіла дзяцельніца, доўга кружаняла над гняздом, пятля за пятлёй, бы на некалькі вузлоў па-вясковаму завязвала сваё жытло, адлятала не адразу. Пахла ўжо яловым гарам, смаляком на распалку. Марта трывожна кідалася, брахала без дай прычыны.

Шчаняты ўжо адкрылі вочы. А першая ад усіх — Мірта. Што б ні рабіла: ловіць, гуляючы, хвост, смакуе нешта на зуб — вочы з цябе не зводзіць, быццам усё гэта знарок, наўмысна, каб гаспадыню забавіць. Усе спяць, а яна ляжа паверх іх і глядзіць, стоіўшыся. То загаралася, то гасла святло трохстворчатага акна. Змрок хаваўся ў поўсці авячча скур на сценах. Пад столлю нізка, як у чыіхсьці далонях трымалася, свяцілася скрозь пальцы гліняная люстра. Ляжалі, можа, ад вясны, не меней, зложаныя дровы ў каміне, накуця вісеў сухі вехаць заламаных у полі зёлак, жменя багунніку. Сюды не заходзіў пражаны дух сонца, пахла нагрэтай імшарай. Апаўдні маленькі вітражык на фотцы пэцкаў бляклы твар гаспадыні рознымі фарбамі, тады яна выглядала маладой свавольнай дзікункай, зачыненай у чужым доме... Злавіла сябе ў люстэрку, засмяялася, агледзелася — гэта ж вось такім шчанюкі будуць разумець сабе свой дом?!. І няўцемна выйшла ў сад, прынесла ў пакой букет рутбекіяў. Цалавала толькі што расплюшчаныя вочкі кожнаму, прычашчаючы да радаснага, ласкавага жыцця навокал, якое сама адчувала амаль вуснамі. Малодшая сястра блыталася, замінала рукам, закідвала чорныя валасы за плечы, падбягаючы да кошыка, каб нізка нахіліцца да іх тварам — усім чыста. Макуш самы калматы, круглыя вочы блізка каля носа, рыхтык — белае медзведзяня! Кінецца на падлогу ніцма, бы ўплаў, а каб ямчэй улегчыся, з нейкай проста асалодай крутанецца яшчэ на ляту, хваляй віхнецца, сышоўшы крывулькай на канцы хваста. Дзяр-

каты Марцінік — той, выйшаўшы з каша, сядзіць ціха, капешачкай, а варта вярнуцца з прагулянкі ў гняздо, чэпіцца да кожнага, ходзіць узалапкі. І ўсё — каб пасярэдзіне, каб цесна было, тады не здагадацца, хто каго ўварваў за хвост ці вуха, любіць цесную гульню-бойку. Мальта трымалася асобна, без даверу ішла на рукі, пужаючыся вышыні, чаплялася кіпцюрамі за адзежу, бы седзючы на дрэве.

Пятае рудое шчаня бянтэжыла сясцёр ад самай першай хвіліны свайго з'яўлення. Так звычайна глядзіш на парадны партрэт дзіцяці, каралевы ці герцагіні, прыбраны па-жаноцку ў багатае, складанага строю, адзенне, уладарнай рукой адхіленае ад чалавечага роду, яно ўжо адчувае сябе выбранніцай. Тут жа рука была ласкавая, мацярынская, — самой прыроды. Яшчэ закрытыя вочы шчанюка абведзены да вушка танюткім пэндзалем. Сурмяныя малёўкі йгралі блікамі, выдавалася, што на яго аднекуль увесь час падала святло. На ілбе высвечана — высокая пярына, дзеля прыгажосці, як на шапцы татарскага хана. Па спіне цягнуўся сурмяны пасак. Шчаня было пазначана, пэўна, успомнілася тут далёкае сваяцтва, далёкая знаць сабачай пароды, адным словам, воўчы акрас. Ханна Мурза не надта любіла гуляць, непрыхілкая, ласку прымала стрымана, бянтэжылася, расчулена пакусваючы лапу. Возьмеш на рукі, неспадзявана аслабне, абмякне, ніводнай костачкі.

Ужо яны гуляюць па пакоі не ўразброд, зграяй, пільнуюцца адзін аднаго, нячутна лётаюць за гаспадыняй, як матылі, толькі вушы ветраюць. Ужо сёстры выносяць кош у сад, самі, выцягнуўшы ногі, садзяцца на траву. Забывалася на тое, што пахне гарам, што ўсё лета стаіць спякота, вылінялі фарбы, усё вакол высвечана да стрыжня, да слепаты, танюткае, босыя ногі, рукі, як сцябло, дрэвы, травы — усё белае на белым сонцы.

Дом стаяў крыху наводдаль, звонку быццам і новы — жоўтая шалёўка, вялікія вокны — а сам прысадзісты, па-дзядоўску ўседзючкі месціцца каля самага лесу, бо на старым

падмурку. Тут будзіць гаспадыню не матка і не бацька — падымае сонца. Раніцай гукаюць адзін да аднаго лясныя галубы. Галасы глухія, нетутэйшыя, і лес дзічае ад іх: вузламі звязваецца над чалавечым следам трава, захінаючы свежыя сцежкі. Птушкі пырхаюць так блізка, аж рукавом захінаешся. Знерухомееш, бы ў даўнейшым лесе-гнездзішчы. Старэйшая любіла снедаць асобна, каб яшчэ ні з кім не прамовіць і слова, не словам пранашчыцца — хлебам. Адчыніць акно — за сталом адны галасы птушак і шэпт дрэў. Тут рэдка апранаюцца ў святочнае, можа, толькі дзеля гасцей, бо любяць, каб адразу ў работу. Скаціцца з ганка гарашыной, блізенька да зямлі й не баяцца запэцкацца. Толькі апоўдні атрэсці падол у баразне, адазвацца даўкім ад стомы голасам. Тут перашываліся леташнія сукенкі, гаспадыні пільнаваліся сучасных строяў, але абавязкова, каб шырокія, на какетцы, абы цела халадала, як у цяньку. А калі ўжо каторай пашэнціць выкленчыць у сяброўкі вынашаную матчыну сукенку з крэпдэшыну, перабіралася кожнае вочка, цыравалася, дзіркаватае сціналася ў зборачку, каб спажыць сабе хоць полачку, хоць шкуток. Старэйшай падабаліся хадодныя, празрыстыя ўборы. «...І ваду любіш... упэўнена, што ты па гараскопу Рак...» — гаварыла ёй малодшая, абедзве не ведалі дня, года свайго нараджэння, трапіўшы зусім малымі ў дзіцячы прыёмнік. Тут увечары не запіналіся фіранкамі вокны, як не зачыняліся з пакоя ў пакой і дзверы. Каб анідзе табе ні клямкі, ні засуўня, аніякіх перашкод перад вачыма. Вось сонца села, але нехта яшчэ ішоў, спяшаючыся, бокам лесу з свечкай, захінаючы рукой святло. І знік. І ўсё на момант, як спужаўшыся цемры, панікла, сцішылася. Адна такая хвіліна перад ноччу. Апошні раз высока пад столь гойкнула зыбаўка — засынае, усхліпнуўшы, як дзіця, зморанны спёкай, чадам, летні дзень. Тут зрэдку вячэралі каля распаленага каміна. Тады падавала на стол малодшая. Блiскі агню пырхалі ў ейных яшчэ цямнейшых напроці ночы валасах, таямніча стаялі ззаду, краталіся каля сцяны іхнія цені. Каторы год запар прыязджаў да старэйшай

знаёмы геолаг, прывозіў торт, невыводная звычка развядзёніка хадзіць у госці па-сямейнаму. Садзіўся і амаль увесь той торт і з'ядаў, бо надта любіў салодкае, саладзіў кашу і нават рыбную кансерву. Сёстры хадзілі каля стала, можа, і спрытней, можа, і лягчэй, далікатна падтрымліваючы ягоныя спадзяванні, як вясковую гульню ці забаўку. Яго прасілі спілаваць сухі сук на яблыні, перавесіць люстру ў пакоі. І ён зноў ехаў дамоў. Што зробіш, каханне ўжо было спазнана. Як розум адымала, калі ўбачыла тады вясной квітнеючае дрэўца. Нават старая ігруша, седзючы каля дому, нявесцілася, праўляла вяселле, якраз тая пара, калі неспадзявана атрымала вестку пра жаніцьбу свайго чалавека... Па начах тут сніўся кожнай адзін і той жа самы страшны, як яны называлі, сон. Быццам, зноў дзіцячы дом, у цесны пакой уносяць яшчэ адзін жалезны ложак. Скрозь ложкі. Ты чамусьці бачыш усё гэта зверху, па-птушынаму зняможана шукаеш сабе месца, куток набаку ці каля сцяны, каб хаця спіну абараніць ад чаплістага, здзічэлага ў сіроцтве позірка. І не знаходзіш, усё пазаймана — твой ложак пад белай капай пасярэдзіне, як на віры...

У гэтым маленькім доме, як той казаў, храме быццям, усё лета шчодра маліліся, каб нагнала хмару. Нават вярнуўшыся з малін, забываешся на момант, што рукі, ногі апечаны крапівой, выдавалася, гэта сячэ, нарэшце, дробны, калючы дождж. Сёстры будавалі дом самі, адрамантаваўшы старую сялянскую хату, і пільна вартавалі ўсіх, хто сяліўся побач: ластаўчына гняздо, шпакоў, нават злодзейку сароку на дзічцы. І кветкі, тут кожная кветка дабывала да пары, красавала на сваім карані, спяліла семя. Першыя гады ніхто не рваў іх на букеты, і цяпер толькі калі зрэдку. Зачынялі дом позняй восенню, ехалі ў сваю гарадскую кватэру.

А шчанюкі ўжо селі на парозе.

Калі ў вырай, гэта, быццам, звыкла, гэта зразумела, а тут... да чужых людзей? З дому?!. Першай адчула незразумелую дагэтуль трывогу старэйшая. На момант спыніўся позірк,

быццам трымала перад сабой, падняўшы з зямлі, зрубленую людзьмі старадаўнюю грамату на бяросце, звестку, з першых рук самага дамавітага на свеце чалавека, стваральніка храма быцця: дом павінен быць повен гукамі, нямымі галасамі малых істот, а падол гаспадыні хай топчуць дзеці... Горача. Прыскам вылятаюць з-пад страхі над ганкам чорныя восы. Недзе блізка шугае шаламя, ідзе да галубінага лесу. Нехта ж запаліў. Нехта кідае і кідае ламачча ў раку. То спіхне старое кола з пагорка, то дзіравы кацёл, прэнт, абы з свайго двара, абы далоў з вачэй. Бяжыць тая рака басанож па жалеззі з халоднай стронгай у плыткіх кішэнях затокаў, шукаючы па свеце чысты прытулак далёка ад вёскі. Суседзі, сама бачыла, сякуць трускам маладыя арабіны, не збіраючыся доўга жыць... Каму з іх аддаць шчанюка? Хто будзе надта даглядаць, пільнавацца? А ў горадзе хіба лепей?

— Ты калі-небудзь бачыла аб'яву ў «Вячэрнім Мінску», каб шукалі згубленага дварняка? — дапытвалася ў малодшай.

Тая маўчала. Так, амаль на кожным двары ў горадзе сустрэнеш беспароднага сабаку: выбракавалі, выгналі або звычайна не дагледзелі і не вельмі турбаваліся, каб знайсці.

— Надта шчыруеш... У цябе размыта граніца паміж чалавекам і... жывёлай, — спрабавала ўсміхнуцца малодшая.

— Пачакай, ты не разумееш... Неяк зімой бачыла бяздомную сучку з двума шчанюкамі. Яна ішла па снезе, ні на кога не звяртаючы ўвагі, нізка апусціўшы галаву, шукала ежу, зазірала ў пусты чалавечы след... Ішла роўна, не збочваючы, яе пільнаваў, вёў на повадзе голад... Ты не памятаеш, цябе мама несла на руках, мы йшлі некуды, без напрамку, як ходзяць па свеце жабракі... галодныя ... сібірскія маразы. Заначавалі, забіўшыся ў чужы хлеў, сытна пахла саломай, моцным кароўскім духам, з храп ішла пара. Я, пэўна, па-звярынаму чула пах ейных гарачых, як варыва, вантробаў... Цемра звісала адусюль космамі поўсці, быццам сядзіш пад падбрушшам... Морыць сон, бы ты ўжо і павячэраўшы... І зноў — дарога, вочы долу, унікліва, каб падняць што-небудзь з'есці.

Да людзей не прасіліся, людзі ссыльных не пускалі... А як у хлеў зачынены трапілі, хіба, па-воўчы страху дзёрлі, пачуўшы жывёльнае цяпло?.. І цяпер я ступаю ў хлеў, як у боскія сені... І цяпер люблю раптам, як прыпадак, збедніўшыся, знайсці капейку... адчуць тую радасць ссыльнога дзіцяці, асалоду ахвяры... Люблю перайначыць чужыя сукенкі...

— Абавязкова, каб у кветкі, празрыстыя, бляклыя, бы пялёсткі сібірскай шыпшыны... — па-змоўніцку дабавіла малодшая.

Хто гэта зразумее, акрамя выбракаванага чалавекам дварняка?..

Згортваўся ў камячок яшчэ зялёны ліст на дрэве. Птушкі не памяталі дажджу, ягоных шляхоў, ходак, будавалі гнёзды ў вадасцёкавых конаўках, выводзілі птушанят. Іх потым, малых, бездапаможных, змывала. Празрыстыя цельцы, свяцілася наскрозь блакітным загубленая душа. Насцярожвае ў лесе нават сухі трэск страказінага скрылля, усё выдаецца, ляціць угору ад вялікага вогнішча, лопаецца, пырскае дробнае сучча. Выцягнулі з ямы, некім выкапанай на дзіка, ледзь жывога вожыка. Не прыходзіць болей, казалі, на суседні хутар лось, недзе, пэўна, ужо ўлажылі ягоную прыгожую галаву, закідаўшы ад лесніка ломам. Усюды, як на тое, дурныя знакі нічогага чалавека, быццам ён, гэты чалавек, і не тутэйшы, і наогул — не жылец. Сядзіць старая суседка на панадворку, лушчыць фасолю:

— А ці будзе яна мець для жызні на лета ўсё патрэбнае?— пытаецца ў Бога.— Не паравое, не набрала сабе сілы зерне...

Старэйшая, дабраўшы часу, садзілася за стол і пісала суправадзілаўкі кожнаму шчанюку, ужо былі напытаўшы людзей, якія возьмуць гадаваць. «Марцінік нарадзіўся ў 4 гадзіны раніцы 17 ліпеня» ... Чым карміць, як даглядаць, лячыць, калі захварэе, характар... Каб знайсці такую паперыну аб сабе, ездзіла неяк у Сібір, падымала дакументы, — і следу няма... сярод людзей... Сама сваёй рукой (рука, ведала, лёг-

кая) брала шчанюка з кошыка, каб замовіць, загадаць на добры лёс, адхінуўшы малога ад дому, дзе нарадзіўся. Яшчэ ўчора:

«Марцік, слухайся, каб цябе там ніхто не біў, не наказваў...» І ў слёзы, як не ўголас, хаваючыся адна ад адной, стыдаючыся. І сёння:

«Ты едзеш... да сябе дамоў...» Сказала і адхілілася ўбок, каб не сцебанула па вачах, бы йдучы за некім ззаду па гушчары. Каб аддаць не шкадуючы. Божа, а нялюдскае, ну якая тут жальба, добрых гаспадароў знайшлі, ды й сярод сваіх знаёмых!..

Тут не любілі адлучацца ад дому, не любілі й адлучаць. Забралі Мальту і Макуша. Аддаўшы Мірту, старэйшая хадзіла ад сцяны да сцяны, дом расхістала, быццам ірваліся путы пачуццяў, якія звязваюць з сусветам. «Як ціха навокал, ці я памерла ўжо?» — падумалася.

— Хопіць, я зачыняю гэты дзетпрыёмнік! Ханна Мурза застаецца!

— Як ты будзеш весціся з імі па горадзе — кожны ў розныя бакі?!. А выгульваць? Адныя мэнкі!.. Людзі падумаюць: ідзеш раніцай з начной варты!.. А ездзіць сюды ў набітым аўтобусе? У нас жа няма машыны!.. — спужалася малодшая, і было чаго, халадамі яны жылі ў гарадской хрушчоўцы, наведвалі вёску толькі па суботах.

— Супакойцеся! Гэта проста... паталогія... трымаць двух сабак! — не разгубіўшыся, зазначыла знаёмая ўрач з суседняга хутара.

Каб не пасварыцца, старэйшая звычайна выходзіла з дому, ішла да ракі. Вада загусла ад гарачыні, рака быццам не давала сабе ходу, стаяла на месцы. Пасадзілі былі на тым голым беразе вярбу — не ўседзела, выцягнулі, заламалі на дубцы, праганяючы кароў на выган. Мільгануў ў траве нехта ў галубовым — калыхалася, ўратаваўшыся каля самай вады, высокая сінюха. Побач у кустах круцілі ручку прыёмніка. Зноў пра тэракты ў Ізраілі, у Таджыкістане, у Гаграх. Ваююць,

змагаюцца... за што? Няма на свеце такой прычыны, каб хадзіць узакладкі з жыццём. Усё гэта ёй было падобна на жахлівую азартную гульню маладых мужчын, як карыда ці гонкі на аўтамабілях. Як толькі жанчына адважваецца пусціць на свет сваё дзіця?.. І яна павінна слухаць гэтых людзей, раіцца з імі пускаць шчанюка ці не?!. Сарвала ў садзе яблык, скура на ім нязвыкла цвёрдая. Усё жывое баранілася, хавалася ад пагібелі. Нават Ханна Мурза. Дзікая прывабная сіла заўсёды затрымлівала на ёй позірк даўжэй, чым на іншых.

Цела пруткае, не прытуліш да сябе, надта не прылашчыш. І вышыні не разумее, страху не баіцца, пырхне з рук неспадзявана, ледзь зловіш ужо ў паветры. Як з караня ўсё есь.

Ханна Мурза засталася. Сёстры дзівіліся самі сабе, што завуць яе, лашчаць тымі ж словамі, што і Марту. «Няўжо, нават сабаку магу любіць толькі аднаго?» — смяялася сама сабе старэйшая.

Яны абедзве былі аднալюбамі.

Парадзеў дым, недзе спыніўся агонь. Пэўна, ластаўка без памяці нізка нахілілася над зямлёй, растапырыўшы скрылле каромыслам, насіла з ракі ваду.

Пэўна, спраўдзілася тое, што нават пярун не запаліць ТВОЙ ДОМ, калі побач пад страхой лесу жывуць галубы...



# НА ЗЯЛЕНЫМ ЧАЎНЕ ХАРОНА

*Хіба шчаслівае жыццё павінна*
*канчацца смерцю?*
*Л. Галубовіч*

Яшчэ, памятаецца, пазалетась ці што, трапіўшы на гэтую сцежку, Данута ўбачыла чалавечы след, здзівілася — чалавек тут хадзіў звярыным крокам. Вытаптана дзень у дзень, але бы за першым разам, нанова, і не думаючы вяртацца назад. Перак карчы, багністыя луміны, галлё нізкае па твары з расой, з дажджом, і ніводнага скранутага з месца сука, ніводнай заламанай ці адхінутай галіны — чутка, старожка ходзіць. Сцежка сырая, каля самай вады. Хіба што сцягвала чалавека плынь вады, як топельніка, на глыбейшае. «Дурны Імполік?!.» — і злякацца не паспела. Ледзь заўважыла, шэрым ценем ад дрэва зварухнуўся на ветры. Зімовая шапка сярод лета, у паліто. «Мяне нешта, во, сцюжа бярэ...» — сказаў, бы перапрошваючы за недарэчнасць свайго адзення. Адно імгненне — і зноў, як заўсёды, вочы без пагляду, невідушчыя, бы адкрытыя ў сне. І пайшоў, як па паветры, высока падымаючы ногі, адчуваючы перашкоду аднымі ступнямі. Як можна зноў патрапіць на ранейшае месца, калі не трымаеш у галаве аніякай здумкі, мэты.

Тады здагадаўшыся, што гэта Імполікава сцежка, ледзь не войкнула, бы ўступіўшы на гадыню. Трохі вышэй, па сушэйшым беразе сярод чорных ствалоў, хадзіла яна сама — ейны ўлюбёны шпацыр у часы адзіноты.

Але хіба сцежкі вар'ята і мастака не ідуць побач?..

Людзі казалі, сталася з ім, адняло розум пасля смерці маладой жонкі. Казалі, была звычайная жанчына, аніякай харашбы, дробненькая з твару, такіх, як гароху ў гарохаўі, жаніся

другі раз, і трэці, маўляў, няма прычыны, от блазната, не болей. Ніхто не заўважаў іхняй вялікай любосці. Ніхто надта не суцяшаў, ніхто, хай сабе і моўчкі, не выслухаў, не выгарнуў з яго да сябе абедзьвума рукамі пад ногі ягоны сум, як жар, як пякотку. Не вывеў за руку з таго смяротнага шляху. Чалавек іншы раз не можа сам сысці з яго, збочыць. Імполік і ўдзень і ўночы, і год і два ўсё ішоў за жончынай труной, ззаду, дапытваючыся: навошта... куды дзелася... як без яе жыць... Старое паліто на ім — пала за палу, без кашулі, на голае цела, выгнілі гузікі. «Здраства і толькі вам...» — скажа пры сустрэчы. Натрапіцца якраз, ідзе праз вуліцу з агарода з рыдлёўкай у руцэ, крок падламаны, хісткі, паглядзіш услед — пуста вакол яго, ні людзей, ні скаціны, і паветра быццам няма. Шкляная пераборка, чалавек кратаўся за ёй злоўленай істотай, тая пустэльня навокал, у якой ужо не зробіш ад знямогі аніводнага пэўнага руху. Трапіўшы ў ягоную паветраную яму, сэрца на момант праваліцца, адчуўшы накшую вагу свайго цела. Разрэджаная прастора, зжыта вакол усё чалавечае, але надзіва не крануты, не скажоны вар’яцтвам твар: прыгожы, смуглявы не ад сонца, смуга і ў вачах, кучары густым сівым дымам. Казалі, бабка ягоная шляхцянка. Пэўна, у ім іграла перад зводам ейная апошняя кропля крыві, ашчадна захоўвалася фамільнае падабенства. Яшчэ вісела распяццем на сцяне бацькава скрыпка.

Паўзла праз парог трава ў хату.

Чалавек зламаўся, слабы, не пераадолеў страту, не адужаў, зганьбілі людзі. А што, калі яны самі проста не заходзяць да глыбіні ўсведамлення смерці, не пасцігаючы ўсяго жалю расстання. Спыняюцца, лечачыся часам, суцяшаюць сябе вечным жыццём, дзе яны яшчэ змогуць сустрэцца з роднай душой, убачыцца, пакорліва ссылаюцца на боскую волю. Абы толькі заціснуць рану, загаіць нясцерпнае. І з палёгкай вярнуцца да ранейшага жыцця, як з цяжкай дарогі: выпрацаць у хаце, схаваць ад напамінку тое-сёе, плакаць няволле, бо пакойніку будзе там мокра ляжаць... І жыць далей.

Сама Данута нічым гэтым не ратавалася, пахаваўшы адзіную дарослую дачку.

Па нешта трэба было падняцца ў верхні пакой. Адчыніла дзверы — дыхнула сцятым паветрам, тым духам ад самага пачатку здарэння, калі бяда ўвайшла ў дом. Спынілася ў нерашучасці. Бы заспела тут згараванага чалавека, які седзячы задрамаў у крэсле, і прачнуўся, калі рыпнулі дзверы. І слёзы ягоныя яшчэ не высахлі. А яна глядзіць на гэты пакой, на чалавека у крэсле неяк, бы збоку, — і адчула сваю здраду. Няўжо стала забывацца? Тут яшчэ не стаяць свежыя кветкі, яна прыносіла іх у пакоі без радасці, як пад прымусам. І нагогул жыла па нечай чужой звычцы. Нешта перастаўляла, перабірала на пісьмовым стале, забыўшыся, па што сюды прыйшла. Траплялі на вочы запісы на кожны дзень. «Падняць з падполку драбіну, прасушыць ад зімы на сонцы... адрамантаваць вароцейкі ў лес». А вось рэцэпт: «...кожны агурок загарнуць у смуродзінавы ліст, усё перасыпаць астрагонам...» Такія будзённыя знакі, цяпер як улікі апазнання, што тут дагэтуль, да нядаўняга часу жыла зусім другая жанчына. Амаль бянтэжачыся, бы чужое без дазволу, разгарнула свой дзённік. «Хмарная раніца, і так да вечара, не згадаць, якая пара. І раптам на самым захадзе — сонца! Блізка пырхнула і знікла. Не пайдзі я гуляць з сабакам на пагорак, не знайшла б сённяшні дзень, маленькі, асенні, злоўленай жоўтай птушкай з маёй кішэні...» Шмат шчаслівых запісаў, без колераў смутку, без аднастайнасці будзённага. Почырк то дрыготкі, рабаціннем па вадзе, то буйны, круглявы, вінаградзінамі ад прыліву пачуццяў. У куфэрку рознакаляровыя стужкі, матузкі, рабыя каменьчыкі, пёрка птушынае — усё прыхавана любоўна, як нацельны амулет пад далоняй ад чужога вока.

І гэтым можна было цешыцца? Гэтым можна было жыць?.. Чым далей, тым асцярожней дакраналася да рэчаў, да рознай дробязі, пачуваючыся ў сваім доме пастаяльцам, які зняў чужое жытло, пэўней было сказаць, чалядніцай. Тут ёй ужо

анічога не належала, анішто не супадала з ейным настроем. Іншы раз такая сцятасць, цесната, такая патрэба вярнуцца назад, да ранейшага жыцця, як у гадзіну скону, калі доўга пакутуе, паміраючы, вядзьмарка. Парушце столь! Адарвіце бэльку! Душа не можа сама адысці!..

Стук у акно ад панадворку. Яна ўскочыла, увесь час пільнуючыся бяды. Што ў каго здарылася, яшчэ ж добра і не развіднелася? Вось, выдавалася, нехта закрычыць на вуліцы, рвучы на сабе валасы.

— Імполік?!.

— Дайце закурыць....

Такой парой турбаваць людзей, злуецца яна.

— Хіба раніца? Каб я тое ведаў, не прыйшоў бы, — шчыра, памяркоўна гэтак гаворыць, маўляў, уважыў бы, а як жа.

Яна хавае сумную ўсмешку, забаўляючыся тым, як лёгка сама трапляе ў ягоную пустэльню, дзе скасаваны тычкі пазнатку на дзень, на пары году. Толькі, во, пільна ўспомніць, дзе хвілю назад пакінула свае цыгарэты, каб хутчэй развітацца з Імполікам. Вясной ён галадаваў. Па-воўчы шукаў сабе есці, рабіў патраву ў чалавечым статку. Да відніцы, крадучыся, абходзіў вёску: дзе што блага ляжыць, хто спіць, не зачыніўшыся. Яна сама яшчэ не клалася ад учарашняга.

Ноч была светлая, не хацелася нічога запальваць. Святло ад поўні ішло густым зеленькаватым патокам. У ім рухацца, хадзіць па доме лягчэй, бяздумней, бы па беразе страхі.

— Ты ўжо ўстала? — прачнуўся муж.

Даўно не заўважае ейнай адсутнасці, калі сядзіць побач, калі рукі знаходзяць ейнае цела. «Скажы мне што-небудзь...» — папросіць укленчыўшы. Словы кахання даўно выгнаны з ейных вуснаў, з ейнай мовы яшчэ напачатку замужжа... Вядомы хірург, у яго тэрміновая камандзіроўка па хуткай дапамозе, начным цягніком. У Гародню. Поўнач... адна гадзіна... дзве з чвэрцю... дзве з паловай. Ёй крэўная патрэба суправаджаць яго ў думках, не спаць, нічога не рабіць, быццам

таксама з ім у дарозе, патрэба ўвесь час трымаць ягоны шлях на памяці, нічым сабе не замінаючы. Аберагаць, ахоўваць, і тады з ім нічога не здарыцца... Ён — у Брэст.

«Бюро даведак? Скажыце, ці даляцеў самалёт да Брэста?» — пыталася ўслед, пужаючыся самой сябе. У адказ абыякавы механічны голас, якраз тое, што трэба, калі даюць збой нервы... Вяртаўся амаль заўсёды пазней, без папярэджання, пад прыгнётам ейнай штохвіліннай аховы, любові. Вадалей, пад легкадумным знакам паветра, аніводнай парушынкі ў вачах, што здрадзіў ёй, прыйшоўшы дадому ад каханкі. Сорамна гаварыць да яго аб каханні, як брыдка было б, да прыкладу, адчуваць пажаданасць да хлопчыка з царкоўнага хору, у катарага яшчэ і пол не абазначыўся. Адчувала сябе намнога старэйшай у сваіх пачуццях. Вучылася кахаць украдаючыся, нябачна, як з атрутай, і сама ж атручвалася, любячы жыць усёй душой. Ужо яна і да акна не падыходзіць, калі ён ад’язджае. «Скажы мне што-небудзь...» Заўсёды запросіць нечакана, з той гаворкі, з таго даўнейшага, на самым кароткім пачатку. Яму патрэбна было ўпэўніцца ў ейным каханні. Яму патрэбна станка, пэўней кажучы, стойбішча, дзе заўсёды можна было б перачакаць непагадзь, свае любоўныя няўдачы, глынуць чыстай вады й зрэзаць заламаны капыт, і каб ніхто не дапытаўся, адкуль ён і куды зараз. Ніякавата адварочвалася, пераводзячы размову. А ён зноў стоцьма ляцеў у невядомым ёй напрамку, шаўковым ветрам абдымаў нечыя каленькі. Ён не ўмеў пакутаваць. Што яе цяпер з ім аб’ядноўвала? Адзін з нямногіх, а можа, адзіны, суседства якога раскрывала ейную асобу: прымушала ўвесь час напружана шукаць сілы, дабываць сэнс, перажываючы здраду, здзекі, нават натхненне. Умацоўвалася каля яго, як ля выбранага назаўсёды бажка, які пасылаў ёй усё новыя і новыя выпрабаванні. І не адчувала сябе пакутніцай. Менавіта, бажок, жорсткі, таленавіты, не па-чалавечы заблізка да свайго сузор’я — супадала па гараскопу ўсё ягонае жыццё, і нават парадак і настрой дня.

Хіба па гэтым можна быць шчаслівай, каб не дачка... А ёй жа ўдавалася.

У хвіліны адчаю садзілася ў падараваную ім «Шкоду», ехала ў Мінск да найлепшай сяброўкі Алены, анідзе не збаўляда ход, не звяртаючы на святлафоры. Пераступіўшы ейны парог, адчувала палёгку і ад самой дарогі, ад рызыкі быць затрыманай. Размова набывала вясёлы, бесклапотны характар пра літаратурныя навінн, моды, ні слова пра мужа... На хаўтурах дачкі Алена стаяда з ёй быццам побач. І адышла за парог разам з усімі, хто прыходзіў на пахаванне, разам са спачувальнай хваляй, не даючы ёй аніякага права папрасіць застацца. У мужа быў твар незаконна затрыманага на гэты раз злосніка, ён збіраўся ў тэрміновую камандзіроўку.

Якраз учора Алена наведалася з яшчэ адной сяброўкай. Учора быў не па-вясноваму надта цёплы дзень. Алена ў саламяным капелюшы, перавязаным каля брыля істужкай. Пагляд блізарукі, стойка збочаная, бы ўвесь час перад камерай, як манекеншчыца. Круглявы твар без адзінага следу жыцця. Падышла да вады, пачала мыцца. Мокрай даланёй па шчацэ да падбароддзя, ледзь дакранаючыся, бы амывала хрускі ружовы кітайскі ліхтар. Гэтыя сяброўкі толькі дзеля весялосці, яны, вядома, не да яе, а да той гаспадыні, што жыла раней.

Якая нярупная сёлетняя вясна, бавіцца недзе за гарамі, за марамі. Зязюля і тая кукуе нязвыкла блізка. Няўжо ў вёсцы? Сярод драўляных хат, хлявоў, платоў, гук азваўся ўжо і ў хаце. Як у пустым кубле — выбраны, спажыты за зіму крупы, зерне, мука, няшчыльна зачынена вечка ад мышэй, каб выветрыўся затхлы дух. Іншы раз яе спыняла знаёмая мелодыя, білася ў шкло, знікала. Толькі шоргат скрылля матыля, і на руках рознакаляровы пылок. Чым мацней веснавыя галасы, ярчэй краскі, тым мацней глухата, немагчымасць адазвацца, загаварыць. А кропля дажджу са страхі разбівалася аб камень, як вялікая шкляная пасудзіна. Няўпэўненымі крокамі па хаце, з хаты за парог. На панадворку, заціснуўшы маркоўнік, шчавук, узышла нізенькая трава, густая, донная.

Доўга спалі зернюкі, чакаючы во такой маруднай вясны, і хутка закрасавалі. На ёй, па зялёным днішчы, зіхацелі ўпаўшымі зорамі кветкі маргарытак. І па межах, дзе было не ўзарана, скрозь. Не памятаецца, каб гэтак калі яшчэ цвілі.

Гойдаўся пад ёй дрыготкі зялёны човен Харона. Яшчэ самае разводдзе, вады ў рацэ за ноч пабольшала. На тым беразе стаіць наважаны ад учарашняга па каленькі ў вадзе нечы конь. Няўцямна ступіла на мост, мацае нагой, ці ён яшчэ прыбіты, ці ўжо гойдаецца, як плыт. Каламутная плынь накідваецца на вочы, падварочвае сэрца, увесь сыходзіш разам з ёй пад бярвенне. Конь застаяўся на адным месцы, заграз, як тарантас, ледзь зрушыла. А што калі за гэты час знясе мост і яна не паспее вярнуцца? Толькі перайшла, насустрач Імполік, з вядром — куды і па што? Складаецца самае неверагоднае: «Пэўна, у маліны...» А ён:

— Што, у маліны хадзіла?

Гэтак мы думаем адзін аб адным. На момант аж у вочы ўесца, патыхне ад яго жывым, гадамі не змытым нацельным духам.

— Калі б не перайшла, я вядром бы раку вычарпаў! — крычыць наўздагон.

А што яму варта, царкву за вёскай ён ужо будуе, выкапаў цэлы кар'ер. Назад з лесу будзе несці адну, не болей, лясіну на дровы. Ніколі не запасіцца, каб і падкінуць у печ спатрэбілася, то зноў у лес пойдзе. З куста на панадворку вылецела птушка, юркнула за вугал, пэўна, чужая, хавалася ад дажджу, спяшалася ў сваё гняздо. Вільготна, холадна, сонца, як у печы, за заслонкай. «А што, калі не вярнуся назад... да ранейшага жыцця?..» Але яна не хоча супраціўляцца болю. Хто гэта казаў, маўляў, пасля музыкі, жывапісу, паэзіі — боль чацвёртае з мастацтваў. Мартын Вальзер? Хіба адзін чалавек мог зведаць усе шляхі чалавечага смутку?

Па нечыяй чужой звычцы ішла ў лес адразу за домам. Учора бачыла сляды дзіка, і сёння падрыта, зусім свежая ралля на дзірване. Калісьці любіла паспытаць той першародны страх

перад другой дзікай істотай. Страх, гранічны з павагай да невядомага табе, страх, які звязвае тваю волю. Лес выдасца чужынцам, ніводнага знаёмага куста, ні сцежкі, дрэвы сышлі з месца, загарадзіліся, лес здзічэў. Ужо ён належыць толькі гэтаму зверу, быццам нарэшце вярнуўся сюды стары гаспадар і ўсё пераставіў, як мэблю, па-свойму. Толькі на першы момант. Потым страх асядае, асядае, як пад рукі вядуць цябе, знямоглага, сцішанага. Напоўніцу заглынеш ляснога духу. І слова лішняга не прамовіш. А іншы раз лес да цябе толькі што не гаворыць. Стоена чуеш ягоны свежы подых. Спакойна і ўтульна, бы мы нагаварыліся калісьці, склаўшы галовы, там, уверсе, даўно ведаем адзін аб адным ўсё патаемнае. Ступіўшы за ягоны парог, можна і не вітацца, бы жывеш тут разам заўсёды, і начуеш. Елкі тутака, як нідзе болей не бачыла, калісьці заламаныя бурай, разгаліноўваюцца на два вярхі, а то і на тры, стаяць кандылябрамі, як у нетутэйшым палацы. Лес — палац. Туманы ад ракі заносяцца да самай высокай елкі на пагорку, дзе дарала б убачыць даўгі стол. Карункамі да долу, падзорам ветраніца дубраўная, скрозь шалупінне арэхаў, шышак пасля начнога балю.

— Белая пані! Маленькая пані ў белым! — крычаў неяк у гарачцы Імполік, летучы праз ноч да лесу.

Якраз у гэтым месцы ўзыходзіць поўня, падымаецца з-за столу паўначой, стросшы з пеляны шалупінне. Якраз самая тая пара, калі мужчына можа ўбачыць, пазнаць у ёй на момант жанчыну, начную палюбоўніцу, таямнічую пані ў белым, якая зводзіць маладых і старых, вясёлых і засмучоных. «Я польскі кавалер...» — гаворыць сам да сябе Імполік, доўга ходзіць за агародамі, супакойваецца, склаўшы як нябожчык рукі ў рукавы паліто.

І зараз цвітуць анемоны — ветраніца дубраўная. Карчэўе, пні — скрозь адным бялюткім колерам. Чыстыя пялёсткі, без адцення, без пражылак. Абы прыгрэла сонца, ападуць на зямлю яшчэ да вечара з дзіцячым тварыкам. А ёй усё самота. Усё ёй часовае навокал, напамінак аб кароткім жыцці. Ніхто

тут не сеяў, не даглядаў, не прыбіраў, нічога тут не належыць чалавеку. Уваходзіла ў квітнеючы вясновы лес, як у чужы сад. І пара ўжо вяртацца?!. Ейнае асабістае жыццё скарацілася да імгнення, дагэтуль быццам і не ўсведамляла сваёй смерці. Паветра вечнасці, вядома, надае гэтаму свету бясконцасць. Але яе не суцяшае магчымасць яшчэ аднаго жыцця. Яна сумуе па нязменнасці, па пастаянстве месца, вось гэтага, каля лесу, пастаянстве гэтаму дому, мужавай вернасці. Яна абцяжарана патрэбай пастаянства. Будаваць дом — назаўсёды, кахаць — назаўсёды, а не на нейкі тэрмін. Каб стукнуў па бервяне дома, казала суседка, то пэўна б кроў выступіла, гэтак цяжка мужык будаваўся, яго самога ўжо і на свеце няма. «А што, каб мы не сустрэліся?» — іншы раз дапытваўся ў Дануты муж. Яна ніколі не сумнявалася ў сваім выбары, давярала выпадку, любіла ўсёй душой, што толькі ёй ні траплялася, радасна абжывала самыя няўклюдныя куткі быцця. Шкатулкі з істужкамі, яркія пушачкі ад падарункаў, скарбонкі, напамінкі кожнага дня, бы пялёсткі калісьці падараваных кветак. Ніколі не здымала з рукі дарагі заручальны пярсцёнак, калі й рабіла чорную работу, сцёрся да срэбнай ніткі, вось-вось разломіцца, згубіцца. Адну такую палавінку, залатую, знайшла ў зямлі, калі толькі купілі гэтую сялібу. Дакранулася да далоні незнаёмай жанчыны, пераняўшы ад яе веравызначэнне — не разлучацца.

Неяк трапіўшы з дачкой на могілкі, хадзіла, разглядалася, шуткуючы, выбірала сабе месца. Каб на пагорку, каб сонца доўга не заходзіла, быццам з акна будзе ўсё гэта бачыць ці з высокага ганка. І раптам фотаздымак на помніку. Жанчына глядзела ў паўабарота, бы азірнуўшыся на яе, насміхалася і страшыла, не падпускала блізка падысці занадта вясёлую, шчаслівую. Так, яна будзе жыць да глыбокай старасці, якая ўяўлялася таямніча. Як бывае ўлетку за вячэрнім чаем, на змроку, калі не хочацца запальваць святло. І толькі залатыя сполахі бліскавіцы на ўскраі неба, ледзь чутны гром далёкай навальніцы ўзбуджаюць дзіцячы страх, амаль тэатральна, лёгкай трывогай агучваюць ейнае вясёлае застолле.

Ей наканавана іншае: знікнуць пахі, гукі, колеры, як пры канцы свету, яна будзе доўга-доўга плыць у зялёным чаўне на той бераг.

У вёсцы стаяў голас, аж у лесе чувалася. Людзі йшлі біць Імполіка, не вытрымліваючы выпрабавання, спасланага Богам. Дапільнаваўся-такі, калі суседка адвярнулася ад хаты, украў бутэльку гарэлкі. Сядзе іншы раз напроці, нерухомы, шэры, як воўк, вачэй не спускае з акна, пакуль агонь не пагасне. У адным канцы вёскі ўкрадзе, у другім пахваліцца. «Украў — не скажу ў каго!» — шчыра карцела пахваліцца ўдачай. Сама бачыла, як сёння нешта хаваў на дрывотні за суседскім хлевам. Хітра паходзіць некаторы час наводдаль з пустымі рукамі, каб трапіць каму-небудзь на вочы паражняком, і забраць крадзенае ўжо тады, калі сыдуць пошукі злодзея. Білі, паваліўшы на зямлю, палкамі, нагамі. Імполік бараніў рукамі твар, енчыў, не прызнаваўся. Білі за тое, што праз яго даверу не маюць адзін да аднаго, што трэба хату пільнаваць, думаючы на благое, а тут сяўба, тут касавіца, тут і жніво. Білі, каб не абсеў, не адужаў іх, старых, гэты малады дурань. Кідалася заўсёды бараніць, цяпер во не дабегла. Першымі за мужчын адваліліся ад яго бабы.

— Можа, і ўпраўду, не ён, — перагаворваліся на вуліцы астыглымі галасамі, маўляў, у вёсцы поўна алкаголікаў.

Няхай лепей сумняваюцца, думала сабе. Пра тое, пра сёе, і забыліся пра Імполіка. Стаялі, варажылі, ці прыляціць сёлета бусел на старое гняздо. Абшушкаўшыся, цёплая хусткавалёнка ў каторай на галаве ад зімы. Паўночныя людзі, старыя жанчыны. Не на поўную веру тварам да цяпла. Як лёгка, да плачу лёгка падлічыць свае вёсны, гады! Гэта не на поўдні, дзе цвіце лімоннае дрэва, а побач з кветкай вісіць спелы плод. Бы на навагодняй елцы: і пернік, і пеўнік, і анёл з воску. Там, пэўна, чалавек не так заўважае свае гады, жыццё, пэўна, як навагодняе свята, яркае, апавітае бліскучай сонечнай мішурой. Мае бабкі, мае зязюлькі, мае гаротніцы, гэтак пяклуюцца ўсё жыццё, урабляючы зямлю, некаторыя даўно кукуюць без му-

жыкоў і без коней! Вунь і найлепшая ад усіх Надзя. Хочацца даць уголас, гэтак хутка сышла ейная прыгажосць, адны вочы, сінія, чыстыя, бы ўвесь час глядзяць на анёлаў у небе, што плятуць вянкі. Хутка Вялікдзень... Старыя жанчыны ўжо ў тонкіх празрыстых сукенках. Наскрозь віднеецца скрыўленае цела, шэрая скура, ногі апавітыя венамі, як дзікім хмелем. Кожная напроці сваёй хаты. Стаяць нерухома, як старыя вясновыя дрэвы, апладнёныя цяплом сонца, ветраюць падалы квеценню... Данута схамянулася, бы апрытомнеўшы: гэта ж сад! Як жа яна яшчэ не дасталася да такой пары да старога панскага саду? Не затрымлівалася доўга каля баб, як раней. «Ты прыходзь да нас начаваць, хоць нагаворыцеся», — смяяўся сусед. Незлічона, колькі на дзень прыбягала звычайна да Надзі пагаварыць. Цяпер заходзілася, калі толькі трэба стрэмку з пальца выцягнуць.

Пад вечар адну з тых баб як не аблажыў паляруш, здранцвела цела, адымала мову. І не хацелася на тым разе бегчы да яе, ратаваць, шукаць лекі, як звычайна рабіла, жывучы ў вёсцы, марудзіла. Бы там над хворай вяршыўся вышэйшы за людскі суд. Няхай — трохі патруднуе, няволле да такога згубленага чалавека, як Імполік, прыкладаць руку.

У сад ісці трэба дабраць час, ён за ракой, за пагоркамі. Пагоркі высокія, лабатыя, пакрытыя свежай травой і самі выдаюцца свежымі, бы толькі што ў гэтым месцы спыніўся рух гарачай зямлі й ты заспеў іхняе нараджэнне. Яшчэ ў вёсцы каля сваёй хаты стаіць, пераймае кожнага Імполік, адкупіце, кажа, у яго талоны на святло, бо яму няма за што вярнуць украдзеную гарэлку. Апантаны прыродным пачуццём гонару (бабка ж шляхцянка), ён іншы раз праз ноч лезе праз плот, яму нясцерпна пільна аддаць пазычаныя грошы ці пушку сярнікоў. Патрэбна вызваліцца ад чужога.

— Ці ж хораша красці, Імполік...

— Я, можа, хацеў пазычыць. Трэба было дома быць! — адкажа, што і разумны не здумае, вось, маўляў, які ён ёсць, вясёлы рызыкант, свойскі чалавек, а вы тутака здодзея шукалі.

Нешта зачаста ён на ейнай дарозе.

Сад таксама на пагорку, яблыні-векавухі па-жаночы прысадзістыя. Яблыкі не здзічэлі, смак з кіслага на салодкае, маладой рошчыны з дзяжы, — свежая раўгеня. Не заўсёды, прыйшоўшы сюды, трапіш у ягоны настрой. Як не адразу можаш далучыцца да мелодыі, не падбярэш голас, чуючы побач нечый спеў, што зводзіць цябе падпяяць. Бывалі разы, бы прыйшоўшы, нікога тут не заспеў, сад маўчыць, не адзываецца, ходзіш, як пад завешанымі вокнамі, і клямка зашчэплена, закладзена на сучок, даючы знаць, што недалёка гаспадар адышоўшыся, садзіся на ганку, чакай. Сцежкі хутка губляюць памяць, зарастаюць ляснымі бальзамінкамі, мададым маліннікам. Улетку ў алеях скрозь лісце калышуцца празрыстыя цені, нехта ідзе ў белых адзеннях, вяртаецца, зноў адыходзіць, гуляючы. Заіржэ наважаны конь, ускалыхне ўспамін, чаго і ў вочы не бачыў. І гэты шум, і гэты гоман, калі толькі адныя дрэвы паміж сабой ці з птушкамі — без чалавека. Як у манастыры, дзе абы зайшоў за агароджу, моцна не загаворыш, тут толькі птушкі галасней за чалавека. Сад сам па сабе.

Паднялася ад ракі на пагорак... сад ляжаў на зямлі. На момант апанавала такая глухая ціша, бы на тваіх вачах заламвала зімовая бура дрэвы. Яны павольна нахіляюцца долу, абапіраіючыся на расахатае галлё, трашчаць напятыя вены, сасуды. Падбягала да аднаго дрэва, да другога, а можа, яшчэ магчыма нешта зрабіць, катораму дапамагчы. Уверсе без голасу хадзіў вецер. Ніколі не ведалі, ніхто ў вёсцы ўжо не памятаў, колькі яны маюць гадоў. Цяпер відаць, што аднлеткі. Сівыя мёртвыя галіны пераплецены з жывымі. Раптам пасярод разлому відушчае вока, кара лупатымі вуснамі вакол чорнага роту. То голае цела з дуплом запалага жывата, старэчая нявінная плоць кучаравіцца сівым мохам. Некаторыя яблыні яшчэ трымаліся на адным тонкім раменьчыку скуры.

Сюды ўжо нельга зайсціся без смутку, гуляючы, як у юнацтве на могілкі.

Хацелася ці то плакаць, ці то спяваць, далучаючыся да знямоглых дрэў:

Выйду я ў сад белым маем.
Абыйду сад смутным краем...

Суцяшалася сваім захмялелым голасам. Даўно нязведаная раўнавага, палёгка, ужо быццам і не так цяжка, і не так жалобна. Як на памінках пасля другой, трэцяй чаркі, калі загавораць усе разам, мацней, абдымуцца, каб захінуць пустое месца за сталом.

Ніхто з людзей ёй так не патрапіць.

Вярталася, хадзіла па панадворку, не зводзячы вачэй з маргарытак пад нагамі. Маленькія кветкі то гусцелі нябеснымі бегамі, то рассыпаліся рэдкімі зоркамі, зырка свяціліся ў цемры. Гэтым часам прыляцеў бусел, пэўна, ён прынёс з-за мора напамінак аб старыжытнай грэчаскай легендзе: маргарыткі ўзыходзяць па слядах Дзевы Марыі. На момант перад цудам даверліва, звыкла ўзрадавалася ачахлае сэрца.

— Вой, як у цябе, Дануся, хораша! — дзівіліся людзі. — Дзе ты брала гэтулькі насення?

— Па маім панадворку гэтай вясной хадзіла Багародзіца... — адказвала.

— Што яна гаворыць?!. Што гэта яна гаворыць?!. — дапытваліся адзін у аднаго розуму, чуючы нячутае.

Перагаворваліся, пераглядаліся паміж сабой, успудзіўшыся, ужо быццам стоячы за ейнай спіной. І яна сама была задалёка ад іх. Душа перасялілася на незнаёмае месца. Скрозь чысты шэры камень, падстрэшшам нізкае неба. Вызваленая ад усіх пачуццяў — сяброўства, кахання, ад усіх абавязкаў, анічога нажытага, хоць ты з пальца вазьмі выламі. Толькі адзінота творцы.

...Тым летам на выставе шмат гаварылі аб ейнай новай карціне.



# АЗЯРОД

Ад аўтобуснага прыпынку нейкіх крокаў з пяток нашу Зіну падвозіў ужо, едучы дадому на кані, сусед ляснік Хведар. Сядзела з ім на возе плячо ў плячо, па-свойску, быццам закалыханая доўгай няроўнай дарогай, глядзела перад сабой моўчкі, бы ўжо і нагаварыліся, і насядзеліся, і ногі зацяклі, здранцвеўшы. Не памятаецца, каб дзякавала, што падвёз, злезла з воза як да сябе ў двор, як на сваім кані. Спадніца-бантоўка пругка разбеглася гармонікам.

Гледзячы на яе, брала нейкая весялосць. Стаяла вясна. У блізкім лесе кукавала зязюля, потым засакатала курыцай, сагнанай з шаста, засмяялася. Адчыніш дзверы й замінешся на момант: упускаць ці не — ляціць у веснічкі рознакаляровы матыль, пэўна, самы першы гэтай вясной, як госць.

Праз якую хвіліну, не болей, ветрам, бурай праз вокны, праз дзверы на кустах шыпшыны, на плоце віселі, ляжалі посцілкі, падушкі, коўдры, розныя транты, ахапкамі, па-вясковаму, проста на траве. Нічога не пытаючыся, Зіна мяла, мыла дом. Яе нараілі з горада, маўляў, бярэ нядорага і вельмі ўвішная. На дачы да нас чакаліся неспадзяваныя госці, а тут такая няўпраўка пасля зімы, і малое дзіця на руках. Я стаяла пасярод хаты, як у віры, не маючы ні сілы, ні волі нешта зрабіць сама ці падказаць Зіне, параіць. Дом паступова пераходзіў пад ейную ўладу.

— Я ж на самой справе чарнявая. Але сёлета ў модзе колер чырвонага цюльпана! — крычала яна з суседняга пакоя. — Не чула? Бо на Камароўцы гэтая фарба ў шпікулянтаў самая дарагая!

У буфеце старчаком, навідавоку ўжо стаяла ўсё тое, што мае бляск. Наш любімы гліняны посуд схаваны за дзверцамі,

не відаўся. Паліваныя латкі, церніцы, збаны кочма пакаціліся назад у мінулае стагоддзе, а можа, яшчэ і далей. Нешта білася, трашчала пад нагамі чарэп'ем. Затое крышталь, як блакітны агонь, Зіна несла ў абедзвюх руках, захінаючы ад ветру. Выдавалася, вось-вось нарве гэтая жанчына буру. І праўда, раптоўна падняўся вецер, блізка, якраз над хатай, пэўна, ляжаў раскінуўшы полы скрылля ў нашай паветцы, адкуль толькі што выбегла Зіна. Узвярэдзіўшыся, бура падхапіла клён над студняй, круціла яму галаву, а яблыні маладыя ў садзе і не чулі, як нешта рэкнула старая дзічка, адвалілася галіна ад камля. І зноў ціха. Цвіце сад, развязваюцца вянкі на дрэвах.

— Каб мне не наследавала, няхай падлога высахне! — ляцела Зіна насустрач, варта мне было скрануцца з месца. — У аднаго банкіра ў залеццi я прыглядала за ягонай дачай. Дык прыедуць на якую хвіліну з гасцямі, насмецяць — і паехалі! А ты зноў прыбірай! Што? У ваду нашатырнага спірту, каб шкло блішчала? Не-не! Я крэпка разбіраюся ў гэтым дзеле!

Апошняе яна паўтарала кожны раз, як толькі я збіралася запярэчыць ці параіць. Хутка я ведала пра Зіну амаль усё. Муж ейны, цясляр і сантэхнік, узяў яе яшчэ да арміі, гадамі ў вайсковым хадзіў, пакуль штаны не купіў. Робіць без аддухі, каб грошы не зводзіліся. Што, маўляў, цяпер чалавек без грошай. Усё каб як у людзей было. А што як у людзей? Каб і кватэра, і машына, і дача! Здыме целагрэйку, прыйшоўшы з работы, кажа, на! пасушы, а яна пытаецца: хіба там дождж быў?! Адзежа ад поту мокрая. Хто дык краў, а яму ўсё трэба было зарабіць. Зіна спачатку смяялася з гэтых дач. Людзям давалі на балоце, скрозь лаза сядзіць, а яны тут дом ставяць. Аж далі й ім кавалак, паехалі глядзець. Зірк — грыб сядзіць, падасінавік, ступілі яшчэ — баравік! Не, тут далёка і хадзіць не трэба, падабалася месца. Усё цяпер ёсць, хопіць, але вось скарацілі яе на складзе, дзе працавала, вымушана была даць аб'яву ў газеце, маўляў, выконвае розныя паслугі, мые вокны, прыбірае. Часцяком выпадае наймацца разам з мужам. Але ён як раб божы, выслугоўваецца, кожнай гаспадыні хоча патрапіць, злуецца Зіна. Яна

не любіць двудушнасці, маўляў, якая ёсць, такая і добра. У людзях ён такі культурны, такі памяркоўны, што гаспадар ні скажа, усё моўчкі выконвае, і абутак здыме ў чужым доме без напамінку, і попел з цыгарэты не страсе на падлогу, бронь божа! «Дык ён жа за грошы працуе, не за ласку, трэба і гадзіць...» — моўчкі пярэчу сваёй служанцы, як сябе называе Зіна, баючыся, каб гэтая бура ненарокам і пер'е з падушак не пусціла па ветры.

— Дагэтуль я наймалася ў адной бізнесменшы. І гатавала ёй ежу, і сама купляла прадукты, вымяркоўвала, як сабе, каб дзешавей было. Вядома, гэта сапсуецца, тое скісне, тады яна: «Я сама — варона на кухні, нашто мне яшчэ адна такая самая?..» І разышліся. Зараз у тым доме служанка з дамешкам вышэйшай адукацыі, — смяялася Зіна. — А мне ж гэтае ўменне служыць па людзях перайшло, можна сказаць, у спадчыну, ад мамы, каб ты ведала. Яна вярнулася з Германіі, немец быў звёзшы ў вайну. Ні хаты, ні бацькоў жывых. А тут і я знайшлася, ужо ёй ганьба. Узяла яе да сябе на гаспадарку дакторка Стэфанія, палячка, сама гарбаценькая, некрасівая. А муж ейны напроці надта пекны, намнога быў маладзейшы, з простых, пэўна, пакваліўся, што добра жыла, пані. Штоноч па бабах гойсаў. Дзяцей у іх не было. Стэфанія, як цяпер бачу, возьме мяне да сябе ў ложак, я прачнуся сярод начы ўся мокрая ад ейных слёз. Гэтак кахала таго бадзіню. Людзі не спагадалі, маўляў, брыдка сохнуць немаладой бабе, якая там ужо ў яе любоў... Скора і памерла. А перад смерцю: «Гэльця, на маму, ты дом мой не кідай, яго не кідай, ён, маўляў, толькі дзеля забавы, за яго чужая жанчына не пойдзе, сапіўся, разбадзяўся. Ты яго дагледзь», — прасіла. Апошняя ейная воля... І мама не аслухалася... Распісалася... Але ж ніколі да сябе не пусціла, добра ведаю...

Гудзела галава ад нязвыкла голаснай гаворкі, Зіна гукала па пакоях, як у лесе. Спаслаўшыся на тэрміновую працу над кандыдацкай, я схавалася ў кабінеце. Як ужо яна парадкавала побач:

— Хачу бліжэй быць, каб пагаварыць...

Зіна расказвала пра сябе без асаблівага даверу, так палошчыцца на нашай рацэ каторая баба: твар, ногі пасля бялізны толькі памочыць — і лёгенька ёй, вернецца дамоў, бы ўся скупянулася.

Толькі, на жаль, Зіна мала што памятала пра Стэфанію. Нешта ўнутры мяне дапытвалася ўвесь час, хацелася яшчэ і яшчэ раз бясконца слухаць пра яе, як чароўнае паданне, як сумную, страшную казку ў дзяцінстве на ноч... У якой у змрочным палацы і ўдзень не адвешваліся вокны, каб сонца не ўбачыла непрыгожую гаспадыню, не паказала яе людзям. Употайкі ад усіх плакала яна па сваім каханні, купала ў слязах чужое дзіця. Казку, у якой служанкам давяралі не тое, што дом, гаспадарку, але і мужа-каханка... Пэўна, ейны патрывожаны ўспамінамі дух вітаў недзе блізка. Адшліфаванае зламанае грабавідла ў садзе выдалася кіем Стэфаніі, ейнымі парушанымі астанкамі. Бліскавіцы дзвюх стыхій чалавечай прыгажосці й выродства раз-пораз водбліскамі адсвечваліся на Зіндым твары, у ейным прываблівым позірку.

Але што гэта ёсць? Едуць каля хаты мужчыны ў дровы, як паверне каторы галаву ў наш двор, дык хоць ты багром адварочвай, глядзіць, пакуль не схаваецца за вуглом фурманка. Сусед, стары дзяцюк, адлучыўшы кабылу ад жарабя, мяркуецца запрэгчы. Тая кідаецца, не даецца, высока задраўшы галаву, водзіць яго па вуліцы ўзад-уперад, як у карагодзе. Сусед звычайна ходзіць, сцяўшы пашчэнкі, вочы ў зямлю, ужо такі пячурнік, а то, бачу, кінуўшы кабылу, пайшоў дахаты, рукі слабка вісяць, усміхаецца, як вырабіўшыся нарэшцэ з палону, гладзіць свайго сабаку, а можа, сам лашчыцца. У таго ўжо і поўсць халодная, як перад смерцю, такі здзічэлы. Нязвыкла, аж баішся глядзець, каб не спудзіць такую кароткую хвіліну даверу гэтаму свету. Хведар заганяе цяля, яно тузаецца на вяроўцы, брыкаецца, дурэючы, а ён смяецца. Ніколі быццам і сяброўства вялікага не мелі, а тут зайшоўся і раз, і другі, хваліцца Зіне, што надта ажына ў ягоным садзе сартавая.

«Хлопчык ты мой, дзе ж ты гэтак укрыпаўся!» — здымае яна з ягонага пляча старое павучынне. Ужо яна трымае ў руках маладыя парасткі, павязе да сябе на дачу, якраз тыя, што быў дакляравыўшы нам.

І цяпер яшчэ леснікова жонка Лідзя не выпалала тыя атожылкі ажыны начыста. Вышэй плоту, вышэй коміна ўзняліся тады над ейнай старой хатай, пад ейным бабскім зацішкам тыя сакавітыя, юлёвыя ягады надта сартавога заводу.

Зіна лётала з хаты ў двор, з двара ў хату. Ужо мяла вуліцу насупраць. Буйныя кучары на плячах, глыбокае дэкальтэ, спадніца вышэй калена. Зіна не маладзёнак. Але гэта не той апошні ўбор, не той апошні шанец, калі жанчына ва ўзросце, раптам спахапіўшыся, апранае вясной адкрытую сукенку, адчайна здымае панчохі пасля зімы, раней за маладых, самай першай. Ужо зусім не прыкрытая сарамлівасцю, ловіць на сабе мужчынскі пагляд, каб упэўніцца: яшчэ яна жанчына, яшчэ яна мае час. Высвеціцца каторая ўся на вачах, як зямля на пагорку, першай і зазелянее. Зіна апраналася так, ні на кога і ні на што не шманаючы. Яна хадзіла каля мужчын, як ідуць да чужых рук свойскія, цікаўныя да ўсяго дзеці. Аніякай позы. Вось падбегла да маёй дачкі, ідзе з ёй побач, нізка нахіляецца, патрапляючы ейнаму малому росту, дробным крокам, нешта шчабеча. Пасадзіла на руку, другой паказвае, цягнецца, бы хоча памацаць, дастаць да птушкі на галіне яблыні, кратае пальцамі — вунь сарока, а вунь — пятух! І зноў перабірае нябачныя канцы, звязваючы вузельчыкам дзіцячую свядомасць з птушкай, з дрэвам. І дачка, дзіўлюся, не кідаецца ў плач у чужой цёткі.

Я сама стаю, як збяднелы кутнік.

— Не, мне не такі мужык патрэбен, як мой муж! — ужо крычыць да мяне Зіна на ўвесь агарод.

А трапляла, пэўна, у вушы й лесніку Хведару, і суседу перастарку. І кожны падцінаўся, як на агледзінах, ідучы па вуліцы каля нашай хаты, чуючы вольны бабскі дух.

Веснавы вецер гуляў па вёсцы, сыпаліся пялёсткі ў садзе — і ўсё пад ногі лесніковай Лідзе. Сцюдзёныя сцежкі, бы йдзеш па снезе, як напамінак, што вось-вось вясна скончыцца, а ты й не пераапранулася ў лёгенькае за работай. Назаўтра Лідзя ішла ў белай блюзцы. Запозненым цветам блішчэла хустка з ружовым шлячком, якраз як на нашай старой яблыні, якая ўжо не радзіла: толькі некалькі кветак на адной галіне. Блюзка туга і каля шыі, і ў рукавах, пэўна, яшчэ дзявоцкая. Няўжо ўжо малая, зусім жа новая... І валасы закасміліся, як пасля лазні, грэбень не ўсадзіш, век бы мачонік у дзежцы, пот градам. І мужчына ў хаце даўно проста бацька ды бацька, ад той пары, калі дзеці пайшлі. Ідзе ўжо з ім Лідзя побач, як па асеннім садзе. Ён падыме яблык, закусіць адзін — кіне, другі, трэці, пакуль на смачны не ўзаб'ецца. Гучна цягне спелы сок. І яна патрэ яблык аб швэдру і таксама грызе, які трапіцца. Няма калі каб гэта спыніцца, сабраць кошык на стол. Як ягадзіну ў лесе, — усё на хаду. І ўсё іхняе каханне. З аднаго яблыка даўно ўжо не ядуць...

— Ці ведаеш, у тваёй служанкі, бабы кажуць, пэўна... шаленства маткі, — даверліва шэпча мне Лідзя.

Спрабую ёй нешта тлумачыць, разупэўніваць, але зірнуўшы ў ейны змарнелы, разгарачаны твар, палохаюся таго, што тут нарабілася пасля Зінінага прыезду.

— Не хацелася гаварыць, але скажу: тэлефон ейны знайшла ў Хведара...

Я і з твару сышла. Бягу дамоў і раптам бачу: хата быццам адмянілася. На вокнах ад вуліцы стаялі вазоны, на кожным па пары, Зіна іх занесла з веранды, цюлевая фіранка сарамліва запінала свет. Ну проста маладое дзявочае акно ў вэлюме! Мы ж усе ў сям'і любілі, каб сонца слалася на падлогу, каб пасля горада не ўпусціць ніводнага імгнення за акном, на зямлі й на небе.

— Зіна! Я ж прасіла нічога не перастаўляць, не перарабляць па-сваему! — злуюся канчаткова.

— Дзе калі ні ішла, дзе калі ні ехала — ва ўсіх людзей так вокны прыбраныя, — адказвае нявінна. — Я табе параю: пасадзі ты каля ганка на высадкі бурака ў вазу! Гэтак пахне, як цвіце, ну справядловы мёд!

Усё, хопіць! Трэба развітвацца, пакуль бабы тыя вокны шлюбныя не пабілі. Што ты ёй паправіш? Ні яна мяне слухаецца, ні яна сама прыглядаецца да нашага ладу ў доме. Усё робіць, як ёй выдаецца, усё нацягвае на свой капыл. З такім чалавекам дурняў поўная хата.

Зіна ад'ехала. Тыдзень — не меней — трэба было ўсё перастаўляць на сваё ранейшае месца, адшукваць патрэбныя рэчы, перамываць, як пасля якой непагадзі. Вясновая бура не пераціхала і ў хаце лесніка. Хведар не раз ішоў на работу не паснедаўшы. Але маўчаў. Лідзя ляпала дзвярыма, засланкай, лыжкамі. Не-не дый спынялася, ідучы каля сваіх вокан, угледалася ў цёмную шыбіну, бы ў люстэрка, папраўляла хустку. Дык гэта ён яшчэ будзе яе, матку, сарамаціць перад дзецьмі?!. Намуляла яму шыю сямейная вупраж! Вартаўнейшую знайшоў, маладую?!. Гэтак усё жыццё цаляла яму! Каб жа яна калі да каго з мужыкоў засмяялася? Гэтак пільнавалася сям'і! Стары ж ужо чалавек!

— Не маю да чаго прычапіцца, каб усё яму высказаць у вочы. Усё робіць, як на тое, псіна старая! — выносіла Лідзя да мяне свой жар з хаты. — Валасы ёй павыдзіраю, калі яшчэ раз убачу!

І калёсы паправіў, дзівілася, і гной з-пад каровы выкінуў. Ага, во што яна яму загадае, во калі згоніць ахвоту, пасварыцца нарэшце! Колькі гадоў прасіла збіць з жэрдзя такое прыстасаванне, каб зручна было сушыць позняе сена, збажыну, бульбоўнік. Адзін адказ: парой будзе ды парой. Не можа быць, каб тут не сарвалася!

Назаўтра азярод ужо стаяў на высокім пагорку. Быццам і запамяталі ўжо ў вёсцы старыя мужчыны, як яго рабіць. А Хведару, во, успомнілася. Некалькі слупоў, а перак — рэбрамі жэрдзе. Павернуты бокам да сонца, на пагоду. Здалёк азярод

нагадваў нябачны дагэтуль даўнейшы сялянскі інструмент. Садзілася птушка, спявала, прылятаў музыка вецер, перабіраў трапяткое жэрдзе. О, мой цудны свет! Усялякі раз спынішся напроці пад пагоркам, прыслухоўваючыся ці то да сябе, ці то да мелодыі. Сохнуць травы, млее сэрца.

Пэўна, музыка тая пра каханне на свеце, не зжытае сівымі гадамі...

# ТРЫПЦІХ



# ДОМ НА ЗАХАДЗЕ ДНЯ

Жанчына прыходзіла сюды, у былы маёнтак Хамінскіх, амаль кожную вясну.

Здалёк выдавалася, што ён сядзіць на высокім, дрогкім месцы. З пагорка на пагорак хваляй выносіла чалавека якраз пад самую браму. Ад брамы захаваліся два слупы, яны ляжалі напроць адзін аднаго, каменнымі галовамі ў адзін бок, захоўваючы нейкі смутны парадак, бы на могілках. Старыя яблыні часцей з чорнымі, апаленымі часам галінамі, некаторыя дрэвы сыходзіліся парамі блізка, пабраўшыся высока ўверсе, нагадвалі сілуэт далёкай, як на графічным малюнку, касцельнай сцяны, фасаду. Некаторыя паваліліся ўжо набок, бура нахіліла ці старасць, аберуч абапіраючыся на зямлю, яны яшчэ жылі, іншыя стаялі амаль укленчыўшы, цёмнае да бляску мармуровае цела не захінута нічым — кара да яго не бралася, заламаныя вятрамі галіны ўскінуты за голаў...

Але ні жалю, ні скрухі ў старым садзе, дрэвы быццам у доўгім задуменні, кветкі на іх галовах віліся мроямі, і яблыкі, кожная самой сабе ў пеляну быццам дзеля ціхай уцехі. Скульптурны, дзіўны сад...

Цвіў бэз. Жанчына адчувала проста патрэбу бачыць гэты вялікі вясновы куст на пагорку. Не заўсёды выпадала ўчас, тады, баючыся, што ён адцвіце, кідала ўсё і бегла, быццам магла не паспець, не трапіць на нейкае невядомае нікому, акрамя яе самой, свята. Спяшалася, бегла без дарогі напрасткі, як на голас, мінаючы пагоркі, раку, вал, гэтыя адвечныя забароны гаспадароў, без дазволу ўваходзіла за жывую таямнічую агароджу. Бэз звычайна найбліжэй садзяць да дому, каля ганку, і тут таксама грузалле падмур-

ка ляжала побач. Сярод саду, сярод адзічэлых дрэў галубовы бэз блішчэў здалёк смутнымі вокнамі пакояў. Адцвітаў бэз — зачыняліся аканіцы.

З людзьмі ў яе быццам ўсё ўжо было перагаворана, няма чаго новага ўспомніць, каб расказаць: ну, жылі ейныя бацькі таксама ў маёнтку, саслалі іх, палякаў, саветы на Алтай, усе там загінулі, яна адна вярнулася... Усё перабрана... Затое з гэтымі, пакінутымі гаспадаром, дрэвамі — жывасіллем пакінуў, ратуючыся, ад'ехаў з сям'ёй у Польшчу — можна было бясконца маўчаць аб тым, чаго і не памятаеш. Нямыя рэчышчы памяці запаўняліся птушынымі галасамі, шэптам вуснаў у сутоннях лістоты... Не ўспомніць, чаму, жывучы ў такім-сякім дастатку, не любіш, стыдаешся апрануць на сябе, ідучы ў госці ці тэатр, усё новае, асабліва бяда з абуткам, быццам ніяк не могуць збочыць ногі з той сцежкі, на якую цябе басанож на зямлю спусцілі з рук бацькі. «Хоць ты вазьмі й спалі твае старыя чаравікі», — злуюцца на цябе дома. Чамусьці не любіш, пужаешся свежых белых прасціradлаў на ноч, табе ўтульней вяртацца ва ўчарашняе, назапашанае целам цяпло, звыклае, з пахамі свайго прытулку-дому, старое кочава, пасланае як не на зямлі. Амаль не памятаеш, як памерлі бацькі, апошнімі зачыніліся дзверы за старэйшай сястрой Уладзяй. Яны ўсе выходзілі з дому, не развітваючыся, і больш не вярталіся, гінулі ў дарозе, замярзалі на алтайскіх маразах, як птушкі, не даляцеўшы да зацішнай страхі. Толькі цяпер ніколі не ходзіш на хаўтуры да сяброў, па-дзіцячы крыўдуючы, што дарагі табе чалавек пакідае гэты свет сам, па сваёй ахвоце, так табе выдаецца, занатурыўся і пайшоў упрочкі. Зрэдку прыязджае з вёскі далёкая радня, гойдаюць аберуч, аж пад столь, ейную калыску, успамінаючы, як прывезла яе з ссылкі выхавацелька, як гадавалася па чужых людзях.

І стаяў увушшу незразумелы гул — адзывалася кроў, чуючы блізка, побач, сваё племя, аж нездаровілася.

Ад бацькавага маёнтка нічога не засталося, яго лёгка было скасаваць калгаснымі трактарамі. Прыязджала неяк, стала

на пагорку ў полі, ціха зрабілася, вецер высока абыходзіў гэтае месца, можа, памятаў яшчэ тут высокі дом, высокія дрэвы. Убачыла пад нагамі камень — можа, ад падмурка? — адвярнула да сябе, быццам ён ляжаў уніз тварам, — аніякага пазнатку чалавечага жылля, хацішча.

А гэты маёнтак ахоўвала рака амаль з усіх бакоў, цяпер яна абмялела, месцамі разбітая кароўскімі капытамі ў брады, але з жывучай вадой. Дно далікатна высцілалася белым пяском, бы на чыстым сподку, па-польску мовячы, проста да столу. Вадзіліся тут і стронгі, даўнейшыя людзі кажуць, іх было процьма, рукамі лавілі, маўляў, рыбіна любіла, каб яе пад жабрамі пачухалі.

Баранілі маёнтак і дрэвы. Здавалася, некаторыя з іх паляглі на зямлю ў адну ноч, адным разам, каб загарадзіць, зачыніць дарогу, па якой назаўсёды ад'ехаў з дому гаспадар. Крыжнакрыж складзена сухое галлё, не пераехаць, не пераждаргаць, быццам тут жыве вялікая птушка — гняздо непрылюднага чорнага бусла на баране. Адно з нетутэйшых дрэў скідала на зямлю валоскія арэхі, заўсёды загадкавыя і неспадзяваныя, калі натрапіш, заўсёды як дзіцячы навагодні падарунак у панчосе пад падушкай. Другое, галубовы ствол піхты, заўсёды нечакана трапляючы на вочы, стаяла фосфаравым слупам на саракавы дзень. Акацыя рассоўвала камяні, цэглу, жыла на самым падмурку. Пачне чалавек капаць сабе куст і кідае: карані жоўтыя, пакручастыя ад натугі, бы жывыя пахаванцы, цяжка зробіцца ў грудзях, хоць ты тутака агароджу стаў, як на могілках, не чапай гэтае месца.

Надвячоркам мышкавала лісіца, крычалі совы, тут яшчэ так-сяк правіла праўнучка той багатай прыроды, што раскашавала пры былых гаспадарах. Тут яшчэ, калі добра ўгледзецца, існавала магія садоўніка. Старыя дрэвы захоўвалі ягоны парадак, стаялі адно за адным класічнымі алеямі. Глядзіш, быццам у гэтым кутку яны тоўпяцца абы-як, а назаўтра, пераступаючы цяжкімі крокамі, ужо таксама пастануць у рад. Будзе замінаць табе густы самасейка-маладняк,

чапляючыся за адзежу, балюча ўджгне шыпшына, толькі высока над галавой, дзеля адной птушкі, свіціцца наскрозь прагалак — хіба што на крыллях можна праляцець па старых прысадах.

Зрэдку прыходзяць у маёнтак немаладыя бабы, сядзяць тут адны, не баючыся аніякіх прывідаў ці пачвар, да трэціх пеўняў. Нагаворацца праз усю ноч пра сваіх нядбайлых мужыкоў, паспавядаюцца адна адной, лёгка, без крыўды, даверліва, як нідзе болей. Бо тут яшчэ пэўна, нешта прыветна тлее, саграваецца некім гэтае месца здалёк у думках успамінамі без праклёнаў.

Яшчэ, можа, не прастыў улюбёны ў свае мясціны позірк далёкага адгэтуль гаспадара.

Сёлета жанчына хадзіла ў маёнтак амаль кожны дзень. Якраз напроці яе дачы праклалі дарогу машыны — яны звозілі з поля на ток ячмень, і цяпер маёнтак быццам наблізіўся да яе. Нечая неспадзяваная змова.

У той вечар ішла пад сонца, на пагорак. Сонца на захадзе нізкае, колецца ў вочы, промні даўгія, тырчком, бы з-пад нізкай саламянай страхі, хоць ты прыгінайся, ідучы. Блішчыць палеглае пад калясьмі свежае ржышча. На самым пагорку раптам патыхнула цяплом, бы толькі зараз, на вачах выслабанілася поле, адхінула вольна цяжкую палу збажыны, вее цяплом зямнога цела. Ступіш некалькі крокаў уніз, у лагчыну, бы спусцішся па сходках у скляпенне з глухімі мураванымі сценамі — сыра, халадна. Зноў хваляй на пагорак, зноў блізкае цяпло, проста ў твар, шчака да шчакі. Клубамі ходзяць пахі — дыханне свежага жніва, дыханне блізкага лесу, хат. Нізкае неба. Нехта перасцілаў і перасцілаў перад ноччу, ці то ганьбуючы фарбы, ці ўжо занадта модзячыся, і ружовым, і малінковым, і зусім нешта накшае ўскіне, па-дзявоцку гарэзліва, маладымі рукамі. Ціха на дарозе і няўцямна запавольваюцца крокі, спыняешся і раз, і другі. Усё навокал спынілася, чуваць толькі, як шугае твая кроў. Ціша ахоўная, патайная, можа, беражоная вякамі, выстаяная ў полі.

Пэўна, у такі час слабеюць запоры, зашчапы паміж гэтым і тым светам, неба, бы далечыня, адчыняюцца самі па сабе тайнікі, клады, успаміны, размыкаюцца маўклівыя вусны.

Непадалёк цёмныя елкі, галубовыя прасветы паміж імі выдаюцца каменнымі цяснінамі, месцішчам вадаспадаў. Самога патоку не відаць, толькі дробная сліна ў паветры, пырскі, пахне вільгаццю — гэта падымаюцца з зямлі, струменяць туманы. Шуміць кроў у вушах. Па нябеснай далечыні ў той бок, дзе схавалася сонца, якраз над маёнткам, цягнуліся доўгія дарогі. Быццам ехалі па іх, ішлі цыганы, ружовым пылам падымаўся за імі шлях, дымы вогнішчаў, чырвоныя шалі віліся шлейфамі. Ішлі й ішлі ўслед за сонцам ззаду, каб надтачыць дзень, пазычыўшы ў ночы, — каб хоць што ды ўкрасці. Яны ўжо даўно мінулі маёнтак. Цяжка падняўся з зямлі, бы з цыганскай стаянкі, паляцеў за імі, даганяючы чорны каршун... Шум крыві да непрытомнасці й неспакой, бы нехта вельмі знаёмы, блізкі, мяняючы сваё аблічча, пільна ўглядаўся ў яе твар, пытаючыся: ці пазнаеш?!. Бліснула пад нагамі, як ад апошняга серніка, і згасла ржышча, горача ступіць, быццам жар ягоны, сыпучы, тоіцца недзе, пад попелам...

Пазнала! Успомніла! І цыганы на захадзе, і скорагаворка вадаспадаў, і цішыня, быццам у поўнай з берагамі чашы, магло быць толькі там, у гарах! Гэта ейны Алтай! Жанчына агледала ўсё вакол сябе шчаслівымі дзіцячымі вачыма. Ёю зноў валодала моцная ўладарная сіла дзікага хараства, знаёмая з малых гадоў. Яна смяялася сама сабе, зноў, як у дзяцінстве, стоячы недзе каля дарогі, басаНож, таксама чорная ад гарачага цыганскага пылу, і забываючыся, як свярбяць, смыляць струпы на целе. Зноў бегла, скакала з каменя на камень, ледзь паспяваючы знайсці вачыма пад сабой гладкае месца, каб ступіць нагой, не саслізнуць са скалы. Захопленая вышынёй, лётам, не разумела, што гэтая нечалавечая лёгкасць не ад вялікага спрыту, — лёгкасць галоднай істоты, што шукае ў

гарах сабе белую тлустую цыбуліну лілеі саранкі, бадылле «ўшывіка», скочку, згорнутую качанчыкамі. А знайшоўшы рэдкую кветку дзікай півоні, мар'інага кораня, закалоціцца ад радасці й пабяжыць уніз, да людзей, дамоў у склеп. І без дакору поўнымі вялікімі вачыма нежаданага ў сям'і ў гэтым горы дзіцяці, будзе крычаць усім: мяне нехта, нарэшце, заўважыў! нехта знайшоў сярод вас! вылучыў!.. Мяне нехта любіць!.. Бо во якую прыгожую кветку даў у руку!..

Яна ўсё стаяла, смяялася. Ужо схаваліся цыганы, толькі матлялася згубленае адно цыганскае кола, захад сонца мяняў і мяняў сваё аблічча ўвачавідкі. Неба палала так блізка, што міжволі падумалася: гэтае відовішча можа зашкодзіць чалавеку — надта вялікае шаламя агню, яно перапаліць у душы ўсё кволае, слабае — хіба заўважыш пасля ледзь прыкметнае хараство лесу, поля — будзе цяпер жадацца толькі вялікіх відовішчаў, вялікіх палотнішчаў, будзе захапляць толькі стыхія?!.

Ахапкамі клаўся на зямлю змрок, а маёнтак на захадзе яшчэ свяціўся. Пэўна, некалі якраз жа адгэтуль, з ейнага боку, вяртаўся дамоў і гаспадар. Дом, казалі, быў такі белы, аж, выдавалася, празрысты наскрозь. Сонца на захадзе абходзіла пакоі пехатой. Цішыня на дарозе. Разамкнулася рама на люстэрку поўні, у ім відаць чыйсьці непрыгожы твар, нехта пільна ўглядаецца перад ноччу. Пэўна, Юзюня, дачка гаспадара, яна і замуж, казалі, не пайшла, дзевавала. А можа, гэта малодшая прыгажуня Зося пасля таго, як яе коні з пагорка разнеслі, вельмі, казалі, быў твар пашкоджаны? Тут недзе, каля маёнтка, блукае ў сваіх думках і стары дзед Мікалайка, адзіны жывы сведка, але ў яго не дапытацца... На небе ўжо толькі малінковы жар, без галавешкі, без вуголля, бы сена капа згарэла ці сноп... пшаніцы?.. І раптам жанчына заплакала, плач уголас, наўзрыд, быццам душа труднавала доўга — даўно была ўплакаўшыся. Дарога... яна зноў стаіць на той жа дарозе, што і ў дзяцінстве, і ніхто яе дамоў не кліча. Чаму ўспомнілася? Што змусіла? Яна адчула яе фізічна, як пры набліжэнні да нечага

гарачага, небяспечнага, цела сціснулася, торгнулася — адчыніўся яшчэ адзін клапан у цемры бяспамяцтва. Успомніла навобмацак: пад нагамі цёплае ржышча, пах саломы, бляск. Зярняты гарачыя каля вогнішча... Начлежнічалі вазніцы, перавозячы некуды збожжа, палілі снапы, жмені пражанага зерня з зямлёй разам, — ежа... Успомніла ротам, трашчала на зубах, і каб толькі раней за птушак, за звяроў дабегчы да пакінутага вогнішча і выграбаць, выграбаць з попелу, не чуючы гарачыні...

І цешылася, і плакала, бы пры сустрэчы з некім вельмі родным.

Ніколі нікому не распавядала, што бачыла ў дзяцінстве. І голад, і холад, і нежаданае дзіця, а ўсё быццам невясёлы, адчужаны матчын твар (яна і памятае яго толькі па фотаздымку) засланяла нечае іншае аблічча, аблічча горнай прыроды. Вяртаючыся са школы амаль заўсёды як на тое раптам зноў адчуць неверагодную здраду: раскруцілася ануча і цягнецца ззаду, высунуўшыся праз дзіравы валёнак, знойдзены на чужым шуметніку. Не даць рады, каб спыніцца і паправіць абутак, бо скрэплі рукі, і варта іх выцягнуць з-за пазухі, пальцы адваляцца на марозе, абламаюцца, як ледакі. Але не ўстоіш, каб не падняць на дарозе шалупінку ад мандарына. Завея і мароз, абы хутчэй кульнуць у свой падвал (пасля рэабілітацыі ўлады дазволілі палякам выйсці з зямлянак) праз парог і ляжаць качулкай, пакуль іголкі не прашыюць цела да самага сэрца — пачнеш саграваецца. Некаму сустрэць, расшпіліць — маці на рудніку. Дапільнавацца, калі зарыпіць над галавой лесвіца, вынесуць карове памыі й раней за яе вылавіць з цабэрка кавалкі хлеба, бульбіну. Потым залезці на цёплую ад учарашняга пліту і не сваім голасам крычаць выратавальныя словы: «Буря мглою небо кроет, вихри снежные крутя...». Нехта дыктаваў і дыктаваў ёй па-руску. Хто?

Бо чытанка самой не даецца, асабліва забываецца літара «с», пакуль не ўзаб'ешся на неверагодна салодкае: с-с-са-хар! Ледзь-ледзь, квола, пад бацькавым прымусам спявалася

польскае: «На подоле бялы камень, подолянка седзі на нім...» І гналі тады, падалянку, ужо дзетдомаўку, па беразе возера: «Бей белых поляков!» — крычалі дзеці. Усе аднолькавыя, усе ў чорнай адзежы, бераг камяністы, адны камяні. Б'юць наўздагон камянямі. Наперарэз дзецям — выхавацелька. І... непрытомнасць. Ні крыўды, ні злосці, ні страху ад людзей пасля, а толькі — чыстае возера, усё, як у тваіх прыгаршчах, і гуляюць на дне самі па сабе зялёныя каменьчыкі, і неба нізкае над ёй, ляжачай дагары, і глядзецца ў яго можна, як у ваду...

Адымала памяць, лячыла болькі прыгажосць, раскоша, моц зямлі, вады, неба. Нехта падымаў і падымаў падпашкі вышэй сваёй галавы, — пэўна, горы. І нават сам горад ссылкі насіў іхняе імя — Змяінагорск. Чаму яны не выратавалі бацькоў? Чаму самі бацькі, сталыя людзі, не адужалі маразы, голад? Няўжо таму, што яна нарадзілася ў тым небе, у гарах, у цяснінах, а ў іх — другая зямля, другая калыска?

Ім не даваў дазволу на тое, каб зачапіцца карэннем за чужую камяністую глебу пакінуты дом, маёнтак, — жыццё выдавалася часовым, без моцы чалавечай.

Жанчына праз дзесяцігоддзі памятае колер шклянак на матчынай сукенцы, — маці была ўжо без прытомнасці, — зялёнае з чорнай дужкай, летняе ў люты мароз, шаўковыя крылы матыля, замерзлага каля вады, каля студні. І час ад часу лавіла сябе на тым, як нешта змушае яе спыніцца, варта ўбачыць які-небудзь чужы стары падмурак. Чыймі вачыма прагна глядзіць на разбуранае? Няўжо гэта матчына? Разглядае, як нешта ўжо знаёмае, яе трывожаць, хвалююць пахі паламанай цэглы, вапны, пахі згаслага жытла, гатова сядзець, перабіраць рукамі, як дзіця. Няўжо пашкоджана яшчэ ў чрэве?

Яна, як і маці, жыве ў разбураным свеце на грузаллі, на абломках, на чорным падмурку?!

Так адбыўся там, на Алтаі, як бы адбор паміж блізкімі людзьмі, жорсткі, натуральны, — яна адна пакінута на жыццё.

Дзень у дзень жанчына выходзіла з дому, ішла ў маёнтак. Гаварыць ні з кім не хацелася, цяпер яна бліжэй была да дрэў, да травы, чым да людзей. Тут, сярод старых прысад, яна адчувала ў сабе з усіх, што навокал, нарэшце, такую вялікую згоду. Маўклівае сумнае месца, бэз, стары сад, дарога па ржышчы, тут яна трапляла ў тую плынь, дзе лёгка было са сваім цяжарам, скарбам памяці. Згадка гарчыла на вуснах: яна заўсёды хадзіла па гэтай дарозе, адна, пад сонцам, па ржышчы калючым, звыкла па ім ісці, не балюча, тая ж дарога, што і на Алтаі. Толькі яна быццам недзе ўнутры была пад голымі ступнямі. Цяпер абазначылася, як хвароба, даўняя, цяжкая, выйшла вонкі, пайшла па твары.

Ніхто раней не здагадваўся, не бачыў ейнай хады.

Каму раскажаш, хто зразумее? Вакол амаль беспрастанку сварыліся з-за дробязей, хітравалі адзін з адным, здраджвалі, мітусіліся, усе быццам былі даўно перасварыўшыся, страцілі давер і не мелі рады прыйсці да згоды. Жанчына пакутліва стаяла ўбаку ад гэтага няскладнага жыцця, тлуму, дапытваючыся: за што? навошта нішчыце адзін аднаго? Там, на Алтаі, — ссылка, катарга, а тут хіба жыццё? Паміж тым і гэтым светам толькі й розніцы, што на Алтаі маразы мацнейшыя? Ніхто не здагадваўся, што жанчына ведае нешта большае: яны ўсе смяротныя, чалавек вельмі кволая істота, яго лёгка загубіць, згнаіць, парваць сэрца.

Яна спасцігла мяжу чалавечай свары, варожасці, за якой нішчыцца дом, лёс.

«Чаму ты ніколі ні з кім не сварышся? А ты б таксама... А ты б яму катораму адрабіла... А ты б яму не пазычыла, а ты адказал б... — павучалі. — Жывеш, як праз шкло. Ты наіўная, — казалі, усё ўсім выбачаеш, спадзяешся на лепшае, ты людзей не ведаеш...» А ёй — каб толькі хоць у адным месцы не парваць сувязь паміж імі, не адпіхнуць чужую нявернную руку. «Вы мяне працягваеце катаваць... мне мулка, балюча ісці па гэтай этапнай дарозе... Я вам растлу-

мачу, навучу...» Ніхто не слухаў. Які яна, маўляў, мае вопыт? Без мужыка, без дзяцей...

Ніхто не здагадваўся, што ў яе вопыт чалавека, яшчэ ў дзяцінстве асуджанага людзьмі на вышэйшую кару — марудную смерць.

Зноў і зноў ішла, мінала браму, калыхаліся вышэй галавы дзікія травы; дзікая герань, бы праз адчыненае акно, аддавала дамашнім духам; хваравіта, лекамі дыхаў у твар фенхель — моцныя пахі старога жытла. Там-сям трапляў пад ногі белы, чысты сук таполі, бы паламаны Юзюнін кій, ці Зосін? Не зарастала вялікая паляна, якраз перад вокнамі дома, пад пагоркам, улюбёнае месца, не іначай як і цяпер яно на вачах гаспадароў.

Скуль жа тады гэты лёгкі, як дотык, страх за плячыма на пакінутых сялібах, бы ты ў чужых пакоях без дазволу?

Тут, на паляне, жанчына неспадзявана знайшла зуброўку, свяшчэнную траву. У вёсцы дужа здзівіліся, бо, казалі, немцы вывозілі з маёнтка лекавыя зёлкі, кветкі, дрэвы машынамі. Пэўна, ёй, казалі, спрыяе гаспадар. І праўда, як сярод незлічоных пераблытаных карэньчыкаў пустазелля, у дзірване, самому ні знай, ні ведай, натрапіць на такі цуд! «Павінен быў гаспадар даць нейкі знак, адазвацца», — цешылася яна. Вунь, раптам лёгкая, як подых, пара над бродам, дзе пераходзіла заўсёды. Яшчэ цёпла, яшчэ далёка да вечара, але ж так даўно сюды, у маёнтак, ніхто не заходзіў, ды яшчэ адмыслова, каб толькі праведаць, хіба магчыма вытрымаць, сцяўшы каменне на падмурку, і не сустрэць! А пад яблыняй праз ноч — два яблыкі, чысценькія на траве, побач ляжаць, як рукой пакладзеныя, з кішэні... Схавала зуброўку пад падушку — нясвойскі лясны пах, з-пад капытоў звера, аддае танюткім мускусам, таямніча прыручаная да жылля трава.

Ноччу скрозь сон пачула плач. Ці то жаночы голас, ці то мужчынскі, вызвалены з цела чалавека, бесцялесны. Чыясьці

душа? Плач, каля самай галавы — так плачуць, жаляцца, бядуюць, склаўшы галовы...

Яно ўсё там, і зуброўка пад падушкай, аплакана, хоць ты нічога адтуль дамоў не нясі. «Рабіць работу, як перад дажджом! — так, успамінаюць, любіў дамаўляцца Хамінскі з новым работнікам. Столькі гадоў гіне маёнтак, і не знайшлося ні работніка, ні гаспадара, грэх сказаць, акрамя немцаў, тыя хоць нешта выратавалі, вывезшы да сябе дамоў. Выцягнулі калгасныя дзеці піяніна ў кусты, расказваюць людзі, і йгралі на ім палкамі. Ніхто з новых жыльцоў-камунараў, не ведаў, як коміны чысціць, угарэлася сажа, загінуў і будынак. На могілках і сёння садзяць буракі, перабіраюць матычкай чалавечыя косткі. Запякліся на кветніку без догляду пупышкі чырвоных руж, дзе-нідзе па кветцы. Тады вецер ухапіў у жменю семя маргарытак і панёс па полі, па лесе, пусціў па вадзе. Усюды цяпер вышыванкамі блішчаць дробныя белыя кветкі, заплюснуцца на ноч — і зноў пад ногі, пад кола.

Даўно абрушыліся сцены панскага дома, дзённым святлом, бы лагчыны, лугі, запоўніліся былыя пакоі. Дом цяпер, выдавалася ёй, скрозь, усюды, як кінуць вокам, бо калісьці чалавек будаваўся тут невыпадкова. Доўга перабіраў, а ўлюбіўшы менавіта гэтыя мясціны, ставіў дом так, каб ён упісваўся ў наваколле.

І нават неба над дахам было абрана — захад сонца, пэўна, найлепшая ягоная гадзіна.

Жанчына абхадзіла ўсё навокал, з пагорка на пагорак, колькі разоў падымалася і бачыла іх, але кожны раз нанова, не пазнавала, быццам учарашняе змывалася моцнай хваляй. Ніколі не змагла б паўтарыць іх рукой, немагчыма адной нерухомай лініяй, як нельга заспець неспакойнае мора. О, бясконцасць прыгажосці!

Сонца адвярнулася патыліцай, было лягчэй глядзець яму ўслед. Воблакі над маёнткам пырхалі чарадой сівых галубоў. Часта сюды наведвацца... жанчына пужалася ўжо, каб не

вычытаць да канца, не завучыць на памяць усё, што навокал, не спасцігнуць. Вось і зноў на дарозе цішыня, але зусім інакшая, сярод звыклага: дрэў, травы, кветак — чаканне і нават урачыстасць, як за даўгім дамашнім сталом, на свята, перад чыёйсьці прадмовай, а можа, — перад новай працай у полі, ці каля піяніна? «Не уходи, побудь со мною...» — спявалася, вымаўлялася так, быццам яна сама складала гэтыя словы, павольна, не ведаючы, што скажа далей, аднымі вуснамі, як у рэдкую хвіліну прызнання. Нідзе, ніколі раней не адчувала ў сабе такі лёгкі да спеваў голас, не іначай, як трапіла ў самае гняздоўе рамансаў, дзе яны, можа, і нараджаліся. Высокае тут месца, як у небе пабудзеш. Раптам павеяла свежым, нібы перайшла ў другі пакой з адчыненымі вокнамі. О, як знаёма! Так ужо на змроку рыхтуючы ў дзяцінстве ўрокі, гартаючы старонкі ўніклівай чытанкі, убачыш яркі малюнак: крыху наводдаль, сярод поля з дробным шрыфтам іржышча стаялі дубы. Вольна, адзін каля аднаго, мудра калісьці разлічыўшыся на свой вялікі рост, на вечнасць. Неспадзяванае пачуццё маладосці побач з імі, бо ў іх інакшы адлік часу, чым у іншых дрэў. Тут надзвычай светла, як каля даўно і надоўга абжытай сялібы з раннімі па вечары агнямі. Сцямнела ўвачавідкі, быццам падышлі й апусцілі цяжкую штору.

Ці не запазнілася трохі. Ужо была мінула пералесак, як на ўскраі выступіла чыясьці постаць. Маленькая, усохлая, бы злежаная на цвёрдым, галава, здавалася, вочы пільнуюцца, сочаць цябе, але сам чалавек нерухомы, жывасіллем падняты на ногі, і ў вачах смяротная засяроджанасць. Вусны самкнуты, адна рука на грудзях, завысока, нягнутка, бы не сама па сабе, а закладзеная чужымі рукамі. Боты высокія, можа, у паляўнічым убранні, але з эпалетамі на плячы, яны вісяць беспарадкава, шышачкамі хмелю.

Адзежа пабіта зелянькамі, пацягнута сырым магільным марозівам...

Вось-вось зараз ці яна, ці ён, адваліцца, як стой, бразне дагары. Ледзь здужала ўхапіцца за нітку свядомасці, пазнаў-

шы высокі куст дзядоўніка з цёмнымі ланцугамі хмелю. Агледзелася, — хоць ты хрысціся, — вось і дазвалася, нарэшце, гаспадара!

Няўжо пачало ад стомы ўваччу здавацца, самая пара — вечар! А гэта восень разбаўляла скрозь зялёную фарбу лета, дурэючы, пэцкала малявідлам па кустах, дрэвах. Залатыя блікі, барвовыя, сонечным промнем праз акно ў цёмным памяшканні высвечваліся кожны дзень новыя постаці, цэлая галерэя роду Хамінскіх. Фамільным гербам блішчэла здалёк аплікацыя з дубовага лісця. Вунь пані, немаладая, трымае свае цудоўныя даўгія кучаравыя валасы ў руках, як якую адзежыну, нехта з ёй побач прыпыніўшыся, добра не разгледзець. Назаўтра крыху далей ужо стаяла нянька, напаўпаварота, рукі на жываце: ці то прыслухоўваецца да болю ўнутры, ці то ад немачы старэчай прытрымлівае сябе абедзвюма рукамі. Яшчэ жаночы партрэт — адзін твар, напроць яго, як на карце, віновы знак, дама віновая. І ледзь згадвалася постаць кагосьці з дзяўчат, пэўна, Юзюня. Твару не відаць, а каля шыі, на плячах нятленны карункавы каўнер, толькі-толькі ўскладзены, і некалькі разоў на дзень — свежая сукенка. Трывога ішла ад яе неўвядальных убораў.

Нарэшце пералесак, лес, кожнае дрэва ля маёнтку ўбралася астатні раз, ні каслаўкі лішняй, ні рабаціння — скрозь светла і ўрачыста. Фарбы на холадзе быццам ужо не разбаўляліся — чыста сіні, чыста галубовы, пластамі, вышэй і вышэй, як падушкі пад самую столь. Кожнае дрэўца ў густым лесе бачна здалёк, стаіць асобна, як у садзе, танютка ўсё распісана пэндзлем аж да гарызонта. Спыніся і глядзі, колькі хочаш, і ніхто не папросіць зачыніць дзверы, выйсці з гэтай вялікай цудоўнай залы.

Потым ліст ужо не затрымліваўся, пацёк-пацёк далоў. Праз адну марозную ноч асыпаліся дрэвы. Толькі маладзенькія дубы стаялі, як ёсць. Выйшлі, пабраўшыся, уздоўж пералеска, усе аднаго багатага заводу, лісце пакручас-

тае, калянае, чырвонага золага, быццам яно і не леташняе, а даўнейшае дарагое ўбранне палеглых побач волатаў бацькоў.

Пара было закрываць дачу, ад'язджаць у горад. Ужо і машына каля ганку, а нешта яшчэ быццам было не зроблена, нешта не пускала. Як жа... не развіталася да вясны...

Над маёнткам стаяў гул. Верхавы магутны голас, з той вышыні, з якой нідзе болей, акрамя, можа, гор, вецер не гаворыць да чалавека. Самыя высокія ў акрузе дрэвы. Раптам старая таполя змоўкла, бы нехта яшчэ большы за яе самую абняў ейную галаву, сцішыў. Крокі па лісці выдаваліся незнаёмымі, чужымі. Усюды было прыбрана, як на беднае свята, з астатняга. На ламачча, на густое кустоўе, на дзікую траву ўскінуты лёгка, ветрам ці крыламі, сурвэткі, выцінанкі кляновага лісця. Усё чысценькае, ледзь свіціцца, пахне свежым тленам, быццам перад святам яно ўсё лішні раз і апошні памытае — абы абысціся адным светлым днём. Заўтра пад дажджамі ад убрання застанецца толькі сівы кужаль. Крыху ўбаку чорнай капліцай стаяў стары сухі дуб. Калісьці тонкае, порсткае галлё не варушылася, ніводнага гуку каля яго, як пры шчыльна зачыненых дзвярах.

«Сёння ж Пакровы», — успомніла жанчына.

На ўсёй зямлі вакол ішла шчырая служба. Ахвярным агнём ледзь свяціўся над маёнткам захад.

# ДОМ ПАД ЛЕСАМ

Куплёная хата стаяла ў канцы вёскі пустым вуллём: на падлозе, паміж рамамі насыпана вос, чмялёў, леташнія матылі — сухімі кветкамі пад бэлькамі, на печы. Дзесьці чытала, ці гэта сваё, вынашанае гадамі, бадзяючыся па чужых кутках у горадзе: увайсці ў сялянскі дом, як уваходзіш у лес ці ў раку, нічога не перарабляць, не парушаць, знайсці пад печчу кінутую гаспадаром патэльню, чапялу ў памяльніку, прас на вугалях, падцепліць печ — і жыць. Дом не тое, што з бярвення, дошак, камення; дом — як гняздзечка, каб і рукой не дакрануцца, не спудзідь птушку, не звесці сялянскі дух. Пакоі глуха адзываліся рэхам: выдавалася, вось-вось дрэву вернецца ягоная лясная мова — не хацелася нічога ўносіць, — шафу, ложкі. Душа ўвесь час супраціўлялася, але трэба перасцілаць з'едзеную грыбам, падзіркаваную мышамі падлогу, перарабляць, бы перуном пашчапаную на палову, печ; цячэ страха. Адны вокны — на лес, іншыя — на панадворак цёткі Анці, — вясёлая сяліба. І што б ні рабіў, куды б ні ішоў — нехта ўвесь час глядзеў сюды з высокіх нябесных вокан, спрыяючы, цешачыся.

Яшчэ ў аўтобусе з Менска Ядзя лавіла сябе на думцы, што твары людскія выдаюцца знаёмымі, прыхілкімі, вачыма лёгка было адшукаць, знайсці на іх тое дарагое падабенства, што родніць усіх вяўскоўцаў. Дарога да вёскі праз лес з кожным разам карацейшая. Яе не вымяраеш, не параўноўваеш ні з якімі сцежкамі, шляхамі, бо яна — да дому. Некалькі хвілін, каб скочыўшы з падножкі на зямлю, прызвычаіцца да поля, да лесу, да неба, асвойтацца. Стаіш нясмелы, разгублены, як на беразе, перад вялікай вадой, такі недарэчны, і не ў той адзежы, неба блізка і глыбока. Якраз некалькі хвілін на тое,

каб адчуць цяжар паклажы ў руках, стому ад гарадскога тлуму, скінуць усё ля парога разам з абуткам — і лёгка, утрапёна ступіць пад шаты квяцістых фіранак, бярозавага маю пад бэлькамі. Якраз некалькі хвілін той дарогі, абы аднойчы, перад сконам, паспець вярнуцца смяротна атручаным, як тое мышаня, што знайшла ў падполлі: ружовыя лапы, пыса, ляжыць на бачку, як спіць, ляжыць у туга, утульна скручаным саламяным гняздзе. І гэтак па сабе яно падагнанае, што ў ім, як у саване, і закапала... З пагорка на пагорак, незнаёмы дзядзька асадзіў белага каня, едзе павольна, бы й сам пехатой, сваім ходам да чалавека, як з павозкі ўсё роўна злез — насустрач, павітаўся — і зноў ірвануў лейцы. Пагляд запытальны, што ўжо не змоўчыш, азавешся. Глядзіць крыху саромячыся, але ўладарна, як законнік. Гэтае старадаўняе права, старадаўняя патрабавальнасць адзін да аднаго: мы тут, на гары, на гэтай дарозе адны, ты — мой напатканы падарожнік у вялікім сусвеце, дак будзь жа здаровы.

— Адкуль ідзяце? Дзе былі? — крычыць цётка Анця. — Або-о-о, што гэта я кажу, га?!. — смяецца з сябе, спахапіўшыся.

І ты ёй бязмерна ўдзячны, што яна ўжо лічыць цябе сваім чалавекам, мясцовым жыхаром, які быў адлучыўшыся некуды — не наезджым.

Уторкнуць на варажбу нанач у бэльку галінку багатак, а назаўтрае дзіцячымі вачыма разгадаць таямніцу свайго лёсу: калі трава за ноч расцвіце, жыццё будзе багатым. Чаму ж не: купіць хату ў вёсцы, пасяліцца тут, гэта як увайсці ў сям’ю, даўно пахаваўшы вясковых сваякоў, зноў набыць вялікую радню. Рад палення, рад камення — і ступу наверх! Нарэшце, можна скінуць далоў свой заплечнік, здарожыўшыся, спыніцца — ты дома! Пачуць птушак, гукі бягучай вады, галасы працінаюць наскрозь як шчаслівыя слёзы. Адзываешся нясмела, бы маўклівы да гэтага часу інструмент, што трапіў у рукі таленавітаму майстру і ён спрабуе цябе на дасканаласць.

Жаўрук пяе, пакуль ляціць уверх.

Выпраталі з гарышча салому, сена з хлявоў, аддалі суседзям на падсціл скаціне, цэглу старую — у таго под у печы паправіць, праваліўся, у гэтага — комін, дзверы, вокны, хто хацеў, той і браў. І каб аніякай платы — гэта ж цяпер свае людзі, трэба меркавацца. Ад'язджаючы ў горад, Ядзя клала ў кішэню цэлы спіс, каб не запамятаць: каму — пігулкі ад удушша, каму — сіньку цюлі падстроіць на свята, каму — пахадайнічаць наконт даведкі ў архіве, каб атрымаць інваліднасць, падлячыцца ў шпіталі. Быццам бы ва ўсіх старых ёсць дзеці, таксама жывуць у горадзе, але яна лічыла за ахвяру ўсе гэтыя чужыя турботы. Мужу, дзецям хацелася крыху падняць дом, надта нізкі падмурак. Не-не, нядобра ў старой вёсцы сярод старых людзей выдзяляцца, каб хоць не трапіць на благое вока, не ўзверадзіць якога зайздроснага суседа. Вада-верхаводка затапляла падполак. Вёска штовесну цярпліва цягала наверх бульбу, вурыла ваду, не шукала вінавайцаў, лёгка тлумачыла няўдачу: маўляў, снегу было многа, а вясна надта руплівая. А цыбуля зімовая не ўзышла, бо трава заціснула. А пісклюкоў мала ў лета пусціла каторая баба, бо крумкач пахапаў, вунь сядзіць на елцы, крумкае, бы арэхі лоцкія сулотае ў дзюбе, забаўляючыся. Слабка бараніліся ад бяды, быццам няволле было бараніцца. І ты цяпер век вяслуйся ў сырой хаце седзючы, патрапляючы ім...

Трэба было падняць падмурак.

Тут людзі часцей саступалі дарогу і вадзе, і птушцы, і зверу. Лясны ручай цячэ вясной у вёску, нячутны, зеленькаваты, таямнічы, як лясныя думкі, нясе лясное несенне. Пазней каля самага парога ўзыдзе яно дзікай кветкай лабазніку ці ветраніцы. У сад заляціць сойка, дрозд, салавей.

Лес загаворыць да чалавека на сваёй мове. І ты ўжо, як пабраўшыся, будзеш з ім увесь час хадзіць ўпоплечкі, не адчувавчы адзіноты.

Але чаму так лёгка да плачу? Быццам ейны анёл-ахоўнік за плячыма ўвесь час заліты слязьмі. Ён, пэўна, яе і зводзіць...

Цётка Анця абатрэ вехцем саломы запэцканыя цэўкі, боты, выйшаўшы з хлява, паправіць хустку і па нешта ж ідзе да яе ў двор.

— Можа, замок купіла б? — пытаецца. Цёмныя ейныя вочы пасвятлелі — сочыць, пільнуе, каб не здагадаліся, што ёй трэба збыць няўдалую рэч.

Запамятавала, яшчэ летась жалілася: купіла во, ключ ледзь паварочваецца. Моўчкі ўпрошвае і злуецца, што тая марудзіць, маўляў, што табе, багатырцы, варта купіць, а мне ўбытак. Вунь якую будоўлю распачала, плот новы паставіла, веранду, печ новая — свежы дым у хаце. Цётка Анця не надта і хавалася, узяўшы некалькі цаглін, падлажыла на рацэ пад кладку, бо не пільнуецца новая гаспадыня, не дарага, значыцца, ён ёй абходзіцца, не ўгоніш яе гэтым у кошт... Нельга не купіць, нельга даць зразумець, што заспеў, як малога ашуканца. Толькі гэты візіт крыху насцярожыў: а ці не залішне яна тут, у вёсцы, добрыцца з людзьмі, можа, варта было б хоць дзеля прыліку таргавацца з імі? Але ўдзячна давяраючы жыццю, Ядзя выбачала, забываючыся на хітрыкі старой жанчыны. Можа, толькі яшчэ больш шчыра адорвала яе гасцінцамі, вяртаючыся з горада, быццам хацела яе закалыхаць, як малое дзіця, прылашчыць.

Цётка Анця мела тую сілу, што мае глыбокае карэнне лясных нагаворных гаркавых зёлак, якіх і назву ніхто яшчэ не ведае.

Рэдка тая заходзілася ў хату, хаця ўвесь час на вачах, у акне ўвесь ейны панадворак. «А кыш вон! А кыш вон, га?» — ганяе кур з лех, пытаецца, чаму не слухаюцца, карціць слова сказаць, а ў хаце няма да каго і загаварыць — дзеці, унукі ў горадзе. Толькі на ўсю моц уключанае радыё. Штогод праз усю бульбу — ляха квяцістага маку, як дзяркаты каснік у сівых валасах. Во яна толькі яшчэ робіць пад той мак ляху. Качае граблямі зямлю, пляскае, як бы гэта цеста на стале. Узбівала, мяла грузалкі, дабаўляючы нюшок таго, нюшок гэтага, як толькі не каштуючы на смак. Не спяшаючыся, неяк па-свя-

точнаму. Барозны няроўныя, бакі абсыпаюцца — на строй не глядзіць. І з языка не спускае, што цяжка, і сок ёй бярозавы вялы, смагу не праганяе, што дзеці не падскочылі, не кожны раз лучаць у пагоду пад'ехаць, памагчы.

І раптам загадвае разагнаць плугам лужок каля ракі, дабавіць зямлі. І жаліцца, і стагнаць, як у любосці, але не разлучацца. Не тое, што яна, Ядзя. Садзілі садок, прыкра ўспомніць, наняты дзядзька з горада спяшаўся. «Дзе сонца ўзыходзіць? — пытаецца.— Ага, ага!» Круць-верць галавой, паторкаў дрэўцы — і ў машыну. Чужы сад, ён і ёй як чужы — не запамятавала назву яблынь. Цётка Анця звычайна ў сініх штанах, запэцкае, выцягнуцца каленькі, спераду ўжо свіцяцца, тады яна, каб крышу харашэй, нацягне іх задам наперад, а можа, каб зношваліся, рваліся не да дзірак. Ніколі, каб заспяшалася, калі пойдзе дождж. Нічым не захінецца, быццам не чуе і невядома ці схавалася б пад страху, каб ночы не было на свеце.

А тут прыязджае Ларыса, афіцэрава жонка, яны з мужам будуюць сабе напроці цёткі Анці дачу.

— Вой, як Ларыса была прыбраўшыся! Як яе па бацьку? Сукенка ў кветкі, а строю-ю-ю: тут зашчапы на грудзях, тут фальбонка! І спадніца такая шырокая, можа, і сонца-клёш! Ну якраз па мне была яна змодзілася! — і рукамі, пакручанымі ад работы пальцамі, перабірае на сабе, як труднуе ад жадання ўскласці такую сукенку, надта ўспадабаўшы.

І ў будзен дзень! Ярка, светла ёй уваччу, глядзіць прыжмурыўшыся з далёкага пагорка сваёй маладосці. Як Ларысу па бацьку? — во ўшанавала! Ядзя міжволі сумелася: старасць, гразкая работа не закітавала старой жанчыне вочы, а ты тут ходзіш абы ў чым, па-простаму, цягаючы на сабе і дошкі, і цэглу, і зямлю лапатай урабляючы — толькі каб не выдзяляцца!

Што ўжо тычыцца афіцэрыхі, то, на першы погляд, і не заўважыш: прыгожая яна ці не. Яе быццам трэба некаторы час рэстаўраваць у сваёй памяці, успамінаць, як згублены,

зашораны дзе-небудзь на жыццёвым гарышчы дарагі партрэт. Быццам ціхая і непрыкметная, яна магла б быць і белашвачкай, марудная, пагляд даўгі, як за пяльцамі ці за дробным шыццём дзе-небудзь у акне дзевятнаццатага стагоддзя. Каб не густыя рыжыя, пафарбаваныя хной валасы, што цяжкім царскім турбаном велічна ўздымалі галаву. Яркі макіяж напроці сонца надзіва не вульгарны. Жывапісалася нешта нетутэйшае, нечспадзяванае, знаёмае толькі па паданнях гарачых паўднёвых краін. Ну праўдзівая Клеапатра! Не, Клеапатру нельга браць да работы. Аднаго разу толькі ўдалося ёй, бачыла, пераносіць з мужам шыфер, пацяклі густыя малёўкі, на скронях ад напружання выступілі вены. Не, гэты шэдэўр жывапісу, думалася амаль здзекліва, патрабуе шаноўнага абыходжання, пэўнай тэмпературы, як у музеі.

Атрымаў афіцэр пляц на чыста чырвонай гліне, а жадалася пасадзіць дзецям хоць агурок. Цётка Анця, калі папрасілі, вымеркавала ім ляху ў сваім агародзе.

— А можа, яны мне мяшок мукі дастануць! — і стук кулачком па лаве, на якой сядзела. — А можа, прадсядацель — яны з ім добра — жыта выпіша!.. А можа, так што-якое маюць даць! — стук, стук, стук.

Зямлю шкадавала, а тут адважылася на пазыку, як у рулетку згуляць захацелася. Ужо яна тутака, маўляў, не прагадае, усё абдумала. Сам-насам абрадзіла. Але не засцераглася Клеапатра ад бабінага гневу. Тая, не хаваючыся, што брыдзіцца, пазначыла шклянку на малако, каб цётка Анця не пераблытала і ў сваю карэлую не наліла. І грошы пакінула наперад, не дагадзіўшыся, — не ў рукі, а праз унучку ейную.

— Што яна мне, як на вочы ўскінула! Я торт куплю ў горадзе — і ўсе ейныя грошы! Жарт! А я ўсё летца буду за іх у кабале душыцца на гэтае малако! — бліснула на Ядзю вачыма.

Ядзя, праўда, разумела старую: ёй звыкла зарабляць па рубяльку, дакладаючы капейку да капейкі. І каб душа была на волі, не заходзячы ні ў які доўг.

У тую ноч нарваў-такі вецер навальніцу. Грымоты каціліся з аднаго канца ў другі. Выдавалася праз сон, што гэта цётка Анця мые падлогу перад вялікім гадавым святам. Ідзе, не разгібаючыся па хаце, падол у зубах, перасоўвае з карэлай палавіны на чыстае, шоргае лавы, шафа паехала, ужо баба ў сенях, на ганку, ужо вурыць на панадворку, вось і калёсы піхнула на памост у хату, аглоблі забарабанілі на чыстых дошках у розныя бакі, як кляшні ў рака. Назаўтра, сустрэўшыся, кінула праз плячо быццам незнарок, грымнула так блізка, шаравой маланкай аглушыла — і зямля ці адцягне:

— Аднясі каменне, што брала... Сын казаў — яму самому яны патрэбныя...

«Нядобра, калі зязюля кукуе пасля заходу сонца», — тут жа успомніліся ейныя ўчарашнія словы. Надта скора спраўдзілася...

Ядзя ўжо не чула, як за плячыма плакаў уголас анёлахоўнік. Аднесці каменне?! А хіба гэта пазыка?! Гэта як выгнанне. Пасля чаго чалавек павінен сабрацца і пайсці ад людзей. Так зганяе з абжытага месца пярун, калі паліць дом...

Яшчэ і тыдня не прайшло, як цётка Анця сказала: бяры, ляжаць камяні, замінаюць, уросшы ў траву.. Чаму аднесці? Не было паміж імі ні свары, ні прычыны. Добра, што хоць яшчэ не заліла падмурак пад прыстройку... Цяпер Ядзя хадзіла, быццам збілася з дарогі на зямлі, згубіла час, пару. Увечары перад ноччу няўцямна падышла да ложка і стала складаць толькі што пасланую пасцелю. «А што гэта я раблю?» — спахапілася. Уначы брахаў глухі бабін сабака Букет, цяжкім безгалосным брэхам, нешта трывожыла яго па старой памяці, яго ўжо ў вёсцы, суверыўшыся, ніхто не падтрымліваў, адзін лес адзываўся, але сабака і яго не чуў — ён даўно ў адзіноце.

Уставала на досвітку, ішла ў лес. Быццам і не пужалі свежыя разоры дзікоў, незнаёмыя галасы ранішніх птушак. А тут, ужо вяртаючыся, раптам нешта выдалася: азірнулася — на ўскрайку ад дарогі стаяла... здань. Малое дзяўчо, якое за-

рана пабудзілі, ногі нягнуткія, тырчком, гэткі спатыкач спрасонку. Ці то ў старым адзенні, ці то пакрыта карой. У мурзатай руцэ, пэўна, ад учарашняга заціснуты зялёныя арэхі. Пакуль паспелі вочы ўбачыць — страх ужо скочыў на плечы, пэўна, ён пільнаваў яе ў лесе ўвесь час. Здань пагражальна знерухомела, каб счакаць, калі, нарэшце, пакіне чалавек лес.

«Аднясі каменне!..»

Вярнулася, у хаце ужо былі ўсе ўстаўшы — і муж, і дарослыя дзеці, рыхтуюць сняданак, смяюцца, шуткуюць. Ядзя стаяла ў парозе ўся мокрая ад расы. Ніхто не звярнуў на гэта ўвагі, не сказаў, каб хутчэй пераапранулася ў сухое. Мы, думала пра сябе Ядзя, інтэлігенты сельскія, народжаныя пад дажджом, пад снегам, на зямлі. Сапраўднаму гараджаніну тут лягчэй прызвычаіцца, яму патрэбен пляц і больш нічога. Яму звыкла жыць, як на лесвічнай пляцоўцы, абасоблена, адчужана, абы было дзе купіць малако, гідліва пазначыўшы свой посуд, як Клеапатра. Бо ён не зведаў шчаслівых вярыгаў вясковай сямейнасці. Яна ж будзе няўцямна шукаць тут сваю пакінутую калісьці, згубленую радзіму, будзе жадаць вярнуцца ў вясковую сям'ю. Але ж ці прымуць?..

Душа лёгка ашукваецца, абы заляцела пад страху хаты...

Неўзабаве пачаўся першы сенакос. Яшчэ адно ейнае лета зажата. Такая ўлюбёная пара, а цяпер... Цяпер яна паўсюдна шукала адказы на свае пытанні, бачыла ўсё перад сабой без замілавання, жорстка. І можа, праўдзівей, увесь час адчуваючы, як муляе каромысел, шыю не павярнуць, на якім старыя жанчыны носяць ваду з ракі, бульбу-паранку. Увесь дзень, бы замкнёнае ярмо на рабочых валах. Галавой наперад, крок павольны, шырокі, пагойдваюцца ўбакі ўсім целам — цяглавая хада. Здыме баба каромысел, посцілку пушчэйшую сцягне з ложка, пусціць на горшае — носіць на сабе ўзаплечкі траву, ахрап'е свінням, сена. Во, казала неяк цётка Анця, косткі павыпіраліся на нагах, перак становяцца, не можа знайсці абутку, у крыжы баліць, «палец на руцэ з начы не магу адхінуць, паглядзі, верхніх зубоў няма». Стаіць, лыж-

кай агурок выкалупвае, жалубае, есць семя, бы салодкі кавун. А трэба спяшацца сена ўхапіць — пагода ж стаіць, чакаць не будзе, пакуль аддыхнеш.

Спёка. Кожная баба, калі толькі мае, ідзе сенаваць з мужыком. Той каторы не вытрымае, сцягне кашулю праз галаву, а яна ідзе побач, прыбраўшыся, сукенка толькі што з шафы, колецца сенажатка ў ногі, ступае, як на абцасах. Нічым не парушыць адвечнага парадку, калі ўжо на людзях, хустку з галавы толькі скіне ажно ў паўдні — фэст! І старыя ў нечым дзяркатым здалёк, сагнуўшыся — спалавелым, заламаным макам у полі, — фэст!

Віхор падхопіць каслаўку сена і доўга трымае яе ў паветры, круціць над галовамі, бы хлапчук, скачучы на адной назе з граблямі. Паглядаюць на неба, як на кут, каб хаця не захмарылася. Без аддухі грабуць, пласцяць. Рыкае ўпаўдні ў вёсцы, не загнаная ў хлеў нечая карова. Ці сыдзецца ўжо цётка Анця з мададзейшымі? Паходка ейная ў пільніцу, як у смерча, ідзе пасярод дарогі, выпрастаўшыся, у думках яна ўжо далёка, на сваёй дзялцы. Быццам ні грудзей ужо, ні бядра, адзежа адным строем, абы цела ў чыстае захінуць. Але ж ніколі пры сваім мужыку, калі быў жывы, і ў старасці не пераапранулася, саромячыся, толькі калі станік папросіць зашпіліць. Неяк у лазні, мыючыся разам з цёткай Анцяй, Ядзя сумелася, убачыўшы тут, у вёсцы пад лесам, зблочаную працай, састарэлую... Венеру — учыненае ненаўмысля блюзнерства. Той самы ў яе схіл плячэй, і пена марской хвалі яшчэ не сышла з кволых сцёгнаў...

Вазы рыпяць, капытоў не чуваць, такая збітая дарога, адзін гарачы пыл. Сонца ўвесь дзень свяціла пільна, без аддухі, і пакідала поле апошнім, кацілася на захад нязвыкла цяжка, як не ў той бок проста пад конскія капыты, блытаючыся спіцамі ў калёсах. Не, пэўна, яшчэ заставаўся ў полі стары дзед, кульгавы, былы паліцай, недзе, з-за свету чалавек, казалі. Ніхто не падышоў да яго, не памог зложыць у капешкі, яго і цяпер баяліся, нават што добрае асцерагаліся зрабіць. І ён,

пэўна, да смерці так і будзе сабе думаць, маўляў, мала я вас немцу ўдаваў, свалату калгасную. Сціналася сэрца: не яго шкада, а ягоную старасць. Душа вон, так гроб, торба з ежай на ровары ўвесь дзень вісела нечапаная. Ішоў дамоў, ровар побач, як апірышча. Спіна мокрая, а там, дзе крыху ачахла, высахла — соль рагазамі, буйная, бы жарства, на пустой, мёртвай зямлі.

І так дзень — адодня. Выйшла ўвечары за вёску, яшчэ стаяў гарачы дух, пахла агарачкам першай падкапанай бульбы, спечанай тут, у сонечным попеле, пахла вячэрай. І пустое поле, і вёска здалёк падаліся незнаёмымі. І такі жаль забраў, як бывае, калі ты адлучышся ад людзей, а душа запатрабуе шчырасці. Тады ўжо ад сябе праўду не схаваеш, як на споведзі. «Збадзялася я па свеце, на чужыне...» — вымаўлялася не сваім голасам. Здэйся б, паднялася як стой з гэтага чужога гарачага камення і паляцела б на сваё зарослае, як пакінуты магільнік, селішча. Ніколі ты не будзеш у чужой вёсцы за свайго, звякуеш злоснікам з-за свету ці непамыслай нявесткай. «Ты добрая, калі багатая, — сказала неяк цётка Анця. Маўляў, лішку маеш, а жыць не ўмееш — раскідаешся, блазната!

«Аднясі каменне...»

А хіба хто лепшым быў да яе?! Адзін толькі хворы на галаву Тонік, сустрэнецца: «Здрасце і толькі вам, — скажа. А нап’ецца, б’е нагамі па веснічках дачнікаў: — Спалю, усю свалату спалю!» — як жыватом крычыць. Каб хто запытаўся: як маешся, скуль, чыя ты ёсць? Вымкнешся сам у гаворцы іншы раз, не ўтрываеш, аж горача, так хочацца сваіх успомніць. Няма з кім, ніхто іх тут не ведае. Толькі ў царкве, даўшы на памінанне, адным імем: Волька... Антык... Уладзя... Лёня, Бронік, Марыля... Толькі з Богам успомніш.

Неяк незнарок пачула бабіну размову з суседкай: «Дрэнь гэтыя наезжыя, пра што з імі пагаворыш? Таварышы нам — тыя, з кім дзеці гадавалі, з кім на работу хадзілі...» Казала

яна гэтак, быццам смуткуючы па роўні. І праўда, дачнікаў — ужо амаль палова вёскі, паміраюць старыя, прадаюцца хаты.

Заспяшалася дамоў, успомніўшы, быццам можна было нешта паправіць: яна ж так і не падала цётцы Анці вады?! Тая заходзідася ў паўдні. Ядзя пазбягала сустрэч, адчуваючы перад ёй страх, як перад стыхіяй, якая можа цябе зраўнаваць з зямлёй, так сабе, без дай-прычыны разгневаўшыся. Не магу пракаўтнуць, у роце сухата, жалілася Анця. «Ні ты калі што добрае з'еў, ні ты што добрае знасіў, без палудня, во, самы гіль, — як ухапілі раніцай па яйку, то і цяпер сыты...» Забавілася на хвіліну — і зноў у поле.

Не падала на тым разе, як папрасіла, конаўку...

Можа, і не даравала б пасля ўсяго, пасля «камення» гэтага, але карцела зайсціся да цёткі Анці па старой звычцы хоць на хвілінку. Хто вячэраў, хто мыў нанач ногі. Стол ужо стаяў перак, сям'я пабольшала — прыехалі памагчы сенаваць з горада сыны. Нізкая лямпачка над сталом высвечвала толькі схіленыя галовы, ціхія стомленыя твары. Малы ўнук нахіляецца над місай на падлозе, як над бягучай вадой, мые твар, потым залазіць з ножкамі, пялёскаецца. Баба стаіць над ім, трымае рушнік. Зачарэпнула з вываркі на падлозе вады, пліснула ў слоік, дзе было варэнне, п'е стоячы, прагна, да смаку, упусціла з рук чарпалку, бы незнарок, ды ведае, што трапіць. Кожны рух увечары надта дарагі. Малы, сеўшы на самы брыжок, можа, і заснуў, раптам кулікнуў бабе пад ногі, як птушаня з белага ўлоння місы. Тая крыкнула, засварылася, шкаматнула за каўнер, падняла. І зноў ціха. Яна яшчэ не выпусціла лейцы з рук, толькі, во, на момант паслабіла. А бывае, што ўсе пасядуць вячэраць напроці тэлевізара, на лепшай палавіне, і Анця сядзе разам і засне. Яе не чапаюць, сцішана гавораць, смяюцца, бы званочкі на мяжы каля яе ў галавах. Ускінецца, абвядзе невідушчымі вачыма хату, як не пазнаючы месца. «Вады...» — папросіць. Прынясуць, а яна зноў спіць. Яшчэ, пэўна, дзьме ёй у твар сухаветрыца, яшчэ не выйшаў з яе, як з вячэрняга поля, вялікі паўдзённы пал...

Усюды на вёсцы вячэралі.

І на небе запальваюцца ціхія агні, нізкія, пэўна, вячэрае ўседзючкі за свечкай у царстве нябесным Ядзіна мацерына, сялянская радня. А што калі й там яны не пазавуць да сябе вячэраць, угневаўшыся, што не прала, не ткала разам, не сенавала? Што здрадзіла свайму? Ці прабачаць, што зарасло травой-сенажаткай роднае селішча, зямля пустуе?..

Неяк ідучы з сяброўкай праз суседнюю вёску ў лесе да крамы па хлеб, Ядзя раптам спынілася каля хаты на пагорку. Галубовая фарба на сценах, пашчапаўшыся месцамі, абсыпалася, старыя дошкі зніціліся, аж свіцяцца. Вокны без фіранак, адно напроці другога, чыста, празрыста праз усю хату, нават панадворак відзён на тым баку, чапяла, патэльня на прыпечку, саганы... «Нежылы дом?!.» — узрушана прагаварыла. Сяброўка пацягнула за рукаў, усцішваючы, а можа, анёл-ахоўнік незалюбіў. Бо каля хаты нерухома стаяла, склаўшы рукі, старая жанчына таксама ў нечым зніцелым, выцвілым. Галубовыя вочы, набожна ўшчуваючы, пазіралі на незнаёмых людзей. І голасу не падала, так і стаяла, бы вынесены з пакінутага жылля стары абраз... Ядзя сумелася: няўжо гэта яшчэ жыве ў ёй падсвядома пачуццё бяздомнага чалавека, які слепа месціцца пад чужой страхой, век шукае сабе прытулак? Няўжо гатова зграбсці сваю сям'ю і пераехаць?!.

Позняй восенню, ад'язджаючы на зіму ў горад, Ядзя, як заўсёды, развітвалася з домам, з цёткай Анцяй. Ужо яна і за парогам. Тая, стоячы каля веснічак, сказала, быццам незнарок:

— Я ўсё хачу ў цябе, Ядзечка, запытацца: ці відаліся ўлетку з твайго акна мае макі?

Няўжо наўмысна была пасеяўшы якраз насупраць?!. І цяпер, выдаецца, трапечацца святло поўдня на кончыках рознакаляровых пялёсткаў. Праз несканчоныя затокі бульбы, праз платы, перакінула яна да Ядзі вясёлку сваёй кароткай,

як макаў цвет на адзін дзень, сялянскай уцехі. Ядзя адчула на момант, што яна, як у першыя дні тут, у вёсцы, шчымліва любіць гэты складаны свет.

Вярнулася, зноў таропка пайшла па садзе, абышла ўсю сялібу.

Каб паспець абнесці сабой, як любоўнай чашай, кожны куток свайго засмучонага апошнім часам Дома пад лесам.

# ДОМ ВОКНАМІ Ў САД

*Валянціну АКУДОВІЧУ*

*Між зоркай і бяссонніцай крыніц*
*цяжэй за ўсё адкрыцца чалавеку.*
*В. ЯРАЦ*

Ад вясны да позняй восені Хрысціна ў вёсцы. Ступіць за парог давідна, першым увайсці ў свет, як у касцёл, калі яшчэ і пеўчых няма. Птушка адна, другая, нізка, пстрычкай праляцела пад нябеснай столлю, раз-пораз пужліва мяняючы кірунак. І не палёт гэта, а проста сослепу нехта панікліва блукаў у цёмных калідорах паветра, шукаючы выйсця. Вяртаюцца з палявання, запазніўшыся, лятучыя мышы? Колкая згадка ў самыя босыя пяты, бы раптам убачыў нечый свежы след. Ноч адыходзіць. Ускалыхнулася на момант бялявае палатнянае святло, вецер сцягваў, складаў у чатыры столкі прасцірадла з твайго яшчэ цёплага ложка. Хутчэй на вышэйшае мейсца, на першы рад амфітэатра, каб быць найбліжэй, добра ўсё бачыць!

Першая аблачына слаба асвяцілася, паружавела на вачах, налілася малінковым, спела, як тугая набрынялая пупышка кветкі. І варта перавесці зрок, як пялёсткамі ўжо ірдзела паўнеба — лопнуў бутон і адавіў, не ўпільнуешся. Спелыя аўсы недзе пасярэдзіне закраталіся пад ветрам, поўсць — дыба, як на сытых клубах, бы там кідалася ўбакі буйваліца ў ахвоце, наважаная на ўсю ноч на доўгі ланцуг. Поле, лес, неба — усё ўбачанае ўпершыню гэтым днём, набрынялае, вядром зачэрпнеш расу. Шчасліва круціш гала-

вой, як у натоўпе, не ведаючы, да каго найперш павярнуцца, да каго найперш загаварыць. І дзень учарашні такі далёкі, як мінулы год ці нават чалавечы век.

Вяртаешся праз лес. Вавёрка перабегла дарогу, ускочыла на елку, зацокала, дражнячыся. Ты адазвалася ёй гэтаксама. Тая нечакана стала спускацца. Усё бліжэй і бліжэй. І раптам невядомы дагэтуль страх не патрапіць што зрабіць, што сказаць, калі спусціцца, падыдзе блізка. Ты ведала толькі тыя словы, якія звычайна гавораць дзіцяці ці лашчачы сабаку. Зніякавеўшы, заспяшаешся дамоў.

Вёска, выдавалася, не спала. Гэта быў не сон на досвітку, да сонца, салодкі й млосны, калі ўпушчаны з рук на кароткі час ночы сякера, лапата ці лейцы, а захінутыя фіранкі на вокнах бы на дзіцячай зыбаўцы пад нябеснай столлю. Дзяркач прыціснуты ў кутку панадворка, ад вясны да зімы ў тым самым, і бронь Божа, каб каму спатрэбілася яго назаўтрая шукаць. Анідзе каб якая парушына, толькі калі начная птушка праляціць...

А гэтае жытло быццам бы даўно і назаўсёды было пакінута чалавекам. Расчынены стары хлевушок, шэры няроўны паркан, не знятае праз усё лета лесвіца на страсе, калі правілі комін. І бульбоўнік даўно адцвіў. Зжываецца мейсца. Наўдачу, ці дабудзіцца калі сонца да тутэйшыга гаспадара. Спынілася на сваім панадворку пад маладым клёнам, пасаджаным калісьці, калі перабудоўвалі хату пад дачу. Кожны раз тут, пад дрэвам, бы чакаючы, калі ён нарэшце падрасце. А ўгары над галавамі, убачыла, ужо сёння распялены цёмныя шаты — вось ён і дарослы! Як далёка ўчарашні дзень...

На ганку тэрасы ляжалі два жоўтыя лісты дзявочага вінаграду, роўненька, разгладжаныя рукой, якраз, каб трапіць на вочы, умоўным знакам, што нехта прыходзіў і не заспеў. Хто той сябра, які ведае тваю мову? Здаецца, увесь час чакала вось такой размовы, як у японскім «хойку».

Гляжу — опавший лист
Опять взлетел на ветку.
То бабочка была.

Няўжо восень? Калі было?..

Вось-вось зараз праз адчыненае акно пазаве яе старая жанчына (бабуля? маці?) увесці нітку ў сляпое вушка іголкі, каб стачыць ейнае жыццё, зрабіць падобнае на людское, на жаноцкае. Не, ніхто ніколі з дарослых не дакучаў парадамі, маўляў, абавязкова патрэбна сям'я, якая яна ні ёсць, дзеці. Маці, перавязаўшы яе крыж-накрыж хусткай-раблёнкай, пайшла з дому і не вярнулася. Потым нехта падняў падпахі, ўссадзіў на лаву каля труны ў той самай хустцы. Маці ў старой сукенцы, каб людзям не відалася, накрыта да падбародка марлёўкай — зніцелым, змарнелым на сібірскіх ссылках калісьці дарагім вэлюмам, падараваным прыгожай сялянцы неспадзяваным жаніхом, польскім асаднікам.

І цяпер у сцюжу карціць змодзіцца, абвязацца хусткай крыж-накрыж — ахоўным матчыным знакам.

Неяк будучы ў Каіры, бачыла, як маладая, з бедных, егіпцянка паіла ў прыбіральні з крана дзіця. Адной рукой кубачкам да вуснаў малога, другую падстаўляла пад падбародкам, лавіла пацеркі кропель, каб не замачыць белую кашульку. Сачылася вада праз тонкія чорныя пальцы, як скрозь чорны мармур. З чашы ў чашу высечанага свяшчэннага фантана дзенебудзь у Сахары. Стоіўшыся, пустэльняй назірала за імі, адчуваючы, што ніколі не зможа  прагнаць смагу, не тое каб напіцца.

Бацькі, брат, сёстры, спяшаючыся, сыходзілі некуды па сходках кінутых разбураных падмуркаў, занесеных зямлёй. Можа, таму любіла хадзіць на старое панскае памесце за вёскай. Легчы, стаміўшыся, на пагорку, каля бэзавага куста, закрыць вочы. Трава над ёй, трава ўжо скрозь яе самую. Нехта ідзе, ідзе нячутна, толькі зусім блізка пах дарагой вырабленай скуры, высокія лёгкія боты з адваротамі. Вяртаўся з палявання былы гаспадар?

Пэўна, у гэтым месцы некалі была брама, тут наследавана — не размінешся. Лёгка падняцца з зямлі, не спужаўшыся памерці. Толькі, галоўнае, варта выбраць вось такое высокае месца, дзе прывідамі ходзяць летуценныя людзі, паэты. Толькі паспець самой надзець на руку срэбны пярсцёнак, падараваны мужчынам, на ім кветкі за дзвюма ахоўна перакрыжаванымі дзідамі.

Сярод знаёмых і сяброў яна адчувала сябе найбліжэй да таго незямнога свету.

Можа таму кожная хвіліна, як у шчаслівым падарожжы. Выдавалася, адчувае, бачыць, як рухаецца зямля. Перамена надвор'я — гэта проста новая прастора неба, куды яна час ад часу трапляе, вандруючы. Вось у хмары ўвайшлі, вось набліжаемся да ўсходу, як да новай краіны, дзе аблокі колераў кволых паўднёвых кветак, што цвітуць адно імгненне, да сонца. Можа таму лёгшы спаць, не адважвалася павярнуцца да сцяны. Да апошняй хвіліны забыцця тварам да ўсяго, што відаецца ў ейным акне! Той самы клён якраз насупраць. Арганічны жэст кожнай галіны. Сок ішоў па ствале не расплёскваючыся, моцным струменем, як вада ў вялікай рацэ, уверсе плаўна выгінаўся, разыходзіўся па рукавах. Тонкая кара пульсавала, дыхала. Малюнак галін не запамінаўся, быццам ён час ад часу змяняўся без ветру, з раніцы да вечара, праз ноч. Гэтае дрэва, пэўна, ведала, што яно стаіць пад акном, навідавоку. Вочы шкада заплюшчыць. А калі й заснуць, то як у абдымках, — не адварочваючыся.

Насустрач ёй выбеглі два сабакі, Марта і ейнае шчаня Мурза. Хрысціна любіла шуткаваць, маўляў, жыве ў сабачай чарадзе, у сабачай сям'і. Марта, абы адчыніў дзверы, кумільгам ляцела з прыступак на паляну перад домам. Нізка пластуючыся, кружаняла, набірала хуткасць, пятляючы, быццам блытала свой след ці йшла па чужым следзе. Усё гэта з маляўнічай усходняй плаўнасцю, неспадзяванай для яе невялічкай асобы. Спынялася раптоўна, бы сціхла ейная нікому, акрамя яе, нячутная старадаўняя музыка. Спынялася

каля самых ног, хлёстка ўскідвалася ўсім целам, месцячыся, каб адпачыць. Жаданне легчы як мага лягчэй, як мага бліжэй да зямлі, жыватом, усёй істотай, ішло хвалямі па поўсці, скочвалася рабацiннем, саслізгвала з хваста. Гэта быў ейны заўсёдны пры сустрэчы паляўнічы танец. Іншы раз таньчыла проста ад нечакана напатканай радасці. Было нават месца на пагорку, за вёскай, ідучы на старое памесце, дзе Марта танцавала амаль заўсёды, пэўна, каб пазначыць чалавеку спрыяльную зону на зямлі. Хрысціна ўскаціла туды камень — у падмурак свайго летуценнага дому. А ў ім — доўгі стол, не засланы, як калісьці ў ейным сірочым прытулку: звычайна ён змяшчаўся дзе-небудзь у былым панскім маёнтку. Дубовае дрэва стальніцы — сонечным промнем у глыбокай вадзе. І ўся ейная вялікая сям'я напроці. Застанецца толькі апазнаць кожнага ў твар па старых пажоўклых фотаздымках, — яна сама ўжо намнога старэйшая за маці...

Тады аднекуль паяўлялася і Мурза, яна аніяк не магла патрапіць. Як у час небяспекі, залазіла ў густы куст, каб перачакаць матчыну радасць. Марта высока падымала чорную галаву, зазіраючы ў вочы. Пад самай шыяй, прыхаваны ад сонечнага святла, танюткія разводы загадкавага малюнка з маціцовым бляскам. Так можна зазірнуць на самае марское дно, знайшоўшы на беразе пасля буры недзе каля Пафаса выцяты вякамі размаляваны каменьчык. Зблытаўшы невядомыя пароды, Творца паставіў свой знак, каб спыніць чалавека перад дзвярыма таямніцы ніколі непадобных адзін да аднаго непаўторных дварнякоў. Радаслоўная Марты, пэўна, вядзецца ад сабакі, што ў легендзе індзейцаў... Бог, стварыўшы людзей і звяроў, паставіў іх па розныя бакі глыбокай прорвы, каб нічога не пераблыталася. Яшчэ цёплая зямля краталася, прорва шырэла, зяўрала бездань, усё больш і больш раздзяляючы жывых істот. Калі, здавалася, ужо было не пераадолець боскую мяжу, сабака адлучыўся ад звяр'я і пераскочыў да чалавека...

Ясная раніца — гэта ўсё роўна як вельмі шмат цвітучых сланечнікаў. А калі падлога ў хаце чыста вымытая, то і ў небе хмар не відаецца. Дом вокнамі ў сад. Лясныя галасы ў свойскіх дрэвах: прыляталі з блізкага лесу дразды, сойкі, стаяў несканчоны гул на тэрасе, дзе жылі пад страхой чорныя восы.

— Як ты тут сядзіш, ходзіш? — пыталіся суседзі. — Яны ж такія смылючыя!

Восы садзіліся на салодкія яблыкі на стале, лезлі пад рукі. Яна слабка баранілася, бы разводзіла рукамі танюткае скрыпанае прадзіва. Мерна трымцела шаўковая ніць, ссукваючыся, наматвалася на сонечную шпулю. На старой дзічцы гнездзішча сарокі, тая крала яйкі з суседскіх хлявоў. Аніяк не ўдавалася людзям высачыць, дзе злодзейка селіцца, бы ў ейным рукаве. Урабляласе шкода і ёй самой, птушкі абіралі чарэшню, клубніцы. Ноччу, абы вочы спусціў, будзіла, трывожыла крыкам немаўляці сава, зеленькаватым вокам поўні ўсю ноч глядзела ў акно праз шчыліну фіранак, высочваючы чалавека, як мышу. І мела душа невытлумачальную на словах уцеху, калі нехта ціснуўся, будаваўся побач. Як ты парушыш той давер, спорыш гняздо вельмі рэдкіх цяпер, як казаў пчаляр, земляных чырвоных чмялёў у агародзе? Век у цябе на сцежцы ўчарашняе вогнішча, бы прыхаванае попелам, жывое, абы толькі ўзбіўся на яго незнарок.

Невядома, хто тут з іх усіх гаспадар, а хто госць, бо дом калісьці будаваўся сярод карчоўя высечанага лесу.

Мурза надта не дапытвалася, утварала разборкі з кратамі, з птушкамі, абы толькі хто дзе закратаўся. Увесь дзень у пошуках, каб каго заспець. Марта, тая гадзінамі сядзела дзенебудзь у садзе на пні ці на лаўцы, часцей позним вечарам, у цемры, у поўнай цішы, калі толькі ў твар — пахучы подых траў, начных кветак. Паклічаш — не адразу і галаву паверне. Збянтэжышся, бы парушыў глыбокі засяродак разумнейшай істоты.

— Чаго вы там забавіліся, ідзіце вячэраць! — пазаве хто-небудзь з дому.

— Цішэй... ноч на двары... — адзавешся не сваім паслухмяным голасам, бы нехта падасць табе знак маўчання.

У розныя бакі разыходзіліся хвалі спакою...

Для Мурзы сонца — гэта ўладар, паслухмяна сцюцюрыцца на прыпёку, заплюшчыўшыся. Марта, лежачы на сходках, на цёплым мейсцы, з асалодай паварочваецца з боку на бок, адчуваючы сонечны прамень, як ласкавую руку, яшчэ і голас млосны да яго падасць, грацыёзна пацягваючыся — патанае ў сваёй чароўнасці. Ёсць у прыроды дасканалыя формы — ніколі не нагледзішся. Успыхне іссіня-чорным блікам, падхопіцца, калі пройдзеш побач, у вачах столькі таго задавальнення, што на мове чалавечай называецца шчасцем. Глядзіць адна душа на другую. Біблейскае аб звярах «прах хадзячы», пэўна, дзеля таго, каб успомніць Творцу. У такія хвіліны Хрысціна спяшалася падабраць да яе ласкавыя словы, імёны, жадаючы патрапіць, жадаючы даць знаць, што адчувае ейную радасць. Паміж імі ўзнікала пяшчотная дзіцячая мова.

Добрая трэць зносін і паміж людзьмі не ў словах, а ў жэстах, рухах. Сабака ж чуе чалавека амаль заўсёды знутры.

Яна сама часта трапляла ў такі стан, калі яе агортвала пачуццё істоты, якая толькі што знайшла, нарэшце, ступіла на знаёмы зямны парог, перажываючы яшчэ адно жыццё на гэтым свеце — радасць вяртання.

Кім жа Марта была дагэтуль?..

Прыбягае Мурза, спыняецца, павольна асядае, як пад прымусам, не спускаючы вачэй з чалавека, каб не перарваць свой уважлівы пагляд. Што рэдка ўдаецца. Морду палажыла на лапы, рыхтуючыся да доўгай размовы. І... засынае. Дурэючы, сіллю перавернеш на спіну, яна пругка ўскочыць, услончыкам расставіць лапы, каб зноў не кульнуць, павядзе скамэршчаным носам, бы не пазнаючы гаспадыню.

Смеючыся з яе, падхопіш на рукі, яна мякка асядае, галава схіліцца набок, як у птушкі, абміраючай ад страху, нават поўсць мякчэе, робіцца нежывой. Мурза напамінала аб адчужанасці, жыла ў доме выпадкова прыручаным прышэльцам з блізкага лесу. Загаворыш да яе, а іншы раз ад аднаго пагляду, патуліцца, пачне расчулена церці абедзвюма лапамі мордачку, вушы — адным словам, удзячная, сарамлівая сіротка. Сцены, дом ёй — цесная замкнёная прастора, мілая няволя, дзе добра кормяць.

— Марта! Мурза! Есці! — нясецца па садзе.

Мурза ўжо тут, Марта абавязкова запозніцца. Нарэшце, з'явіцца на сцежцы да ганка, бяжыць, быццам спяшаючыся, дробным уборыстым крокам, бы даўно ў дарозе. Відаць, што добра чула гаспадыню, кліч заціснуты ў зубах вясёлым птушыным пёркам. Спыніцца раптоўна за колькі крокаў, глядзіць у вочы, стаіць паслухмяным ашуканцам, якому так лёгка паверыць, што ёсць у яе справы больш пільныя, чым сняданак ці вячэра. Ніколі галопам, ніколі з прагавітасцю да сваёй міскі, ейная далікатнасць здзіўляла, прырода ўвесь час клапацілася, пільнавала сваё ўдалае стварэнне. Мурза, тая акуратна, па-звярынаму, як ля вадапоя ў джунглях, маўляў, пакуль не нап'ецца слон, нават леў чакае сваёй чаргі, не падыходзіла першай да накрытага стала чалавека.

Прыязджаў такі-сякі госць. Убачыўшы сабак, прасіў даць лапу. Аніводная не разумела, чаго ад яе патрабуюць. Марта паслухмяна разглядаецца, шукае гэтую самую лапу вакол сябе, потым гарэзліва падскоквае, цалуе госця і ўцякае. Ніколі не паспееш адхінуцца, запярэчыць ейнай ласцы, у адно імгненне ветрам раптоўным сарваны яблыневы цвет проста ў твар, — ледзь чутны дотык. Ніхто з іх не падаваў пантофлі ў вітальні ці газету, чым звычайна ганарацца гаспадары сабак. Кожны з гэтых сабак выбіраў сабе тыя звычкі, якія больш падабаліся, аніякай дрэсуры. Госць хадзіў па садзе, захапляўся кветкамі, усякі раз нанова пытаўся іх назву, блытаўся: дэльфініум? душыца? зуброўка? І зноў вяртаўся да

размовы аб палітыцы, пра вайну ў Чачні, грабяжы й разбоі, пра гібель тысяч людзей, як статычны факт, голасна, на ўвесь сад. Прасіў нарваць кветак і забываўся забраць букет. Госці прыязджалі заўсёды з незразумелага ёй, варожага асяродка.

Не аб тым хацелася гаварыць, не аб тым. Такая дасада бярэ, бы апаў, запэцкаўся падкасаны рукаў, а ў цябе ўсе рукі ў зямлі. Нахілялася паправіць падвязаны куст кіпрскай вяргіні, хавала твар. Кветка невялічкая, як у нашых зімомых, тугая, пэўна, каб здужаць, не спячыся на паўднёвым сонцы. Не звярнуў бы ўвагі, каб не колер, густы, глыбокі, вабіў позірк, доўга не адпускаў і чалавека і пчалу, колер прагі завязаць насенне, не вырадзіцца.

Госць ад'язджаў. Яна гаварыла яму, што шкадуе аб ягоным ад'ездзе, яшчэ аб нечым, узрушана, палка. Яна яшчэ спадзявалася неяк наблізіцца душой, прыхінуцца ў самы апошні момант, на парозе. Вінавацiла сябе, спрабавала згладзіць сваю невясёласць, тады яшчэ не здагадваючыся, што згладжвала, хавала свой адыход ад людзей. Гэта былі развітальныя сустрэчы.

Госці, як прышэльцы, пакідалі трывогу.

Падзывала да сябе Марту, Мурзу, ішлі ў поле ці ў лес. Раптам вылеціць з-пад ног арлан, драпежная, злая птушка. Як рукой адпіхнуць, так блізка. Галавой уніз, высока падняты плечы, выразны малюнак пер'я на нерухомых шэрых скрыллях, як высечаны на камяні. Павісае прыгожай пагрозай, уступае сваё месца нехаця, сціскае кіпцюры, нарэшце адлягаючы. І адразу лягчэй, бы гэта ён дратаваў душу.

Яна жыла ў краіне сваёй душы, дзе час не супадаў з часам сённяшняга веку.

Любіла рыхтаваць ежу на жывым агні. Языкі патухаючага полымя на вуголлі — юлёвымі гіяцынтамі. Танюткая ножка вырастае на вачах, успыхвае дзікая кветка, трапечуцца празрыстыя пялёсткі ад гарачага подыху, кветка без лісця, на адно імгненне, калі зацвітае камень дзе-небудзь у

Міжземнамор'і, напоены з птушынай дзюбы. Не любіла сустракаць былых сяброў, асабліва сяброў дзяцінства, былых каханых. Пачуцці маюць свой тэрмін, сваю адлегласць. Ніхто не павінен, калі раптам пад нагамі — адно сухое рэчышча на месцы кароткай веснавой ручаіны. І нечага прыходзіць сюды, вяртацца, як бы ты ні быў знепрытомлены ад смагі. Любіла чытаць толькі што напісаныя ад рукі вершы, неапрацаваныя, як асабістыя да цябе лісты — ёй іх прывозіў дзеля парады малады паэт. У іх яшчэ адчуваецца свежае дыханне, напісана спехам, парывіста, пад дыктоўку з нябёсаў — і тут жа адасланае. Любіла старыя дрэвы, высока, магутна разгаліноўваюцца над галавой вякі, шум лісця водгуллем, ты быццам сведка іх доўгага жыцця. І як жа марудна падымаецца, расце пасаджаны табой дуб. «Я памру маладой...» — весела падумаецца адносна ягонага бясконцага века.

Ужо чакала праца ў садзе, штодня, чакала і напятае на падрамнік палатно даўно задуманай карціны. Але паміж мастацтвам і жыццём брала ў яе перавагу жыццё. Трэба было ратаваць яблыні. Надта блізка па каранях ішлі халодныя падземныя воды, дрэвы хварэлі на чорны рак. У вёсцы не было амаль ніводнага салодкага яблыка. Ёсць летнія, але іх ядуць толькі дзеці, стары чалавек не ўкусіць, не ўесць. Прыходзіла да яе на Спаса старая жанчына, суседка, па чырвоны сапкі яблык, каб адправіць унукаў да споведзі, да прычасця. Перад гэтым памые іх, прычэша, просяць дзеці адзін у аднаго прабачэння, мірацца паміж сабой. Потым — у бабулі, у маці. І толькі пасля — у Бога.

Бы па сходках, усё вышэй і вышэй падымаюцца, несучы ў руках галінку мірта.

Найбліжэй да яе бязгрэшныя звяры, дзеці. І старыя людзі, няўжо толькі таму, што яны ўжо слабыя, бездапаможныя — не маюць сіл зрабіць шкоду ці злачынства?!.

Кожную вясну хто-небудзь з вяскоўцаў зноў і зноў прасіў адкапаць корч зімовых кветак геленіума ці перэтрума, жа-

лячыся, што ў яго слаба нешта прыжываюцца. І ёй раіў, маўляў, пасадзіла б ты лепей болей ягадніку, кветку ж не з'ясі. Ніцелі ў чужых глухіх садах ейныя зёлкі, прападалі, даеш катораму, як на звод, на згуб сваёй душы. Раскашуе толькі бульба з буракамі, квітнее адным паганскім цветам. І дзіця неразумнае яго ў букет не збярэ.

Ейны сад квітнеў да позняй восені. Сад — любой парой сад. Ён яшчэ такі малады, што не чуваць шуму лістоты, вецце яшчэ не развілося. І птушкі яшчэ не селяцца, толькі прылятаюць залётнікам. Як няма мовы. Хай сабе і позняя восень. Такая пара, калі вячэрняя зара не разліваецца млосна па ўсім наваколлі, як летам, святло падае фіранкамі, бліжэй і бліжэй, на самыя вочы. Стаіш, як пад вянцом, ка́пае ружовы воск на рукаво. Ледзь абазначыцца поўня срэбным пярсцёнкам. На дрэвах ніводнага ліста, галлё ахутана адным ружовым святлом, бы цвіце абрыкос. Зара гасне, ужо толькі свеціцца вузенькі авал на гарызонце. Лясная птушка на тым, далёкім дрэве, відаецца наскрозь, графічна выведзеная тонкім пэндзалем на самым краі нябеснага блюда.

Часта наязджалі найбліжэйшыя сяброўкі, мастачкі. Гледзячы на гаспадыню, не ўседзіш, таксама працавалі ў садзе. Неяк перад самым ад'ездам у горад адна з іх раптам сказала:

— Буду ўспамінаць аб тваім садзе, як аб катарзе. Мне ўсё думалася, што некалі ж гэта твая шараварка ды скончыцца, прыедзем, будзем гуляць па лесе, маляваць, чытаць. А як аказалася, гэты сад не для цябе, а дзеля яго самога?!. Кветкі самазадаволена-злыя істоты, яны адабралі тваю прыгажосць, змарнавалі! Трэба нешта рабіць, ратавацца!

Хрысціна адчула неспадзяваную небяспеку: сяброўка рашучая, упарыстая, шкадуючы яе, вось зараз возьме высеча дрэвы, заарэ кветнікі, затопча! «Хутчэй бы да аўтобуса, а я тут... неяк жа яно будзе...» — і рукой, выдаецца, паказала ў той бок, да горада, далёка адсюль, каб не вісела над садам пагроза хмарай з градам. Лёгка, як ніколі, бегала, збірала ў

дарогу, адводзіла ад свайго гнязда. Усё навокал сцішылася, маўчала, быццам таксама пільнуючыся, калі ж ад'едуць. Адзін толькі голас скрозь чэзлыя сады, ледзь чутны, знямožаны, як над вадой, з другога далёкага берага ракі. Ці то спявала, ушчувала сябе, ужаліўшыся, родная па маці цётка Марыля, яна садзіла ружачку пад адзіным акном сляпой хаты, ёй кветкі, што сонца. А можа, адзывалася баба Настуля? Ніколі не бачыліся, але ведае ад людзей: яна разводзіла настуркі нават ля сваёй студні, з якой браў ваду ўвесь канец... Стаяць уваччу жанчыны ейнага сялянскага роду, ні зямлі, ні вады, адным словам — палянцы. Вось і маці, твар не памятае, толькі вось гэта: дастае скрэплымі на ссыльных вятрах рукамі з-за пазухі (хадзіла ў горы па дровы) сон-траву, а жадалася толькі аднаго — скарынку хлеба. Расхінаецца ў цяпле касматае апярэнне, точыцца цёмна-юлёвая дзюбка кветкі-птушаняці. Капае са столі зямлянкі, упаў пад ногі адталы ком гліны. Раптам ён скрануўся з месца, выпрастаўся, скочыў у лужыну — ажыла жаба? Заходзіцца ад здзіўлення душа. І цяпер, убачыўшы пад ейным хадніччком ля парога жабу, суседка брыдзіцца: «Ты б яе прагнала, гэтую паскудніцу!» Хрысціна патаемна ўсміхаецца.

Хто там адвярнуў камень, не чапайце, пад ім разам з жабінай ці з мышынай і мая нара...

Вернешся ад ракі — на руцэ сядзіць слімак, вінаградніца. Няўжо так доўга бавілася, абвіваючы любоўнай лазой увесь белы свет... Людзі хіба што не ведаюць: жыццё на зямлі суцэльнае, як вытканы святочны габелен: аніводнага спушчанага вочка, аніводнай брыдкай шэрай ніці.

Ад'язджалі сяброўкі. Ніколі яшчэ так не развітваліся, а гэтак чакалася сустрэчы. Як трывожны сон у дарозе: няўжо задрамала, няўжо гэта снілася? Цяпер яна перад людзьмі такая, якая яна ёсць. Зараз пазаве да сябе сабак. Трэба жыць, трэба зрушыць ейны «каўчэг» пасярод маркотнага разводдзя бульбоўніка, уратаваць кожную зёлку, салодкую яблыню дзеля Спаса, кожны зярнюк заводнай кветкі.

Хіба не чулі, што Бог пасе коней апакаліпсіса там, дзе раскашуе дзікая трава...

Позні вечар, трэба мыць лапы. Марта, як заўсёды, недзе бавіцца. Пачуўшы незадаволены голас гаспыдыні, кідаецца лашчыцца, просіць прабачэння, каб аніводнай хвіліны ў разладзе, у няміласці. Мурза, тая доўга штукуецца, не любіць вады. Хітруючы, агінае кусты, кветнікі, ідзе завулкамі, абы не напрасткі, каб неяк адцягнуць надалей непамыслае купанне. «Мы ніколі не разлучымся... Будзем жыць разам доўга-доўга, пакуль не надакучыць...» — гаварыла да іх, супакойвалася. Шчаслівa блытала тэрміны іхняга і свайго жыцця.

Будзем жыць доўга. Гэта колькі?

...Марты не стала зімой, калі былі пераехаўшы з дачы ў горад, ноччу.

Знікла, аніводнага гуку, ні стогну, толькі ціха выбірала сабе месца, асцерагаючыся настрашыць, бы ў доме на ейны час адныя малыя дзеці. І першае імгненне, калі толькі адышла ад яе, ужо нерухомай, заплюшчыла вочы, адчула ледзь улоўны дотык — ветрам сарваны яблыневы цвет пацалункамі проста ў твар, на рукі. Яна скрозь сон пакорліва ўсведамляла: гэта развітваецца Марта. Сёння яна сама разамкнула іхняе шчаслівае кулэчка. Раней, чым гэта быў вырашыў сам Бог. Дашчэнту стомленая бяссоннымі начамі, сёння ноччу перастала верыць, што ўратуе, перастала пільнаваць ейнае кволае жыццё. Бы дала згоду. Далучылася да ўсіх зняверaных, ужо народжаных стомленымі, не здатных зберагчы побач з сабой дрэва, птушку, звера, — адзін інстынкт самаабароны. Спаць, толькі адно — спаць... Стаміліся, паснулі, пэўна, усе німфы. Ці можа, перад зімой яны разам з птушкамі адлятаюць у цёплыя краіны?

Ноч якраз перад каталіцкімі Калядамі. Калі перад вялікім святам памірае чалавек, з яго здымаюцца ўсе грэхі. А калі бязгрэшная істота? Падносіла да газавай гарэлкі сернік і за-

бывалася, што хацела рабіць, агонь гас. У акне, бы ад ейнай запалкі, успыхваў кароткі зімовы захад і таксама хутка гас. Чорны сярнік яшчэ ў руцэ. Няўжо ўжо вечар? Толькі што бачыла раніцай свежы снег, толькі што нанова была пераслана зямля.

Яшчэ адзін дзень, пераажыты паасобку. Ранейшае жыццё аддалялася ўсё болей і болей ад ейнага берага, як вясёлы шчаслівы параход. У адзін час, амаль аўтаматычна загараліся вокны насупраць. Гукі з вуліцы, гукі дома разладжаныя, незразумелыя, бы на чужой мове, на незнаёмым месцы. Вячэрняе святло ліхтара ці проста яшчэ не пагашанае ад учарашняга, ранішняе? Мурза не пазнавала ў горадзе голас ветру, пужалася, і нават вада з крана губляла свой прыродны гук. Варта ляпнуць вечкам ці лыжкай, уздрыгвала, ішла з кухні, напружана цікаючыся, на адных пазногцях, на дыбачках, каб той, варожы ёй дух, не заўважыў яе, не дагнаў. Цяпер, як аказалася, яны тут дзве малазнаёмыя адна адной істоты: чалавек і сабака.

Цяпер нельга сказаць, што яна жыве ў сабачай сям'і. Гаспадыня нечакана выявіла, што зусім мала размаўляла з Мурзай, і тая ўвесь час, пільнуючыся толькі маткі, цяпер жыла, бы згубіўшы павадыра. Дом апусцеў, аглох. Нясцерпная патрэба, невымоўная, як у нямка, гаварыць некаму ласкавыя словы, перш-наперш ад самага рання, звыклае на кожны дзень, як адсунуць начныя фіранкі на вокнах. Мурза не выклікала пяшчоты. Дом калеў. У ейным доме цяпер зачынены самы светлы, вясёлы пакой, дзіцячы, і згублены ключ. Марта адчувала, куды паварочваецца сонца, абы яно яшчэ толькі абапрэцца адной пяцярнёй на падваконне, яна ўжо тут, дапільнавалася, злавіла. Ужо галаву падставіла, млосна заплюшчылася, сонечны прамень ужо ў тваіх руках, клубком, перакінутым ёю ў вясёлай гульні.

У доме павінна быць радасная боская істота, хай сабе і божая кароўка, якая раптам прачнецца сярод зімы, на раме,

і адлегласць да вясны намнога робіцца карацейшай. Радасная істота найбліжэй да Бога.

Стукалася, турбавала звонкавае жыццё, нікога не пазнаць.

— Хто там? — пыталася, перасцярожліва не адчыняючы дзвярэй, горад жыў па жорсткіх крымінальных законах.

Прыйшоў выклік ад сяброў з Германіі, на выставу, дзе павінны быць і некалькі ейных карцін. Даўно аб гэтым марылася. Але цяпер яна не паедзе.

— Чаму?! Што ў цябе такога здарылася? Паглядзі «Времечко», навіны, у свеце скрозь войны, забойствы, грабяжы, а ў цябе ўсёй бяды, што сабака прапаў! Гэта проста ненармальна! — дзівіліся сяброўкі.

Калі яшчэ, маўляў, здарыцца такая магчымасць, такі рэдкі выпадак трэба скарыстаць. Тым больш якраз упару ад'ехаць з дому, адхіліцца ад дробязяў. Але хіба яе, калі прыедзе з Германіі, нехта з іх забярэ ў сваю сям'ю, у шчаслівы дом, без супярэчнасцяў, да скону, як сабачая зграя? Няма куды перасяляцца, усё навокал цесна занята другімі людзьмі. І ці здольны сучасны чалавек, з вострым розумам, здзеклівы, прадпрыемец, даць адзін аднаму шчаслівы прытулак нават у каханні, радавацца кожны раз, калі ты проста пераступаеш парог не толькі знадворку, а з аднаго пакоя ў другі, праходзіш побач, як гэта ўмее кожны сабака. Ёй усё роўна трэба будзе вярнуцца на гэтае пустое месца. Астыгне, зусім выдзьмецца жылы дух за час ад'езду. Ёй трэба зараз, з першай хвіліны, ад парога пачаць абжывацца нанова, раздзьмухваць вугаллё. З гэтэга самага, з паламанага, як пасля навальніцы, сярод разбою і грабяжа, скласці цёплае гняздо. У яе толькі вось гэты кавалак зямлі пад нагамі, яго трэба ўрабляць, як сад у вёсцы.

На зжытым месцы душы не селяцца.

Званіў тэлефон. Гатова прасіць: пагаварыце са мной, распытайце мяне. У бягучай мове, як рацэ на схіле, лягчэй знайсці выйсце, супакоіцца, разбурыць грэблю перадумак.

Маўчанне сам-насам шкодзіць. Але ніхто з сяброў не ведаў, што ёй сказаць, толькі адно тое: хопіць, кінь, сабака таго не варты. Тады проста пабудзьце разам, моўчкі даўшы сваю згоду на спачуванне: плач, я тут, з табой побач, плач, я разумею. «Заходзьцеся, мне будзе весялей...» — хацелася сказаць, і не было каму. Усплывалі на памяць гэтыя словы, якіх быццам і не ведала ніколі, так кажуць адна адной, труднуючы ў адзіноце, простыя вясковыя жанчыны, калі нехта дарагі сыходзіў з хаты назаўсёды.

Хтосьці пужаўся за ейны розум, хтосьці саромеўся аб ейнай бядзе гаварыць, каб не выглядаць дзіваком. Яна раптам адчула адзіноту, як у дзяцінстве, калі тваё гора для дарослых проста дробязь. Маўляў, жыццё яшчэ не наследавала табе, не пакінула горкага вопыту, забаўляйся пакуль, чым маеш. Самі дарослыя ўжо прызвычаіліся да бед. Мэнкі іхнія, пакуты — сапраўдны тэатр, дзе ёсць жалобныя песні, смутак выражаецца ў танцы. Можна апрануць рытуальнае чорнае адзенне — і тады кожны жывы чалавек пачціва дасць табе дарогу, каб не ўгнявіць вышняга.

Дзеці ў бядзе безабаронныя, яны не «ўмеюць» пакутаваць, — нічога акрамя адчаю.

Цяпер яна ні з кім пра Марту болей не загаворвала, адварочвалася, плячыма захінаючы свой свет, даўно забыты, занядбаны людзьмі. Цяпер ёй успомнілася, як пры сустрэчы, ці прыйшоўшы ў госці, шаснаццацігадовая дачка сяброўкі купляла ёй шакаладку: ты, маўляў, у нас дзяўчынка, смяялася.

Зазірала ў вочы набожная суседка:

— Засталася была свянцоная вады, калі поп адпяваў майго бацьку. Глядзіце, наказваў, не дайце яе сабаку, каб ён і канаў ад смагі, лепш кветкі паліце...

Няволле, казала, плакаць па сабаку, перажываць, грэх гэта, бо чалавек найвышэй за ўсіх звяроў, ён павінен над усімі панаваць... Ужо ўсе роўныя, пярэчыла яна суседчынаму Богу, бо ўсе ў небяспецы, пад пагрозай, — атручана зям-

ля, вада, — усе, як на Ноевым каўчэгу. Усіх шкада, хто гіне, і можа, найбольш бязгрэшнага звера. У чалавека ёсць радня, блізкія, яго абараняюць законы, ён мае розум, мову. Звер безабаронны. Бяздомны сабака не віе сабе гнязда, не рые нару, спіць холадам у горадзе на незамярзаючым вечку вадасцёкавай трубы, бы гэтая ягоная бяздомнасць часовая. Абы неяк перабыць, неяк перачакаць, пакуль чалавек нарэшце злітуецца, забярэ яго да сябе. А чалавеку дварняк як ганьба, «новы беларус», упадабаўшы моднага шчанюка, праз некаторы час прывязе яго ў ветлячэбніцу ўсыпіць, маўляў, псуе абіўку дарагой машыны або не падыходзіць да яе па колеру... Частка інтэр'еру, не болей.

Пасля размовы з суседкай яшчэ тужэй сціналася кола адзіноты.

Кім жа Марта была раней? А яна сама? Хіба магчыма прывязацца гэтак адзін да аднаго на працягу кароткага жыцця?

Дрэвы за вокнамі стаялі ўначы высокімі чорнымі кандэлябрамі да самых зорак, трашчалі агаркі. Вецер яшчэ раз завядзе рукавом — і раніца. Сляды халоднага полымя на шкле віхрамі. Усё прыгожае ў прыродзе цяпер выклікала сум. Як не можаш у поўнай меры, сэрцам, цешыцца прыгажосцю дзяўчынкі-калекі. Ніколі не любіла зіму, цяпер ёй гэтая зласвесная белата скрозь рассыпанай атрутай. Вокны не завешвала. Агні таксовак на тым баку сквера па-вясковаму нізкія, падслепаватыя, як у лазні. Штовечар да самай раніцы спыняўся пад вокнамі аўтобус, гразкі, зմораны, у кабіне спаў чалавек. І ёй ужо весялей, бы нехта ўлёгся ў нагах, праводзячы з ёй разам бяздомную ноч. Батарэі грэлі слаба, дом прамярзаў на трэску, выдавалася, мароз хадзіў па падлозе, перабіраў масніцы.

Нечакана згасла святло. Свечку не запальвала, цемра ахінала як забыццё, супакойвала. Засынала нахаду, седзячы, звесіўшы галаву, бы на вечку вадасцёкавай трубы, увесь час

пільнуючыся, каб ніхто не наступіў, не ўз’ехаў. Гэтаксама раптоўна і прачыналася сярод начы, у хустцы крыж-накрыж, завязанай падпахі. Мурза стаяла на парозе ў ейны пакой. Пераступала з лапы на лапу, вытарашчыла вочы, бы дзіця ў начной кашулі, разбуджанае знянацку. Вось-вось не пазнае, дзе яна ёсць спрасонку, і заплача. Яна сама толькі што крыху агледзелася. Трапіў на вочы, сам выйшаўшы з цемры, плецены падножны табурэцік каля крэсла, вугал пляцёнага куфэрка на кухні, дзе хавала сухія зёлкі. У люстэрку насупраць — секцыя з кнігамі. У той дзень пасля Марты была сплюшчылася на ейных вачах на пустую пушку ад сярнікоў у сціснутай руцэ. Усё паасобку, бы толькі завезенае ў дом.

Дзень на дзень нагрувашчваўся гурбамі. Якраз насупраць чарнела пустое варонне гняздо. Пазірала на яго, як у акно свайго пустога дома. Яна магла б жыць і ў птушынай зграі, самага нізкага птушынага сану, абы сям’я. Пакідала на балконе зерне, але вялікімі маразамі сініцы не даляталі да ейнага паверха — зусім гублялася сувязь з сусветам. Голас згас, нічога не магло ўзбудзіць гаварыць да некага, нечым захапляцца, мова перасыхала. Горача рукам, бы вось толькі што спусціла хворую Марту на падлогу. Выходзячы з дому па такой-сякой патрэбе, спяшалася вярнуцца, каб заспець яшчэ тое, што толькі тут, у ейных сценах. Хутчэй вярнуцца на тое месца, дзе разышліся. Іншы раз туга, адчувальная на дотык, з абодвух бакоў, ад Марты.

Гэта калі ведаеш, што нехта ў дарозе дадому і дарога тая здоўжылася абедзвюм. Тады йдзеш адчыняць загадзя засувень у сенях, не закладаеш клямку нанач. Або выходзіш насустрач, каб зрабіць дарогу таму, хто да цябе ідзе, карацейшай. А можа, проста сесці, склаўшы рукі, і толькі — чакаць... Мурза таксама, варта было спытацца, дзе Марта, бегла на акно, глядзела на вуліцу, яхкала. Пачуўшы яе, бяздомныя сабакі спыняліся, глядзелі на яе, задраўшы галаву, утрапёна, аж на трэці паверх, як на каменнага бажка.

Яшчэ яны не разлучаны, пакуль паміж імі смутак.

Перажывала прагна, як нешта апошняе, падараванае пры жыцці пазнанне. Ніколі раней не думаючы пра смерць, адчула сябе на апошнім схіле круга — цвяроза, жорстка, без шкадавання. Смерць, наведаўшыся ў ейны дом, закранула і яе самую, высвеціўшы сівыя валасы, крыху згорбленую постаць далёка немаладой жанчыны. Зачынены дзіцячы пакой у ейным доме, у якім хацелася заўсёды смяяцца, радавацца, весяліцца, летуценна схавацца ад лёсу, ад людзей, якія нават у вочы лічылі яе няшчаснай. Зажылася яна сярод дарослых. Быццам зазірнула ў радавое скляпенне — усе сваякі даўно там і нікога з жывых побач, хто б яе разумеў. Рвала, нішчыла паштоўкі, лісты, фотаздымкі, якія берагла, даражыла, прыбіралася ў доме, як пасля нечыяй чужой смерці, калі табе самой ягонага нічога не трэба на памяць — хавала ад зняважлівых вачэй. Марта цяпер выдавалася далёкім мроівам. Як галюцынацыя ад скрыжавання промняў святла, вясёлкавае, радаснае да слёз — не ўтрымаць рукамі, не ўберагчы.

Прычына знікнення ў ёй самой — змяніўся зрок, надышла старасць.

Жыццё кароткае і тленнае.

У сне ці яўна звязвала ўсё нажытае ў невялічкую вязку, каб толькі ў адну руку, звала да сябе ўсіх сабак і бегла з імі да той прорвы, што паміж людзьмі й звяр'ём, вяртаючы іх назад. І сама хацела яе пераскочыць. Нехта паблажліва ўсміхаўся, нехта здзекліва, а каторы й баяўся сустрэцца вачыма, як з вар'яткай. «Маеш, што заслужыла, мілачка! Молішся мала!» — крычала ўслед багамольная суседка з помслівым захапленнем. Ейная праўда, не турбавала Бога просьбамі, узяўшы сабе найменшае, тое, што не надта людзям абходзіць. Толькі, во, у першую хвіліну, калі не стала Марты, прасіла перад абразамі: «Вазьмі яе, Божа, сабе ў ахову... Паклапаціся, упусці яе ў дом вокнамі ў сад...» Бегла. Ніхто не затрымліваў. Як раптам на ейнай дарозе стаў

манах у беднай рабіце, стомлены ад доўгай пешай хады. Незнаёмец ушчувальна ўсміхаўся, ля ягоных ног ляжаў уціхаміраны воўк. Дзікія галубы сядзелі на плячах манаха, пырхне каторы, пад ягоных, цёмным скрыллем, як пад габітай, асвеціцца чыстае танюткае пер’е. Яна яго дагэтуль не ведала, вось толькі што, пэўна, перад сном перагарнула нейкую кніжку. Каталіцкі святы Францыск Ассізскі? Які чытаў пропаведзь «сёстрам ластаўкам і братам кветкам», адухаўляў прыроду? Якое стагоддзе? Пачатак трынаццатага. Які доўгі ягоны шлях...

Якое доўгае жыццё... І нятленнае, падумалася, і толькі гэта. Як нехта здымае з пляча ейную ношку, каб аслабаніць. Нехта кладзе на плячо белае крыло адзення першых хрысціян, яго павінны былі насіць пасля хрышчэння цэлы тыдзень — знак чысціні. І перад ёй ужо не манах, а ксёндз Ян з прыгожым аскетычным тварам, як з фільмаў шведа Бергмана. Хлопчык у белай комжы падносіць пад падбароддзе срэбны сподак. Падаюць у яго хрусталёвыя кроплі свянцонай вады.

— Яна хоча ўзяць другое імя — Францішка... — кажа нехта.

— Цяпер у цябе, Хрысціна-Францішка, яшчэ адзін апякун, — тлумачыць ксёндз.

Нікога не было побач, а тут — вакол цэлы натоўп радасных людзей, усе абдымалі яе, віншуючы...

Вядома, што сон, але які праўдзівы.

У ейных скрэплых руках ляжаў чорны францішканскі ружанец, бы ўкладзены некім ёй, памерлай, у труну.

У двары выў сабака. Мароз, позні вечар, і ходзяць людзі. Ён засяроджана, нічога не бачачы, падымае ўгору галаву і нават ледзь-ледзь ківаецца ўбакі, упаўшы ў экстаз, вые. Сёння ягоны гаспадар, бачыла на свае вочы, пераехаў у дом са знесенага жытла. Знесена і сабачча будка. Прыйшоў ён сюды за гаспадаром, пэўна, сам. Але ў гарадскую кватэру яго не збіраліся браць. Голас сабачы нязвыклы, лясны пасярод го-

рада, якраз бы з ейнага лесу каля ейнага дома вокнамі ў сад.. І надзіва не сумна было слухаць яго, не на бяду ён вые.

Няхай галосіць, абы хоць хто-небудзь з двух, чалавек ці сабака, яшчэ не згубіў прывязанасці, любові адзін да аднаго...

Раніцай прыляцелі пад акно сініцы ў вясёлых навагодніх масках. Пэўна, адваліўся мароз...

# Змест

Два гады да вясны ... 4
Месячная камея ... 14
Ад халоднага боку сонца ... 26
Каціўся пярсцёнак ... 49
Асеннія птахі ... 58
Сухія навальніцы ... 67
Сад нявіннасці ... 78
Коні ... 90
На плывуне ... 102
Ханна мурза ... 109
На зяленым чаўне харона ... 120
Азярод ... 134

Трыпціх

Дом на захадзе дня ... 143
Дом пад лесам ... 157
Дом вокнамі ў сад ... 170

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Марыя Антонаўна Вайцяшонак
Сад нявіннасці
Апавяданні

Адказны за выпуск *А. Аношка*

Рэдактар *А. Масарэнка*
Карэктар *Н. Ражкова*
Камп'ютэрны набор і вёрстка *Д. Андрэеў*
Вокладка *Д. Кандрацьеў*
Фотаздымкі *М. Вайцяшонак*